- Гадавік газэты -

# БЕЛАРУС

студзень 2022 - ліпень 2023

## ВОЛЯ ДЗЕМКА

*«Я была, ёсць і буду беларускай»*



## Ад галоўнага рэдактара

*Адказны рэдактар газэты “Беларус”*
***Ганна Сурмач***
***Ліпень 2023***

Шаноўныя сябры!
Перад вамі першы выпуск “Гадавіка газэты “Беларус”. За ўсю гісторыю свайго існаваньня ад 1950 году газэта “Беларус” прайшла праз розныя ступені свайго разьвіцьця. Рэдакцыя мяркуе, што гэтае разьвіцьцё адбывалася ў прагрэсіўным накірунку і выводзіла наша выданьне на больш высокую ступень. Нашы папярэднікі і сучасны склад Рэдакцыі заўсёды імкнуліся ісьці ў нагу з патрабаваньнямі часу, адпавядаць узроўню грамадзкага разьвіцьця.
Большую частку свайго шляху да чытачоў газэта прайшла ў традыцыйным пісьмовым выглядзе і ўсе выдадзеныя асобнікі газэты захаваліся ў архівах і бібліятэках, куды паступала газэта. Год таму Рэдакцыя зьвярнулася да чытачоў і прапанавала перайсьці ў віртуальную прастору, што дазваляе сучасны ўзровень навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ад газэта пачала выходзіць у інтэрнэце і яе сайт “Bielarus.info@ працягвае жыцьцё газэты. Выданьне стала больш аператыўным і дазваляе кожнаму аўтару без лішніх праблемаў падаваць свае інфармацыі ў газэту.
Аднак, Рэдакцыя таксама прыйшла да высновы, што нельга зусім адмаўляцца ад пісьмовага варыянта, каб ён мог захоўвацца ў архівах і бібліятэках, а таксама стаць даступным не толькі ў інтэрнэце. Так узьнікла ідэя раз у год выдаваць пісьмова падборку найбольш зьмястоўных і цікавых матэрыялаў, якія былі на старонках сайту газэты, пад назваю “Гадавік газэты “Беларус” з пазначэньнем крайніх датаў публікацый.
Прапанаваны вашай ўвазе зборнік - гэта наша першая спроба і яна не зьяўляецца поўнасьцю адпрацаваным варыянтам, форма будзе ўдасканальвацца ў працэсе далейшай працы. Трэба адзначыць, што гэты выпуск абмяжоўваецца рамкамі аднаго года - ад ліпеня 2022 па ліпень 2023, фактычна, гэта перыяд ад пачатку выхаду інтэрнэт- сайту амаль да часу перадачы зборніка ў друк. Магчыма, у далейшым лепш будзе, каб “Гадавік” супадаў з рамкамі аднаго календарнага году. Па розных прычынах зараз не вытрыманы поўнасьцю прынцып расстаноўкі матэрыялаў па датах. Падаецца, што ў далейшым больш мэтазгодна імкнуцца да расстаноўкі па датах публікацый.
Рэдакцыя будзе ўдзячная за прапановы нашых чытачоў, як удасканаліць выданьне, а таксама і за крытычныя выказваньні, якія дапамогуць нам палепшыць зборнік у далейшым. Дасылаць іх прапануем на сайт газэты.
Рэдакцыя выказвае падзяку намесьніку рэдактара газэты сп. Міхалу Чаропку, які выканаў пераважную частку працы па фармаваньню зьместа зборніка.





# БЕЛАРУСКІЯ ВАЛАНЦЁРЫ УКРАІНСКАГА ФРОНТУ



***Галіна Пазьняк***

**Расейская акупацыя Беларусі** і напад Расейскай Федэрацыі на Украіну -- дзікая, барбарская, сярэднявечная вайна з боку расейцаў супраць украінцаў, вынішчэньне ўкраінскага насельніцтва, жудасныя злачынствы расейскай ваеншчыны супраць чалавецтва скаланулі сэрца і розум многім людзям. Эўропа і цэлы сьвет пабачылі крывавае аблічча дзяржаўнага расейскага нацызма, які паўстаў разам з ідэялёгіяй і агрэсіяй “русского міра”, гэтага пачварнага расейскага монстра, які ненавідзіць вольныя народы, нацыі і культуру.
**Акупацыя і вайна** выявілі сапраўдную цану людзям. Шмат якія беларусы, знаходзячыся пад гнётам беззаконьня і рэпрэсій антынароднага рэжыму, зьдзеку і вынішчэньня, знайшлі ў сабе сілы для супраціву акупантам і волю дзеля дапамогі ўкраінцам.
**Беларусы замежжа паехалі** дабраахвотнікамі ваяваць супраць рашыстаў за Украіну, іншыя сталі зьбіраць сродкі дапамогі для ўкраінцаў, стварылі валанцёрскія арганізацыі для забесьпячэньня ваенным рыштункам украінскай арміі і беларускіх змагароў за Украіну (батальён Каліноўскага і іншыя групы). Людзі ахвяруюцца сваім часам, працай, заробкам, дабрабытам дзеля дапамогі братам па змаганьні, бо кожны валанцёр-беларус разумее, што рускага мордара трэба спыніць, зьнішчыць і разьбіць, што ад перамогі ўкраінцаў будзе залежыць таксама і вольная будучыня Беларусі.
**У Польшчы, у** Злучаных Штатах, у Канадзе – усюды, дзе жывуць беларусы, ёсьць разуменьне трагедыі Беларускай нацыі, якую вынішчае прамаскоўскі акупацыйны рэжым, ёсьць салідарнасьць з Украінай і падтрымка справядлівай барацьбы ўкраінцаў з маскоўскім агрэсарам за існаваньне, волю і незалежнасьць сваёй Айчыны.
**Тут падаем распow** у форме інтэрв’ю пра Беларускі валанцёрскі цэнтр ў Нью Ёрку, які дзейнічае пры Саборы Сьв. Кірылы Тураўскага Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы у Брукліне. Дзейнасьць цэнтра падтрымліваецца Парафіяй Сабору і Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем (БАЗА).
**Галіна Пазьняк размаўляла** з актыўнымі працаўнікамі гэтага цэнтру - Андрусём, Віктарам і Валерам (празьвішчы не называем з меркаваньняў ваеннага часу).
**ВЫБАР**
**Андрусь і Віктар** -- беларускія валанцёры ўкраінскага фронту, пасябравалі яшчэ на Бацькаўшчыне ў Беларусі, разам займаліся спортам, у лукашысцккай турме сядзелі разам за апазыцыйную справу, потым выйшлі з турмы і разам дабраліся да Амэрыкі.
**Галіна Пазьняк (далей -** Г.П.): Як атрымалася, што вы сталі валанцёрамі ўкраінскага фронту?
**Андрусь (далей – А.**): 24 лютага я глядзеў навіны і даведаўся, што пачаліся абстрэлы Украіны з боку Расеі. Я патэлефанаваў сябру Паўлу, які знаходзіўся ў ЗША на спартовых зборах. Павал – беларус, удзельнік Алімпійскіх гульняў, майстра спорту міжнароднага клясу. Ён кажа: “Прыязджай, мяне забірай. Я еду на вайну.”
**Я скокнуў у** машыну, еду, зьбіраю торбы для Паўла. Частку рэчаў аддаў Віктар, частку я, плюс яшчэ на двух хлопцаў і нешта для трэцяга жаўнера -- тое, што ў нас было. Першых нашых беларускіх дабраахвотнікаў мы экіпіравалі. Мы аддалі свае шлемы, свае бронекамізэлькі, усялякія падсумкі, дзяжкі і іншыя рэчы, і хлопцы былі цалкам падрыхтаваныя (акрамя зброі).
**Г.** П.: Выглядае, штоў вас ужо было ўсё патрэбнае для вайны?
**А.**: Усё неабходнае, каб перайсьці з цывільнага жыцьця да вайсковага, у нас было. Мы з Віктарам ўсё жыцьцё займаліся актыўным адпачынкам і ўдзельнічалі ў розных спаборніцтвах. Пэўныя спартовыя спаборніцтвы патрабуюць наяўнасьць такіх рэчаў. У некаторых спаборніцтвах ты ня можаш удзельнічаць, калі ў цябе няма сваёй зброі, свайго пісталета, сваёй бронекамізэлькі. Гэта абавязковы рыштунак. Таму ў нас усё гэта было. Гэта ўсё каштуе дорага, але мы не задумваючыся аддалі нашым хлопцам, бо мы сабе тут яшчэ набудзем, а хлопцам гэта патрэбна менавіта зараз.Таму нашым хлопцам, якія сьпешна зьязджалі са Злучаных Штатаў на вайну ва Украіну, не трэба было хваляваацца за асабісты рэштунак, мы адразу ж



привезьлі ўсё і распавялі, як чым карыстацца.

**Далей зьвязаўся з** іншымі беларусамі. На раніцу другога дня вайны мы сустракаемся, ідзем па крамах, набываем ўсё, што змаглі з іх выграбсці: навушнікі, рэчы медычнага прызначэньня, нейкія хімічныя сродкі, нажніцы для разразаньня вопраткі пры аказаньні першай дапамогі і г. д.

**Г.** П.: Бяз вашай дапамогі (ня толькі вашай асабістай, але і шмат каго іншых), экіпіраваць беларускіх жаўнераў на фронце было б цяжка.

**А.**:З першага дня вайны нашыя сябры-беларусы трапілі да ўкраінскай тэратэрыяльнай абароны, і ўсё, што ім там выдалі -- гэта “падсумак” на чатыры “магазіны”, камусьці пашанцавала і яму далі яшчэ рэмень, аўтамат і патроны. І ўсё. З такім малым рыштункам шмат не наваюеш, сучасная вайна – ня танная і вайсковае забесьпячэньне дарагое.

**З гэтага і** пачалася нашая праца, каб у нашых людзей было ўсё неабходнае, што забясьпечвае ахову жыцьця вяароў на вайне.

**Г.** П.: Вы з Віктарам кінулі дзеля валанцёрства сваю працу. Але, бяз працы ў Амэрыцы выжыць немагчыма, як вам даводзіцца самім выжываць?



**А.**: Так, мы з Віктарам часова не працуем, я спадзяюся, што на пару тыдняў ці на месяц у нас яшчэ грошай хопіць. Потым прыдзецца зноў вяртацца да працы, бо на тыя грошы, што намі былі зароблены раней, доўга тут не пражывеш. Відаць прыдзецца мяняць працу, напэўна, на цяжэйшую, але каб было больш вольнага часу, каб працаваць 2-3 дні, астатняе -- на нашую валанцёрскую патрэбу.

**Пэўныя сувязі і** шляхі ўжо наладжаны, але ўсяроўна яны займаюць шмат часу. Зараз жа мы з Віктарам не займаемся нічым іншым, акрамя валанцёрскай арганізацыйнай працы: зьбіраем грошы, арганізоўваем, закупляем рыштунак, адпраўляем.

**Да нашай валанцёрскай** працы далучыўся яшчэ сябра Валера, які працуе кіроўцам “траку”. Ён шмат ахвяруе грошай на вайну, каб задзейнічаць валанцёрства. Ён мне сказаў: “За тваю кватэру плаціць буду я, каб ты не адхіляўся на такія клопаты. Займайся, чым трэба займацца”.

**Г.** П.: Днямі я размаўляла па тэлефоне з Валерам. Вось што ён мне распавёў.

**Валеры:** Як толькі пачалася вайна 24 лютага, я таксама хацеў стартаваць ва Украіну. Мы з хлопцамі доўга размаўлялі. Мне казалі: “З цябе ваяр – так сабе. Што ты ведаеш пра тактыку боя? Анічога. Не валодаючы ваеннай падрыхтоўкай – ты цяжар для іншых жаўнераў. У нашай вызвольнай справе, на аднаго байца павінна працаваць у тыле каля 12 чалавек, калі ты здолееш забяспечыць хлапцоў неабходным рыштункам гэта будзе лепшы ўнёсак у агульную справу. Ты тут сам можаш зарабляць рэсурсы на фронт. Сёньня жадаючых ваяваць больш, чым зброі. Але, ня кожны можа зарабляць і ахвяраваць грошы”. Мы прынялі такое агульнае рашэньне: дапамагаць тым, хто на фронце, каб яны засталіся жывымі і перамаглі.

**Кожны з нас** выбірае, дзе яго ўдзел будзе больш патрэбным. Таму на дадзены момант мы прынялі такое рашэньне. Праўда, нашае рашэньне застацца тут і дапамагаць было для нас даволі цяжкім, хацелася таксама далучыцца да тых, хто змагаецца там, на лініі фронта.

**А.**: Усё так. Валеры нам вельмі моцна дапамагае з першага дня. Калі звоніш яму і кажаш, што ў нас закупка і нам не хапае некалькі тысячаў даляраў, ён проста адразу закрывае сваімі грашамі гэтую праблему, плюс ён дае вельмі добрую рэкляму сярод сваіх “дальнабойшчыкаў”, з якімі працуе. Людзі тэлефануюць і кажуць, што яны ад Валеры, якi ім сказаў, што трэба тое і тое. Давайце гэта зробім.Валеры дапамагае вельмі моцна.

**Г.** П.: Андрусь, пра сваё валанцёрства вы распавядаеце, як чалавек дасьведчаны. Адкуль у вас гэты досьвед?

**А.**: Я служыў у войску ў 103-й асобнай мабільнай брыгадзе, быў гранатамётчыкам і восем гадоў праслужыў у МНС (Міністэрстве надзвычайных сітуацыяў). Зброі там не было, але ўвесь астатні рыштунак падобны, толькі скіраваны на выратаваньне. Я працаваў з вайсковай і авіяцыйнай тэхнікай, з вадалазнай тэхнікай, працаваў як ратавальнік, які аказвае дапамогу пры зруйнаванні будынкаў, як ратаўнік, які ратуе людзей з пажараў і ў аўтамабільных катастрофах, плюс я ўмею страляць.

**Г.** П.: А Віктар?

**А.**: Ён прапаршчык вайсковы, прычым складскі. Ён дасьведчаны ў тылавых справах, добра разьбіраецца, што-як лепш захоўваецца, як перавозіцца, як маркіруецца машына. У лагістыцы ён разьбіраецца значна больш за мяне. Таму ў тандэме вельмі добра атрымалася працаваць.

**Мы з Віктарам** валанцёрствам пачалі займацца даўно, з 2014 года, калі пачалася ўкраінска-расейская вайна, бо Украіна заўсёды была для нас братняй краінай. З Расеяй жа мы, беларусы, ваявалі ўсю сваю гісторыю. За саветамі нашу беларускую гісторыю ад людзей хавалі і беларусы ня ведалі праўды пра гэта.

## ВАЛАНЦЁРСКАЯ ПРАЦА

**Г.** П.: Валанцёры – гэта асобы, якія дабрачынна дапамагаюць людзям у іхным мірным жыцьці перадолець розныя цяжкасьці і праблемы. А калі ідзе вайна, тут могуць быць розныя іншыя віды валанцёрства, так?

**А.**: Мы хутчэй валанцёры тылавога забесьпячэньня. Мы займаемся выключна забесьпячэньнем неабходнымі для вайны рэчамі.

**Валанцёраў, якія дапамагаюць** войску – безьліч. Яны займаюцца і закупкай розных рэчаў (ад ваеннай амуніцыі да прадуктаў харчаваньня), і нарыхтоўкай прадуктаў харчаваньня (адмыслова сушаць гародніну, мяса, каб на лініі сутыкненьня з ворагам людзі асабліва не задумваліся, што ім есьці). У ваяроў ёсьць рацыён на некалькі чалавек, яны высыпаюць свае пайкі ў адно вядро з кіпенем і праз некалькі хвілінаў у іх усё гатова.

**Валанцёры ў Адэсе** зьбіралі пясок на пляжы ў мяшкі, каб абкласьці імі помнікі культуры, каб зрабіць абаронча пабудовы ў горадзе. Хтосьці шые дабрачынна. Дзяўчаты ва Украіне для ваяроў плятуць маскіровачныя сеткі (якіх заўсёды не хапае). Таксама яны штосьці пакуюць, перапакоўваюць, каб паслаць на фронт, вядуць анкеты. Ёсьць валанцёры, якія займаюцца выключна дастаўкай на фронт розных рэчаў. Тут разнастайная праца. Хтосьці займаецца медыцынай, зьбірае лекі, хтосьці эвакуацыяй параненых. А ёсьць яшчэ гуманітарны аспэкт: гэта і ўцекачы-бежанцы, і дзецi, і жывёла.

**Г.** П.: Зараз у Эўропе, асабліва ў Польшчы, шмат людзей займаецца валанцёрствам. І тут вельмі важная каардынацыя.

**А.**: Так, трэба абменьвацца інфармацыяй, дзе што лепш можна набыць.. Напрыклад, за адзін заплечнік у ЗША можна набыць 8 заплечнікаў ва Украіне і вельмі якасных. Гэта ўсё трэба адсочваць, каб ведаць і працаваць эфэктыўна.

**Наша дзейнасьць – адзін** з такіх накірункаў, бо мы дасьведчаныя ў вайсковым рыштунку і можам набываць правільныя і патрэбныя рэчы. Сярод вытворцаў для вайсковых патрэбаў існуе шмат кітайскіх падробак. Вось аптэчкі. Частку з іх можна ўжываць толькі ў трэніровачных працэсах, на фронце іх выкарыстоўваць нельга. І так шмат чаго. Трэба ва ўсім разьбірацца. Ёсьць рэчы вайсковага прызначэньня і ёсьць вельмі падобныя, хоць такімі не зьяўляюцца.

**Для нас з** Віктарам гэта ня першы год валанцёрства і трохі разумеем, што патрэбна непасрэдна на месцы. Адна і тая ж рэч розных вытворцаў можа быць зусім розная па якасьці. Напрыклад, жгут можна набыць за 12 даляраў і за 30. Зьнешне выглядаюць амаль аднолькава. Але гэта два розныя жгуты па сваіх якасьцях.Так, амэрыканскія даражэйшыя за кітайскіх, яны праверaныя і лепшыя.

**Г.** П.: А чым яны лепшыя?

**А.**: Па-першае, яны прайшлі ўжо сем пакаленьняў. Амэрыканцы вельмі добра зьбіраюць статыстыку: яны глядзяць, колькі іх парвалася, колькі іх было няправільна накладзена і чаму, і яны з гэтага робяць высновы, удасканальваючы кожнае наступнае пакаленьне выраба. Атрымалася, што сёмай генэрацыі турнікета “САТ” (гэта жгут) ён стаў шырэйшым за папярэдніх. Вось паглядзіце: вось сапраўдны, а вось несапраўдны.

**Г.** П.: Але зьнешне яны абсалютна падобныя.

**А.**: Так, зьнешне вы іх не адрозьніце. Але, на сапраўдным на зваротным баку выраба ёсьць усе патрэбныя штампы, чаго няма ў “несапраўдным”. Істотная рэч -- маленькія кіёчкі, якія заціскаюць крываток і маленькая страпа, якая ўнутры шырокай страпы. Бывае, што пры заціскані нават на трэніроўках (ня кажучы ў баявых умовах) гэтая страпа проста рвецца. І вось вы набылі для жаўнера такі “турнікет”, а ён ня ведае, можна яму давяраць, ці не. А вось гэты, сёмага пакаленьня, -- выпрабаваны часам, і ў сёмым пакаленні выраб амэрыканцы прыйшлі да такога вось узору “турнікета”, які Вы бачыце.

**Г.** П.: І колькі ён каштуе?

**А.**: Мы іх набываем па 22-24 даляры, а так ён каштуе 26-28 даляраў, дзе-нідзе каштуе і 30. яны выглядаюць амаль аднолькава. Але гэта два розныя жгуты па сваіх якасьцях.Так, амэрыканскія даражэйшыя за кітайскіх, яны праверaныя і лепшыя.

## АДНОСІНЫ АМЭРЫКАНЦАЎ ДА ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ

**Г.** П.: Гэта амэрыканцы вам робяць сьскідку?

**А.**:Так, нам робяць скідку два амэрыканскія прадпрыемствы. Адно з іх знаходзіцца ў Фларыдзе, другое – у Нью-Ёрку. Яго трымае паліцыянт, які аказвае дапамогу паліцыянтам пры правядзеньні паліцэйскіх акцыяў, калі некага паранілі падчас затрыманьня злачынцаў. Ён таксама праводзіць трэнінгі, і вось у яго мы набываем мэдычныя камплекты. Першы чалавек, да каго мы зьвярнуліся, гэта быў ён, і прадае нам па значна ніжэйшаму кошту, чым звычайным пакупнікам.

**Г.** П.: А як вы яго знайшлі?

**А.**: У гэтага паліцыянта Шона Солера з Нью-Ёрку мы праходзілі курс па аказаньні першай дапамогі пасьля масавай стральбы (займаліся для сябе).

**Г.** П.: Ён робіць зніжкі, таму што вы купляеце шмат, ці таму, што ён спачувае Украіне?

**А.**: Таму што ён спачувае Украіне і беларусам, якія далучыліся да узброеных сіл Украіны. Ён на свае вочы ўбачыў беларуса, які збіраўся ехаць туды, на іншы кантынэнт, ваяваць і які проста вёз з сабой дзьве торбы неабходнага на фронце. Ён вельмі моцна ўзрушыўся і сказаў: “У любы момант зьвяртайцеся, калі штосьці трэба. Мы заўсёды будзем супрацоўнічаць”.

**Г.** П.: Ён амэрыканец?

**А.**: Так, амэрыканец. У яго няма ніякіх каранёў ні з Украінай, ні з Беларусяй. Для яго гэта – іншы кантынент. Ён у свой час сказаў (калі мы прайшлі ў яго трэнінг), што мы “адна вялікая сям’я”. Мы думалі, што гэта, так бы мовіць, для “прыгожага слоўца”: сказаў і забыўся. Але, для амэрыканца, як яны кажуць, так яно і ёсьць.

**Г.** П.: -- Што яшчэ вы набываеце?

**А.**: Безьліч рэчаў. Бо вайна, на жаль, зараз вельмі тэхналягічная і патрабуе вялікіх сродкаў. Хаця, вайна заўсёды каштавала дорага. На жаль, амэрыканскія законы не дазваляюць вывозіць рэчы падвойнага вайсковага прызначэньн (чалавеку дазволена браць з сабой толькі 1 бронекамізэльку і 1 шлем.) Таму мы ня можам іх перасылаць ва Украіну. Але мы набываем усё тое, што дазволена.

**Г.** П.: А ў звычайных амэрыканцаў ёсьць якое-небудзь разуменьне-спачуваньне украінцам, ці проста вось прадаюць нейкія рэчы і ўсё?

**А.**: Амэрыканцы, з якімі мы супрацоўнічаем, вельмі адгукаюцца: робяць добрыя зьніжкі для тых, хто едзе ва Украіну альбо робяць закупы для Украіны. Вось калі я гандляру-амэрыканцу распавядаў пра свайго кума, які хрысьціў маё дзіця і зараз ён на вайне, ён перадаў яму вельмі добры нож, які каштуе 150



даляраў. І такіх выпадкаў вельмі шмат, хоць і ў амэрыканцаў нямала сваіх праблемаў. У іх жа шмат сваіх ветэранаў, і для амэрыканцаў гэта як бы такая далёкая вайна. Але тыя, з кім мы сутыкаемся (асабліва сярод былых вайскоўцаў), вельмі прыязна ставяцца да людзей, якія едуць на вайну, бо разумеюць, што Расея – гэта такі пэрманэнтны вораг. Яны ведаюць, што такое Расея.

## ПАТРЭБЫ І ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ЖАЎНЕРАЎ

**А.**: У першыя ж дні вайны тэрытарыяльных абаронаў ва Украіне зьяўлялася шмат, а забесьпячэньне для іх было вельмі нізкім. У нейкіх гарадах лепей, у нейкіх горш. Камандаваньню батальёна Кастуся Каліноўскага атрымалася ўвайсьці ў склад Збройных сілаў Украіны, а гэта ўжо зусім іншае забесьпячэньне. Хаця і зараз ёсьць праблемы, таму што людзей прызываецца шмат, а забясьпечыць можна не заўсёды.

**Г.** П.: Значыць, беларускія дабраахвотнікі пакуль не забясьпечаны ўсім неабходным для байца?

**А.**: Трэба зразумець, што ўкраінцы ў першую чаргу забясьпечваюць сваіх жаўнераў, што натуральна. А іншаземныя батальёны, іншаземныя фармаваньні будуць забясьпечвацца пазьней. Таму нам трэба самім забясьпечваць сваіх людзей. Калі мы ня здолеем забясьпечыць іх, то ў баях яны ня будуць добра абароненыя. А бяз гэтага нельга ваяваць. Ёсьць такое выслоўе, што вайна, у першую чаргу, -- гэта вайна рэсурсаў. Калі мы здолеем забясьпечыць сваіх хлопцаў, то ім будзе прасьцей выконваць пастаўленую задачу. Калі ў цябе ёсьць мэдычнае забесьпячэньне, калі ты разумееш, што ў выпадку раненьня кваліфікаваныя людзі давязуць цябе да шпіталя, то ты ўжо не задумваешся пра тое, што трэба будзе рабіць у выпадку раненьня. Ваяр ужо адчувае ўпэўненасьць. Калі чалавек упэўнены – ён больш канцэнтруецца на выкананьні задачы. А гэта асноўнае падчас ваенных дзеяньняў.

**Г.** П.: Вам трэба пастаянна мець інфармацыю колькі і якія рэчы трэба набываць.

**А.**: Так,так. Ёсьць першасныя патрэбы забесьпячэньня ваяра, а ёсьць нейкія групавыя забесьпячэньні. Скажам, мэдыцынскія заплечнікі – гэта групавая патрэба. Рыдлёўкі вялікія, якія хлопцы набываюць у Кіеве, таксама больш групавыя, чым індывідуальныя.

**Г.** П.: А патрэбныя таксама і індывідуальныя.

**А.**: Так, патрэба ў іх вельмі вялікая.

**Г.** П.: І колькі можа каштаваць індывідуальная рыдлёўка?

**А.**: Самая танная, якую мы знайшлі і якая больш-менш адпавядае патрэбам у вайсковых дзеяньнях, гэта за 14 эўра, яна была выпушчана ў 1960 годзе. А калі мы бярэм сучасныя рыдлёўкі, то гэта 70 эўра.

**Г.** П.: Розьніца істотная. Рыдлёўка патрэбная кожнаму байцу, так?

**А.**: Так, рыдёўка павінна быць у кожнага. Калі браць па закупах рыштунка на аднаго байца сярэдняй якасьці забесьпячэньня (ня самае дарагое), то на аднаго чалавека ідзе ад тысячы (гэта самае таннае і бяз бронепласьцін) да трох-чатырох тысячаў даляраў – толькі тое, што вельмі патрэбна і зношваецца хутчэй. А так – пад 5 тысячаў. Вось, напрыклад, чахол для бронекамізэлькі, яго можна набыць за 210 даляраў, а можна за 100.

**Г.** П.: Але, відаць яны розьняцца па якасьці ?

**А.**: Так, за 210 даляраў у разы зручнейшы. Гэта рэч цяжкая: мы ў яе ўстаўляем бранявыя пліты, вешаем на яе дадатковыя падсумкі, і яна (гэтая бронекамізэлька) пачынае важыць каля 8 кг. І ў гэтым трэба хадзіць да 24 гадзін на суткі. Ад зручнасьці такой простай рэчы, як бронекамізэлька, залежыць тое, наколькі ваяр будзе сябе добра адчуваць. Бронекамізэлька за 100 доляраў будзе сядзець прыкладна гэтак жа, як і за 210, але калі мы бярэм 3-5-7-10 дзён, то адчуваньне зусім адрозьніваецца, як на плячах, так і ва ўсім целе. Плюс важны момант – патрэба ў якаснай пэўнай тканіне. Таму што ў вайскоўцаў (у адрозьненьне ад цывільных людзей, якія карыстаюцца ў сваім звычайным жыцьці заплечнікамі і могуць набыць сабе тонкі заплечнік, які яму будзе добра служыць) вайсковы заплечнік павінен быць з тоўстай трывалай тканіны, бо ў ім будуць насіцца цяжкія рэчы, зь ім будуць поўзаць і за яго будуць цягнуць з поля боя, калі баец будзе паранены. Такія заплечнікі робяцца зь якаснай тканіны, якая ня можа каштаваць танна. І гэтак жа можна сказаць па кожнаму пункту амуніцыі. Вось боты. Можна набыць за 70 даляраў, а можна за 200. Даражэйшыя ня будуць мокнуць, бо ў іх стаіць добрая мэмбрана, і нага будзе адчуваць сябе камфортна, яны праслужаць даўжэй. У таньнейшых хутка ад вільгаці пачнуць распаўзацца ніткі і сам абутак, хаця зьнешне боты будуць вельмі падобныя.

**Г.** П.: А як з памерамі – ва ўсіх жа памеры розныя?

**А.**: Сазвоньваемся з людзьмі, якія зараз служаць, і зьбіраем сьпісы з патрэбамі. Нам прыходзяць сьпісы, скажам, 15 штук 41 памеру, 20 – 42-га, 4 – 45-га, 47-га і г. д. Мы складаем адпаведную заяўку і адпаведна з заяўкай пачынаем закуп.

**Г.** П.: А вось гэтыя прыборы начнога бачаньня, якія вы мне паказвалі, – яны жудасна дарагія.

**А.**: Мы пакуль яшчэ іх не закупалі, бо ёсьць пытаньні па вывазу. (Іх нельга вывозіць, гэта вайсковая спэцыялізацыя). Ёсьць украінскія арганізацыі, якія маюць на гэта адпаведныя ліцэнзіі. Будзем даведвацца, удакладняць, як можна вывезьці і ў якой колькасьці і тады будзем перадаваць і прыборы начнога бачання.

**Г.** П.: Выглядае, што грошай трэба шмат.

**А.**: Так, сто індывідуальных аптэчак – гэта недзе 8.5 тысяч даляраў. А адной аптэчкі для байца, зразумела, мала. Скажам, шлем каштуе ў залежнасьці ад таго, што на ім ёсьць – ад 300 да 500 доляраў. Я ўжо не кажу пра больш сучасныя сродкі. Адзін добрыкаліматарны прыцэлкаштуе амаль 800





даляраў (гэта тое, што ставіцца на зброю і павялічвае хуткасьць прыцэлу іпераноса агня). Дорага. Яшчэ вялікі дзякуй, што хлопцы ваююць не сваімі патронамі. Бо калі ваяваць яшчэ сваімі патронамі – то было б яшчэ даражэй.

**Жаўнерам патрэбна вельмі** шмат чаго. Напрыклад, адмысловыя ліхтары, у якіх павінна быць чырвонае сьвятло, адмысловыя дзяжкі, на якіх трэба пераносіць рыштунак, адмысловыя рыдлёўкі. Аўтамат жывіцца з дапамогай “магазіна” – трэба “магазін”, бо іх выдаюць ня ў той колькасьці, у якой патрэбна. Гэтыя “магазіны” трэба ў нечым пераносіць – патрэбныя падсумкі для пераноса, плюс гранаты, якія зноў жа трэба пераносіць і патрэбны падсумкі пад гранаты. Рацыі -- і іх таксама трэба пераносіць, значыць – падсумак пад рацыю, заплечнік, дзе пераносіцца вада, ежа, дадатковы боекамплект, прыстасаваньні, каб арганізаваць свой быт (той жа “дажджавік”, тое ж “пончa”, каб зрабіць мінімальны навес на пазыцыі. Там безьліч рэчаў, якія трэба мець і насіць. І ўсё гэта каштуе грошай.

**Вось апошняе, што** сталася: хлопцам раздалі камплекты зброі і яны бяз рэменя ў камплектацыі. Зброя і бяз рэменя страляе добра, але доўга насіць яе бяз гэтай дзяжкі вельмі цяжка. Значыць на кожную зброю трэба набыць і рэмень. І так адно чапляецца за другое, і выходзіць вельмі шмат патрэбаў.

**Г.** П.: Я ўражана, колькі ўсяго трэба.

**А.**: Гэта толькі самае-самае першаснае. Але, чалавеку трэба яшчэ 2 камплекты зьнешняй вопраткі (нагавіцы-кіцель), трэба нейкая цёплая бялізна (гэта яшчэ 2 найменьні), 2 пласты тэрмабялізны, якія трэба памножыць яшчэ на два (бо яе ж трэба мяняць), плюс зьменныя шкарпэткі, зьменныя боты пажадана, нейкія тапкі хадзіць мыцца, плюс спальнік, плюс дыванок – ня кажучы пра рэчы, якія неабходныя для выкананьня заданьня. Такіх рэчаў набіраецца шмат. Мы жывем у іншыя часы, і гэта ўжо ня тое далёкае незразумелае савецкае войска, якое зараз у Беларусі альбо ў Расеі. Чым лепш салдат забясьпечаны, чым лепш ён высыпаецца, нармальна паеўшы, тым лепш ён выконвае задачу на полі бою.



Чым лепш ягоная экіпіроўка, тым больш ён абаронены ад раненьня. Так, усё вайсковае каштуе дорага, але ёсьць як бы за што плаціць. Трэба памятаць, што чалавечае жыцьцё – асноўнае. А на вайне ў ворага задача нанесьці як мага большую страту жаўнерам і максімальна зьнішчыць тэхніку. І хто з байцоў будзе лепш экіпіраваны і падрыхтаваны, той будзе лепш спраўляцца са сваёй задачай. Тады яны не адхіляюцца на розныя нязручнасьці. А тое, што зручнае, тое, на жаль, каштуе. Таму пытаньне грошай у нас стаіць востра.

**Калі вы самі** сабралі грошы і ведаеце, што вы набылі і для каго яны пайшлі, -- гэта непасрэдны ваш унёсак у пэўную справу. Таму самая якасная праца, гэта калі вы ўзялі на сябе нейкі пэўны кавалак справы. Вось людзі з Сан-Францыска ўзялі на сябе абавязак набываць засьцерагальныя акуляры. Я ім скінуў спасылку на дакладныя абарончыя вайсковыя акуляры, якія трэба набыць і ў пэўнай вайсковай фірме. Я сам насіў гэтыя акуляры, ведаю, што яны добра бароняць вочы, трымаюць выстрал 12-га калібра, калі ў іх трапляюць, яны спыняюць асколкі. Гэта тое, што патрэбна вайскоўцу. Іх нам патрэбна зараз да трохсот. Яны набудуць сто – мы адправім сто (ці больш). Нашыя хлопцы атрымаюць добрыя акуляры.

**Вось мы зараз** набылі 20 мульцітулаў.

**Г.** П.: Гэта што?

**А.**: Мульцітул – гэта інструмант са шматлікім прызначэньнем. У вайсковым жыцьці ён вельмі патрэбны, асабліва, калі людзі пачынаюць працаваць зь нейкімі выбуховымі рэчамі. Нават звычайная чыстка зброі патрабуе рыштунку. Пласкагубцы (да прыкладу) на вайне вельмі “паляпшаюць” жыцьцё, а іх ні ў адной замове не было. Я са свайго досьведу ведаю, што гэтая рэч вельмі патрэбная. І мы закупілі 20 штук.

**Ні ў адной** замове няма газавых газьнічак (гарэлак). А гэта тое, што неабходна ў халоднае надвор’е. Калі байцы ў памяшканьні з добрымі сьценамі, яны могуць зрабіць сабе кіпень (ёсьць сьвятло ці не) Аднаго балона на 10 чалавек пры разумным карыстаньні можа хапіць на тыдзень.

**У розных падразьдзелаў** ёсьць свае нюансы. Некаторыя беларусы служаць у артылерыі. У іх няма генератара. Патрэбны сонечныя батарэі.

**Г.** П.: Вы расказалі пра вайсковае забесьпячэньне байца. Але ж яшчэ пытаньне і ў харчаваньні – яны ж ня могуць галодныя ваяваць.

**А.**: З харчаваньнем прасьцей. Гэтым займаюцца адпаведныя службы ўзброеных сіл. Жаўнерам на лініі сутыкненьня з ворагам трэба спэцыфічныя прадукты, што хутка гатуецца з дадаткам кіпеня. Каб аддзяленьне было забясьпечана вадой – патрэбныя фільтры, бо калі людзі пап’юць кепскай вады, яны ўжо хворыя і ня могуць выконваць вайсковую задачу. Адзін групавы фільтр каштуе каля 70 даляраў. Ім можна адфільтраваць шмат вады (ад 4-х да 15 тысячаў літраў вады), а потым трэба другі.

## БРОНЕКАМІЗЭЛЬКА

**Г.** П.: А што сабой уяўляе бронекамізэлька ?

**А.**: Бронекамізэлька – гэта такая наборная штука. Гэта мінімум дзьве бронепласьціны (грудзі і сьпіна), якія ўстаўляюцца ў адмысловы чахол, плюс супрацьасколачныя бакавыя альбо пакеты, альбо такія штукі, каб мацаваць камізэльку (заднюю і пярэднюю пласьціны). Яны з адмысловай ліпкай тканіны, і бакавыя ўстаўкі супрацьасколачныя.

**Г.** П.: І такая бронекамізэлька колькі можа каштаваць?

**А.**: Сам “кавар” (такі добры) без бронепласьціны – каля 200 даляраў і да яго 2 пласьціны – ад 300 да 600, у залежнасьці ад класа аховы і матэрыялу.

**Тут трэба сказаць**, што беларусы ў Чэхіі зрабілі немагчымае: яны набылі бранёвую сталь і самі пачалі рэзаць, гнуць мэтал і абшываць яго патрэбнымі супрацьаскепкавымі матэрыяламі.

**Г.** П.: Гэта менавіта, калі пачалася вайна?

**А.**: Так, расейцы загадзя рыхтаваліся да вайны і пабралі на сябе вельмі шмат кантрактаў на падстаўныя фірмы, каб не было на рынку складнікаў для бронекамізэлек. Буйны вытворца вайсковых бронекамізэлек "Вэлмет" ва Украіне сутыкнуўся з тым, што ў іх ня стала магчымасьці наладзіць вытворчасьць. Акрамя таго ў першы тыдзень вайны рускія разбамбавалі амаль усіх вытворцаў бронекамізэлек і шлемаў. Дзякуй Богу, людзі неяк здолелі перавесьці свае вытворчасьці ў заходнюю Украіну і патроху пачынаюць наладжваць працу. Але нам ад гэтага ўсяроўна не прасьцей, таму што, калі размаўляеш з украінскімі вытворцамі, яны кажуць: "Прабачце, у нас зараз вельмі вялікія кантракты для ЗСУ, і мы проста фізічна ня можам вам нешта прадаць". І са шлемамі зараз самая вялікая праблема.

**Г.** П.: І з Амэрыкі ня вывезеш, так?

**А.**: Так. З бронекамізэлькамі зараз больш-меньш добра (дзякуючы таму, што беларус у Празе наладзіў сваю вытворчасьць). Ёсьць магчымасьць беларусам перакрыць патрэбы.

**Г.** П.: Гэта вельмі ўражвае, што нашы беларусы змаглі закупіць сталь.

**А.**: Але, сталь – гэта толькі адзін са складнікаў бронекамізэлек. Метал выгінаюць па стандартах. Беларусы Меніапаліса здолелі набыць сто бронекамізэлек бяз пліт, у якія можна ўкладаць пласьціны рознага памеру, у залежнасьці ад камплекцыі чалавека. Цяпер хлопцы могуць выразаць пліты ледзь ні пад кожнага байца і апрацаваць гэтыя пліты.

**Г.** П.: Гэта ж так шмат працы.

**А.**: Так, працы хапае.

**Г.** П.: Калі мы сёлета 26 сакавіка адкрывалі бюсты Кастусю Каліноўскаму і Андрэю-Тадэвушу-Банавантуру Касьцюшку ў Нью-Ёрку перад будынкам Беларускай Аўтакефальнай Царквы Сьв. Кірылы Тураўскага, Зянон Пазьняк сваю прамову пачаў з хвіліны маўчаньня па нашым забітым у гэты дзень на вайне ва Украіне беларусе Зьміцеры Апанасовічы. Ці меў ён бронекамізэльку?

**А.**:.Зьміцер быў ранены пад лапатку. У яго аскепак зайшоў якраз паміж бронекамізэлькай і сьпіной. У яго быў пнеўматаракс, яму хлопец вельмі добра аказаў першую дапамогу, у стабільна цяжкім стане яго давезьлі да шпіталя, але, на жаль, у шпіталі ён памёр. Ігар Ліцьвін памёр ад кравацечы, і яшчэ адзін наш жаўнер памёр, бо выцекла кроў.

**Адно з небясьпечных** і распаўсюджаных раненьняў – гэта асколачнае раненьне ў вобласьць таза, калі закранута артэрыя і будзе вялікая страта крыві. Бандаж, які накладаецца на вобласьць таза – там ужо зусім іншыя грошы. Гэта 320-350 даляраў. Гэты сродак для чалавека, які прайшоў больш глыбокае навучаньне, як яго накладаць. Такое прыстасаваньне сам паранены ня ў стане надзець, гэта робіць спэцыяліст, зьвязовы мэдык. Сам баец можа аказаць сабе дапамогу пераважна пры раненьні канечнасьцяў з дапамогаю спэцыяльнага жгута, які называюць "турнікетам".

**Г.** П.: А гэтыя "турнікеты" павінны быць у кожнага?

**А.**: Так, прычым павінна быць мінімум два, бо бывае, калі мышачная маса ног вельмі развітая, то аднаго жгута можа не хапіць перацягнуць нагу цалкам.

**Г.** П.: Як валанцёры вы камунікуецеся з беларусамі, якія жывуць у Амэрыцы і ў Эўропе. Да вайны вы, напэўна, шмат каго і ня ведалі?

**А.**: Поўна людзей, якія ў мяне запісаны, якіх я ніколі ня бачыў. Але, пры гэтым справа робіцца, і часам – вельмі хутка. Такі прыклад. Беларус з Амэрыкі, які пэўны час жыў у Адэсе і мае там маёмасьць, перадаў у карыстаньне адэскаму атраду Ліцьвіна сваю ўласную "Тэслу" -- напісаў даверанасьць і перадаў яе на час вайны хлопцам, якія займаюцца абаронай Адэсы (гэта даволі дарагая машына). У канцы даверанасьці напісаў "Жыве Беларусь!" і "Слава Украіне!"

**Медычнае забесьпячэньне – на** нас. Па астатняму – штосьці робяць беларусы ў іншых краінах. Мы ўсе камунікуемся між сабой і намагаемся рабіць так, каб не было адноькавых закупак.

**Некаторыя беларусы Пераводзяць** грошы непасрэдна ў батальёны, іншыя зьбіраюць грошы ў сваіх суполках, раяцца з намі і самі набываюць нейкія рэчы для ваяроў і адпраўляюць іх у Польшчу, адтуль усё едзе ў Кіеў, Адэсу альбо ў іншыя месцы.

**Г.** П.: Якія медычныя сродкі набываюцца ў ЗША?

**А.**: Гэта тое, што называецца "індывідуальная аптэчка жаўнера". Гэта набор мэдычных сродкаў для аказаньня непасрэднай дапамогі на полі бою і падчас эвакуацыі.

**Г.** П.: Ва Украіне цяпер, відаць, недахоп медычных сродкаў?

**А.**: Вялікі недахоп ня толькі ва Украіне, але нават у Эўропе. ЗША зьяўляецца найбольшым прадукоўцам медычных сродкаў, якія павышаюць жывучасьць параненага чалавека. Тут іх шмат і іх лёгка набыць.

**Г.** П.: Сярод беларусаў Амэрыкі першымі, хто пачаў зьбіраць грошы на мэдычныя сродкі для беларускіх жаўнераў ва Украіне, гэта былі якраз менавіта вы са сваімі сябрамі.

**А.**: Так, мы пачалі гэтую працу на базе Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку, у Брукліне. Потым моцна ў гэтую працу ўключыліся чыкагскія беларусы. Яны зрабілі свой рахунак, сабралі грошы, і зараз на гэтыя сродкі мы будзем набываць і камплектаваць медычныя заплечнікі (гэта тое, што патрэбна ўжо больш дасьведчанаму ў медыцыне чалавеку, уключаючы крапельніцы, кроваспынныя сродкі; яны даражэйшыя, чым звычайная аптэчка). Арганізацыя АБА (Арганізацыя Беларусаў Амэрыкі) сабрала на свой рахунак грошы і набыла каля ста індывідуальных аптэчкаў для жаўнера. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква таксама перадала грошы на закупку прыкладна ста індывідуальных аптэчкаў – непасрэдна сам Архіепіскап Сьвятаслаў і Парафія Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага. Сто аптэчак ужо набылі і адправілі ва Украіну беларусы Мінеапаліса.



**Г.** П.: -- Я была сьведкаю, як вы пакавалі агромністыя валізкі, і ня проста складвалі, а пакавалі камплектамі, каб адправіць іх з некім. Паўночы вы гэтыя ўсе камплекты складалі. Здавалася б, такая простая праца, але калі ўбачыла гэта ўсё, колькі ўсялякіх рэчаў, дробязных і буйных, вы раскладалі ў некалькі велізарных валізаў, то была вельмі ўражана. Такія валізы яшчэ трэба знайсьці недзе.

**А.**: Ну, так. Калі мы шукалі звычайную аптэчку, то выходзілі на нейкія фірмы, якія нешта танна распрадавалі. Мы пасьпявалі тое набыць. Трэба заўважыць, што украінцы таксама ня сьпяць і набываюць тое ж самае. У нас няма наўпраставай канкурэнцыі, але ўсяроўна – хто хутчэй набудзе, той пасьпее. Тады так атрымалася, што мы здолелі ўраздроб набыць шмат мэдычных сродкаў, і потым іх трэба было пэўным чынам кампанаваць, каб хлопцы не гублялі час на лічэньне, разьмеркаваньне (камусьці далі – камусьці не дасталася). Плюс, перадаеш нейкія рэчы даволі крохкія, іх трэба адмыслова запакаваць, каб яны даехалі да месца ў цэласьці.

**Г.** П.: Як я зразумела, вы з Віктарам, з дапамогай Валеры ў асноўным цягнеце гэты цяжкі воз працы.

**А.**: Не-не-не. Глядзіце: беларусы Чыкага арганізавалі ў сябе збор сродкаў, сабралі 8 тысячаў даляраў. Праз іх мы закупім "медыцыну". Яны зрабілі сваю частку працы. Хлопцы з Мінеапаліса зрабілі збор на сто добрых, якасных бронекамізэлек. Плюс яны ўжо самі адправілі сто камплектаў аптэчак. Плюс арганізацыя БАЗА (Нью-Ёрк), БАПЦ, АБА, асабіста архіепіскап Сьвятаслаў далі пэўную частку на мэдычнае забесьпячэньне.

**Атрымоўваецца, што мы** робім найперш каардынацыйную працу, працу па збору грошай і па актуалізацыі патрэбаў.

**Г.** П.: Ну, тут я з вамі не пагаджуся. Тое, што я бачу на свае вочы -- гэта праца велізарная, каб я сама ўсё гэта ня бачыла, не ўяўляла б увесь аб"ём, які вы ахопліваеце. Гэта ўражвае і выклікае вялікую павагу да вашай працы.

**А.**: Ну, дык патроху-патроху і набіраецца тое, што патрэбна і што выратуе жыцьцё нашым беларускім абаронцам Украіны, якія пайшлі ваяваць за Украіну і за Беларусь. Праўда, часам сутыкаемся і з праблемамі.

**ПЕРАПРАЎКА дапамогі ва** Украіну

**Г.** П.: Як вы дастаўляеце набытыя рэчы ва Украіну?

**А.**: Мы намагаемся перадаваць валізкі на фронт праз людзей. Калі хтосьці едзе ў Варшаву, мы перадаём гэта туды, а там ужо хлопцы з Варшавы едуць альбо ў батальён Кастуся Каліноўскага, альбо ў іншае месца і аддаюць гэтыя валізы. Мы ўвесь час на сувязі з рознымі гарадамі, цэнтрамі, якія фармуюць дабраахвотнікаў. За гэтую сувязь ёсьць адказны ў Польшчы. Тэлефануем, нашыя хлопцы ў Варшаве сустракаюць прыляцеўшых людзей. Чалавеку ж, які ляціць на вайну, знаходзяць, дзе разьмясьціцца і чакаць сваёй адпраўкі.

**Г.** П.: Я ведаю, нядаўна вы езьдзілі спэцыяльна з Нью-Ёрку ў Вашынгтон, каб давезьці валізкі да самалёта.

**А.**: Так, дзяўчына маленькая, у якой у самой кіль 45, згадзілася ўзяць з сабой 53 кілі багажа, каб давезьці. Гэта былі дзьве вялікія сумкі.

**Але, там у** мяне было яшчэ некалькі важных сустрэчаў, таму я зрабіў адразу колькі справаў. Сустрэўся з украінцамі, каб абмеркаваць валанцёрскія пытаньні. Так адной паездкай зрабіў некалькі спраў, у выніку чаго палепшылася далейшая праца.

**Мы ня думаем**, што вайна скончыцца хутка, ведаючы расейцаў (наколькі яны не кіруюцца ніякай логікай), яны могуць гэтую вайну расьцягваць вельмі доўга. Гэта будуць чарговыя "перамовы", яны будуць чарговы раз сьцягваць сілы, пераходзіць у наступ, і такое можа цягнуцца вельмі доўга.

**Г.** П.: Як я разумею, вы гэтыя валізкі перадаеце праз дабраахвотнікаў з розных гарадоў ?

**А.**: У нас асноўная праблема – перадачы з Амэрыкі ў Эўропу. Калі ўсё даляцела да Варшавы, то там увесь шлях адладжаны. З варшаўскага цэнтру машыны едуць на Кіеў, і там усё трапляе непасрэдна нашым хлопцам. Але адсюль пасылаць пасылкі ў Варшаву -- гэта і дорага, і доўга. Хлопцы зь Мініапаліса адправілі першую пробную пасылку самалётам да Львова 17-га сакавіка. Паглядзім, як яна дойдзе.

**Г.** П.: Але, валізы дадатковыя трэба аплочваць.

**А.**: Так. І валізы, і пасылкі, зразумела. Але калі нешта тэрміновае, то валізы (самалётам), безумоўна, хутчэй.

**ГРОШЫ-АХВЯРАВАНЬНІ**

**Г.** П.: Пакуль ідзе вайна, грошы патрэбныя ўвесь час.

**А.**: Калі б кожны беларус у Амэрыцы кожны месяц аддаваў, скажам, па 100-200 даляраў на войска (у Амэрыцы, хто праце, -- такое магчыма) -- гэта б забясьпечыла найбольш надзейна нашых ваяроў. Але яно, хутчэй, з вобласьці фантазіі...

**Шмат працы цяпер**, і шмат – наперадзе.

**Ёсьць проста тэхнічна** дарагія праекты. Хлопцы, якія кіруюць дронамі для пошука ворага -- гэты праект 4-х чалавек, якія прайшлі навучаньне, плюс машына, плюс дадатковыя батарэі, дадатковыя камэры на гэтыя дроны – у выніку гэты праект ужо каштуе каля 60 тыс. даляраў. Я ўжо не кажу, што чым больш людзей становіцца "ў шэрагі", тым больш узьнікае патрэбаў забесьпячэньня іхняй дзейнасьці.

**Першапачаткова мы "закрываем"** самыя неабходныя патрэбы беларускіх фармаваньняў, але з цягам часу патрэбы узрастаюць.На вайне жаўнеры не заўсёды знаходзяцца ў акопе. Ім трэба выязджаць на заданьні, на лінію сутыкненьня праціўніка (хтосьці гэта называе "на нуль"). Частку шляху жаўнеры ідуць пешшу, часам едуць транспартам і іх трэба на чымсьці перавозіць. Калі байцы затрымліваюцца надоўга, то ежу і баепрыпасы трэба падвозіць пастаянна. Нагамі тут не находзіш, таму машына з вялікай праходнасьцю вельмі патрэбная. Плюс перавозка параненых, гэтым займаецца мэдычнае аддзяленьне.

**Дарэчы, мы ўжо** дзьве машыны набылі і зьбіраемся яшчэ набываць. Мэдычнае аддзяленьне павінна працаваць 24 гадзіны ў суткі. У ім 4 чалавекі: медыкі, якія аказваюць дапамогу параненаму, 2 чалавекі, якія дапамагаюць (адзін кіроўца, другі забясьпечвае прыкрыццё на выпадак стралянін). На гэтых дваіх павінна быць уся экіпіроўка, як у звычайнага байца, плюс абавязкова два прыборы начнога бачаньня, бо

аднаму трэба весьці машыну ўначы з выключанымі фарамі, а другому трэба арыентавацца на мясцовасьці (чытаць мапу, глядзець па баках, каб ведаць, куды можна ехаць – куды не (да месца забору параненага). А прыбор начнога бачаньня – на дваіх 20 тысячаў даляраў. Я ўжо не кажу, што сярэдняй зношанасьці рэамабіль каштуе каля 30-40 тысячаў. Плюс яго трэба падрыхтаваць, памяняць гуму, зрабіць троху вышэйшым (бо дарогі разьбітыя). І так набягаюць вельмі вялікія грошы.

**Вось так, тут** неабходна, там неабходна. І адно чапляецца за другое. Беларусы толькі зараз пачалі фармаваць свае вайсковыя фармаваньні на тэрыторыі іншай краіны. Украіна дае некаторае забесьпячэньне, але шмат чаго не хапае, і ўсё кладзецца на нашыя беларускія плечы.

**Г.** П.: А як людзі ахвяруюць грошы? Пакуль ідзе вайна і нашыя беларусы таксама, як украінцы, гінуць на ёй, бываюць параненыя, трэба, каб беларускія суполкі пастаянна зьбіралі грошы на забесьпячэньне беларускіх жаўнераў, каб грошы паступалі ўвесь час. Дабраахвотнікаў, мы ведаем, едзе шмат, і іх усё прыбывае. Экіпіроўка павінна папаўняцца няспынна.

**А.**: Так, грошы на вайну патрэбны пастаянна. І чым даўжэй будзе ісьці вайна, тым больш патрэбныя грошы на забесьпячэньне нашым ваярам. Нашы беларускія аддзелы толькі фармуюцца, фармаваньне ня скончана. Новыя людзі будуць прыязджаць і прыязджаць. Кожнаму новаму чалавеку патрэбныя першасныя рэчы, а пасьля гэтага – пачынаюцца другасныя рэчы: усё ж не спыняецца на бронекамізэльцы і на шлеме. Потым людзям патрэбныя ўжо нейкія больш тэхналягічныя рэчы. Ёсьць праект, напрыклад, кошт якога каля 57 тысячаў даляраў (гэта разьведаддзяленьне, якое будзе карыстацца добрымі дронамі).

**Якім чынам людзі** здаюць грошы? Грошы ахвяруюцца па-рознаму. Часта проста ў сваіх суполках зьбіраюць, тэлефануюць і кажуць: “Што там сёньня актуальна – давайце мы набудзем”. Яны набываюць і адпраўляюць на адрас ў Польшчу і адтуль даходзіць да адрасата. Альбо гэта даходзіць да нашай Царквы ў Брукліне і адсюль мы знаходзім, якім шляхам гэта пераправіць. Я вельмі ўражаны тым, што людзі, якія лятуць самалётамі, баруць торбы з сабой, аплочваюць квіток -- за торбу ж таксама трэба плаціць.

**Г.** П.: Наша матэрыяльная падтрымка павінна ісьці няспынна, бо там людзі ахвяруюць жыцьцём.

**А.**: Добра было б, калі б яны не ахвяравалі жыцьцём, а прымушалі ахвяраваць жыцьцём ворага, які напаў на Украіну, а нашыя байцы проста рабілі б прафэсійна вайсковую справу. Вайсковае забесьпячэньне ня можа быць часовым, яно павінна быць пастаянным, пакуль ідзе вайна. Зараз мы павінны плаціць такі нацыянальны падатак на нацыянальнае войска.

**Тыя, хто не** на фронце, павінны разумець, што людзі кідаюць усё і едуць выяваць. Яны ахвяруюць усім. Вайна – гэта вельмі цяжка і фізычна, і эмацыйна. Колькі чалавек можа знаходзіцца пад фізычным і псіхалягічным прэсінгам? А яны знаходзяцца пастаянна пад стрэсам, бо пастаянна сутыкаюцца са сьмерцю. Жаўнеры мала сьпяць, выконваюць баявыя задачы, бачаць сьмерць, сутыкаюцца з усімі гэтымі жахамі вайны. Акрамя сьмерці, яны сустракаюць галодных людзей, якія сядзяць у падвалах, якім трэба дапамагаць. Я ўжо не кажу, наколькі цяжка бачыць параненых і забітых дзяцей, жанчын... Расейцы ж не мяняюцца: яны як гвалцілі нямецкіх жанчын у 2-ю Сусьветную, тое самае яны робяць зараз ва Украіне. І чалавек з гэтым усім сутыкаецца, і гэта накладае на яго пэўны псіхалягічны адбітак.

**А ў гэты** час шмат людзей на сьвеце жывуць звычайным жыцьцём і нават ня думаюць, што хтосьці там дзесьці змагаецца...

**Г.** П.: Я бачу, што вы ўвесь час на тэлефоне.

**А.** Д.: Так, калі ў ЗША ноч, пачынаецца сувязь з Кіевам і Польшчай. Вельмі шмат кантактаў у гэты час пачынаецца з Эўропай, бо ёсьць пытаньні па адсылках і па каардынацыі пасылак патрэбных рэчаў.

**І яшчэ праблема** ў набыцьці рэчаў. На жаль, існуе вельмі-вельмі шмат кітайскіх адпаведнікаў. І калі не разьбіраешся, то не адрозьніш вайсковыя ад страйкбойнай. Трэба адразу набываць тое, што будзе добрае, не кітайскія падробкі. З нашым сябрам Паўлам, які ваюе ва Украіне, адбыўся выпадак, калі парваўся ягоны заплечнік. А бегаць з парваным заплечнікам цяжка. Таму зараз мы набылі яму заплечнік, які праслужыць доўга. Вайсковыя рэчы дарагія. Лепш браць у амэрыканскіх фірмаў, якія забясьпечваюць мэдыкаў, паліцыю, войска.

**Г.** П.: Колькі працы. Адна толькі каардынацыя шмат бярэ часу, потым набыцьцё, перасылка, дастаўка.

**А.**: І яшчэ, калі ты сабраў грошы, трэба ж людзям гэта паказаць -- каб была справаздача. А калі хлопцам прыходзіць партыя аптэчак, гэта тое, што патрэбнае ім проста зараз. Вось першая партыя аптэчак прыйшла, і хлопцы разабралі так хутка, што нават не пасьпелі сфатаграфаваць партыю. У 2014- 2015 гадох валанцёры самі прывозілі сабранае для жаўнераў. Зараз такое немагчыма. Беларусу ж ня проста так уехаць ва Украіну. Трэба браць спэцыяльны дазвол. Таму перадаюць іншымі шляхамі.

**Альбо вось “прыехала”** медычная сумка. Медык бяжыць яе разьбіраць, а яна не зялёнага, а сіняга колеру -- для пэўнага падразьдзяленьня, яму не падыходзіць, а падыходзіць медпадразьдзяленьню, якое на этапе эвакуацыі. Гэта значыць, што рыштунак трапіў не па адрасу і цяпер трэба ізноў яго перапраўляць. Бывае такое. Альбо хлопцы на вучэньні і прыйшла машына, яе пачынаюць разьбіраць без іх прысутнасьці, бо машына павінна ехаць у іншае месца. Так што першыя дні вайны былі ў гэтым плане вельмі сумбурныя. Цяпер ужо людзі трохі прызвычаіліся, папрыцерліся, пачатковая паніка і жаданьне ўсё рабіць хутчэй мінула і людзі па-троху ўцягваюцца ў працу.

### БУДУЧЫНЯ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС

**Г.** П.: Шмат хто з нашых ваяроў кажа, што калі вызваляць Украіну, то пойдуць вызваляць Беларусь. Як вы лічыце, ёсьць у нас для гэтага “порах у парахаўніцах”?

**А.**: Трэба ўсё рашаць па этапах. Спачатку – арганізацыя добрых вайсковых падразьдзелаў.





Набяром добрых людзей, **будзем добра арыентавацца**, што адбываецца на сучасны момант у Беларусі.

**План выдатны.** Але, для яго рэалізацыі трэба прыкласьці шмат-шмат намаганьняў. І гэта тычыцца ня толькі хлопцаў, якія знаходзяцца ў батальёнах (дабраахвотнікі), а проста ўсіх нас, калі абавязкова будуць прыкладаць намаганьні ўсе беларусы, уся наша дыяспара, бо без яе тут не абыйдзецца. Добра, калі беларусы закрыюць пытаньне дапамогі палітзьняволеным, калі ўсе беларусы будуць працаваць на фронт – па-іншаму ня будзе нічога. Знайсьці ж адгаворку, што нешта немагчыма, канешне, прасьцей.

**Г.** П.: Калі глядзіш фотаздымкі з цяперашняй Беларусі, то для мяне, як для асобы не вайсковай, уся там навезеная ворагам ваенная тэхніка – гэта жалеза. Гэтага расейскага “жалеза” ў Беларусі зараз столькі... Але ж, ня пойдзеш з сякерай супраць танкаў. Выгнаць узброеных рашыстаў з Беларусі – гэта магчыма?

**А.**: Канешне, магчыма, было б жаданьне. Беларусь – вельмі ўзброеная краіна. Было б жаданьне – астатняе прыкладзецца. Дзеяньне пачынаецца зжаданьня. Потым знаходзяцца сродкі і спосабы, якімі дамагаюцца перамогі

## БЕЛАРУСЫ ЗША ПРАВОДЗЯЦЬ ДЗЕНЬ ГОДНАСЬЦІ








*Алесь Пазьняк*

**Мытынгі і шэсьці** ў памяць аб падзеях жніўня 2020 году ўжо адбыліся ў Вашынгтоне, Філядэльфіі, Бостане, Сан-Францыску, Троі, Чыкага, Шарлаце.

**Адна з актывістак** і арганізатараў Дня Годнасьці ў Шарлаце (Паўночная Караліна) Аляксандра Шырокава распавяла, што беларусы сабраліся 14 жніўня ўжо ў традыцыйным месцы – парку Рамар Бірдэн, каб нагадаць аб фальсіфікацыі і гвалце пасьля т.зв. “выбараў” 2020 году.

**“У гэтым парку** беларусы пачалі зьбірацца яшчэ ў ліпені 2020. А пасьля гэта ўжо стала знакавым месцам і фактычна кожная палітычная акцыя адбываецца тут. Гэтым разам мы правялі Дзень Годнасьці, як напамін пра фальсіфікацыю выбараў і гвалт, які ўсчыніўся пасьля іх. Тым хто прыйшоў, распавядалі пра важнасьць падтрымкі палітвязьняў і беларусаў, якія выехалі з-за палітыкі з краіны. А таксама пра дапамогу беларускім добраахвотнікам ва Украіне”, - распавяла Аляксандра.

**Падчас акцыі хвілінай** маўчаньня ўдзельнікі Дня Годнасьці з Шарлата ўшанавалі ўсіх загінулых ад рэжыму ў Беларусі і беларускіх добраахвотнікаў ва Украіне. Таксама прагучала прапанова аб стварэньні беларускамоўнай школкі для маленькіх. Усе прысутныя падтрымалі гэтую ідэю.

**Аляксандра Шырокава лічыць**, што такія акцыі павінны быць сьведчаньнем для іншых беларусаў аб тым, што трэба падтрымоўваць адзін аднаго і не мірыцца з існуючым рэжымам у Беларусі.

**“Ніхто ня вырашыць** наш лёс за нас. Нам трэба вырасьці і зразумець гэта. Беларусам трэба пашыраць сувязі паміж сабой і трымацца прынцыпаў салідарнасьці і ўзаемадапамогі”, - кажа актывістка.

**На акцыі беларусы** Шарлата зьбіралі грошы для дапамогі тым, хто вымушаны быў пакінуць краіну і тым беларусам, хто змагаецца цяпер са зброяй ў руках за Украіну. Усе грашовыя сродкі былі пералічаны ў фонд “INeedHelpBy”.

**20 жніўня Дзень** Годнасьці запланавана пройдзе ў Нью-Ёрку. Дакладнае месца і час можна спраўдзіць па спасылцы ТУТ. Заяўку на правядзеньне падавала “Асацыяцыя беларусаў Амэрыкі”.

# ЧАРГОВЫ КАНГРЭС БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАГА ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ

**18 чэрвеня 2022** года ў грамадскай залі сабору Сьв. Кірылы Тураўскага (Бруклін, Нью-Ёрк) адбыўся чарговы Кангрэс Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, на якім прысутнічалі прадстаўнікі Нью-Ёрскага, Вашынгтонскага аддзела і аддзела БАЗА ў Паўднёвай Фларыдзе.



**Новаабраны склад Галоўнай** управы БАЗА:

**Натальля Федарэнка - старшыня**;
**Ганна Сурмач - намесьнік**;
**Таццяна Красоўская - скарбнік**;
**Міхась Чаропка - сакратар**;
**Вячаслаў Бортнік;**
**Юрка Азарка;**
**Яўген Барысевіч;**
**Расьціслаў Гарошка;**
**Вадзім Васільеў.**

**Пажадаем усім плённай** працы!

**БАЗА**













# МАРГАРЫТА ЛЯЎЧУК І ІЛЬЛЯ СІЛЬЧУКОЎ ВЫСТУПІЛІ Ў НЮ ЁРКУ






***Алесь Пазьняк***

**Беларусы Амэрыкі цягам ліпеня мелі магчымасьць пабываць на імпрэзах у межах дзён беларускай культуры з удзелам Маргарыты Ляўчук і такім чынам падтрымаць Украіну**.

Маргарыта Ляўчук – опэрная сьпявачка, якая да 2020 года з’яўлялася салісткай Вялікага тэатра Беларусі (сапрана). Цяпер жыве ў Літве, дзе сумесна з блогерам Андрэем Павуком стварыла гурт «Красная зелень» і выпускае на YouTube сатырычныя кліпы, якія высмейваюць рэжым.

У Амэрыцы сьпявачка выступіла на дабрачынных канцэртах у падтрымку Украіны і беларускіх абаронцаў ва Украіне. Канцэрты праходзілі ў наступных лякацыях: Паўднёвая Фларыда (3 ліпеня), Бостан (7 ліпеня), Нью-Ёрк (10 ліпеня), Арлінгтан (Вірджынія) (13 ліпеня), Мінеапаліс (15 ліпеня), Чыкага (17 ліпеня), Сіэтл (19 ліпеня), Осцін (22 ліпеня), Сан-Францыска (24 ліпеня) і апошні канцэрт прайшоў у Лос-Анджэлесе (30 ліпеня).

Разам з Маргарытай у канцэртах удзел прымала піяністка **Тацяна Лойша**. На некалькіх выступіў вядомы ў сусьветных опэрных колах сьпявак **Ільля Сільчукоў**, а таксама зьбіральнік фальклёра **Сяргей Доўгушаў**.

У Нью-Ёрку 10 ліпеня сьнеўны паўтарагадзінны вечар праляцеў хутка, але яшчэ доўга нікто не хацеў разыходзіцца. Ільля Сільчукоў, Маргарыта Ляўчук і Тацяна Лойша сабралі ва Украінскім Дома на Мангэтане каля трохсот беларусаў.

Усё пачалося з духоўнага гімна “Магутны Божа”, пад які ўся заля ўстала і сьпявала разам з выканаўцамі. Артыстамі былі выкананы творы з Полацкага сшытка, Станіслава Манюшкі (музыка), У. Сыракомлі, Я. Купалы, У. Някляева і інш. Асабліва кранальным быў сьпеў на словы аднаго з вяроў палка Каліноўскага песьні “Прайду няўхільна цяжкі шлях”, які адлюстроўвае барацьбу і дух беларускіх вяроў ва Ураіне. Скончыўся канцэрт гімнам “Пагоня”, пад які таксама ўся заля ўстала.

Пасьля было шмат размоў, усьмешак, фота і пачастункаў. Кожны мог знайсьці сабе нешта па душы і жаданьні. Вольная Беларусь паказала, што жыве і засьведчыла сваю падтрымку Украіне.

---

## БЕЛАРУСЫ ПРАГІ АДЗНАЧЫЛІі 505-ГОДДЗЕ ВЫХАДУ БІБЛІІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

***Алесь Пазьняк***

Скарынаўскі дзень адзначылі беларусы Чэхіі.

Суботнім ранкам, 6 жніўня, беларусы Прагі сабраліся ля помніка Скарыны, каб адзначыць 505-годдзе выхаду Бібліі на беларускай мове.

Менавіта ў гэты дзень у 1517 году ў сталіцы Чэхіі выйшла ў сьвет першая друкаваная кніга па-беларуску - Біблія ў перакладзе Францыска Скарыны. Прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Празе ў сувязі з гэтай падзеяй наладзілі сьвята ля помніка асьветніку.

Імпрэза пачалася ў адзінаццаць гадзін пры ўдзеле чэшскіх і замежных палітыкаў. Падтрымаць беларусаў на важную падзею прыйшлі дэпутат чэскага парлямэнту Гаят Ёзаф Акамура, першы дарадца польскага пасольства ў Празе Магдалена Марыксевіч, старшыня Праскага лінгвістычнага таварыства Томаш Госкавец, дырэктар Польскага інстытуту ў Празе Мацей Ручай і іншыя.

Госьці і прысутныя выступілі з кароткімі прамовамі, у якіх падкрэслівалі выключную ролю Францішка Скарыны і выданнай ім Бібліі не толькі для Беларусі, але і для Усходняй Эўропы.

Паміж выступамі прамоўцаў гучала музыка флейты, а таксама фальклёрныя сьпевы.

На сьвяце прайшоў абмен кнігамі. Кожны жадаючы мог прынесьці сваю кнігу па-беларуску і абмяняць яе на іншую. Таксама тут прадаваліся майкі з беларускай сымболікай, лягатыпамі Скарыны і беларускія кніжкі.

Скарынаўскае сьвята скончылася лекцыяй гісторыка Паўла Котава «Што мы ведаем і ня ведаем пра Скарыну» ў Беларускай клюбоўні. Усіх прыйшоўшых навуковец пазнаёміў з выданьнем «Францыск Скарына ў дакументах і сведчаннях» (гал. укладальнік Алесь Жлутка, Мінск 2020).

Сьвята атрымалася насычаным і цікавым. Кожны з прысутных пасьля лекцыі мог абмяняцца сваімі думкамі з прысутнымі і задаць пытаньні гісторыку.

Беларусы Прагі штогод ладзяць падобныя імпрэзы ў гонар Скарыны. Фармат такіх мерапрыемстваў заўсёды грунтоўны і разнастайны.

# У НЬЮ-ЁРКУ АДБЫЎСЯ МАРШ ПАНЯВОЛЕНЫХ НАРОДАЎ




***Алесь Пазьняк***

Бел -чырвона-белыя сьцягі 17 ліпеня залуналі над Мангэтанам. У гэты дзень у Амэрыцы распачаўся Тыдзень паняволеных народаў.

У ЗША гэты тыдзень праводзіцца з 1959 года Камітэтам паняволеных народаў. Першапачаткова ён быў скіраваны на падтрымку народаў, якія апынуліся пад камуністычнымі рэжымамі.

У бягучым годзе прэзідэнт Джо Байдэн афіцыйна абвесьціў дні з 17 па 23 ліпеня Тыднем паняволеных народаў. Напярэдадні Белы дом апублікаваў заяву, дзе Байдэн разважае пра трывожныя тэндэнцыі ў сьвеце.

«Рэпрэсіўныя рэжымы ў Расеі, Іране, Беларусі, Сырыі, Кубе, Вэнэсуэле, Нікарагуа, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы, Кітайскай Народнай Рэспубліцы і іншых краінах усё часьцей імкнуцца падпарадкаваць сабе ня толькі тых, хто знаходзіцца ў іхных уласных межах, але і тых, хто знаходзіцца ў іншых краінах. Яны перасякаюць межы, каб сачыць, турбаваць, пагражаць і нават забіваць праваабаронцаў, работнікаў СМІ і цывільных асоб у іншых сувэрэнных краінах. Дэмакратыі сьвету павінны аб’яднацца і прадэманстраваць сілу нашай рашучасьці пакласьці канец гэтай несправядлівасьці», - заяўлена на сайце Белага дома.

Удзельнікі Марша, касьцяк якога склалі беларусы, у нядзелю 17 ліпеня ў Нью-Ёрку сабраліся а 9-й раніцы каля гатэлю Плаза (Plaza Hotel, at 5 Ave and 59th Street) на Мангэтане.

Адтуль вырушылі да Катэдры Сьвятога Патрыка, дзе адбылася імша за Паняволеныя Народы. Затым у 11 гадзін актывісты рушылі маршам па 5-й эвэню і 59 вуліцы да Сэнтрал Парку. Тут а 12-ай гадзіне каля Мэйн-манумэнту (Maine Monument, near Columbus Circle) адбылося ўрачыстае адкрыцьцё Тыдня Паняволеных Народаў.

Адзін з удзельнікаў і актывістаў Марша, які прыехаў з Філадэльфіі Вадзім Васільеў распавёў, што ўжо шосты раз бярэ удзел у гэтай акцыі.

«Прыехаў у Нью-Ёрк разам з сябрамі, бо адчуваем важнасьць таго, каб паказаць у якой небясьпецы знаходзіцца наша краіна. Я заўсёды імкнуся браць удзел у Маршы. Прапусьціў Марш толькі раз, калі быў пік пандэміі каранавіруса. Мы мусім падтрымаць таксама і Украіну, частка якой акупавана расейскімі агрэсарамі. Крыўдна, што ў гэтым годзе беларусаў было няшмат. Колькі ў Амэрыку перайшло беларусаў праз Мэксіку? Тысячы людзей! І дзе яны? Чаму не прыйшлі паўдзельнічаць?» - задаецца пытаньнямі Вадзім Васільеў.

Па словах удзельніка Марша беларусы зноў засьведчылі аб тым, што наша краіна знаходзіцца ў цісках дыктатуры і паняволеньня.

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і ўдзеле ў Маршы таксама ўзяло згуртаваньне “Пагоня”.





# БЕЛАРУСКА Ў АМЭРЫЦЫ ЗЬБІРАЕ НАРОДНАЕ АДЗЕНЬНЕ З РАДЗІМЫ



***Алесь Пазьняк***

*Фатаздымкі з альбому **Волі Дземкі***

**Часам можна пачуць, што тых, хто з’язджае з роднай краіны і жыве за мяжой працяглы час, перастаюць турбаваць пытаньні самаідэнтыфікацыі. І людзі проста прыстасоўваюцца пад рэчаіснасьць, губляючы свае карані. Але гэта не датычыцца Волі Дземкі, прадзюсаркі і рэжысэркі, якая каля 20 год жыве ў амерыканскім Сіэтле. Жанчына мае незвычайнае захапленьне – зьбірае беларускае народнае адзеньне мінулых часоў. Гэтым самым яна папулярызуе Беларусь далёка за яе межамі.**



**ПАЧАЛОСЯ ЎСЁ СА СЬПЕВАЎ**

Яшчэ жывучы ў Беларусі, Волю цікавіла краязнаўства, старажытная гісторыя, а таксама народныя сьпевы. Яна брала ўдзел у этна-фолкавым гурце “GUDA”, які быў утвораны ў 1996 годзе.

*“Сьпяваць – гэта маё. Калі пераехала ў ЗША, то і тут пачала займацца творчасьцю. Разам з іншымі дзяўчатамі стварылі гурт “VOLYA”, дзе выконвалі народныя песьні. Ён існуе з 2009 года. У гурт прыйшлі знаёмыя дзяўчаты і нават адна не беларуска. Для прыкладу, у “VOLIA” сьпявае балгарка Дарынка, якая вывучала беларускія народныя песьні на факультэце этнаграфіі ў Санкт-Пецярбургу”, – распавядае Воля.*

Дарэчы, Воля гэта ніякая ня Вольга, бо ў пашпарце яна таксама Воля. Гэтым жанчына ганарыцца.

Для выступаў дзяўчынам трэба было народнае адзеньне якога не было і жанчына пачала шукаць. Першую кашулю Вольга набыла на аўкцыёне “eBay”, на якім была выстаўлена «русское платье». Але пільнае вока сьпявачкі заўважыла, што гэта нешта зусім іншае. Вольга зьвязалася з прадаўцом і высьветліла, што гэта ніякае ня “платье”, а вопратка бабулі прадаўца з Веткаўскага раёна.

*“Гэта быў веткаўскі народны строй з Гомельскай вобласьці. Хацела даведацца ў гэтага чалавека болей пра яго гісторыю, пра бабулю. Але ён нічога мне не сказаў. Ня выдаў ніякай інфармацыі. Акрамя гэтага прыгожага строю, набыла яшчэ ў яго рушнікі з Гомельскай вобласьці, якія ён прадаваў, як “русские полотенца”. Гэта былі першыя зярняты маёй калекцыі”. Так што народнае адзеньне – гэта пабочка ад таго, чым я першапачаткова пачала займацца ў ЗША”.*



Жанчына шукае аўтэнтычныя рэчы ў беларускіх вёсках і інтэрнэт-аўкцыёнах і набывае іх за ўласныя грошы. Штосьці з набытага трэба рэстаўраваць і абнаўляць. Штосьці прадаецца ў вельмі добрым выглядзе. Для некаторых строяў не хапае некаторых элементаў. Таму, зімовымі вечарамі, калі сын – школьнік Антось глядзіць мульцікі, жанчына дарабляе набытую прыгажосць. Але 90% ад таго, што мае калекцыянерка – гэта рэальнае народнае святочнае адзеньне мінулых часоў.

Зараз у Волінай калекцыі 234 элемента адзення, што складаюць поўных 32 жаночых строя XIX стагоддзя. Акрамя іх ёсць і 3 мужчынскія. Воля назьбірала шмат палескіх строяў – кобрынскі, жабінкаўскі, бярозаўскі, маларыцкі, альшанскі… Бракуе строяў з Віцебскай вобласьці, але этнографка спадзяецца, што ўсё яшчэ наперадзе. Захапленне прывяло да таго, што прыйшла ідэя стварыць фотаальбом для таго, каб іншыя людзі змаглі ўбачыць гэтую прыгажосць.

## ХВАРОБА І ВАЙНА НЕ ПЕРАШКОДЗІЛІ ФОТААЛЬБОМУ

*“Калі ў краіне вымываецца ўсё беларускае, зачыняюцца выдавецтвы, чыняцца рэпрэсіі, патрэбна нешта рабіць, каб паказаць, што Беларусь існуе, не гледзячы ні на якія акалічнасці”, – распавядае Воля.*

Першы фотаальбом прафесійная прадзюсэрка і відэаздымачка выпусьціла ў 2021 годзе. Для якога сама зрабіла ўсе кадры. У якасці жанчын у строях першапачаткова планаваліся прафесійныя амэрыканскія мадэлі. Але потым Вольга зразумела, што гэта будзе зусім не тое, чаго яна хоча. І тады прыйшла ідэя апрануць у старадаўнюю вопратку зводную сястру хрэсьніцы – Жэню. Атрымалася, на думку Вольгі, выдатна. Бо хударлявая юная Жэня змагла “ўлезці” ва ўсе касьцюмы невялікіх памераў, бо раней дзяўчыны шлі ў замужжа даволі рана, у 14 – 15 год.

*“Першы альбом атрымаўся больш як каталог. У ім я паказала, што ёсць ў назбіранай калекцыі. Яго вельмі аздобіла сваёй прыгажосцю Жэня. Але другі альбом атрымаўся больш грунтоўны. У папяровай версіі ён мае 140 старонак на дзвюх мовах – беларускай і англійскай. Ёсць таксама электронная вэрсія, якую можна набыць у інтэрнэце. Калі ў першым альбоме была толькі мая сваячка Жэня, то ў другім бясплатна да працы далучылася сям’я з Беларусі, якая цяпер жыве ў Сіэтле – Антон і Дар’я Слабада”, – кажа калекцыянерка.*

Выдаць фотаальбом аказалася справай няпростай, так як Вольга рабіла яго фактычна паміж сэансамі хіміятэрапіі. Тры гады, як яна ўжо змагаецца з рэдкім цяжкім аўтаімунным захворваньнем, пры якім на ёй тэстуюць пэўныя лекі. Таму нават інтэрв’ю было не так проста зрабіць, бо Воля толькі прайшла чарговы курс “хіміі”.

*“Я адношуся да свайго захворвання так, як быццам у мяне вечны каронавірус”, – усьміхаецца Воля.*

Яшчэ адна акалічнасьць – гэта вайна ва Ўкраіне. Справа ў тым, што другі альбом фактычна быў падрыхтаваны 23 лютага бягучага году. А 24 пачаліся баявыя дзеяньні. Вользе казалася бессэнсоўным выдаваць альбом, калі ўвага ўсіх, у тым ліку і яе, была прыкаваная да інфармацыйных паведамленьняў, а потым да рэальнай дапамогі ўкраінцам, апынуўшымся ў бядзе. Але яна пайшла на такі крок і альбом пабачыў сьвет, атрымаўшы самыя лепшыя водгукі.

*“Мой занятак – гэта і аддушына, і тэрапія адначасова. Пры маёй хваробе – гэта пазітыўныя моманты, якія мяне натхняюць. Няма нейкага рэцэпту, каб захаваць беларушчыну. Я ўсё раблю не таму што трэба, а таму што не магу не рабіць, бо я – творчы чалавек”.*

## ПРЫПЫНЯЦЦА НЕ ЗЬБІРАЮСЯ

Частка калекцыі Волі Дземкі пабывала на дабрачынным вечары ў падтрымку Украіны, які ладзіўся 19 траўня і дзе яна прадставіла і украінскія строі. Падчас яго фондам **“You Are The Angel”** было сабрана 38 тысяч даляраў для ўкраінскіх уцекачоў і жыхароў прыфрантавых тэрыторый на медыкаменты, ежу, ваду і іншае. Часам валанцёры фонда дастаўляюць неабходныя рэчы людзям нават пад артылерыйскім агнём.

**10 верасьня** Вольга прадставіць назьбіраныя строі на ўкраінскім фестывале ў Сіэтле. Потым плянуецца **“Metropolitan Fashion Week”,** які пройдзе **24 верасьня** таксама ў Сіэтле. **1 кастрычніка** пройдзе паказ у Лос-Анджэлесе. Таксама ёсьць пляны і на іншыя амэрыканскія гарады.

*“Калі пачала зьбіраць беларускія строі, стала прыліпаць нешта памежнае, блізкае. Так, акрамя беларускіх, паступова з’яўляліся ўкраінскія. Цяпер у маім куфары 15 жаночых і 3 мужчынскіх ўкраінскіх строяў. Усе яны будуць паказаныя на ўкраінскіх мерапрыемствах у Амэрыцы. Прыпыняцца я не зьбіраюся. Тым больш, што ўкраінскае зараз прасоўваць лягчэй, чым беларускае”, – падкрэсьліла зьбіральніца.*

У планах этнографкі стварэньне беларускага музэя ў Сіэтле. Але гэта толькі задумка. А пакуль Воля лічыць, што трэба рабіць усё магчымае, каб паказаць прыгожую Беларусь усяму свету праз колератэрапію народнага адзення.







# У НЬЮ-ЁРКУ НА АКЦЫІ “СВАБОДНАЯ БЕЛАРУСЬ” УШАНАВАЛІ ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ



*Алесь Пазьняк*

**У суботу, 20 жніўня, ў Вашынгтон-сквэр-парку было горача ня толькі ад сонца, але і ад канцантрацыі беларусаў. Тут а 13-ай гадзіне пачалася акцыя “Support Freedom In Belarus”.**

**Ганна Шарко**, арганізатар мерапрыемства, напачатку акцыі адзначыла важнасьць беларускай салідарнасьці, а таксама падзякавала ўсім, хто ахвяраваў часам і прыйшоў. Актывістка раздала прысутным фатаздымкі палітвязьняў, каб была магчымасьць распавесьці амэрыканскім і замежным наведвальнікам парка пра дыктатуру ў Беларусі. Яна зьвярнула ўвагу, што цяпер рэжым Лукашэнкі ўтрымлівае каля 1500 палітычных зьняволеных.

Ганна прызвала прысутных ушанараваць хвілінай маўчаньня загінулых на пратэстах у 2020 годзе. І тых беларусаў, хто ахвяраваў сабой, бароначы Украіну. Таксама яна распавяла пра двух сваіх сяброў, юрыстаў **Яўгена Бабака і Яўгена Юшкевіча**. На сёньняшні дзень абодва з’яўляюцца палітвязьнямі.

У працягу сваёй прамовы Ганна акцэнтавала ўвагу на дапамозе **Ігару і Дар’е Лосікам**, маёмасць якіх хочуць выставіць на продаж і заклікала падтрымаць іх фінансава, каб гэтага ня здарылася.

*“У Беларусі сёньня людзі нічога ня могуць сказаць. І мы павінны выказвацца за тых, хто зараз ня можа гаварыць. Мы павінны падтрымаць палітвязьняў і галасна заяўляць пра тэрарыстычны рэжым у Беларусі. Кожны беларус павінен усьвядоміць, што мая хата ня з краю!” – выказалася Ганна.*

Акцыя сабрала каля сотні беларусаў. Некаторыя прыйшлі на яе толькі ўчора апынуўшыся ў Нью-Ёрку пасля перасячэньня мэксыкана-амэрыканскай мяжы. Людзі прынесьлі з сабой бел-чырвона-белыя сьцягі. Некаторыя трымалі плякаты.

Падзея была адзначана тым, што кожны жадаючы мог выказацца і распавесьці ўласную гісторыю перасьледу.

Адзін з прысутных, супрацоўнік часапіса “Беларус” **Міхал Чаропка**, заклікаў беларусаў прытрымлівацца салідарнасьці і ня кідацца ў сваркі. Ён выказаўся пра важнасьць таго, што нельга спыняцца ў пашырэньні інфармацыі пра злачынствы рэжыму. Таксама ён заўважыў, што беларусы гэтым разам на акцыі пачалі выказвацца і прагучала некалькі добрых сьведчаньняў аб перасьледзе.

*“Трэба паказваць, што ў Беларусі ёсьць голас і ён не задушаны. Яны закапалі нас у зямлю, але яны ня ведалі, што мы – бульба. Беларусы няскораныя і будуць змагацца паўсюль, дзе яны ёсьць. Сёньня гучалі добрыя прамовы. Жыве Беларусь!” – сказаў Міхал Чаропка.*

**Андрэй Малецкі**, які прыйшоў з сям’ёй, распавёў, што знаходзіцца ў вышуку за палітычную дзейнасьць у Беларусі. Ён два тыдні як прыехаў у ЗША. Аднак мужчына ўпэўнены, што вернецца, бо рэжым ня вечны. А пакуль трэба жыць у новых варунках.

Старшыня беларуска-амэрыканскага згуртаваньня “Пагоня” **Віталь Зайка** зрабіў акцэнт на дапамозе палітвязьням. Ён адзначыў, што яна можа быць рознай – ад сумесных дзеяньняў беларусаў за мяжой да матэрыяльных ахвяраваньняў.

Спадар Зайка распавёў пра свайго знаёмага, палітвязьня **Яўгена Афнагеля**, які быў затрыманы ў 2020 годзе ў межах крымінальнай справы па ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (“Удзел у масавых беспарадках”). Сілавікі тады выламалі дзьверы кватэры, у якой ён пражываў.

*“У 2020 годзе адбылася нацыянальная самаідэнтыфікацыя. Трэба падтрымліваць кожнага, хто змагаецца супраць дыктатуры і памятаць пра палітвязьняў. Гэта вельмі важна”, – адзначыў старшыня “Пагоні”.*

Спадарыня **Жэня** распавяла, што ўжо шэсць год жыве ў ЗША, але ёй неабыякавы лёс Беларусі, бо гэта яе Радзіма. Па гэтай прычыне яна прыйшла на акцыю “Свабодная Беларусь”.

Мерапрыемства скончылася сумесным пікнікам з піцай і кавай ў Вашынгтон-сквер-парку. Тут прысутныя маглі бліжэй пазнаёміцца і абмяняцца кантактамі. Цікава, што толькі што апынуўшыхся ў ЗША беларусаў турбавала прысутнасьць амэрыканскай паліцыі ў месцы адпачынку. Аднак тыя, хто жыве ў Амэрыцы працяглы час, патлумачылі, што паліцыя нікога ніколі не чапае бяз пэўных прычын, асабліва калі людзі сабраліся, каб спакойна выказаць свае думкі і погляды.

Вокліч “Жыве Беларусь!” шмат разоў гучаў у Вашынгтон-сквер-парку і прыцягваў увагу нью-ёркцаў.

# У САН-ФРАНЦЫСКА РАЗГАРНУЛІ 10-МЕТРОВЫ БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫ СЬЦЯГ







***Алесь Пазьняк***
***Фота: Надзея Нортан***

**Беларусы Сан-Францыска разам з сябрамі правялі Дзень Годнасьці. Акцыя прайшла 13 жніўня на плошчы Эмбаркадэра (Harry Bridges Plaza, Embarcadero). Яе адметнасьцю стала тое, што беларусы разгарнулі вялікі бел-чырвона-белы сьцяг даўжынёй ў 10 метраў.**

**Надзея Нортан**, арганізатарка акцыі і нефармальны лідэр беларусаў Сан-Францыска, адзначыла, што месца, дзе сабраліся беларусы, стала знакавым за апошнія два гады.

*"Месца вельмі ўдалае. Тут таксама зьбіраюцца і ўкраінцы. Каля плошчы заўсёды шмат руху, аўтамабіляў, людзей, а значыць і ўвагі", – сказала актывістка.*

На пачатку акцыі былі зачытаныя імёны загінулых беларускіх дабраахвотнікаў ва Украіне, якіх прысутныя ўшанавалі хвілінай цішыні.

Мітынгоўцы выйшлі з партрэтамі палітвязьняў і раздавалі ўлёткі аб сітуацыі ў Беларусі ўсім зацікаўленым мінакам. А таксама разам прасьпявалі "Пагоню".

Дзень Годнасьці сабраў не толькі мясцовых беларусаў. Да яго далучыліся прадстаўнікі з Сакрамэнта і Флорыды, а таксама новыя беларусы, палітычныя ўцекачы, якія нядаўна прыехалі ў ЗША.

З прамовамі выступілі **Надзея Нортан і Джон Рэйман** (прадстаўнік Ukraine Socialist Solidarity Campaign), якія падбадзёрылі дыяспару працягваць змаганьне за дэмакратыю і незалежнасьць Беларусі.

Акрамя беларускай супольнасьці да Дня Годнасьці далучыліся амерыканцы з **"Ukraine Socialist Solidarity Campaign"**. Яны прынеслі плякаты і ўлёткі ў знак салідарнасці з ліквідаванымі незалежнымі прафсаюзамі на Беларусі.

Прысутныя зрабілі грашовы збор для сем'яў палітвязьняў праз фонд **"DISSIDENTBY"**. Па словах арганізатара, атрымалася сабраць грошы для падрыхтоўкі ў школу шасьці школьнікаў з сямей палітвязьняў.

Дні Годнасьці былі зладжаныя беларускімі суполкамі ў васьмі амэрыканскіх гарадах і сабралі шмат беларусаў, якія не толькі працягнулі беларускую павестку ў ЗША, але і падтрымалі фінансава сем'і палітычных зьняволеных.

Акцыі былі прымеркаваныя да ўшанавання 2-й гадавіны скрадзеных прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі і пачатку беспрэцэдэнтных рэпрэсій супраць тых, хто зрабіў выбар не жыць пад уладай дыктатара. Дні Годнасьці адбыліся пры інфармацыйнай падтрымцы Асацыяцыі беларусаў Амерыкі.





# БЕЛАРУСЫ ВЫСТУПІЛІ НА ПРЭСТЫЖНЫМ ЗАБЕГЕ "HOOD TO COAST"



***Алесь Пазьняк***
***Здымкі прадастаўлены Надзеяй Пынкінай і Надзеяй Нортан***

**Каманда "Free Belarus" 26 і 27 жніўня прабегла эстафету даўжынёй 200 міль у Штаце Арэгон з беларускімі і ўкраінскімі сьцягамі.**

Забег **"Hood to Coast"** ("Ад гары да Узбярэжжа") з'яўляецца самым вялікім і вядомым у ЗША. У гэтым годзе яму споўнілася 40 год.

"Hood to Coast" у народзе называюць маці ўсіх амэрыканскіх эстафет. Працягласьць эстафеты 200 міль, якія неабходна прабегчы за двое сутак. І каманда з 12 беларусаў ЗША меньш чым за двое сутак 26 і 27 жніўня пасьпяхова з гэтай задачай справілася. Свой забег спартоўцы зрабілі ў падтрымку Украіны і Беларусі.

*"У кожнай камандзе эстафета займае розны час. Наша каманда прабегла яе за 30 гадзін і 20 хвілін. У ёй было шасьцёра жанчын і шасьцёра мужчын з розных мясьцін Амэрыкі. Атрымалася файна!" – кажа адна з удзельніц, кіроўца мінібуса* ***Надзея Пынкіна.***

Сярод 1044 каманд з капітанам Кацярынай Машохай (Каліфорнія) беларусы фінішавалі 420-мі. А ў сваім дывізіёне са 135 каманд былі 40-мі.

Забег не спыняўся ні удзень, ні ўначы. Два мінібусы падвозілі беларускіх ўдзельнікаў да чарговага адрэзка дыстанцыі, дзе на фінішы і старце бегуны перадавалі адзін аднаму бел-чырвона-белыя і ўкраінскія сьцягі.

Беларусы загадзя падзяліл дыстанцыю на 36 адрэзкаў. Бегуны прабеглі тры адрэзкі дыстанцыі ўдзень, уначы і раніцай агулам ад 15 да 20 міль.

*"Эстафета – гэта вялікая падзея. Увесь Штат Арэгон жыве гэтым некалькі дзён. Мы беглі праз сам Портланд, лес, горы, да акіяна. Было шмат удзельнікаў, якія памяталі нас з мінулага года. Да нас падыходзілі, віталіся і выказвалі словы падтрымкі. Людзі ведалі, што мы бяжым за свабодную Беларусь і Украіну і падбадзёрваюча крычалі "Go Belarus!" – распавяла Надзея.*





Па словах актывісткі, ідэя стварэньня каманды "Free Belarus" пачалася з падарожжа БЧБ сьцяга. У 2020 годзе Асацыяцыя беларусаў Амэрыкі пад кіраўніцтвам **Надзеі Нортан** правяла такую акцыю ў ЗША. Тады адзін і той жа сьцяг жыхары розных Штатаў перадавалі адзін аднаму. Ён, падхоплены ініцыятыўнымі беларусамі, правандраваў нават па Канадзе і ў мінулым годзе дасягнуў Польшчы.

Забегам у Арэгоне беларускія удзельнікі распавялі пра Беларусь і зрабілі грашовы збор на падтрымку палітвязьняў і мабільнага шпіталя імя Пірагова ва Украіне. Усе грашовыя сродкі праходзяць праз фонд **"Human Rights Foundation".**

*"Мы стомленыя, але вельмі ўражаныя. Для мяне гэта яднаньне з Радзімай. Таксама дапамога рэпрэсаваным беларусам і украінцам у іх сёньняшнім ваенным становішчы", – распавяла Надзея.*

Забег у Арэгоне адзначыўся не толькі спартыўным азартам і ініцыятывамі, але агульнай салідарнасьцю і хатняй гасціннасьцю ўдзельнікаў і групы падтрымкі каманды "Free Belarus".



# ГУТАРКА З ГЭНЭРАЛЬНЫМ КОНСУЛАМ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА Ў НЬЮ-ЁРКУ / ROZMOWA Z KONSULEM GENERALNYM RP W NOWYM JORKU



***Гутарыў:*** *Міхал Чаропка*
***Перкалад польска-беларускі:*** *Алесь Пазьняк, Міхал Чаропка*

(BLR-POL)
Рэдактар часапіса “Беларус” Міхал Чаропка пагутарыў з Гэнэральным консулам Рэспублікі Польшча ў Нью-Ёрку спадаром **Адрыянам Кубіцкім**.

**– Добры дзень, шаноўны спадар Консул, і вялікі дзякуй за згоду на гэтае інтэрв’ю. Дазвольце яшчэ раз падзякаваць Вам і польскаму грамадству за падтрымку, якую Польшча аказвае беларусам. А беларусы, у сваю чаргу, вельмі падтрымліваюць Польшчу, якая робіць усё магчымае і немагчымае, каб дапамагчы Украіне. У сувязі з гэтым у мяне да вас некалькі пытаньняў.**

**– Спачатку раскажыце нам крыху пра сябе. Дзе вы нарадзіліся і ці маеце беларускія карані? Якія даты ў супольнай польска-беларускай гісторыі вы лічыце найболыш важнымі, каб на гэтым фоне хутчэй аднавіць адносіны?**

– Я нарадзіўся ў Торуні і, на жаль, сярод маіх бліжэйшых продкаў няма беларусаў. Але я ўпэўнены, што калі б добра пашукаць у радавым дрэве, то напэўна ва ўсіх дзесьці ёсць трошку і ад палякаў, і ад беларусаў, і ад украінцаў...

Бо гісторыя ўзаемаадносін нашых народаў доўгая і цікавая. Безумоўна, адной з найважнейшых падзей паміж намі была Люблінская унія 1569 года, у выніку якой палякі і беларусы пачалі дзяліць землі ў межах адной дзяржавы.

Яшчэ адна важная дата – 1794 год, калі Тадэвуш Касцюшка падняў паўстанне супраць падзелаў, аб’яднаўшы жыхароў Рэчы Паспалітай. Гэта было не апошняе паўстанне, якое нагадвае наша памяць. У 1863 годзе Кастусь Каліноўскі актыўна ўдзельнічаў у Студзеньскім паўстанні, за што заплаціў самую высокую цану.

Аднак неабавязкова хадзіць так далёка, каб заўважыць падзеі, важныя для нашых народаў. У мінулым годзе мы адзначылі 30-годдзе ўстанаўлення дыпляматычных адносін, калі незалежная Беларусь стала на шлях незалежнай дзяржавы. Сёлета спаўняецца 30 гадоў з дня падпісаньня Дамовы аб добрасуседстве і сяброўскім супрацоўніцтве паміж Польшчай і Беларусьсю.

Сумна, што размова ідзе ў жніўні, усяго праз паўтара дзясятка дзён пасля другой гадавіны фальсіфікацыі выбараў у Беларусі. 9 жніўня 2020 года – гэта дата, якая сімвалізуе парушэньне правоў чалавека, грамадзянскай свабоды і дэмакратыі. Аднак мы ўсе бачым, што беларусы ніколі не адмаўляліся ад імкненьня да дэмакратыі, пачатае ў 1991 годзе. Такія апазыцыянэры, як Сьвятлана Ціханоўская ці Зянон Пазьняк, зьяўляюцца найлепшым таму прыкладам, і іх рашучыя дзеяньні даюць надзею на тое, што дэмакратычныя працэсы ў Беларусі наступяць.

**– Як вы лічыце, што адчувае і чым жыве польскае грамадства з пачатку вайны, якую Расея пачала ва Украіне?**

– Імпэрыялістычная палітыка Расеі ўжо шмат гадоў хвалюе польскае грамадства. Польскія палітыкі і грамадскія дзеячы ўвесь час падтрымлівалі дэмакратычныя працэсы у краінах, якія пацярпелі ад агрэсіўнай экспансіі Крамля. У 2008 годзе перад расейскім нападам на Грузію Лех Качыньскі папярэдзіў кіраўніцтва ў Тбілісі пра расейскую пагрозу. Сёння, перад тварам варварскага нападу на Украіну, гэтыя словы вяртаюцца да нас з падвоенай сілай.

Вайна за нашу ўсходнюю мяжу, па сутнасці, доўжыцца ўжо шмат гадоў. Аднак маштаб узброенага нападу, які мы назіраем з 24 лютага, усіх нас здзівіў і напалохаў. Мы з трывогай назіралі за развіццём сітуацыі, але ў той жа час адразу адчулі атмасферу еднасьці з украінскім народам, асабліва з бежанцамі, якія масава прыбылі ў Польшчу.

Вельмі кранальнай была рэакцыя мільёнаў палякаў, якія адгукнуліся на біду суседа. Арганізаваная цэнтральнымі ўладамі і мясцовымі органамі самакіраваньня дапамога давала магчымасьць хутка знайсьці жыльлё людзям, якія беглі ад вайны. Да сёньняшняга дня многія палякі прысвячаюць свой час падтрымцы людзей, якія прыехалі ў Польшчу з Украіны пасля 24 лютага. Больш за 5 мільёнаў бежанцаў перасеклі нашу мяжу. Аднак я перакананы, што пры надзвычайнай салідарнасьці, суперажываньні і актыўнасьці польскага грамадства і людзей добрай волі з усяго свету дапамога будзе працягвацца.

**– Якая пазыцыя кіраўніцтва Польшчы ў дачыненьні да сытуацыі ў Беларусі? Ці згодныя вы з тым, што цяпер Беларусь знаходзіцца пад падвойнай акупацыяй з аднаго боку Расеі і з другога боку антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі?**

– Польшча ўжо шмат гадоў падтрымлівае дэмакратычныя працэсы на Беларусі. Беларускія апазыцыянэры змагаюцца за сваю, самастойную і незалежную дзяржаву. Мы прызнаем, што выбары 9 жніўня 2020 года былі сфальсіфікаваныя, і тым больш мы ня можам прыняць вынікі канстытуцыйнага рэфэрэндуму, на якім дыскрэдытаваная ўлада спрабуе навязаць грамадзянам законы, якія супярэчаць любым правілам дэмакратыі. Мы, палякі, у рэшце рэшт, маем падобны досьвед, калі падчас існаваньня ЗССР мы знаходзіліся пад падаўляючым уплывам Савецкага Зьвязу. Таму мы, як палякі, з вялікім разуменьнем ставімся да барацьбы, якую вядуць сёньня ўсе беларусы, якія змагаюцца за свабоду і дэмакратыю.

Цяперашняя сытуацыя ў Беларусі вельмі балючая, калі кожны дзень мы назіраем неабгрунтаваныя замахі на грамадзянскія правы і свабоды. Ахвярамі такіх рэпрэсій сталі таксама грамадзяне Польшчы: Анджэй Пачобут і Анжаліка Борыс. Міжнародная супольнасць ня можа прыняць такія паводзіны беларускага рэжыму, якія носяць прыкметы перасьледу і закранаюць саму сутнасць правоў чалавека.

Палітыка менскіх уладаў — гэта таксама парушэньне многіх нормаў і звычаяў міжнароднага права. Расследаваньне ICAO паказала, што беларускія ўлады наўмысна парушылі правілы міжнароднай грамадзянскай авіяцыі, наўмысна паведамілі пра ілжывую пагрозу выбуху і прымусілі да пасадкі ў Менску самалёт, з якога быў прымусова зьняты апазыцыянэр Раман Пратасевіч.

Для палякаў надта балюча адбіваецца зьнішчэньне магілаў і месц памяці польскіх жаўнераў, аб чым мы чуем у апошнія месяцы. У ліпені беларускія ўлады пастанавілі зьнішчыць цвінтар польскіх жаўнераў у Мікулішчах, на якім спачываюць жаўнеры III і IV Брыгад Арміі Краёвай, якія ўдзельнічалі ў апэрацыі “Вострая Брама”, і якія загінулі ў бітве за вызваленьне Вільні з-пад нямецкай акупацыі. Гэта чарговы акт барбарскай спробы перапісаць гісторыю.

**– Я ведаю, што цяпер у Польшчы, як і ў краінах Усходняй Эўропы, дамінуе ідэя праэкту Балта-Чарнаморскага зьвязу. Якую ролю ў гэтым павінна адыграць Беларусь і на якой аснове плянуецца будаваць адносіны паміж краінамі, якія ўваходзяць у яе склад?**

– Сапраўды, з 2015 года, дзякуючы сумеснай працы прэзідэнта Анджэя Дуды і прэзідэнта Каліндзы Грабар-Кітаравіч, была распрацавана “Ініцыятыва трох мораў”, якая ў цяперашні час аб’ядноўвае 12 дзяржаў-членаў Эўрапейскага зьвязу, размешчаных паміж Балтыйскім, Чорным і Адрыятычным морамі. Нью-Ёрк з’яўляецца асабліва важным месцам для развіцьця гэтай ініцыятывы, таму што мэнавіта тут 7 гадоў таму адбылася першая міждзяржаўная сустрэча, якая прывяла да арганізацыі 1-га саміту “Ініцыятывы трох мораў” у 2016 годзе.

Такая форма партнэрства дазваляе моцна і салідарна выказваць інтарэсы краін рэгіёна, якія ў сілу гэаграфічных умоў і гістарычнага мінулага вельмі часта з’яўляюцца агульнымі.

Гэта і эканамічныя, і палітычныя інтарэсы, якія не заўсёды маюць аднастайны характар. Аднак сярод краін, звязаных з Ініцыятывай, мы заўважаем, што існуе патрэба ў моцнай арганізацыі, якая дапаможа дзейнічаць дзеля развіцьця і бясьпекі Цэнтральнай Эўропы. Такая салідарнасць асабліва патрэбна сёньня, калі ідзе вайна, выкліканая расейскай агрэсіяй.

Пачынаючы з чэрвеня 2022 года краіны, якія не з’яўляюцца асацыяванымі ў Эўрапейскім зьвязе, таксама маюць магчымасьць прыняць актыўны ўдзел у “Ініцыятыве трох мораў” у якасьці партнэраў-удзельнікаў. У выніку ўдалося ўключыць у сваю дзейнасць Ініцыятыву Украіны, намаганьні якой па ўступленьні ў Эўразьвяз падтрымліваюць усе асацыяваныя краіны. Я думаю, што многія краіны нашага рэгіёну спадзяюцца, што прыйдзе час, калі і дэмакратычная Беларусь зможа ўдзельнічаць у Ініцыятыве.

**– Эўразьвяз сёньня абмяркоўвае забарону на візы для грамадзян Расеі. Ці беларусы таксама павінны атрымаць такія абмэжаваньні?**

– Такая дыскусія сярод прадстаўнікоў дзяржаў-членаў сапраўды ёсць. Пры гэтым варта падкрэсліць, што ў асноўным гаворка ідзе аб шэнгенскіх візах, якія дазваляюць уязджаць у любую краіну Шэнгенскага пагадненьня і знаходзіцца там 90 дзён на працягу 180 дзён. Любыя зьмены ў гэтым пляне павінны, аднак, грунтавацца на дыпляматычных і палітычных дамоўленасьцях на ўзроўні ЭЗ. Аднак гэта не раўнавартасна забароне на ўезд у краіны-члены, якія самі фармуюць сваю візавую палітыку.

Нельга забываць, што Расея больш за паўгода вядзе агрэсіўную вайну, ня лічачы ахвяраў сярод мірнага насельніцтва. Міністар замежных справаў Рэспублікі Польшча Зьбігнеў Раў, наведваючы ў жніўні Бучу, Ірпень і Барадзянку, выразна заявіў, што гэтыя мейсцы «*ўвойдуць у гісторыю як мейсцы ваенных злачынстваў супраць чалавечнасьці*». Цяжка ўявіць сабе сытуацыю, калі грамадзяне Расейскай Фэдэрацыі могуць падарожнічаць па Эўропе з турыстычнымі мэтамі.

Зараз у Беларусі дзейнічаюць польскія прадстаўніцтвы, дзякуючы якім беларускія грамадзяне, многія з якіх схаваліся ад палітычных рэпрэсій, а таксама тыя, хто вучыцца ці працуе ў Польшчы, могуць у звычайным парадку падаваць заявы на розныя формы дазволу на знаходжаньне ў Польшчы.

**– Мы ведаем, што польскі ўрад вельмі дапамагае беларусам у Польшчы. Акрамя таго, спадар Консул у сваіх прамовах казаў, што ён гатовы дапамагаць беларусам, якія тут знаходзяцца. Ці ёсць плян гэтай дапамогі?**

– Польшча нязменна падтрымлівае дзейнасць, накіраваную на пабудову сувэрэннай і дэмакратычнай Беларусі. Таму мы стараемся падтрымліваць грамадзян Беларусі і за межамі Нашых краін. Ёсць шмат праяваў такой дзейнасьці, як асобных людзей, так і арганізацый і аб’яднаньняў.

У індывідуальным парадку консульскія ўстановы, у тым ліку Гэнэральнае консульства Рэспублікі Польшча ў Нью-Ёрку, могуць прымаць заявы ад замежных грамадзян, якія прэтэндуюць на Карту паляка. Гэта дакумант, які палягчае ня толькі знаходжаньне ў Польшчы, але і перамяшчэньне па краіне, уладкаваньне на працу ці пачатак вучобы. З моманту пачатку выдачы Картаў паляка толькі ў Беларусі было пададзена больш за 160 тысяч заявак на гэты дакумант. У консульстве ў Нью-Ёрку мы пастаянна апрацоўваем шмат заяваў ад грамадзян Беларусі, якія адчуваюць сябе звязанымі з Польшчай. Гэта паспяховы прыклад інстытуцыйнай дзейнасьці, якая заснаваная на агульнай спадчыне, з’яўляецца выразам клопату аб агульнай будучыні.

Польшча актыўна падтрымлівае беларускія арганізацыі і суполкі, а таксама беларускую культуру. У прошлым годзе, калі ня змог адбыцца менскі “Месяц фатаграфіі”, Інстытут Пілецкага арганізаваў у Бэрліне выстаўку “Жыве Беларусь!”, каб адзначыць беларускую фатаграфію, дазволіць раскрыць яе багатае выяўленьне без цэнзуры, а

таксама і расказаць нашым заходнім суседзям пра падзеі 9 жніўня 2020 года. У Польшчы таксама арганізаваны фэстываль фільмаў Bulbamovie, дзе дэманструюцца фільмы незалежных беларускіх кінематаграфістаў, і партнэрам якога гэтым разам выступіла Міністэрства замежных спраў.

**– У сакавіку 2022 года перад беларускай царквой у Брукліне ўсталявалі два помнікі нацыянальным героям нашай былой агульнай дзяржавы. Ці лічыце вы, што беларусы і палякі сапраўды павінны падзяляць спадчыну, напрыклад, паэзію Міцкевіча ці музыку Манюшкі? Як увогуле трэба ставіцца да агульнай спадчыны, каб было як мага меньш канфліктаў?**

– Адкрыцьцё помнікаў Тадэвушу Касцюшку і Кастусю Каліноўскаму перад беларускай царквой з'яўляецца знакам таго, што ў палякаў і беларусаў ёсць агульныя героі. Гэта вялікія постаці, якіх хопіць не на адзін народ. Тадэвуш Касцюшка, акрамя нашага кантэксту Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, з'яўляецца яшчэ і амэрыканскім героем.

Бо наша культура — гэта ня толькі Міцкевіч ці Манюшка, але і традыцыі і звычаі, у тым ліку моцная прыхільнасць да свабоды і незалежнасьці, якія матывуюць дзеяньні беларускіх апазыцыянэраў. Наша гісторыя дзяржаўнасьці складвалася ў супольнай, шматэтнічнай і талерантнай дзяржаве – Рэчы Паспалітай.

У Польшчы створаныя грамадскія ўстановы, якія клапоцяцца пра матэрыяльнае вымярэньне гэтай спадчыны, напрыклад, «Нацыянальны інстытут польскай культурнай спадчыны за мяжой Polonika», які падтрымлівае ініцыятывы, якія выхоўваюць месцы, важныя для нашай агульнай гісторыі. Такія працы адбываліся і ў Беларусі, дзе Фонд падтрыманьня культурнай спадчыны займаўся, у тым ліку, рамонтам Фары Вітольда ў Навагрудку, дзе быў ахрышчаны паэт Адам Міцкевіч. Тым больш сумна, што ўлады ў Менску не ўспрымаюць гэтае агульнае вымярэньне нашай гісторыі і не дазваляюць праводзіць працы, якія маглі б закласьці падмурак шанаваньня агульнай спадчыны нашых краін.

Агульная гісторыя — гэта, вядома, і творцы нашай культуры, якіх шануюць і ў Польшчы, і ў Беларусі. Вы згадалі Манюшку і Міцкевіча, якія нас, безумоўна, звязваюць, але ёсць таксама Агінскі і Нарушэвіч, у якіх мы знаходзім шматлікія асабістыя польска-беларускія сляды ў біяграфіі. Безумоўна, ёсць шмат творцаў, як старажытных, так і сучасных, чыю польска-беларускую спадчыну яшчэ трэба будзе адкрыць. Добрай нагодай для гэтага можа стаць абвешчаны Святланай Ціханоўскай Міжнародны дзень беларускай культуры, які мы адзначаем 7 ліпеня.

Агульная спадчына — гэта перш за ўсё пошук таго, што нас аб'ядноўвае. Таму мы стараемся шукаць такія агульныя моманты. Адзін з іх — колеры: польскі бела-чырвоны і беларускі бел-чырвона-белы, якія мы падзяляем. У ліпені гэтага году быў абвешчаны, сярод іншых Міністэрствам замежных справаў, міжнародны конкурс на плякат «Бел-чырвона-белы», які заахвоціў прадэманстраваць прадэмакратычныя выступы апошніх гадоў у Беларусі. Было створана шмат прыгожых твораў, якія потым дэманстраваліся на пленэры ў Варшаве.

Гісторыя нашага краю вельмі цяжкая і складаная, таму польска-беларуская гісторыя ня можа абмінуць асобных цёмных старонак. Адносіны паміж народамі павінны будавацца на праўдзе, але гэта не павінна прыводзіць да таго, што некаторыя постаці прымаюцца за свае і ідуць указваньні на ўзаемныя крыўды. Бо польска-беларуская гісторыя вучыць нас, што сапраўдная, доўгатэрміновая сіла — у еднасці і салідарнасьці.

**– Спадар Гэнэральны консул, вялікі дзякуй за інтэрв'ю.**

– Дзякуй вялікі.



***Narrator:** Michał Charopka*
***Perkolacja polsko-białoruska:***
*Aleś Paźniak, Michał Charopka*

Redaktor miesięcznika “Białoruś” Michał Charopka rozmawiał z Konsulem Generalnym RP w Nowym Jorku, Panem **Adrianem Kubickim**.

**– Witam, Szanowny Panie Konsulu, i bardzo dziękuję za zgodę na ten wywiad. Pozwolę sobie jeszcze raz podziękować Państwu i społeczeństwu polskiemu za wsparcie, które Polska wskazuje Białorusinom. A Białorusini z kolei bardzo wspierają Polskę, która robi wszystko, co możliwe i niemożliwe, aby pomóc Ukrainie. W związku z tym mam do Pana kilka pytań.**

**– Najpierw proszę opowiedzieć nam trochę o sobie. Gdzie się Pan urodził i czy ma jakieś białoruskie korzenia? Jakie daty we wspólnej polsko-białoruskiej historii uważa Pan za najważniejsze, aby szybko odbudować stosunki na tym tle?’**

– Pochodzę z Torunia i niestety nie mam wśród swoich bezpośrednich przodków żadnych Białorusinów. Ale jestem pewien, że to gdyby tylko sięgnąć odpowiednio daleko, ktoś taki by się znalazł. Przez tyle lat nasi przodkowie mieszkali w jednym państwie, obok siebie, że na pewno wszyscy mamy w swoich drzewach genealogicznych Polaków, Białorusinów, Ukraińców...

Historia relacji między naszymi narodami jest przecież długa i ciekawa. Na pewno jednym z najistotniejszych wydarzeń była unia lubelska 1 lipca 1569 r., w wyniku której Polacy i Białorusini zaczęli dzielić ze sobą ziemie w ramach jednego państwa.

Kolejną ważną datą jest 1794 rok, kiedy Tadeusz Kościuszko ruszył z insurekcją przeciw zaborcom zrzeszając mieszkańców Rzeczpospolitej, czym zapisał się na zawsze w naszej wspólnej historii. Nie było to zresztą ostatnie powstanie, którego pamięć nas łączy. W 1863 roku Kastus Kalinouski, postać tak ważna dla rozwoju kultury i języka Białorusi, aktywnie włączył się w Powstanie Styczniowe, za co zapłacił najwyższą cenę.

Nie trzeba jednak sięgać tak daleko, żeby dostrzec ważne dla naszych narodów wydarzenia. W zeszłym roku obchodziliśmy 30-lecie nawiązania stosunków dyplomatycznych, kiedy to niepodległa Białoruś wkroczyła na drogę ku obywatelskiej, demokratycznej państwowości. W tym roku mija 30 lat od podpisania traktatu o dobrym sąsiedztwie i przyjaznej współpracy między Polską a Białorusią.

To przykre, że rozmawiamy akurat w sierpniu, zaledwie kilkanaście dni po 2. rocznicy sfałszowanych wyborów na Białorusi. 9 sierpnia 2020 r. to data, która stanowi symbol pogwałcenia praw człowieka, wolności obywatelskiej i demokracji. Widzimy jednak wszyscy, że Białorusini nigdy nie zrezygnowali z dążenia ku w pełni demokratycznej państwowości, jakie rozpoczęli w 1991 roku. Opozycjoniści, tacy jak Swietłana Cichanouska czy Zianon Pazniak, są tego najlepszym przykładem, a ich pełne determinacji działania budzą nadzieję, że procesy demokratyczne na Białorusi nadejdą.

**– Jak zdaniem Pana czuje się i żyje polskie społeczeństwo od początku wojny, którą Rosja rozpoczęła na Ukrainie?**

– Imperialistyczna polityka Rosji budziła zaniepokojenie polskiego społeczeństwa już od wielu lat. Polscy politycy i działacze społeczni angażowali się we wspieranie procesów demokratycznych państw dotkniętych agresywną ekspansją Kremla. W 2008 r. śp. Lech Kaczyński, po bezprecedensowym ataku na Gruzję, ostrzegał w Tibilisi przed rosyjskim zagrożeniem. Dziś, w obliczu barbarzyńskiej napaści na Ukrainę, słowa te wracają do nas ze zdwojoną siłą.

Wojna za naszą wschodnią granicą *de facto* toczy się już od wielu lat. Jednak skala zbrojnej napaści, którą obserwujemy od 24 lutego, zaskoczyła i przestraszyła nas wszystkich. Z zaniepokojeniem obserwowaliśmy rozwój sytuacji, jednak równolegle od razu dało się odczuć atmosferę jedności z narodem ukraińskim, szczególnie z uchodźcami, którzy masowo przybywali do Polski.

Reakcja wielu milionów Polaków, odpowiadających na krzywdę sąsiada, była bardzo poruszająca. W ramach oddolnych inicjatyw ludzie organizowali się na dworcach, w punktach pomocy i w miarę swoich możliwości poświęcali czas uchodźcom. Oddolne, jak i zorganizowane przez władze centralne oraz samorządy działania pozwoliły błyskawicznie znajdować zakwaterowanie dla chroniących się przed wojną. Przyjmujący uchodźców otrzymywali od rządu zapomogę, która miała wspierać ich domowy budżet i pozwalać lepiej zaopiekować się uchodźcami. Wolontariusze z całego świata, w tym ze Stanów Zjednoczonych, a także wielu Białorusinów, angażowali się we wszystkie przejawy działalności na rzecz uchodźców.

Do dziś bardzo wielu Polaków poświęca swój czas wspieraniu osób, które przybyły z Ukrainy do Polski po 24 lutego. Naszą granicę przekroczyło ponad 5 milionów uchodźców i potrzeby wciąż są ogromne. Jestem jednak przekonany, że wobec niezwykłej solidarności, empatii i aktywności, jaką okazało polskie społeczeństwo oraz ludzie dobrej woli z całego świata, pomoc będzie dalej trwać.

**– Jaka jest pozycja kierownictwa Polski w związku z sytuacją na Białorusi? Czy Pan się zgadza z tym, że Białoruś jest obecnie pod podwójną okupacją Rosji z jednej strony i anty białoruskiego reżimu Łukaszenki z drugiej strony?**

– Polska od wielu lat wspiera procesy demokratyczne na Białorusi. Białoruscy opozycjoniści walczą o własne, niezależne i niepodległe państwo. Uznajemy, że wybory z 9 sierpnia 2020 r. były sfałszowane, tym bardziej nie możemy zaakceptować wyników referendum konstytucyjnego, w którym zdyskredytowana władza próbuje narzucić obywatelom prawa wbrew jakimkolwiek zasadom demokracji. My jako Polacy mamy przecież podobne doświadczenia, kiedy za czasów istnienia ZSRR znajdowaliśmy się pod przemożnym wpływem Związku Sowieckiego. Dlatego mamy jako Polacy bardzo dużo zrozumienia dla walki jaką odbywają dzisiaj wszyscy Białorusini walczący o wolność i demokrację.

Obecna sytuacja na Białorusi jest bardzo bolesna, gdy każdego dnia obserwujemy nieuzasadnione ataki na swobody i wolności obywatelskie. Ofiarami takich represji są również obywatele polscy: Andrzej Poczobut i Angelika Borys. Społeczność międzynarodowa nie może godzić się na takie postępowanie białoruskiego reżimu, które nosi znamiona prześladowania i wymierzone jest w samą istotę praw człowieka.

Polityka mińskich władz to również pogwałcenie wielu norm i zwyczajów prawa międzynarodowego. Dochodzenie ICAO wykazało, że białoruskie władze umyślnie naruszyły międzynarodowe przepisy lotnictwa cywilnego, celowo zakomunikowały nieprawdziwe zagrożenie bombowe i spowodowały lądowanie w Mińsku samolotu, z którego siłą wyprowadzono opozycjonistę Ramana Pratasiewicza.

Dla Polaków wyjątkowo bolesne jest niszczenie mogił polskich żołnierzy i miejsc pamięci, o którym słyszymy w ostatnich miesiącach. W lipcu Władze Białorusi postanowiły zniszczyć cmentarz żołnierzy polskich w Mikuliszach, na którym spoczywają żołnierze III i VI Brygady Armii Krajowej, uczestnicy operacji „Ostra Brama”, którzy polegli w walce o wyzwolenie Wilna spod okupacji niemieckiej. To kolejny akt barbarzyńskiej próby przepisywania historii.

**– Wiem, że teraz w Polsce, a również w krajach Europy Wschodniej dominuje idea projektu Unii Bałtycko-Czarnomorskiej. Jaka rola w tym należy Białorusi i na jakiej podstawie planuje się budowanie relacji między krajami, w niej zawartymi?**

– Rzeczywiście od 2015 r., dzięki wspólnej pracy Prezydenta Andrzeja Dudy oraz Prezydent Kolindy Grabar-Kitarović, rozwijana jest Inicjatywa Trójmorza, która zrzesza obecnie 12 państw członkowskich Unii Europejskiej, położonych między morzami bałtyckim, czarnym i adriatyckim. Nowy Jork jest miejscem szczególnie istotnym dla rozwoju tej Inicjatywy, bo właśnie tutaj 7 lat temu odbyło się pierwsze spotkanie międzypaństwowe, które doprowadziło do organizacji w 2016 r. 1. szczytu Inicjatywy Trójmorza.

Taka forma partnerstwa pozwala w silny i zjednoczony sposób wyrażać interesy państw regionu, które z uwagi na uwarunkowania geograficzne, jak i zaszłości historyczne, są bardzo często wspólne.

Są to zarówno interesy gospodarcze, jak i polityczne, które nie zawsze mają jednolity charakter. Wśród państw zrzeszonych w Inicjatywie dostrzegamy jednak, że potrzeba silnej organizacji, która pomoże działać na rzecz rozwoju i bezpieczeństwa Europy Środkowej. Taki rodzaj solidarności potrzebny jest szczególnie dziś, gdy toczy się, wywołana rosyjską agresją, wojna.

Od czerwca 2022 r. państwa, które nie są zrzeszone w Unii Europejskiej również mają możliwość aktywności w Inicjatywie Trójmorza jako partnerzy uczestniczący. Dzięki temu możliwe stało się włączenie w działania Inicjatywy Ukrainy, której dążenie ku dołączeniu do Unii Europejskiej jest wspierane przez wszystkie państwa zrzeszone. Myślę, że wiele państw naszego regionu ma nadzieję, że przyjdzie czas gdy również demokratyczna Białoruś będzie mogła uczestniczyć w Inicjatywie.

**– Unia Europejska dyskutuje dziś o zakazie wydawania wiz obywatelom Rosji. Czy Białorusini też powinni dostać takie**

**ograniczenia?**
– Wśród przedstawicieli państw członkowskich rzeczywiście toczy się taka dyskusja. Jednocześnie należy podkreślić, że dotyczy ona przede wszystkim wiz Schengen, które umożliwiają wjazd na teren dowolnego państwa strefy Schengen i pobyt przez 90 dni w ciągu 180 dni. Ewentualne zmiany w tym zakresie muszą mieć jednak charakter ustaleń dyplomatycznych i politycznych na poziomie unijnym. Nie jest to jednak równoznaczne z zakazem wjazdu do państw członkowskich, które we własnym zakresie kształtują politykę wizową.
Nie można też zapomnieć, że Rosja prowadzi od ponad pół roku napastniczą wojnę, nie mając na względzie ofiar cywilnych. Minister Spraw Zagranicznych Rzeczypospolitej Polskiej Zbigniew Rau odwiedzając w sierpniu Buczę, Irpień i Borodiankę, powiedział wyraźnie, że miejsca te „zapiszą się w historii jako miejsca zbrodni wojennych popełnionych przeciwko ludzkości”. Ciężko wyobrazić sobie sytuację, w której obywatele Federacji Rosyjskiej mogą podróżować po Europie w celach turystycznych.
Obecnie placówki polskie na Białorusi funkcjonują, dzięki czemu obywatele białoruscy, spośród których wielu poszukuje schronienia przed represjami politycznymi, ale także ci, którzy studiują czy pracują w Polsce, mogą ubiegać się w normalnej procedurze o przyznanie różnych form uprawnienia do pobytu w Polsce.
**– Wiemy, że Rząd Polski jest bardzo pomocny dla Białorusinów w Polsce. Oprócz tego, Panie Konsulu powiedział w swoich przemówieniach, że jest gotowy pomóc Białorusinom, którzy są tutaj. Czy istnieje jakiś plan tej pomocy?**
– Polska niezmiennie wspiera działania służące budowie suwerennej i demokratycznej Białorusi. Dlatego też staramy się wspierać obywateli Białorusi również poza granicami naszych państw. Jest wiele przejawów takiej aktywności, które dotyczą zarówno pojedynczych osób, jak i organizacji oraz stowarzyszeń.
W wymiarze indywidualnym placówki konsularne, w tym Konsulat Generalny RP w Nowym Jorku, mogą przyjmować wnioski zagranicznych obywateli, którzy ubiegają się o przyznanie Karty Polaka. Jest to dokument ułatwiający nie tylko przebywanie w Polsce, ale także poruszanie się po kraju, podjęcie pracy czy rozpoczęcie studiów. Od kiedy przyznawana jest Karta Polaka, tylko na Białorusi złożono ponad 160 tys. wniosków o przyznanie tego dokumentu. W nowojorskim konsulacie na bieżąco rozpatrujemy wiele wniosków białoruskich obywateli, którzy poczuwają się do łączności z Polską. Jest to udany przykład instytucjonalnego działania, które bazując na wspólnym dziedzictwie, stanowi wyraz troski o wspólną przyszłość.
Polska aktywnie wspiera białoruskie organizacje i stowarzyszenia, ale także białoruską kulturę. W zeszłym roku, gdy nie mógł odbyć się miński „Miesiąc fotografii”, Instytut Pileckiego zorganizował w Berlinie wystawę „Żywie Biełaruś!”, żeby celebrować białoruską fotografię, pozwolić ukazać bez cenzury jej bogactwo wyrazu, ale też opowiedzieć naszym zachodnim sąsiadom o wydarzeniach z 9 sierpnia 2020 r. W Polsce organizowany jest też festiwal filmowy Bulbamovie, gdzie wyświetlane są filmy niezależnych białoruskich filmowców, a którego ostatniej edycji partnerem było Ministerstwo Spraw Zagranicznych.
**– W marcu 2022 roku przed kościołem białoruskim na Brooklynie było postawiono dwa pomniki bohaterów narodowych naszego dawnego wspólnego Państwa. Czy Pan uważa, że Białorusini i Polacy powinni naprawdę dzielić dziedzictwo, na przykład poezję Mickiewicza lub muzykę Moniuszki? Jaki powinien być stosunek do wspólnego dziedzictwa w ogóle, aby wywołać jak najmniej ewentualnych konfliktów?**
– Odsłonięcie pomników Tadeusza Kościuszki i Kastusa Kalinouskiego przed białoruską cerkwią to znak, że Polacy i Białorusini mają wspólnych bohaterów. To postaci wielkiego formatu, których wystarczy dla więcej niż jednego narodu. Tadeusz Kościuszko, poza naszym kontekstem Europy Środkowo-Wschodniej, jest przecież również bohaterem amerykańskim.
Nasza kultura to w końcu nie tylko Mickiewicz czy Moniuszko, ale również tradycje i obyczaje, w tym silne przywiązanie do wolności i niepodległości, które motywuje działania białoruskich opozycjonistów. Nasza historia państwowości rozwijała się we wspólnym, wieloetnicznym i tolerancyjnym państwie – Rzeczypospolitej Obojga Narodów.
W Polsce powołane zostały instytucje publiczne, które troszczą się o materialny wymiar tego dziedzictwa, jak choćby „Narodowy Instytut Polskiego Dziedzictwa Kulturowego za Granicą Polonika”, który wspiera inicjatywy pielęgnujące miejsca ważne dla naszej wspólnej historii. Takie prace odbywały się również na Białorusi, gdzie wspierana Fundacja Dziedzictwa Kulturowego zajmowała się m. in. renowacją Fary Witoldowej w Nowogródku, w której ochrzczony został wieszcz Adam Mickiewicz. Tym smutniejsze jest, że obecnie władze w Mińsku nie dostrzegają tego wspólnego wymiaru naszej historii i nie pozwalają prowadzić prac, które mogłyby kłaść fundament pod docenianie wspólnego dziedzictwa naszych państw.
Wspólna historia to oczywiście również twórcy naszej kultury, których docenia się zarówno w Polsce, jak i na Białorusi. Wspominał Pan Moniuszkę i Mickiewicza, którzy na pewno nas łączą, ale są też Ogiński czy Naruszewicz, u których odnajdujemy liczne polsko-białoruskie tropy. Na pewno jest jeszcze wielu artystów, dawnych i współczesnych, których polsko-białoruskie dziedzictwo pozostaje do odkrycia. Dobrą okazją ku temu może być ogłoszony przez Swiatłanę Cichanouską Międzynarodowy Dzień Kultury Białoruskiej, który obchodzimy 7 lipca.
Wspólne dziedzictwo to przede wszystkim poszukiwanie tego co nas łączy. Staramy się więc szukać takich punktów wspólnych. Jednym z nich są barwy: polskie biało-czerwone i białoruskie biało-czerwono-białe, które współdzielimy. W lipcu tego roku ogłoszony został, m. in. przez Ministerstwo Spraw Zagranicznych, międzynarodowy konkurs na plakat „Biało-czerwono-biały”, który zachęcał do przyjrzenia się demokratycznemu zrywowi ostatnich lat na Białorusi. Powstało wiele pięknych prac, które następnie pokazywano na wystawie plenerowej w Warszawie.
Historia naszego regionu jest bardzo trudna i złożona, tak więc i polsko-białoruska historia nie może uciec od pewnych ciemnych kart. Relacje między narodami trzeba budować na prawdzie, nie powinno to jednak prowadzić do zagarniania niektórych postaci na własność i wzajemnego wytykania sobie krzywd. Polsko-białoruska historia uczy nas przecież, że prawdziwa, długotrwała siła leży w zjednoczeniu i solidarności.
**– Panie Konsulu Generalny, bardzo dziękuję za rozmowę.**
– Dziękuję bardzo.





# У ЗША АДБЫЛАСЯ 34-Я СУСТРЭЧА БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЙ АМЭРЫКІ



*Тэкст: Алесь Пазьняк*
*Фота і відэа: Алесь Пазьняк, Аляксандр Хомчанка*

**Падобныя Сустрэчы пачалі ладзіцца беларускай эміграцыяй ў ЗША і Канадзе з 1952 году.**
**Мэрапрыемства сабрала беларусаў ад Флорыды да Таронта, якія прыехалі, каб пабачыць адзін аднаго, абмяняцца думкамі й ідэямі.**
Арганізатарам івэнту выступіла Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (BAZA) пры падтрымцы Згуртаваньня беларусаў Канады. Сустрэча прайшла 3-4 верасьня ў Беларускім цэнтры пры саборы Сьв. Эўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рыверы (Нью Джэрзі) з удзелам беларускіх ініцыятыў, арганізацый й суполак ЗША і Канады.
Адчыніў Сустрэчу сямейны гурт **Kozak Family Ethno Trio** (Валянціна Пархоменка, Алесь Казак і Вольга Казак-Анлар) выкананьнем гімну ЗША і духоўнага гімну Беларусі “Магутны Божа”.
Вядоўцамі абодвух дзён Сустрэчы былі **Міхась Чаропка** і **Натальля Федарэнка** (BAZA), якія нагадалі, што падобныя Сустрэчы традыцыйна ладзяцца раз на два гады. Але ў выніку пандэміі каранавірусу апошняя адбылася ў 2018 годзе.
Некаторыя з запрошаных на мэрапрыемства гасьцей не змаглі на ім прысутнічаць асабіста, але даслалі свае звароты да ўдзельнікаў Сустрэчы. Так госьці Сустрэчы былі ўсьцешаныя праглядзець відэазварот-прывітаньне **Івонкі Сурвіла,** старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.
Зварот Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы
Спадарыня Сурвіла нагадала, што такія Сустрэчы пачалі ладзіцца беларусамі Паўночнае Амэрыкі, каб выказаць сваю любоў да паняволенай Бацькаўшчыны і паўтарыць вернасьць ідэалам 25 сакавіка. Таксама Старшыня Рады БНР зьвярнула ўвагу на тое, што неабходна прыцягваць маладую эміграцыю да стваральнай дзейнасьці на беларускай ніве і нагадала аб небясьпецы з боку расейскага агрэсара, якая ўвесь час застаецца актуальнай для Беларусі.
**Зянон Пазьняк** у сваім аўдыёзвароце распавёў пра ўнутраную і зьнешнюю акупацыю Беларусі, дзейнасьць акупацыйных карных ворганаў. Ён нагадаў пра лёзунг змаганьня за Беларусь – “Беларусь перад усім” і пра стварэньне суполак нацянальна-вызвольнага руху.
Пісьмовае прывітаньне было даслана ад кіраўнічкі Супольнасьці Беларусаў Сьвету “Бацькаўшчына” Алены Макоўскай і старшыні Рады СБС “Бацькаўшчына” Ніны Шыдлоўскай. У сваім лісьце кіраўніцтва СБС “Бацькаўшчына” віталі ўдзельнікаў Сустрэчы, зычылі плённай працы і выказвалі спадзеў на далейшае супрацоўніцтва.
**Алена Лявончанка**, старшыня Згуртаваньня беларусаў Канады (ЗБК) ў сваёй прамове нагадала, што гэтая Сустрэча беларусаў – юбілейная:
*“Першая Сустрэча беларусаў Паўночнай Амэрыкі адбылася ля Ніагарскага вадаспаду на канадыйскім баку дзякуючы намаганьням Вінцэнта Жук-Грышкевіча, аднаго са старшыняў БНР. Вельмі цешыць, што гэтая традыцыя ўжо працягваецца 70 год. І самая галоўная каштоўнасьць людзей, якія сабраліся на Сустрэчу – гэта тое, што ім неабыякавая Беларусь. Бо павага і любоў да Беларусі застаецца на ўсё жыцьцё! І нам усім патрэбна перамога”.*
**Юрась Беленькі**, прадстаўнік беларусаў Мінесоты, дэпутат Вярхоўнага Савета XII скліканьня нагадаў прысутным, што беларуская дыяспара ў свой час захавала нацыянальныя сымбалі – бел-чырвона-белы сьцяг і герб “Пагоня”, якія адрадзіліся на некаторы час, калі Беларусь здабыла незалежнасьць. Спадар Беленькі таксама распавёў аб значнай ролі дыяспары ў захаваньні і аднаўленьні самасьвядомасьці беларусаў.
*“У 1991 годзе мне быў 31 год. Бальшыня апазыцыі Беларускага Народнага Фронту тады былі маладыя. Але мы ўжо былі ўзбагачаныя прыкладам трыманьня сымбаляў нацыянальнага Адраджэньня. Бальшыня тагачаснага Вярхоўнага Савету ня ведала пра*

*БНР, Вялікае Княства Літоўскае... Людзі на гэтым баку акіяну зрабілі важную рэч, каб адрадзілася незалежная Беларусь. Сёньня тыя хто тут, таксама павінны змагацца за Беларусь”, – распавёў спадар Беленькі.*

Далей прамаўлялі прадстаўнікі маладой беларускай дыяспары, сябра Асацыяцыі Беларусаў Амэрыкі (АБА): **Жана Чарняўская (Belarus Freedom Forum, Суполка Беларусаў Чыкага), Яўген Сокалаў (Беларусы Бостану і Новай Англіі), Піліп Гаўрышаў (стваральнік INeedHelpBY, Фларыда), Сяржук Шаліга і Глеб Івашкевіч (Belarus Freedom, Філадэльфія), старшыня АБА Надзея Нортан і Наста Хадкевіч (Беларусы Сан-Францыска і Бэй Эрыі)** і іншыя.

*“Дзякую ўсім беларускам Амэрыкі, якія далучаюцца да беларускага руху. Гэтага б не было без Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня і Згуртаваньня беларусаў Канады. Нават свой Статут мы пісалі на аснове й з дазволу BAZA. Для нас важна пераемнасьць, сувязь генэрацый. Жыве Беларусь!”, – падкрэсьліла Надзея Нортан.*

Сакратар галоўнай Управы BAZA **Міхал Чаропка** ў сваёй прамове-справаздачы коратка распавёў пра дзейнасьць BAZA ў Амэрыцы, петыцыі ў ААН, распрацоўку важных дакумэнтаў. Таксама ён распавёў пра новы сайт і фармат часапісу “Беларус”.

Вядоўца **Натальля Федарэнка** ўзгадала пра каардынацыйны цэнтр дапамогі беларускім ваярам ва Ўкраіне, які быў утвораны пры катэдральным саборы Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне.

Каардынатар цэнтру **Андрусь Дундукоў** прапанаваў хвілінай маўчаньня ўшанаваць памяць 13 загінулых ва Ўкраіне беларускіх ваяроў. Таксама Андрусь распавёў пра маштабы дапамогі беларускім дабраахвотнікам, супрацу з беларускімі эміграцыйнымі суполкамі, фінансавыя зборы і закуп абсталяваньня, лагістычныя ланцугі. Каардынатар выказаў падзяку паліцыі Нью-Ёрка за дапамогу ў набыцьці медычнай дапамогі.

Выступілі таксама **Алесь Кот** (ЗБК, сябра Рады БНР), **Павал Куцавол** (Human Rights Foundation), **Зьміцер Левіт** (ветэран амэрыканскага войска). Гэта былі далёка ня ўсе выступы, бо кожны жадаючы мог узяць слова.

Таксама ў сустрэчы прыняў удзел старшыня Вашынгтонскага аддзелу БАЗА **Яўген Барысевіч**.

На Сустрэчы беларусы прадавалі кнігі, сувэніры, цішоткі, заробленыя кошты з якіх пайдуць на падтрымку беларускіх дабраахвотнікаў ва Ўкраіне.

Першы дзень 34-ай Сустрэчы беларусаў Паўночнай Амэрыкі быў завэршаны цудоўным канцэртам. У канцэрце прымалі ўдзел ужо ўзгаданы **Kozak Family Ethno Trio** (**Валянціна Пархоменка**, заслужаная артыстка Беларусі, **Алесь Казак**, **Вольга Казак-Анлар**), а таксама **Зісл Слеповіч** (клезьмер-кларнетыст, саксафаніст, спявак на ідыш, кампазітар), **Надзя Чэчэт** (сьпявачка) і **Яўген Магаліф** (вядомы беларускі кампазітар). Пад сьпевы музыкаў можна было і пасумаваць аб беларускай долі і весела патаньчыць у карагодзе. Чым скарысталіся прысутныя.

Кульмінацыяй канцэртнай часткі быў Беларускі пэрформанс “Чараўніца”, у якім 9 прыгажунь дэманстравалі сучасныя беларускія сукенкі, танцавалі і вадзілі карагоды паміж гасьцей. Аўтар праекту **Юлія Калбыка** прыехала адмыслова з Чыкага. Мадэлі – прыгажуні з Нью-Джэрзі ды Філадэльфіі. Падчас пэрформансу заля напоўнілася цёплынёй, сьветам і неверагоднай жаночай энэргіяй.

Другі дзень Сустрэчы пачаўся з набажэнства ў саборы Сьв. Жыровіцкае Іконы Божае Маці ў Гайлянд Парку і саборы Сьв. Эўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рыверы. Яны былі прымэркаваныя да 100-годзьдзя Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. У Гайлянд Парку служэньне прайшло пад кіраўніцтвам архіяпіскапа БАПЦ **Сьвятаслава.**

У 14 гадзін пачалася дыскусія за круглым сталом “Новыя мэты і задачы беларускай дыяспары Паўночнай Амэрыкі ва ўмовах акупацыі Беларусі й вайны ва Ўкраіне”. На ім былі прынятыя агульныя рашэньні й дакуманты, якія будуць накіраваныя да кіраўніцтва ЗША, Канады і ААН.

А ўжо ўвечары пасьля афіцыйнай часткі, удзельнікі працягнулі адпачынак на сьвежым паветры каля будынку беларускага цэнтру. Бавілі час за сяброўскімі размовамі, смажылі барбекю, гралі ў валейбол. Адначасна госьці мелі магчымасьць атрымаць асалоду ад музычнага выступу сямейнага гурта **Тацьцяны і Валянціна Дзямешчыкаў.**
























# НАБАЖЭНСТВА ДА 100-ГОДЬДЗЯ БАПЦ АДБЫЛОСЯ Ў ГАЙЛЯНД ПАРКУ

***Алесь Пазьняк***

**У Нядзелю, 4 верасьня, у царкве Сьв. Жыровіцкае Іконы Божае Маці ў Гайлянд Парку (Нью Джэрзі) адбылося адзначэньне 100-годзьдзя Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы.**

Набажэнства ўзначаліў **Высокапрывялебны Сьвятаслаў**, архіяпіскап БАПЦ, які завітаў з Канады ў ЗША на 34-ю Сустрэчу беларусаў Паўночнай Амэрыкі.

У Гайлянд Парку сабраліся як парафіяне, так і беларусы, якія прыехалі на Сустрэчу. Архіяпіскапу Сьвятаславу саслужылі настаяльнік Парафіі Мітрафорны пратаярэй айцец Зіновій, пратаярэй айцец Іван і дыякан Мікола – сьвятарства Катэдральнага сабору БАПЦ у Нью-Ёрку, а таксама сьвятарства Украінскай і Грузінскай Цэркваў.

Падчас набажэнства архіяпіскап Сьвятаслаў зачытаў ўрывак пра маладога чалавека з Евангельля паводле Мацьвея, які меў вялікае багацьце. Яму Хрыстос адказаў, што «лягчэй вярблюду прайсці праз вушка іголкі, чым багатаму ўвайсці ў Валадарства Божае».

Тэрмін «іголкавая вушка» выкарыстоўваецца як метафара для вельмі вузкай адтуліны. Сьвятаслаў патлумачыў, што так і чалавеку складана ўвайсці ў Валадарства Нябеснае. Для гэтага шмат ад чаго трэба адмовіцца і пайсьці за Богам.

*“Кожны чалавек можа прысьвяціць сябе Богу і ўвайсьці ў Валадарства Нябеснае. Галоўнае, каб ён набываў багацьце духоўнае. Людзі рэдка задумваюцца пра вечнае жыцьцё. Усе заклапочаныя зямнымі справамі. Але чалавек павінен знайсьці час, калі ён будзе раздумваць над сваім жыцьцём. І пачне імкнуцца да Бога. Хрыстос прыходзіў, каб чалавек мог быць разам з Богам”,* – сказаў у прамове архіяпіскап *Сьвятаслаў.*

Уладыка ўзгадаў, што працягваецца сьвята Успеньня Божай Маці. Таксама ён заклікаў не спыняцца маліцца за рэпрэсаваных рэжымам беларусаў і правёў такую малітву. Сьвятар нагадаў, што ў Беларусі тысячы людзей пазбаўлены волі за свае перакананьні і пазыцыю.

Пасьля Службы адбыўся сьвяточны абед, а таксама збор сродкаў на дапамогу братэрскай Украіне.

Падчас абеду архіяпіскап БАПЦ Сьвятаслаў распавёў пра трагічную гісторыю Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы на Беларусі. Пасьля прамовы людзі зьвярталіся да яго з пытаньнямі і маглі даведацца шмат цікавых фактаў пра БАПЦ.













# ПАДЧАС СЭСІІ ААН БЕЛАРУСЫ ВЫСТУПІЛІ СУПРАЦЬ РАСЕЙСКАЙ АГРЭСІІ



***Алесь Пазьняк***

**Здымкі: Міхась Чаропка, Павел Стэльмах, Ірына Хадарэнка, Алесь Пазьняк**

Акцыя “Stop Russian Invasion” адбылася 24 верасьня на Таймс-сквэр у Нью-Ёрку, дзе гэтымі днямі праходзіць сэсія ААН.

На мерапрыемства сабраліся беларусы Нью-Ёрка, Філадэльфіі і Таронта. Беларускія актывісты выступілі супраць расейскай агрэсіі ва Украіне і Беларусі.

Арганізатар акцыі Ірына Хадарэнка прынесла 10-метровы бел-чырвона-белы сьцяг, які разгарнулі прысутныя. Людзі трымалі плякаты і скандавалі “Жыве Беларусь! Слава Украіне!”

Цікавасьць да акцыі выказалі мінакі, якія ў выходны дзень шпацыравалі па Таймс-сквэр. Мерапрыемства, якое зладзілі беларускія актывісты прайшло падчас правядзеньня 77-ай сэсіі Генэральнай Асамблеі ААН, якая сёлета прысьвечана вайне Расеі супраць Украіны. Гэтым самым беларусы Амэрыкі прыцягнулі ўвагу да пытаньня расейскага ўварваньня ва Украіну і акупацыю Беларусі.

Мерапрыемства было анансавана праз Facebook.

**Вось, што сказалі некаторыя ўдзельнікі акцыі “Stop Russian Invasion”:**

**Ірына Хадарэнка, Беларуская Асветніцкая Ліга Амэрыкі (BELA):**

*“Гэта акцыя прысьвечаная прыцягненьню ўвагі да сітуацыі ва Украіне і Беларусі, якая ахапавана. Мы б хацелі, каб больш беларусаў усьвядомілі, хто ёсьць сапраўдны вораг. Расея з’яўляецца тэрарыстычнай краінай. Беларусы павінны дбаць пра тое, каб вярнуцца ў сям’ю еўрапейскіх народаў. Змены надыдуць, калі прыйдзе ўсьведамленьне таго, што Расея – наш вораг”.*

**Ганна Сурмач,**
**рэдактар часопіса “Беларус”:**

*“Для мяне заўсёды сьвята, калі беларусы выходзяць пратэставаць. Я бываю амаль на кожнай акцыі, калі магу хадзіць. Мне хацелася, каб мы пратэставалі не толькі тут, але і каля будынку ААН, дзе сабраліся прадстаўнікі краін сьвету на паседжаньне. Людзі сёньня падыходзяць, цікавяцца, бачаць гэтае пудзіла, якое абазначае зразумела каго... Агрэсія з боку Расеі накіравана не толькі на Украіну, але і на нашу Бацькаўшчыну. І яна павінна быць спынена. Жыве Беларусь! Слава Украіне!”*

**Павел Стэльмах, Філадэльфія:**

*“Я прыехаў сюды для таго, каб падтрымаць Украіну і выказаць сваю пазыцыю супраць расейскіх улад і тых, хто іх падтрымлівае. Ад Украіны залежыць і лёс Беларусі. Веру ў перамогу Украіны і ў будучыню вольнай Беларусі”.*

**Віталь Зайка, Беларуска-Амэрыканскае згуртаваньне “Пагоня”:**

*“Я тут, бо я жадаю, каб вайна найхутчэй скончылася. Каб Украіна перамагла ў гэтай вайне і вярнула ўсе страчаныя землі. Каб расейскія злачынцы на ўсіх узроўнях панеслі адказнасьць за свае дзеяньні ва Украіне. Каб Беларусь вызвалілася ад расейскай акупацыі і стала сапраўды незалежнай краінай”.*

**Міхась Чаропка, намесьнік рэдактара часопіса “Беларус”:**

*“Ад любой акцыі ёсьць карысьць, бо так мы паказваем сваю салідарнасьць. Людзі павінны ведаць, што ёсьць беларусы, якім баліць, якія выказваюць сваю пазыцыю ў сьвеце апошніх падзей. Беларуская нацыянальная гістарычная сымболіка вельмі прыгожая і яна павінна лунаць на ўсіх важных мерапрыемствах, якія адбываюцца ў сьвеце. Беларусы павінны змагацца за свабоду Беларусі і падтрымліваць Украіну”.*

Да пратэстуючых беларусаў падыходзілі амэрыканцы, артысты з Таймс-сквэр, уйгур, грамадзяне Украіны і Расеі, якія зьбеглі ад пуцінскага рэжыму. Людзі выказвалі салідарнасьць і падтрымку свабоднай Беларусі.











# ГЕНРЫХ ДМАХОЎСКІ

*Міхась Чаропка,*



Выбітныя асобы, слава аб якіх сягае праз кантынэнты, вельмі часта маюць унікальныя погляды, персаналіі і жыццёвыя лёсы. А месца, якое яны завуць “домам” вельмі цяжка вызначыць, нават калі яны жывуць недзе стала на працягу пэўнага часу.
Так, 14 кастрычніка беларусы адзначаюць народзіны свайго знакамітага земляка Генрыха Дмахоўскага (Henry D. Saunders (US), Henryk Dmochowski(PL)).
Будучы знакаміты амэрыканскі скульптар і герой трох паўстанньяў (два супраць Расейскай Імпэрыі і адно супраць Аўстравэнгрыі) нарадзіўся ў вёсцы Забалацьце на тэрыторыі сучаснага Мёрскага раёну. Дагэтуль на сцяне мясцовай школы вісіць мэмарыяльная дошка, прысьвечаная яму.
Генрых атрымаў вышэйшую юрыдычную адукацыю ў Віленскім унівэрсітэце. Але замест заможнага і спакойнага жыцьця юрыста ён абірае шлях змаганьня. Малады Дмахоўскі прымае ўдзел у лістападаўскім паўстаньні 1830-га году, пасьля паразы якога трапляе ў Францыю – краіну дзе ён авалодаў мастацтвам скульптуры.
Пасьля ўдзелу ў паўстаньні ў тагачаснай Галіцыі і вулічных баёў у Львові, Генрыха Дмахоўскага схапілі ўлады Аўстравэнгрыі і прысудзілі да 5-ці гадоў турмы. Па сканчэньні тэрміну наш зямляк накіраваўся зноў у Францыю, а потым ў 1851 годзе ён апынаецца ў Філядэльфіі.
Ужо тут на амэрыканскай глебе ён абірае сабе псэўданім Henry D. Saunders і распачынае сваю творчую дзейнасць.
Генры Д. Сандэрс стварае бюсты Тадэвуша Касьцюшкі, Казімера Пуласкі, якія былі закупленыя Кангрэсам ЗША і зараз выстаўленыя ў Капітоліі. Ім таксама былі зробленыя бюсты Томаса Джэфэрсана, Джорджа Вашынгтана, Даніэла Ўэбстэра, Барбары Радзівіл (у Польшчы), Уладзіслава Сыракомлі (у Польшчы), а таксама 70 мэдальёнаў і шмат яшчэ бюстаў па Амэрыцы.
Але самай адметнай яго працай з’яўляецца помнік яго жонцы і дзецям, які знаходзіцца на цвінтары Laurel Hill у Філядэльфіі. Алена Шааф была таленавітай баварскай піяністкай. Падчас першых родаў дзіцё з’явілася мертванароджанным. Другія ж роды скончыліся трагічна ўжо і для самой Алены разам з немаўляці.
Скульптурную кампазіцыю ўтварае маці, якая трымае на руках дваіх дзетак. Як стала вядома з запісаў Генрыха Дмахоўскага, помнік – гэта выява яго сям’і.
Але, як пазначана ў самым пачатку, лёс выбітных людзей не ідзе прамалінейна. У 1863 годзе ўжо знакаміты і прызнаны скульптар Генры Д. Сандэрс пакідае Злучаныя Штаты каб далучыцца да паўстанцаў Кастуся Каліноўскага.
14 траўня ён відзе ў бой супраць расейскіх войскаў атрад з сотні паўстанцаў каля Докшыц. Але гіне “працяты васьмю кулямі”.
Яго пахавалі разам з двума невядомымі паўстанцамі каля вёскі Бірулі ў Докшыцкім раёне. Помнік доўгі час быў у занядбаньні, але стараньнямі невядомых беларусаў быў адноўлены і вернуты з небыцьця.
Імя Генрыха Дмахоўскага – гэта прыклад адданасьці справе барацьбы за Свабоду. Акрамя таго, ён значана ўзбагаціў культурную спадчыну ЗША, Польшчы і Беларусі. Такое імя ня можа быць забыта і таму яно шануецца на абодвух берагах Атлянтыкі.

---

# HENRY D. SAUNDERS/ HENRYK DMOCHOWSKI

***Maryna Krazhova***

The views, ways, and personalities of transnational people are always unique. They have more than one name, more than one goal, and often no particular home place, even if they own land somewhere. On this day, 10/14, in 1810, the American sculptor Henry D. Saunders was born.
Originally Henrik Dmakhovsky was born in the village of Zabolotce, in modern Belarus, where, perhaps, a memorial plaque dedicated to the famous sculptor is still visible in one of the local schools. After the suppressed uprising of 1830, Henrik left Vilnius (where he was living and studying) for France and began to prepare for the next clash with the Russian enemy. Unfortunately, he was arrested by the Austrian authorities, and after five years behind bars, he returned to France, where he continued to study sculpture.
In 1851, Henryk moved to Philadelphia and chose the pseudonym Henry D. Saunders, under which he became known when creating busts of Tadeusz Kosciuszko and Kazimierz Pułaski that were purchased by the US Congress and currently installed in the Capitol. In addition, he made 70 medallions and many busts in America, such as Daniel Webster, Thomas Jefferson, George Washington, etc.; and in Poland, such as Barbara Radziwill, Władysław Syrokomła, etc.
He was noted for the sculpture of his wife (Helena Schaaff – a talented pianist of Bavarian origin) at Laurel Hill Cemetery in Philadelphia, who died during the second labor. In the sculpture, she holds two babies in her arms, representing her first and second children, born dead. It is known from Henrik’s private letters that he suffered greatly from the loss.
In 1863, Henry, already recognized and successful sculptor, left the continent to participate in Kastus Kalinowski’s uprising (the Belarusian battalion currently fights in a war as a part of the Ukrainian army under the name of Kastus Kalinowski). Henryk led about a hundred officers and died in a battle with the Russian army on May 14. The grave where Dmochowski/Dmakhovsky/Дмахоўскі/Saunders is buried with two unknown officers is located near the village of Biruli, Dokshytsky district, Belarus. It was neglected for a long time and was recently restored by the people who wished to remain anonymous. His works are still circulating in modern-day auctions.








# OSLO FREEDOM FORUM 2022 У НЬЮ-ЁРКУ




***Ганна Сурмач***

3 кастрычніка ў Нью-Ёрку адбылася важная падзея ў сусьветным руху барацьбітоў за правы чалавека -Oslo Freedom Forum 2022.
**Oslo Freedom Forum** (**OFF**) – гэта сэрыя глябальных кангрэсаў, якія арганізуюцца некамерцыйнай грамадзкай арганізацыяй **Human Rights Foundation** (Фундацыя правоў чалавека). OFF быў заснаваны ў 2009 годзе і прайшоў у Осла – сталіцы Нарвегіі, як разавае мерапрыемства. Аднак, у далейшым стаў праходзіць штогод у пашыраным масштабе. Асноўная канфэрэнцыя OFF праводзіцца штогод у цэнтры Осла. А потым спадарожнікавыя мерапрыемствы адбываюцца ў розных краінах і гарадах. Сёлета такі спадарожнікавы Форум прыймаў Нью-Ёрк. Арганізатары вырашылі пакінуць назву нарвежскай сталіцы ў назве ўсіх спадарожнікавых мерапрыемстваў, бо яна ўжо пертварылася ў брэнд і стала пазнавальнаю ў сьвеце.
Форум лічыцца галоўным зъездам людзей, якія змагаюцца за правы чалавека па ўсім сьвеце. Людзі, якія прысьвяцілі свае жыцьці барацьбе з прыгнётам і несвабодай, зьбіраюцца разам, каб падзяліцца асабістым вопытам, шырока паведаміць пра свае рэальныя гісторыі, якія адбываюцца ў іхных краінах. Змагары за правы чалавека прыносяць свае аповяды на сцэну Форума, каб праліць сьвятло на працэсы барацьбы за свабоду ў цэлым сьвеце. Як правіла, гэта адметныя асобы, якія дасягнулі значных вынікаў у сваім змаганьні, сталі публічна вядомымі ў сваіх краінах ці нават у сьвеце.
Форум атрымаў высокую ацэнку сярод сусьветнай грамадзкасьці за тое, што зьбірае разам некаторых з самых уплывовых людзей з розных краінаў з асаблівімі лёсамі. Форум нават стали называць «Зьбіральнікам герояў». *Газэта The New York Times* назвала Форум месцам, дзе “у дысідэнтаў сьвету ёсьць сваё слова», гэтым самым падкрэсьліўшы яго міжнародную значнасьць для дэмакратычнага руху ў сьвеце.
Форум вызначаецца сваімі нетрадыцыйнымі падыходамі да справы змаганьня за правы чалавека. Часам яго называюць таксама майстэрняю крэатыўнага пратэсту. Крэатыўны падыход, крэатыўнае мысьленьне найбольш выяўляецца ў маладога пакаленьня. Гэта было бачна праз склад удзельнікаў Форуму ў Нью-Ёрку, дзе пераважала моладзь.
Форум праходзіў у памяшканьні вядомага Нью-ёркскага тэатра The Town Hall, 123 W 43 Street, у цэнтры Мангэттана, раней тут ужо праходзіў Форум 2019 году. Заля тэатра, якая налічвае 1500 месцаў, не выглядала пустою. Нават у фае пад час перапынку было цяжка праціснуцца ў натоўпе.
Там я ў непасрэднай блізкасьці пабачыла 46-гадовага Тора Халворссена (Thor Halvorssen), заснавальніка Форума Свабоды. Ён пад час перапынку выходзіў да людзей і было бачна, што многія сустракалі яго з радасьцю і павагаю, віталіся, гутарылі з ім.
У сусьветным праваабарончым руху Тор Халворссен ёсьць вельмі адметнаю асобаю. Тут варта трохі падаць інфармацыю пра яго. Малады чалавек заснаваў Форум у даволі маладым узросьце для такога ўзроўню справы. Осла быў выбраны не выпадкова. Тор нарадзіўся ў 1976 годзе і вырас у Венесуэле, але яговыя карані з боку бацькі маюць нарвескае паходжаньне.
Продак ягонага бацькі – дыпламат з арыстакратычнага нарвескага роду некалі патрапіў у Венесуэлу па службовых справах, дзе і застаўся. Маці Тора належыць таксама да паважанага роду, які мае крэўныя сувязі з родам знакамітага героя вызвольнага руху Сымона Балівара і з сямьёю першага прэзыдэнта Венесуэлы Крыстабала Мендозы. Бацькі Тора, незалежна ад іх высокароднага паходжаньня, сур’ёзна пацярпелі ад перасьледу з боку венезуэльскіх уладаў і хлопцу, на той часстудэнтудавялосяваймацца грамадзкай дзейнасьцю, каб абараніць сваіх родных. Так ён набыў свой першы вопыт у справе барацьбы за правы чалавека. Гэта быў час, які папярэднічаў прыходу да ўлады Уго Чавэса. Сытуацыя ў Венесуэле ў наступны перыяд шмат чаму навучыла Тора, а таксама прымусіла яго выехаць у эміграцыю. Але, Тор быў рашуча настроены працягваць барацьбу за свабоду і правы чалавека. У 2006 годзе ён заснаваў у Нью-Ёрку грамадзкую праваабарончую арганізацыю – Human Rights Foundation, якая і стала ў 2009 годзе галоўным арганізатарам Oslo Freedom Forum.
Тор Халворссен афіцыйна займае кіруючую пасаду заснавальніка і генэральнага дырэктараHuman Rights Foundation. Фундацыя мае таксама ганаровую пасаду старшыні. Першым на гэтую пасаду быў абраны Вацлаў Гавэл і займаў яе да ягонай сьмерці ў 2011 годзе. Далей функцыю пераняў Гарры Каспараў. Сам Каспараў таксама прамаўляў на Форуме ў Нью-Ёрку. У мяне засталося добрае ўражаньне, выглядае, як сапраўдны трыбун, здольны ўзьняць людзей.
Штаб-кватэра Human Rights Foundation знаходзіцца ў Нью-Ёрку, у цэнтры Мангэттана, 350 Fift Avenue, у адным будынку з дырэкцыямі двух іншых больш вядомых абаронцаў правоў чалавека – Human Rights Watch и Human Rights in China. Аднак, гэта зусім розныя арганізацыі ў сваіх метадах падыходу да праблем барацьбы за правы чалавека.
Кіраўнік Human Rights Foundation так вызначае ў адным інтэрвію мэты арганізацыі і яе адрозьненьне ад іншых: “Усім зразумела, што такое ёсьць базавыя правы чалавека. Гэта свабода слова, свабода сходаў, свабода перамяшчэньня, гарантыя таго, што ўлада не падвергне цябе зьдзекам і не забярэ тваю маёмасьць. Адным словам, гэта абарона ад уладнага дыктату...Аднак, праваабарончы істэблішмэнт у структуры ААН далей прыгожых дэкляраций не ідзе, бо ўрады некаторых яе краінаў-чальцоў самі забіваюць, ці кідаюць у турмы сваіх апанэнтаў... Самые буйныя праваабарончыя канфэрэнцыі ў сьвеце спансіруюць пад эгідай ААН, як правіла, самыя рэпрэсыўныя рэжымы. Мы супроцьпастаўляем гэтаму вольны абмен думкамі пра несілавыя метады пратэста паміж наватарскі

думаючы людзьмі з галінаў культуры, журналістыкі, навукі, тэхнікі, бізнэса”.
Тор Хальворссен не даверае істэблішмэнту, таму Human Rights Foundation праводзіць у Осла, горадзе, дзе ўручаецца Нобелеўская прэмія міру, свой уласны прэстыжны зьезд, у пэўным сэнсе праваабаронцы аналёг Сусьветнага эканамічнага форуму у Давосе, які, як лічаць у HRF, прыўносіць у справу міру на плянэце больш рэальны ўклад, чым афіцыйныя структуры.
Human Rights Foundation надае ўвагу і праблеме абароны правоў чалавека ў нашай Беларусі, якія груба парушаюцца дыктатарскім рэжымам Лукашэнкі. Сярод асноўных прграмаў Фундацыі ёсьць і адмысловая праграма пад назваю – Belarus Solidarity Fund.
Адпаведна і арганізаваныя Фундацыяй Форумы сталі трыбунай і для прадстаўнікоў праваабарончых арганізацый і апазыцыйных дзеячаў з Беларусі, дзе распавядалася пра дыктатарскі рэжым і напады на базавыя правы чалавека. Ужо ў 2009 годзе там выступіла Жанна Ліцьвіна – старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў, якая распавяла пра перасьлед журналістаў ў Беларусі і апазыцыйных рэжыму сродакаў масавай інфармацы. Далей удзельнікам быў Алесь Бяляцкі, кіраўнік Праваабарончага цэнтру «Вясна», які знаходзіцца за кратамі і якому зараз нададзена званьне Ляурэата Нобілеўскай прэміі міру.
На асноўнай пляцоўцы Форума ў Осла ў гэтым годзе, які праходзіў 23-25 с траўня, былі прысутныя з выступамі Сьвятлана Ціханоўская, Вераніка Цэпкала і Вольга Хоміч (сястра Марыі Калесьнікавай).
На сёлетнім Форуме ў Нью-Ёрку таксама заўважна гучала беларуская тэма. Беларусь прадстаўляў сябра БАЗА Павал Куцавол, які падрыхтаваў грунтоўную інфармацыю з паказам уражлівага відэа на экране пра беларускія пратэсты 2020 году. Мне запомнілася, што вядомы праваабаронца з Венесуэлы Леопольдо Лопез, які цяпер жыве у Гішпаніі, наймнееі як тры разы згадваў у сваёй прамове Беларусь.
Вельмі годна прадстаўлялася на Форуме Украіна ў асобе Аляксандры Матвійчук, таму я не зьдзівілася, што менавіта Цэнтр грамадзянскіх свабодаў ва Украіне, які ўзначальвае Аляксандра, сёлета стаў ляўрэатам Нобілеўскай прэміі міру.
Яркім і запамінальным быў выступ тыбетскай актывісткі Чемі Лгамо. Пра набалелае гаварылі прадстаўнікі Нікарагуа, Паўночнай Карэі, Венесуэлы, Гон Конга, Гамбіі, Руанды. Вельмі ўразіў, думаю, многіх у зале, сьмелы, эмацыйны выступ журналісткі з Ірану Масіг Алініджад. Яе прамова сталася асабліва актуальнаю ў сувязі з пратэстамі ў Іране пасьля забойства паліцыяй нораваў маладой жанчыны, якая была затрымана за тое, што быццам бы не была апранутая адпаведна законам ісламу. Свой пратэст журналістка дэманстравала і сваім зьнешнім выглядам, яна мела распушчаныя пышныя валасы і кароткую да каленяў сукенку. Напэўна за гэта і яе чакаў бы такі прысуд у цяперашнім Іране. Усе выступы слухаліся на адным дыханьні, былі цікавыя і часам адгукаліся болем у сэрцы.
Форум мае і яшчэ адну асаблівасьць. У ягоных праграмах закранаюцца тэмы бясьпекі для людзей, якія змагаюцца з рэжымамі , Human Rights Foundation займаецца глыбока гэтымі справамі і навучае людзей метадам абароны. На Форумы запрашаліся Джымми Уэйлс, заснавальнік “Вікіпедыі “, Джон Каллас, сузаснавальнік фірмы Silent Circle, якая спецыялізуецца на крыптаабароне мабільных і стацыянарных камунікацыйных сістэмаў, пра што абсалютна неабходна ведаць праабаронцам, каб супрацьстаяць «Вялікаму Брату», які мае гіганцкія фінансавыя рэсурсы і вядзе за імі пастаянны нагляд.
У актыве Human Rights Foundation – адмысловыя семінары, арганізаваныя ў высокатэхналягічных кампаніях каліфарнійскай Крэмніевай даліны, юрыдычныя практыкумы для тых, хто змагаецца за вызваленьне з турмаў палітычных зьняволеных і інш.
Таксама распрацоўваюцца пытаньні выкарыстаньня сучасных тэхналёгіяў у справе фінансавга забесьпячэньня дзейнасьці.У такім кантэксце на гэтым Форуме быў прадстаўлены выступ, дзе гаварылася пра крыптавалюту, якая пашырае магчымасьці руху фінансаў і робіць іх выкарыстаньне больш бясьпечным. Крыптавалюта можа быць таксама і тым інструмэнтам, які магчыма будзе здольным абмяжаваць фінансаваньне дыктатарскіх рэжымаў.
Human Rights Foundation заклала таксама сваю премію *за “креатыўны пратэст”, (creative dissent)* у гонар Вацлава Гавэла сумесна з ягонай удавою Дагмар Гаўлавай. Нефармальна прысвойваюцца і антыпрэміі за патворства дыктатурам. Такой прэміяй была ўганараваная, напрыклад, Дженіфэр Лопес, якая паехала ў Туркмэнію, каб пацешыць тамтэйшае кіраўніцтва, ці рэпэр Канье Вест, які выступаў для сямьі Назарбаевых, таксама сьпявачка Мэрай Кэры, якая абдымалася ў Анголе з тыранам Жозэ Эдуарду душ Сантушам .
Арганізатары Форуму ў Нью-Ёрку паклапаціліся і аб мастацкім афармленьні падзеі. Паседжаньне адкрыў цудоўнай ігрою на скрыпцы музыка Юры Рэвіч. Ён расеец, нарадзіўся ў Маскве, вучыўся у Вене і зараз жыве там. Ёсьць музыкаю сусьветнага ўзроўню і ў гэтым можна было добра пераканацца. Ён выступіў і напрыканцы з падборкаю музычных кампазыцый, у якіх выразна, моцна гучалі ўсе трывогі сёньняшняга сьвету. Зрабіў надзвычайнае ўражаньне.
Шкада, што ў зале было мала нашых беларусаў. Сядзелі мы ўдвох з Андрэем Курэйчыкам, Ён цяпер на запросіны Йельскага універсытэту выкладае там на тэмы, блізкія да Форуму. Андрэй пазнаёміў мяне з цэлай групай выкладчыкаў гэтага універсытэту, які прыехалі на Форум. Тут варта дадаць, што Форум мае яшчэ адмысловую праграму для каледжаў і такія мерапрыемствы праводзяцца час ад часу ў розных універсытэтах, Йельскі універсытэтт бярэ ўдзел гэтай праграме і Трэйці форум для каледжаў праходзіў менавіта ў гэтым універсытэце.
Праходзячы на сваё мейсца ў залі, я пабачыла на адным з радоў пазнавальную асобу, а менавіта кіраўніка «Свабоднага тэатра» Мікалая Халезіна, які прыехаў з Эўропы. Безумоўна, ўзрадавалася, падыйшла і прывітала яго ад беларусаў Нью-Ёрку. Побач з ім сядзела прыгожая дзяўчына і ён прадставіў мне сваю дачку. А потым уткнуўся ў праграмку, беларуская прысутнасьць у Нью-Ёрку яго не зацікавіла.
У цэлым Форум пакінуў вельмі станоўчыя ўражаньні. Гэта была сустрэча неабыякавых, актыўных, адказных маладых людзей, якім наканавана будаваць новы сьвет без дыктатураў і войнаў, за імі будучыня. .Яны не баяцца ўступаць у барацьбу з гэтымі монстрамі ўчарашняга дня – сучаснымі дыктатармі. Яны разумеюць, што дыктатарскія рэжымы яшчэ маюць сваю моц, што гэтыя пачварныя істоты яшчэ могуць прынесьці сьвету шмат гора і стратаў. Галоўным матывам на Форуме было – дыктатары аб’ядноўваюцца і мы павінны аб’яднацца і не дапусьціць іхнай перамогі, не дапусьціць падзеньня сьвету ў цемру.
Высокая грамадзкая значнасьць Human Rights Foundation і Oslo Freedom Forum палягае таксама і ў тым, што паказвае сьвету новы, альтэрнатыўны шлях будаўніцтва міжнародных, сусьветных структураў, якія больш адпавядаюць сучаснасьці, больш эффектыўныя ў сваёй дзейнасьці, чым састарэлыя маральна і арганізацыйна структуры, створаныя ў мінулым стагоддзі.
Наступны Форум пройдзе сёлета 3 лістапада ў Тайбеі – сталіцы Тайваню.Напэўна, месца абраная невыпадкова. Сёньня сталася даволі рэальнаю пагроза нападу на свабодалюбны востраў з боку камуністычнага Кітаю, які натхняецца прыкладам Пуціна і хацеў бы вярнуць Тайвань пад уладу Пекіна, бо дагэтуль лічыць яго сваёй тэрыторыяй.

# СЯБРОЎСКАЯ ДАПАМОГА ЧАРНАГОРЦАМ

***Ганна Сурмач***

16 кастрычніка, у суботу, будынак нашага Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага на 401 Атлантык Авэню быў адчынены для незвычайных гасьцей. У гэты дзень ў нашай царкве прадстаўнік Чарнагорскай праваслаўнай царквы япіскап Барыс адпраўляў багаслужбу для сваіх суродзічаў, якія жывуць у Нью-Ёрку.
Япіскап знаходзіўся з візытам у Амэрыцы і вельмі хацеў сустрэцца з суродзічамі, аднак чарнагорцы не маюць у Нью-Ёрку свайго памяшканьня. Давялося шукаць дапамогу ў іншых брацкіх цэркваў. З гэтай мэтаю япіскап Барыс прыйшоў у наш Сабор і прысутнічаў 9 кастрычніка на Багаслужбе, а потым вёў перамовы пра магчымасьць правесьці ў нас Багаслужбу для ягоных вернікаў. Просьбу япіскапа падтрымаў былы генеральны консул Рэспублікі Чарнагорыя ў ЗША сп. Стаматавіч, які ад свайго імя накіраваў ліст да нашай Парафіі з просьбаю дазволіць чарнагорскай грамадзе памаліцца ў нашым Саборы.
Япіскап Барыс вучыўся ў Духоўнай акадэміі ў Кіеве, добра валодае украінскаю і расейскай мовамі. Больш за 70 адсоткаў насельніцтва Чарнагоры, якое налічвае больш за 620 тыс. чалавек, вызнаюць сябе праваслаўнымі хрысьціянамі і ім таксама даводзіцца, падобна беларусам, змагацца за сваю незалежную царкву.
У перыяд з 1992 году па 2006 год гэтая балканская краіна знаходзілася ў адной саюзнай дзяржаве з Сэрбіяй, дзе перавагу мела сэрбская праваслаўная царква, якая панавала над Чарнагорыяй ужо з 1918 году. 3 чэрвеня 2006 году Чарнагорыя правяла рэфэрэндум і абвесьціла аб сваёй дзяржаўнай незалежнасьці. Краіна вядомая ў сьвеце таксама пад назваю – Монтэнегро. Яна уваходзіць у склад Эўразьвязу і НАТА. Аднак, да сёньня Чарнагорская праваслаўная царква яшчэ не можа цалкам вызваліцца ад уплыву сэрбскай царквы і знаходзіцца ў сытуацыі будаўніцтва сваёй незалежнай царкоўнай структуры і арганізацыі дапамогі сваім суайчыньнікам у замежжы.
Спадзяемся, што і наша царква сваёй сьціплаю дапамогаю паспрыяе адраджэньню гэтай братэрскай нам царквы.
На Багаслужбе прысутнічала блізу чатырох дзесяткаў вернікаў. Адчувалася, што яны былі вельмі ўсьцешаныя такой магчымасьцю памаліцца разам. Напрыканцы Багаслужбы адбыліся хрэсьбіны, двое вернікаў, ужо дарослых людзей, далучыліся ў гэты дзень да веры Хрыстовай.
Наш Сабор даў магчымасьць арнагорцам не толькі памаліцца, але і пабыць разам у сяброўскай бяседзе. Пасьля Багаслужбы яны сабраліся ў грамадзкай залі і яшчэ доўга абмяркоўвалі свае праблемы, дзяліліся думкамі і прапановамі.
Япіскап Барыс і консул сп. Стаматавіч сардэчна дзякавалі нашай Парафіі. У сваім лісьце падзякі дыплямат згадаў, што гэта была для іх першая Багаслужба ў Амэрыцы пасьля 1923 году. А нам застаецца толькі цешыцца, што беларусам удалося адрадзіць і захаваць сваю царкву на эміграцыі і цяпер мы можам і павінны дапамагаць іншым. Мы запрасілі чарнагорцаў наведваць нашы Багаслужбы па нядзелях, пакуль у іх тут няма сваёй царквы.





# БЕЛАРУСЫ ПАЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў НАЙБУЙНЕЙШЫМ ВУЛІЧНЫМ ФЭСЦЕ НЬЮ-ЁРКУ





***Алесь Пазьняк***
***Здымкі Алеся Пазьняка, Алега Гаркаўца, Аляксандры Станкевіч***

**Нягледзячы на дождж, найстарэйшы вулічны кірмаш Брукліна Атлянтык Антык (Atlantic Antic) прадэманстраваў лепшае з мясцовага бізнесу і забаў для жыхароў Нью-Ёрка.**
Atlantic Antic з’яўляецца самым вялікім і найстарэйшым вулічным кірмашом у горадзе. У сувязі з пандэміяй каронавіруса ён не праводзіўся два гады запар. Аднак у гэтым годзе ён вярнуўся з музыкальнымі нумарамі, сямейнымі мерапрыемствамі і гандлем.
Уздоўж Атлянтык авэню, ў нядзелю раніцай 2 кастрычніка, узьняліся шапікі гандляроў з таварамі і ежай. А таксама дзіцячая пляцоўка з надзіманымі домікамі. І хоць надвор’е не спрыяла, усё ж жыхары горада прыйшлі пад парасонамі на сьвята, якое пачалося ў 12 гадзін.
Antic ахапіў 10 кварталаў Атлянтык авэню паміж Чацвёртай авеню і Хікс-стрыт (Hicks Street) з раёнамі Бруклін-Хайтс (Brooklyn Heights), Кобл-Хіл (Cobble Hill), Бурум-Хіл (Boerum Hill) і Форт-Грын (Fort Greene).
Нягледзячы дождж, які часам пераходзіў у лівень, ньюёркцы атрымалі асалоду ад музыкі маладых выканаўцаў і закусачных.
Па словах **Сяргея Кудзеліча**, аднаго з беларускіх актывістаў, мерапрыемства атрымалася даволі насычаным і шматлюдным. Таксама ён распавёў пра асаблівую цікавасьць да беларускай кухні з боку амэрыканцаў.
Наведвальнікі сьвята памятаюць беларускую кухню яшчэ з мінулых разоў. Мужчына, які падыйшоў да беларускага шапіка запытаўся адным словам: “Га-луб-цы?”. І пакаштаваўшы на месцы, набраў кантэйнер галубцоў дамоў.
Адна з амэрыканак прызналася, што беларуская кухня вельмі смачная, бо ежа зроблена з натуральных прадуктаў. Амэрыканцы прывыклі да азіяцкай, італійскай ці мексіканскай кухні. Але



ёй спадабалася, як прыгатавалі беларусы.
У гэтым годзе беларуская дыяспара прадставіла на продаж галубцы, смажаную каўбасу, дранікі.

Украінцы перадалі варэнікі з бульбай і капустай.
Актыўны ўдзел у мерапрыемстве ўзялі сябры Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА) сумесна з парафіяй Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы.
**Аляксандр Хомчанка**, староста Катэдральнага сабора імя св. Кірыла Тураўскага адзначыў, што беларусы падчас мерапрыемства збіралі сродкі на ЗСУ і на падтрымку беларускіх добраахвотнікаў ва Украіне.
*“Усяго было прадана ежы на 1215 даляраў і 98 даляраў мы атрымалі як ахвяраваньне. У гэты раз мы сабралі толькі на 200 даляраў меньш, чым на мінулым фэсце. Гэта выдатна, улічваючы неспрыяльнае надвор’е! Мы ведалі, што будуць перашкоды, але не апусцілі рукі і з задачай справіліся. Дзякуй за гэта нашым дзяўчатам – Таццяне Красоўскай, Людміле Хомчанке, Аксане Пятрашке, Натальле Федарэнке і ўсёй нашай вялікай камандзе”, – выказаўся спадар Аляксандр.*
Па словах **Таццяны Красоўскай**, якая адказвала за прыгатаваньне ежы, на адных украінскіх варэніках атрымалася зарабіць больш за 300 даляраў, але яны вельмі хутка скончыліся. Таму вырашана, што на будучыню трэба больш прадаваць украінскіх нацыянальных страў.
*“Да мерапрыемства пачалі рыхтавацца з серады. А ў нядзелю парадавалі амэрыканцаў духмянымі толькі сьпечанымі беларускімі дранікамі”, – зазначыла спадарыня Таццяна.*
Падчас фэсту ў адным з беларускіх шапікаў прадаваліся ўкраінскія тавары ручной працы для падтрымкі ЗСУ. Адказная за гэты аспект з украінскага боку выступае **Валянціна Бардакова.**
Фэст Атлянтык Антык штогод праводзіцца Карпарацыяй мясцовага рэзвіцця Атлянтык авэню (AALDC). **Говард Колінз**, выконваючы абавязкі выканаўчага дырэктара AALDC, распавёў прэсе, што нядзельнае мерапрыемства было традыцыяй раёна, напоўненае культурнай разнастайнасцю.
*«Мы вельмі ганарымся Antic. Гэта шматкультурны, шматэтнічны вулічны кірмаш, які прадстаўляе шматграннасьць Брукліна – столькі формаў, столькі асаблівасцей, столькі колераў», – сказаў Говард Колінз.*
У гэтым годзе фэсту Атлянтык Антык споўнілася 47 год.





# БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАЕ ЗАДЗІНОЧАНЬНЕ ПАДПІСАЛА СУМЕСНЫ ЗВАРОТ ДА КАНГРЭСА ЗША




**Ініцыятар звароту**
**American Coalition for Ukraine**

**Беларуска-амэрыканскія грамацкія арганізацыі падтрымалі зварот да Кангрэса ЗША з заклікам прыняць папраўкі да закону аб абаронным бюджэце ЗША.** Мэта папраўак: узмацненьне дапамогі Украіне ў вайне супраць агрэсіі Расеі.
Зварот падтрымлівае **чатыры накірункі дапамогі Украіне**:
1) Палепшыць правілы перадачы зброі й вайсковых прыстасаваньняў Украіне;
2) Надаць права Гэнэральнаму пракурору ЗША перадаваць арыштаваную каштоўную маёмасьць Расеі ў ЗША на карысьць Украіны ў адпаведнасьці з законамі;
3) Узмацніць нормы праверкі замежных кліентаў амэрыканскай фінансавай сістэмы, каб абмежаваць уплыў расейскіх алігархаў і спыніць карупцыйныя схемы;
4) Увесьці візавыя санкцыі супраць асобаў, якія ўдзельнічаюць у карупцыі і спрабуюць даваць хабар амэрыканскім чыноўнікам.
**Закон аб абаронным бюджэце ЗША** традыцыйна выходзіць на галасаваньне напрыканцы году. У яго звычайна дадаюць папраўкі, якія тычацца нацыянальнай бясьпекі й зьнешняй палітыкі. У 2020-ым годзе гэтакім чынам быў прыняты чарговы закон аб дэмакратыі, правах чалавека і суверэнітэце Беларусі. Гэтым разам адмысловых санкцыйных правілаў для Беларусі няма, але выканаўчая ўлада ЗША ўжо мае досыць шырокія паўнамоцтвы ўводзіць санкцыі супраць дыктатарскага рэжыму.
Зварот ініцыявалі украінска-амэрыканскія грамацкія арганізацыі **“Разом”**, **“Украінская нацыянальная ліга жанчын Амерыкі”** ды **“Украінскі кангрэсавы камітэт Амерыкі”**. Яго падтрымалі 22 іншыя арганізацыі баснійскай, балтыйскіх, грузінскай ды сірыйскай дыяспар. Ад беларускага грамацтва пад зваротам падпісаліся **“Асацыяцыя беларусаў у Амерыцы”**, **“Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне”** (БАЗА), **“Беларускі форум свабоды”** ды **“Кааліцыя за вольную Беларусь”**.

# ВІНШАВАННІ НОБЕЛЕЎСКАМУ ЛАЎРЭАТУ АЛЕСЮ БЯЛЯЦКАМУ АД ГАЛОЎНАЙ УПРАВЫ БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАГА ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ



Прыводзім тэкст віншаваньня Ноблеўскаму лаўрэату Алесю Бяляцкаму ад Галоўнай управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня:

***Галоўная управа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня***
***Нью-Ёрк***
***8 кастрычніка 2022***

Тэкст: https://baza.nyc
Фота: https://spring96.org

*“Шаноўны сп. Алесь!*
*Вельмі ўсьцешаныя добрай навіною з Осла. Нададзеная Вам Нобелеўскім камітэтам Прэмія міру – заслужаная ўзнагарода Вам за шматгадовую ахвярную працу па абароне правоў чалавека. Шматпакутны беларускі народ патрабуе такой абароны ад дыктатарскага рэжыму, які апанаваў нашу Бацькаўшчыну, які зьневажае нашых людзей, утоптвае ў гразь іхнае права людзьмі звацца, дараванае Богам кожнаму народжанаму на Зямлі чалавеку. Мы дзякуем Вам за Вашае служэньне свайму народу.*
*Сумна і горка, што рэжым трымае за кратамі Вас, аднаго з лепшых сыноў Беларусі. Мы тут у Амэрыцы памятаем пра пакуты нашага народу і робім ўсё магчымае для змаганьня з вар’яцкай уладаю, для вызваленьня палітзьняволеных у Беларусі.*
*Сёлетняя Нобілеўская прэмія – гэта высокая ўзнагарода для ўсяго беларускага народа, які мужна выйшаў на пратэсты ў 2020 годзе і працягвае сваё змаганьне да сёньня дзеля вызваленьня ад лукашэнкаўскага рэжыму, за пабудову дэмакратычнай і вольнай Беларускай дзяржавы. Гэтая прэмія – знак павагі і ўшанаваньня таксама для ўсіх палітзьняволеных у Беларусі, якія сёньня разам з Вамі пакутуюць у турмах.*
*Віншуем Вас з высокай узнагародай!*
*Жадаем Вам і ўсім беларускім палітзьняволеным духовай моцы, мужнасьці, надзеі і веры ў нашу перамогу, ў сьветлы дзень вашага вызваленьня.*

*Верым! Можам! Пераможам!*
*Жыве Беларусь!!!*

# УРОК ГІСТОРЫІ



***Ганна Сурмач***
***Здымкі Алеся Пазьняка, Алега Гаркаўца, Аляксандры Станкевіч***
***Photo via Good Free Photos***

Нядаўна натрапіла ў інтэрнэце на інфармацыю пра адметны факт гісторыі Амэрыкі, які набывае актуальную значнасьць для нашага часу. Сёньня варта нагадаць пра гэту павучальную падзею.

14 кастрычніка 1912 году (якраз 110 гадоў таму) адзін звычайны амэрыканскі грамадзянін зьдзейсьніў напад на Тэадора Рузвельта. Пад час сустрэчы палітыка з выбаршчыкамі нехта Джон Шранк выстраліў з рэвальвэра проста ў сэрца Рузвэльта.

Тэадор Рузвельт быў адным з самых папулярных амэрыканскіх прэзыдэнтаў, ён выконваў гэты абавязак цягам двух дазволеных Канстытуцыяй тэрмінаў з 1901 па 1909 год. Потым яго замяніў новабраны прэзыдэнт Уільям Тафт. Сытуацыя ў ЗША пачала імкліва мяняцца да горшага, новы прэдыдэнт аказаўся не падрыхтаваным да такой высокай пасады.

У грамадстве пачаліся забурэньні, усе пачалі ўспамінаць, што пры Рузвельту было лепш, ягоная папулярнасьць узрасла да 80 %. Шырока выказваліся прапановы, каб запрасіць Рузвэльта балятавацца на трэйці тэрмін. Група рэспубліканцаў падтрымала гэтую ідэю і ўрэшце Рузвельт пагадзіўся ісьці на трэйці тэрмін і пачаў перадвыбарчую кампанію. Краіна была ахоплена эйфарыяю, пачалі выказвацца новыя прапановы – газэты пачалі пісаць, што прэзыдэнты павінны кіраваць не два, а тры тэрміны, некаторыя нават дагаварыліся да таго, што Рузвельта трэба надзяліць паўнамоцтвамі Вярхоўных суддзяў (яны назначаюцца пажыцьцёва).

Мудры палітык і разумны чалавек Тэадор Рузвельт ведаў, што гэта будзе парушэньне Канстытуцыі. Але, не вытрымаў спакусы “усенароднай любові” і пагадзіўся на гэты крок. “Калі народ зробіць на мяне стаўку, я не адмоўлюся ад службы” – заявіў ён. Сталі мяняцца і ягоныя паводзіны, ён станавіўся папулістам, слава, як выглядала, прыходзілася Рузвельту да спадобы.

Рэвальвэрны выстрал у Мілуокі, куды палітык прыехаў на сустрэчу з выбаршчыкамі, да якой падрыхтаваў выступ на 50 старонках, прыпыніў увесь гэты небясьпечны працэс.

Нападнік быў арыштаваны, грамадства патрабавала расправы над ім. Сьледчыя спрабавалі высьветліць прычыны ягонага ўчынку, яны не маглі ўцяміць, чаму ён хацеў забіць такога ўсенароднa любімага палітыка, які, як выглядала, не зрабіў нічога злачыннага за сваю палітычную карьеру.

У адказ на абвінавачваньні Джон Шранк сказаў і ўвесь час паўтараў адну фразу: “Кожны чалавек, які пажадае балатавацца на трэйці прэзыдэнцкі тэрмін, павінен быць забіты”. Урэшце, Шранка адправілі ў закрытую псіхіятрычную клініку, дзе ён і памёр у 1943 годзе.

Прызнаны варьятам чалавек аказаўся самым цьвярозым сярод экзальтаванага папулісцкімі ідэямі грамадзтва. Гэта быў просты чалавек, які не мог палумачыць свой учынак высокімі словамі, але ён глыбока ўцяміў усю небясьпеку сытуацыі для краіны. Ён ніяк не мог перапыніць гэтыя падзеі і выбраў такі брутальны спосаб змаганьня, каб ахвяраваць двума жыцьцямі – Рузвельта і свайго асабістага.

А што магло б быць, калі б Рузвельт у трэйці раз стаў прэзыдэнтам?

Можна паразважаць з улікам абставінаў. Калі Рузвельт быў амаль гатовы пераступіць праз Канстытуцыю і пачаў адчуваць сябе ўсенародным любімцам, то гэта ўжо ёсьць падстава абаўляцца, што палітык далей мог паступова і нават незаўважна для самога сябе ісьці па шляху да шырокай і абсалютнай улады, мог і на чацьвёрты тэрмін пайсьці, калі б “народ пажадаў”. Ні ён сам, дык ягоныя наступнікі маглі б уважаць, што можна пераступаць праз Канстытуцыю, а некаму захацелася б, можа, і пяты тэрмін адолець. Дастаткова разагрэць грамадзтва папулісцкімі ідэямі. Як паказвае сусьветная гісторыя, так адкрываюцца шляхі да самых жорскіх дыктатураў.

Лёс захаваў жыцьцё Тэадору Рузвельту, бо, напэўна, ён не заслугоўваў такога прысуду і шмат добрага зрабіў для Амэрыкі. У той драматычны дзень ён быў апрануты ў тоўстае паліто, ва унутранай кішэні якога, якраз насупроць сэрца, ляжаў мэталёвы футарал для акуляраў і там жа былі складзеныя ўдвая 50 лістоў з тэкстам ягонай прамовы. Куля прайшла праз гэтыя перашкоды, але толькі падрапала скуру, а палітык застаўся жывым.

Якая была рэакцыя Рузвельта? Ён не стаў выстаўляць сябе ахвяраю, не стаў падыгрываць натоўпу, бо тады ягоны рэйтынг, напэўна, наблізіўся б да 100% і перамога ў выбарах была б яму гарантаваная. Ён асэнсваў гэты ўрок вельмі адказна, зразумеў, што ледзь не перайшоў тую “чырвоную лінію”, якая падзяляе закон і беззаконьне. Рузвэльт згарнуў сваю перадвыбарчую кампанію і не быў абраны прэзыдэнтам. Паступова адыйшоў ад палітыкі і памёр у 1919 годзе.

Але, другі прадстаўнік роду Рузвельтаў – Франклін Дэлано Рузвельт стаўся адзіным амэрыканскім прэзыдэнтам, які адслужыў тры тэрміны і быў нават абраны на чацьвёрты, аднак ў хуткім часе памёр. Ён узначальваў амэрыканскую выканаўчую ўладу ў самыя складаныя часы новай амэрыканскай гісторыі – Вялікай дэпрэсіі і Другой сусьветнай вайны (ад 4 сакавіка 1933 да 12 красавіка 1945). Здолеў вывесьці краіну з крызісу і ўнесьці свой важкі ўклад у перамогу над гітлераўскай Нямеччынаю і яе саюзьнікамі. Апраўдаў давер амэрыканскага народу, ніяк не выяўляў дыктатарскіх схільнасьцяў і не дапускаў краіну да сытуацыяў, якія нясьлі б пагрозу амэрыканскай дэмакратыі.

Будучы выхаваныя ў амэрыканскай дэмакратычнай палітычнай сыстэме, абодва Рузвельты паказалі, якой можа быць роля асобаў у палітыцы. Абодва былі назвычай папулярнымі ў грамадзтве, карысталіся высокім даверам, усенароднай славаю, але не скарысталі гэта дзеля ўмацаваньня сваёй абсалютнай улады.

Аднак, цяпер варта сказаць і пра ролю грамадзтва ў палітыцы. Усеагульнае ачмурэньне папулісцкімі ідэямі адкрывае дарогу да дыктатуры і безадказныя палітыкі заўсёды могуць гэта скарыстаць. У выпадку з Тэадорам Рузвельтам мы бачым, што грамадзтва было гатовым да гэтага і што магло здарыцца далей з Амэрыкаю?

Грамадзтва, якое не мае адказнасьці за сваю будучыню і лёгка паддаецца папулізму, вырошчвае дыктатараў. Адна вядомая беларуская журналістка выказала сваю думку пра сытуацыю ў сёньняшняй Расеі: калі б расейскаму народу далі ў прэзыдэнты анёла, ён усёроўна зрабіў бы з яго дыктатара.

З-за безадказнасьці грамадзтва і палітыкаў вырастаюць самыя брутальныя дыктатуры. Як правіла, пачынаецца з парушэньня Канстытуцыі, існуючых законаў. Чаму ж “добраму цару “ не даць магчымасьці яшчэ паваладарыць, калі нам пры ім добра жылося? – так думаюць, на жаль, многія.

Канешне, цывілізаванае грамадзтва не можа прыняць меры, які выкарыстаў некалі Джон Шранк. Але, як паказвае гісторыя і сёньняшняя сытуацыя ў Расеі, Беларусі, Венесуэле, Паўночнай Карэі і іншых дыктатрскіх краінах, авалодаўшы абсалютнай уладаю дыктатары заўсёды самі пачынаюць забіваць спачатку сваіх апанентаў, а потым і цэлыя народы – прыклад вайны ва Украіне.

Грамадзтва кожнай краіны павінна клапаціцца пра тое, каб пабудаваць сістэму процідзеяньня дыктатуры, каб гэтая сістэма, а не фізічнае забойства парушальнікаў законаў – будучых патэнцыяльных дыктатараў, папярэджвалі станаўленьне дыктатарскай улады.

Пазбаўленье ад дыктатуры каштуе шмат даражэй, чым яе папярэджаньне.





# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ ПРЫЕХАЛА ДА ЗША

***Алесь Пазьняк***
***Фота/відэа: Yurii Eber***

**Зьміцер Лукашук з “Еўрарадыё” прэзентаваў новую кнігу ў Нью-Ёрку.**

Насычаная і зьмястоўная сустрэча з рэдактарам эфіру “Еўрарадыё” **Зьмітром Лукашуком** адбылася 26 кастрычніка ў беларускім цэнтры ў Брукліне. Спадар Зьміцер прыляцеў у ЗША разам з **Лявонам Вольскім**, ягонай камандай і гуртом **J:Mors**.

Журналіст прэзентаваў у Нью-Ёрку кнігу “Нацыянальная ідэя на маршы” і падпісваў яе ўсім ахвочым. Сустрэча працягнулася каля дзьвюх гадзін. Падчас яе Зьміцер Лукашук распавёў пра сваіх студыйных суразмоўцаў, ідэю стварэньня кнігі, а таксама вёў актыўную дыскусію з прысутнымі ў залі. Кожны прысутны мог задаць пытаньне, або адказаць на яго.

Сам Зьміцер Лукашук зрабіў акцэнт на тое, што кніга ўтрымлівае ў сабе настроі грамадства падчас пратэстаў жніўня – верасьня 2020 года.

*“Гэтая кніга складзеная з праграмаў, якія былі запісаныя пасьля 9 жніўня 2020 года. Мы спрабавалі злавіць настроі, эмацыйны выбух, ідэю, якая ахапіла вуліцы беларускіх гарадоў. Таму быў час, што мы запісвалі па 4 – 5, а то і 7 праграм кожны дзень. Кожная з іх пісалася гадзіну. Я прыходзіў тады ў 7 гадзін раніцы на працу і сыходзіў толькі пасьля 11”, – сказаў Зьміцер.*

Шырокую дыскусію ў залі выклікала пытаньне наконт таго, калі беларусы сталі нацыяй. Увогуле, вечар атрымаўся цёплым і атмасферным. Госьця з “Еўрарадыё” беларусы частавалі дранікамі і галубцамі.

Мадэратам і арганізатарам сустрэчы выступіў **Міхась Чаропка (Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне “БАЗА”)** пры падтрымцы старшыні ньюёркскага аддзелу БАЗА – **Аксаны Пятрашка**, а таксама адказнага рэдактара **газэты “Беларус” Ганны Сурмач**. Таксама ўарганізацыідапамагаліпарафіяне**катэдральнага сабору імя св. Кірылы Тураўскага Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы - Тацьцяна Красоўская, стараста Аляксандр Хомчанка** і скульптар **Гэнік Лойка**.

На самой сустрэчы таксама прысутнічалі: кіраўнік **царкоўнага хору сабору Ала Орса-Рамана**, **Валянціна Трыгубовіч** ад **фундацыі імя Крэчэўскага** і **Ірына Хадарэнка – Беларуская Асьветніцкая Ліга Амэрыкі**.

А ўжо сёньня, 27 кастрычніка, VOLSKI і J:Mors выступяць у Нью-Ёрку з праграмай “За нашу і вашу свабоду”. Заўтра плянуецца канцэрт у Філядэльфіі. Агулам у музыкаў адбудзецца пяць канцэртаў у ЗША. Іх вядоўцай выступае Зьміцер Лукашук.





# J:MORS I VOLSKI ЗЛАДЗІЛІ СУМЕСНЫ КАНЦЭРТ У НЬЮ-ЁРКУ











***Алесь Пазьняк***
***Фота/відэа: Yurii Eber***
***Здымкі Сяргея Трыгубовіча, Зьмітра Лукашука, Алеся Пазьняка***

**Генэралы айчыннага року J:Mors і Volski выступілі на адной сцэне перад беларусамі Амэрыкі.**

Увечары, 27 кастрычніка, у клюбе DROM у Мангэтане было горача ад таго, што ў адным месцы сабралася шмат беларусаў.

Канцэрт “За нашу і вашу свабоду” распачаў журналіст, рэдактар эфіру “Еўрарадыё” **Зьміцер Лукашук** воклічам “Жыве Беларусь!” Яго падтрымала ўся заля. Пасьля гэтага некалькі англамоўных кампазыцый выканаў Антось з маладога гурта **Graphotype**. А калі на сцэну выйшаў **Уладзімір Пугач** са сваёй камандай, беларусы прыйшлі ў захапленьне. Славуты гурт выканаў шмат старых хітоў, а таксама новыя песьні, якія былі напісаны пасьля падзей 2020 года на трох мовах – беларускай, рускай, украінскай.

Таксама Уладзімір Пугач і Лявон Вольскі выканалі сумесны хіт “Дыхаем зноў”.

Сам **Лявон Вольскі**, калі выйшаў на сцэну адразу запеў “Партызанскую”, якую голасна падхапілі прысутныя. А потым пасыпаліся хіты ўсіх часоў пачынаючы ад “Мроі”.

У канцы канцэрту Зьміцер Лукашук зладзіў аўкцыён. На ім выставілі першую (белую) кнігу “Беларуская нацыянальная ідэя”, якую ён адмыслова прывёз з Варшавы . У ёй ёсьць ідэі Уладзіміра Пугача і Лявона Вольскага. Дарэчы, яе лукашэнкаўскія кнігалюбы ў Беларусі прызналі “экстрэмісцкай”. Кніга была аздобленая аўтографамі дзьвюх легенд – Пугача і Вольскага. І была прададзена за 2 тысячы даляраў.

Акрамя таго за 500 даляраў была прададзена майка з аўтографамі музыкаў. Грошы ад дзьвюх продажаў пайшлі ў адмысловы фонд дапамогі Украіне.

Зьміцер Лукашук распавёў, што па адной такой кнізе будуць выстаўляць на аўкцыён у кожным горадзе, дзе будуць адбывацца канцэрты. На сёньняшнім канцэрце ў Філядэльфіі аўкцыённыя грошы пойдуць на дапамогу беларускім палітвязьням.

Таксама падчас і пасьля канцэрта можна было набыць тавары з беларускай атрыбутыкай, кнігі “Нацыянальная ідэя” і нават пернікі з бел-чырвона-белай афарбоўкай. Гэта рабілі валанцёры і прадстаўнікі розных беларускіх арганізацый ў Амэрыцы.

Старшыня ньюёрксага аддзела Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня “БАЗА” **Аксана Пятрашка** распавяла, што асабіста яна нагандлявала на 230 даляраў. Усе сабраныя сродкі пойдуць на патрэбы беларускіх добраахвотнікаў у ЗСУ.

*“Я ўдзячна арганізатарам канцэрта за магчымасьць і за месца для продажу тавараў, каб падтрымаць беларускіх вайскоўцаў ва Украіне. Асабліва добра продаж пайшоў пасьля канцэрта, калі ўсе хацелі атрымаць на купленых рэчах аўтографы рокераў,” – распавяла Аксана.*

У ЗША плянуецца пяць канцэртаў генэралаў беларускага року. Сачыце за праграмай ў сацсетках, бярыце сяброў і прыходзьце. Не пашкадуеце!







# БЕЛАРУСЫ НЬЮ-ЁРКУ АДЗНАЧЫЛІ ДЗЯДЫ. ВЫСТУПІЎ ЗЯНОН ПАЗЬНЯК













***Алесь Пазьняк***

**Беларусы Нью-Ёрка, а таксама госьці сабраліся суботнім вечарам, 5 лістапада, у Грамадзкай Залі Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага, каб адсьвяткаваць Дзяды. Імпрэзу падрыхтавала Управа Нью-Ёркскага аддзела БАЗА.**

Яе вядоўца Натальля Федарэнка агучыла назву мерапрыемства – “Ноч Расстраляных Паэтаў. Абрад ушанаваньня Продкаў, Дзяды”. Яна зьвярнула ўвагу прысутных на тое, што Дзяды з’яўляюцца старажытным беларускім сьвятам з глыбокім сэнсам і філязофіяй.

*“Сёньня мы будзем успамінаць ня толькі сваіх продкаў, якія адыйшлі. Але будзем успамінаць ахвяр рэпрэсій мінулага стагодзьдзя. У ноч з 28 на 29 кастрычніка 1937 года былі расстраляныя 132 прадстаўніка беларускай эліты: паэты, пісьменьнікі, драматургі ды культурныя дзеячы карнікамі з НКУС. Беларусы ва ўсе часы будуць памятаць тых нявінна загіблых дзеячоў, асабліва ўсьведамляючы, што яны былі забітыя за сваю беларускасьць,” – сказала Натальля.*

Пасьля ўступнага слова вядоўца перадала слова Зянону Станіслававічу Пазьняку, які распавёў пра геапалітычную сітуацыю вакол Беларусі і ва Украіне, а таксама ўзгадаў пра Курапаты і ўшанаваньне Дзядоў. У сваёй прамове ён зрабіў гістарычны экскурс, дзе паказаў карані сучаснага злачынства, якое адбываецца на Усходзе Эўропы.

*“Злачынства пачалося з XVII стагодзьдзя пры маскоўскім цары Аляксеі Міхайлавічы. Гэта час, калі пачала фармавацца новая арда. Яе палітыкай стала зьнішчэньне Вялікага Княства. У выніку войнаў з насельніцтва ў тры мільёны чалавек у Вялікім Княстве засталося толькі паўтара мільёна. Фактычна палова была вынішчана. Тое самае робіцца ва Украіне сёньня. Працягваецца палітыка вынішчэньня ўкраінскай нацыі,” – зазначыў Зянон Пазьняк.*

Палітык засяродзіў увагу прысутных на тым, што сёньня Дзяды сьвяткуюцца ў незвычайных умовах у стане вайны з Расеяй. Па ягоных словах на сёньняшні дзень ёсьць хоць невялікі, але шанец, дэзінтэграваць імпэрыю. І для гэтага недастаткова сіл адной Украіны. Гэта павінна ўсьвядоміць Эўропа.

Таксама лідар Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ дадаў, што Дзяды паказваюць злачынствы рэжыму, які працягвае панаваць у Расеі.

*“За Саветамі Дзяды былі забаронены. Але калі ў 1988 годзе Дзяды пачалі сьвяткаваць, гэта сьведчыла аб адраджэньні нацыі. Гэта не магло не закрануць грамадзтва. Яно было глыбока ўскалыхнута. А камунізм пацярпеў паразу. А ўжо ў 1991 годзе Беларусь набыла незалежнасьць. Грамадзтва 70 гадоў выхоўвалася ў каланіяльнай сістэме думаньня. Людзі тады не да канца разумелі, што адбылося,” – падкрэсьліў палітык.*

Пасьля прамовы Зянона Пазьняка кожны прысутны мог падзяліцца думкамі і прачытаць верш забітага ў 1937 годзе паэта ці верш аб тых падзеях, якія тады адбыліся.

Сярод выступоўцаў былі Надзея Шыкаловіч, Аксана Раманюк, Гэнік Лойка, Ганна Сурмач, Міхал Чаропка, Ірына Хадарэнка, Алесь Пазьняк, Ігар Вырвіч, Галіна Пазьняк, Натальля Федарэнка. Уласнымі вершамі пра Радзіму падзяліўся Павел Надольскі.
Вечар скончыўся гутаркамі і знаёмствамі з новымі людзьмі, якія завіталі, каб прыяднацца да адзначэньня Дзядоў.



# ДОЎГІ ШЛЯХ ДА ВЫНІКАЎ



***Марына Кражова***
***Фота https://www.senate.gov/artandhistory/history/common/image/WI_Proxmire_William_1963.htm***

Яшчэ са студэнтскіх часоў у Беларусі, мне запомнілася лекцыя з заняткаў па псіхалогіі, дзе выкладчыца педагагічнага каледжу распавядала пра псіхалагічны стан вязьняў у параўнанні са станам закладнікаў канцэнтрацыйных лагераў. Сцвярджалася, што вязням лягчэй адбываць тэрмін за конт існавання пэўнай часовай межы.У той жа час, людзі якія е ведаюць тэрміну і нават прыкладна не могуць прадказаць час вызвалення, знаходзяцца пад большым эмацыйным ціскам і не маюць іншага выйсця, як існаваць надзеямі (чытайма фантазіямі).
Мэта – даволі часта становіцца рухавіком жыццядзейнасці чалавека, але нават самы ідэйны і адданы сваёй спаве чалавек застаецца скрапным да вынікаў. Праца без вынікаў ставіць яго ў ступар, дэматывуе і расчароўвае, а недасяжныя вынікі, якія павінны былі б забяспечыць вызнанне, падтрымку, узнагароду, становяцца раздражняльнай ілюзіяй. На шчасце, не для ўсіх.
Адзінаццатага лістапада 1915 году нарадзіўся амерыканкскі сенатар Вільям Проксмайер (Edward William Proxmire). Сваю палітычную кар'еру дзеяч у штаце Вісконсін падмацаваў дзіўнай заявай:
*“ Я вазьму няўдальцаў...*
*Калі тыя, хто згубілі ў бізнесе, каханні, спорце ці палітыцы прагаласуюць за мяне, за чалавека дасведчанага ў стратах, але здольнага працягваць барацьбу, то я з задавальненнем падтрымаю і сваіх апанентаў з электаратам удачлівых галасоў, якія ніколі нічога не гублялі.”*
Акрамя электарату няўдальцаў, спадар Біл браўся і за няскончаныя, так бы мовіць, няўдалыя справы і прапановы, адной з якіх стала ідэя Рафаіла Лемкіна ў барацьбе за падпісанне і прызнанне Амерыкай значнасці Канвенцыі па генацыду. Лемкін нарадзіўся недалёка ад Ваўкавыску, ён прыдумаў само слова “генацыд” і прысвяціў усе свае жыццё на прыняцце неабходных законаў па супрацьстаянню і супэненню масавага вынішчэння людзей. Рафаіл памёр у Нью Йорку ў 59 гадоў так і не пабачыўшы вынікаў сваёй фундаментальнай працы. Тым не меней, спадар Біл Праксмайер вырашыў, што з амерыканскай настойлівасцю “дацісне” справу Рафаіла Лемкіна, польскага адваката, габрэя з-пад Ваўкавыску пра якога некаторыя амерыканскія дзеячы з пагардай казалі “прапагандыст замежнай краіны са зламанай ангельскай мовай”. (Насамрэч, Лемкін быў паліглотам і заслугоўвае асобнага артыкулу.)
Біл Проксмайер прамаўляў аб неабходнасці ратыфікавання Канвенцыі па папярэджанню генацыду і адпавядальнасці за яго **кожны дзень** з 1967 па 1986 год. Колькасць прамоў сягнула 3211, калі ўрэшце законапраект быў прыняты 11 лютага 1986 года. Падпісаў яго Рональд Рэйган у 1988 годзе. Кожная з прамоў Біла была ўнікальнай і выдатна падрыхтаванай. Крытыкуючы ўладу за абыякавасць і адсутнасць логікі, пад час аднаго з выступаў ён заявіў:
*“ Сярод болей за сотню пагадненняў ёсць Канвенцыя аб тунцы з Коста-Рыка, ... Канвенцыя аб палтусу з Канадай, ..., Канвенцыя аб крэветках з Кубай, дагавор аб сяброўстве з Маскатам і Аманам і, нават самы маляўнічы і апетытны дагавор пад назвай “Пратакол ружовага ласося”. Я не хачу сцвярджаць, што любы з гэтых дагавораў не павінен быў быць ратыфікаваны... Але кожны з іх садзейнічае або прыбытку, або задавальненню.”*
Акрамя гэтага, кожны месяц з 1975 году, сенатар выдаваў прэмію за самыя бязглуздыя выдатки грошаў. Першым намінантам і пераможцам, напрыклад, стала Акадэмія навук (National Science foundation), якая атрымала грант у памеры 84.000 даляраў на вывучэнне пытання “чаму людзі закохваюцца”. У 1976 прэмію атрымаў Нацыянальны Інстытут алкагалізму (National Institute of Alcohol Abuse), які вытраціў 102 тысячы дзяржаўных грошаў на вывучэнне ўзроўню агрэсіўнасці ў п'янай і цвярозай рыбы. Было яшчэ шмат намінантаў, якія знаходзяцца ў агульным досягу на старонцы Гістарычнага таварыства Вісконсіну (Wisconsin Historical Society).
Агулам, справа Канвенцыі Генацыду ў ЗША распачатая Лемкіным і перахопленая Праксмайерам доўжылася 40 гадоў і ніхто з іх не ведаў тэрмінаў і не меў гарантый поспеху. Але ў іх была мэта і , як казалася вышэй, мэта даволі часта становіцца рухавіком жыццядзейнасці чалавека.
Сёння ўздымаецца праблема генацыду ўкраінскага народу. У Амерыцы, адным з найгучнейшых галасоў стаў гісторык, прафесар Ельскага універсітэта Цімаці Снайдэр. Ніхто не ведае, колькі прыйдзецца выдаціць часу, каб цэлы свет падтрымаў і выступіў з беззаганным агульным дакументам у дачыненні да масавага вынішчэння украінцаў, але я не маю сумневаў, што той хто пачаў прамаўляць, не спыніцца нават калі яго/яе ўласнага жыцця будзе недастаткова, каб засведчыць чаканы вынік.





# У НЬЮ-ЁРКУ АДБЫЛОСЯ ШЭСЬЦЕ І МАЛЕБЕН ПА ГАЛАДАМОРУ ВА















***Алесь Пазьняк***
***Здымкі: Алесь Пазьняк, Dinara Khairova***

**У Нью-Йорку ў саборы Сьвятога Патрыка з удзелам розных хрысціянскіх канфесій адбыўся ўрачысты малебен з нагоды 90-годзьдзя Галадамору ва Украіне.**
Дзень памяці ахвяр галадамора 1932-1933 гадоў прыпадае на чацвёртую суботу лістапада і адзначаецца з 1998 года ва Украіне. Лічыцца, што ў выніку яго загінулі сама меней 3,9 млн чалавек. Агульная колькасць ахвяр можа дасягаць да 7-10 мільёнаў.
У суботнім малебне 19 лістапада ў Нью-Ёрку прынялі ўдзел палітыкі, дыпламаты, прадстаўнікі міжнародных арганізацый, шматтысячная ўкраінская грамада, беларуская дыяспара на чале з **Зянонам Пазьняком.**
Перад гэтым удзельнікі малебна здзейснілі па Манхэтэну шматкіламетровае шэсьце з украінскімі і беларускімі сьцягамі, плякатамі і банерамі з інфармацыяй пра Галадамор.
Збор стартаваў ля царквы Сьвятога Юра (30 East 7th Street) ў 10 гадзін раніцы. А служба і выступы ў саборы Сьвятога Патрыка пачаліся ў гадзіну дня. Беларусы паўдзельнічалі і ў шэсьці, і ў малебне.
Цікава, што ўсю працэсію ад пачатку да канца суправаджала ньюёркская паліцыя. А само шэсьце рухалася за аўтамабілем, на якім быў усталяваны вялізны звон. Перыядычна па дарозе ў яго званілі, каб ушанаваць памяць загінулых.
У галоўным каталіцкім саборы Нью-Ёрка першым выступіў сэнатар штата **Чак Шумэр**, які нагадаў, што яго продкі паходзяць з Тэрнопальскай вобласці, і падкрэсліў, што Галадамор быў генацыдам украінскага народа.
*«Сталін імкнуўся знішчыць украінскі народ і ўкраінскі дух, але ён і савецкі рэжым загінулі, а ўкраінскі народ жыве. Як сталін пацярпеў крушэнне ў сваіх намерах, гэтак жа церпіць крах і пуцін»,* – выказаўся Чарльз Шумэр.
Таксама сэнатар зрабіў акцэнт на важнасць узмацнення ваеннай дапамогі Украіне з боку ЗША.
*«Няхай жыве ўкраінскі народ!» – гэтымі словамі завяршыў Чак Шумэр сваю прамову.*
Пастаянны прадстаўнік Украіны пры ААН **Сяргей Кісьліца** адзначыў, што мэтанакіраваны голад застаецца галоўнай зброяй крамля. А ягоная палітыка вынішчэньня не зьмяняецца стагодзьзьмі.
*“На гэты раз яго прымяняюць не толькі ва Украіне, але і ва ўсім сьвеце, уключаючы самыя слабыя краіны Афрыкі і Азіі”, – адзначыў дыплямат.*
Сяргей Кісьліца нагадаў, што па дадзеных ААН, зараз з праблемай голаду сутыкаюцца сотні мільёнаў чалавек у сьвеце. Прычым для многіх з іх прычынай пакут стала расейскае ўварванне ва Украіну, якое прывяло да дэфіцыту харчавання.
Напярэдадні Вярхоўная Рада Украіны заклікала парламенты дзяржаў сьвету прызнаць Галадамор генацыдам супраць украінскага народа.
Па некаторых падліках у галоўным каталіцкім саборы Нью-Ёрка ў суботу на 90-годзьдзе па Галадамору сабралася каля чатырох тысяч украінцаў.

# ГАДАВЫ СХОД НЬЮ-ЁРКСКАГА АДДЗЕЛУ БАЗА



***Ганна Сурмач***

20 лістапада, у нядзелю, прайшоў гадавы справаздачна-выбарчы сход Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА). Падзея адбылася ў грамадзкай залі Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага на 401 Атлантык Авэню ў Брукліне.

Сваю першую справаздачу на пасадзе старшыні Аддзелу зрабіла сп. Аксана Пятрашка. Яна ўпершыню стала кіраўнічкаю Аддзелу пасьля абраньня на лістападаўскім сходзе мінулага году. З выступу старшыні было выразна бачна, што яна сама і ўвесь склад Управы працавалі даволі плённа, было зроблена шмат чаго карыснага і цікавага. Свой першы іспыт сп. Аксана вытрымала з годнасьцю.

Скарбнік Аддзелу сп. Сяргей Кудзеліч у сваёй кароткай справаздачы распавёў пра фінансавы стан Аддзелу, які выглядае даволі прыстойна. Старшыня Рэвізійнай камісіі сп. Пятрашка паведаміў, што камісія зрабіла праверку фінансавай дакумэнтацыі Аддзелу і не знайшла заўважных парушэньняў.

Сябра Управы Аддзела і рэдактар газэты “Беларус” сп. Ганна Сурмач давяла да ведама прысутных інфармацыю пра дзейнасьць Рэдакцыі газэты “Беларус”, у складзе якой бяруць удзел сябры Нью-Ёрскага Аддзелу. Газэта цяпер мае свой сайт у інтэрнэце – **Bielarus.info** і выходзіць у электронным варыянце. Рэдакцыя таксама пляну выдаваць гадавы нумар газэты з найбольш значнымі публікацыямі ў папяровым варыянце. Сп. Сурмач выказала асаблівую падзяку за працу ў Рэдакцыі сябру Аддзелу сп. Міхалу Чаропку, які вядзе сайт газэты. Таксама падзякавала журналісту Алесю Пазьняку, які аператыўна падае інфармацыю ў газэту пра ўсе падзеі беларускага жыцьця ў Амэрыцы. Рэдактар заклікала прысутных браць больш актыўны ўдзел у інфармацыйным забесьпячэньні дзейнасьці беларусаў у Нью-Ёрку, дасылаць у газэту свае інфармацыі, артыкулы, паведамленьні.

Удзельнікі сходу прынялі да ведама справаздачы і падтрымалі станоўчую ацэнку дзейнасьці Управы Аддзелу за мінулы справаздачны год.

Далей адбыліся выбары складу Управы Аддзелу на наступны год. У першую чаргу трэба было абраць старшыню Управы. З улікам актыўнасьці і адказнасьці сп. Аксаны Пятрашкі на пасадзе старшыні яе кандыдатура была прапанаваная на пераабраньне. Таксама была пададзена прапанова абраць старшынём вельмі актыўнага сябра Аддзела сп. Міхала Чаропкі. Але, ён узяў самаадвод у сувязі з тым, што хоча больш часу аддаваць працы з газэтным сайтам. У выніку патаемнага галасаваньня **сп. Аксана Пятрашка была ў другі раз абраная старшынёю Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА.**

Прысутныя да сходзе падтрымалі прапанаваны новаабранай старшынёй сьпіс сяброў у новы склад Управы аддзелу, які ў выніку галасаваньня быў зацьверджаны.

**У склад Управы аддзела ўвайшлі**:
**Чаропка Міхал – заступнік старшыні**
**Шыкаловіч Надзея –сакратар**
**Сяргей Кудзеліч –скарбнік**
**Красоўская Тацьцяна – сябра**
**Аксана Раманюк – сябра**
**Ганна Сурмач – сябра**
**Валеры Мінец – сябра**
**Таксама быў абраны новы склад Рэвізійнай камісіі:**
**Сяргей Рудкоўскі – старшыня**
**Максім Пабярэжнік – сябра**
**Юры Козінцаў – сябра**

На завяршэньне сходу слова ўзяла сп. Аксана Пятрашка. Яна падзякавала ўсім, хто працаваў з ёю ў мінулым годзе, прывітала новых сяброў Управы і запрасіла іх да актыўнай працы.







# АЛЬМАНАХУ “БЕЛАРУС” СПОЎНІЛАСЯЯ 15 ГОД



***Алесь Пазьняк***
***Здымкі: Алесь Пазьняк, Віктар Дударaў***

**Марат Клакоцкі, заснавальнік і выдавец літаратурнага альманаха беларускіх пісьменнікаў замежжа “Беларус” прэзентаваў новы нумар выданьня за 2022 год.**

Сустрэча і прэзэнтацыя адбылася ў грамадзкай залі Сабора Сьв. Кірылы Тураўскага 26 лістапада а пятай гадзіне вечара. Гэта 16 выпуск альманаха, які выдаецца са жніўня 2007 года. А само выданьне жыве ў літаратурнай прасторы ўжо 15 год. Пра гэта ўзгадаў **Віталь Зайка**, сталы аўтар “Беларуса”, кіраўнік Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”, які і адкрыў сустрэчу.

Спадар Зайка падкрэсьліў, што “Беларус” працуе на карысьць беларускай культуры ў замежжы. І яго варта падтрымліваць тэкстамі і сродкамі. Дарэчы, сам Віталь Зайка прачытаў усе тэксты і зрабіў summary выданьня.

**Марат Клакоцкі**, падчас выступу сказаў, што альманах створаны для пісьменнікаў замежжа. І экзэмпляры “Беларуса” ёсьць па-за межамі Амэрыкі. Для прыкладу, ён рэгулярна дасылае выданьні ў вучэбныя ўстановы Польшчы – Варшава, Кракаў, Беласток.

Сярод удзельнікаў сустрэчы былі некаторыя аўтары “Беларуса”. Адзін з іх – гэта **Віктар Едзіновіч**. Ён прадставіў да друку два сваіх апавяданьні: “Апошні карчоўшчык” і “Ня тэхніка, а людзі!”, аб ваенных падзеях II Сусьветнай вайны.

Журналістка **Тацяна Заміроўская**, якая ў свой час супрацоўнічала з “Белагазетай”, “Радыё Рацыя”, “Музычнай газетай” і стала папулярнай пісьменніцай ў Расіі, але стала жыве ў ЗША, прадставіла сваё першае апавяданьне па-беларуску.

Пасьля гэтага Тацяна напісала ў Facebook:

*“Гэты момант павінны быў настаць і ў маім жыцьці! Упершыню ў жыцці напісала апавяданне па-беларуску, і вось яны, бонусы – надрукавалася ў альманаху “Беларус” побач з Зянонам, а таксама атрымала фота з Зянонам!”*

**Зянон Пазьняк** выступіў у гэтым нумары “Беларуса” ў новай ролі. У альманаху выйшла ягоная тэтралёгія “Эвангельскія дзеі” (“Ірад”, “Хрыстос”, “Юда”, “Пётра”), напісаная ў сярэднявечным жанры міракляў, міралітэ, беларускай народнай драмы і батлейкі. Гэты жанр, на думку аўтара, можа перадаваць тонка хрысьціянскія і эвангельскія тэмы.

Але выступ аўтар пачаў з таго, што 26 лістапада распачаўся Слуцкі Збройны Чын і прыгадаў гістарычна падзеі 1920 года, сучасных ваяроў і абаронцаў Беларусі і Украіны. А потым распавёў пра свае новыя творы з прэзэнтаванага выданьня, якія калі-небудзь будуць пастаўлены ў тэатры.

**Галіна Пазьняк** распавяла пра пачатак вайны ва Украіне і беларускіх валанцёраў, якія кінулі працу, каб дапамагаць забяспечваць беларускіх вайскоўцаў ва Украіне неабходным рыштункам, сродкамі, вопраткай. У альманаху выйшла інтэрв’ю з адным з іх – Андрусём, які паказаў сваё бачаньне сітуацыі і працу на карысьць перамогі Украіны над агульным ворагам.

**Зьміцер Левіт**, чалавек, які распаўсюджваў незалежную прэсу ў Беларусі ў канцы 1980-ых да 1992 года, сябра БНФ, беларускі жыд, распавёў пра свой шлях да Беларусі для ўсіх прысутных. Ён 30 год стала жыве ў ЗША, працуе ў ахове і служыць у амэрыканскім войску. Але не згубіў беларушчыны ў сваім сэрцы.

Падчас прэзэнтацыі і пасьля можна было задаць пытаньні любому аўтару, абмяняцца думкамі, ідэямі, набыць альманах, календары, ахвяраваць сродкі на ЗСУ.

**Ганна Шарко**, якая прадстаўляе беларускі бізнэс у ЗША і IT, а таксама вялікую суполку ў Facebook “Беларусы ЗША. Разам лягчэй” прыпаднесла торцік Марату Клакоцкаму ў гонар 15-годзьдзя выданьня.

Прысутныя таксама змаглі атрымаць аўтографы ад аўтараў, пагутарыць адзін з адным за кубкам кавы. Сёлета ў альманаху сабраныя творы 24 беларускіх літаратараў замежжа. Некаторыя з іх з’явіліся па-беларуску ўпершыню.

Беларусы ЗША могуць замовіць альманах у Марата Клакоцкага весь па гэтых мэйлах:
**mklakotski@gmail.com,**
**zamova@e-krama.com**





# УГОДКІ СЛУЦКАГА ЗБРОЙНАГА ЧЫНУ Ў НЬЮ-ЁРКУ



***Алесь Пазьняк***

**Дзень Герояў вольнай Беларусі адзначылі ў Нью-Ёрку. Гэта адбылося 4 сьнежня ў беларускім цэнтры пры Саборы Сьв. Кірылы Тураўскага. Мерапрыемства сабрала як беларусаў з Нью-Ёрка, так і гасьцей з Філадэльфіі, Вірджыніі й іншых мейсц.**

Распачаў імпрэзу **Міхал Чаропка**, заступнік старшыні Нью-Ёркскага адздзелу БАЗА. Ён зьвярнуўся да прысутных уганараваць хвілінай маўчаньня памерлага ў суботу, 3 сьнежня, **Вітаўта Кіпеля**, беларускага патрыёта і дзеяча навукі і культуры ў эміграцыі (1927-2022).

Пасьля Міхал уключыў відэа з гісторыкам Уладзімірам Арловым, які ў некалькіх хвілінах распавёў пра ўзброеную абарону Бацькаўшчыны случчакамі ў лістападзе-сьнежні 1920 года. Потым Міхал засяродзіў увагу прысутных на асобах, беларускіх вайскоўцах, афіцэрах, іх лёсах пасьля збройнага супраціву.

Спадаром Чаропка былі пераліччаны і пададзеная аўтабіяграфічная інфармацыя аб наступных імёнах: **Уладзімір Паркулевіч, Павал Жаўрыд, Анастас Анцыповіч, Улас Дубіна, Юры Лістапад, Ян Мацэля, Арсень Паўлюкевіч, Васіль Русак, Юльян Сасноўскі, Павал Чайка, Лукаш Семянюк, Ахрэм Гаўрыловіч, Якуб Гузьней.**

У залю вядоўцай было зададзена пытаньне: “Чаму гэтыя людзі вярнуліся ў БССР?”. Адказ прагучаў ад **Ганны Сурмач**, якая коратка патлумачыла, што яны купіліся на прапаганду бальшавікоў аб тым, што ім нічога не будзе…

Пасьля выступіў ганаровы госьць **Зянон Пазьняк**, які працягнуў тэму. Ён прывёў жахлівую лічбу ў 1 800 000 тыс. чалавек, зьнішчаных у Беларусі праз рэпрэсіі.

*“Ні адзін народ не панёс столькі стратаў, колькі беларусы. У нас было зьнішчана больш за ўсё людзей жахлівым камуністычным рэжымам. Дарэчы, камунізм – гэта форма расейскага імпэрыялізму”, – прамовіў Зянон Пазьняк.*

Далей спадар Зянон прывёў факты з гісторыі Слуцкага Збройнага Чыну – рашэньні случчакоў абараняць БНР у гістарычных межах.

Ён распавёў пра тое, што супраць некалькіх тысяч чалавек, якім не хапала зброі, харчаваньня і амуніцыі была брошаная 16-я армія бальшавіцкіх галаварэзаў. Але случчакі на працягу двух месяцаў стрымлівалі іх удары і трымалі фронт даўжынёй ў 100 км.

*“Восеньню 1920 году, у час вайны Польшчы і савецкай Расеі, ваюючыя бакі падпісалі мірнае пагадненьне. Дэмаркацыйная лінія і нэйтральная зона прайшлі якраз цераз Случчыну. Сытуацыю выкарысталі случчакі. Быў скліканы Першы беларускі зьезд Случчыны, які абраў часовы ўрад – Беларускую раду Случчыны. Пры падтрымцы сялянства і месьцічаў Рада за тры дні сфармавала з добраахвотнікаў 1-ю Слуцкую брыгаду стральцоў войскаў Беларускай Народнай Рэспублікі з двух палкоў. Узброеная барацьба пачалася 27 лістапада 1920 году. Баі з Чырвонай арміяй працягваліся да канца сьнежня 1920 году. Спроба стварыць незалежную беларускую дзяржаву была гераічнай”.*

Таксама Зянон Пазьняк зьвярнуў увагу прысутных, што супраць бальшавікоў, калектывізацыі і савецкай ўлады ў Беларусі на працягу 20-ых гадоў было больш за 500 паўстаньняў. Дакумэнты аб гэтым засакрэчаны. Дадзеных ніякіх няма. Але ў адпаведны час праўда ўсё роўна пральецца ў грамадзтва.

*“З ворагам трэба змагацца. Мы маем працяг Слуцкага Збройнага Чына ў палку Каліноўскага. Я размаўляў з прадстаўнікамі палка і запэўніваю, што беларусы ваююць добра. Да палка ёсьць давер з боку ЗСУ. Каліноўцы даказалі крывёй сваю годную справу па вызваленьні Украіны і ў будучым Беларусі ад ворага”, – працягнуў Зянон Пазьняк.*

На сёньня палітык стварае суполкі нацыянальна-вызвольнага руху “Вольная Беларусь”. Яны прадстаўлены найбольш у Польшчы, Летуве, але ёсьць і ў Нарвэгіі, Чэхіі, Нямеччыне, Каліфорніі і і ншых мейсцах.

Падчас імпрэзы былі паказаны ўрыўкі з фільма “На Чорных Лядах” па матывах аповесьці **Васіля Быкава** пра паўстанцаў-случчакоў. Таксама быў зачытаны Зварот **Івонкі Сурвіллы**, старшыні Рады БНР, **Натальляй Федарэнка**, старшынёй БАЗА. Спадарыня Івонка распавяла пра мэдаль “Пагоня”, якая будзе ўручацца за выбітныя заслугі перад Бацькаўшчынай тым беларусам, якія змагаюцца за яе волю і незалежнасьць.

**Віталь Зайка**, кіраўнік Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня” таксама ўспомніў добрым словам Вітаўта Кіпеля і заклікаў працягваць справу нашых папярэднікаў.

**Расціслаў Гарошка**, распавёў, што першы сьвятар Сабора Сьв. Кірылы Тураўскага быў слуцкі ваяр **Хведар Данілюк**. Спадар Гарошка зьяўляецца актыўным парафіянінам БАПЦ з 1949 года, а ягоныя бацькі былі фундатарамі Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью-Ёрку. Рукамі спадара Гарошкі зроблена шмат працы ў саборы, і ён працягвае займацца ёю, нягледзячы на паважны ўзрост.

Староста царквы, спадар **Аляксандр Хомчанка**, заклікаў прысутных ахвяраваць на дрон для палка Каліноўскага. Ён падзяліўся інфармацыяй, што частку грошай беларусы Амэрыкі ўжо ахвяравалі ў мінулую нядзелю. Але гэтага недастаткова, бо ён каштуе 12 тысяч даляраў. Таму збор працягваецца і ён папрасіў не быць абыякавымі да агульнай справы па барацьбе супраць ворага.

Таксама на царкоўным ганку Спадарыні **Людміла Хомчанка і Валянціна Бардакова** прадавалі украінскі хэнд мэйд. Жанчыны робяць гэта на працягу некалькіх месяцаў, каб падтрымаць ЗСУ.

Пасьля афіцыйнага івэнту ўсіх прысутных чакаў сьвяточны абед, прыгатаваны гасьціннымі беларускамі Нью-Ёрка. А пасьля яго была яшчэ неафіцыйная чатска – круглы стол, арганізаваны старшынёй Нью-Ёрксага адздела БАЗА **Аксанай Пятрашка.**

За ім **Галіна Пазьняк** узьняла пытаньне русіфікацыі Беларусі і стане мовы. Яна на вершах класікаў паказала прыгажосьць, тэмп, моц і каларыт беларускай мовы. Таксама спадарыня Галіна заклікала прысутных рабіць такія круглыя сталы часьцей і зьбірацца разам тэматычна.

Аляксандр Хомчанка за круглым сталом паказаў памятныя манеты, якія выпусьціў Белы Дом. На іх выгравіраваны надпіс **“Moskva Russian Warship go f**k yourselves”.** Гэта словы, якія былі сказаны ўкраінскім ваенным у адказ на запыт расейцаў на востраве Зьмяіны. Гэтыя манэты маюць лімітаваную сэрыю і карыстаюцца попытам у пакупнікоў “гіфт шопа” Белага Дома.

Беларусы Нью-Ёрка маглі яшчэ доўга паразмаўляць і падзяліцца ўласным досьведам выкарыстаньня мовы і прагнозамі на будучыню Беларусі. Размова закончылася цудоўным баршчом і салатам ад Галіны Пазьняк.









# ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЫЛКА ЗША

***З адкрытых крыніц падрыхтаваў Алесь Пазьняк***

**ЗША пабудавалі ўсю прамысловасьць СССР у XX стагодзьдзі**

**У школьных падручніках па гісторыі мы неаднойчы чыталі пра глябальныя посьпехі індустрыялізацыі ў СССР. Але ў іх нікoлі не пісалі, хто спрычыніўся да таго, каб гэтыя посьпехі сталі магчымымі. Дзякуючы ЗША фактычна СССР застаўся дзяржавай, атрымаў моц і стаў пагрозай для цывілазаванага сьвету. Лічбы і факты, якія прыводзяцца ніжэй ўражваюць і на застаўляюць без роздумаў.**

За 10 год амэрыканцы пабудавалі ў СССР каля 1500 заводаў і фабрык.

Усяго за 10 гадоў (1930-1940) амерыканцы стварылі ў СССР хімічную, авіяцыйную, электратэхнічную, нафтавую, горназдабыўную, вугальную, металургічную і іншую прамысловасьць.

Напрыклад, знакаміты Сталінградскі трактарны завод быў цалкам пабудаваны ў ЗША, на 100 судах перавезены і потым сабраны ў СССР. “Днепрагэс” пабудавала амерыканская фірма “Cooper Engineering Company” і германская кампанія “Siemens”. На гэтым заводзе стварылі першыя танкі. Горкаўскі аўтазавод (ГАЗ) быў пабудаваны амерыканскай кампаніяй “Austin”. Знакамітая Магнітка – дакладная копія металургічнага камбіната ў г. Гэры, штат Індыяна.

Фірма “Albert Kahn Inc” спраектавала і пабудавала 500 савецкіх прадпрыемстваў. Альберт Кан з’яўляўся індустрыяльным архітэктарам Дэтройта. Спраектаваўшы ўсе заводы Форда, ён адпрацаваў высокапрадукцыйную тэхналогію праектаваньня прамысловых прадпрыемстваў. У

ЗША яго фірма штатам у 400 чалавек працоўныя чарцяжы рыхтавала за тыдзень, карпусы прамысловых прадпрыемстваў узводзіла за пяць месяцаў. Кан змог практычна даказаць, што здольны зрабіць тое ж самае і ў СССР. Менавіта фірма “Albert Kahn Inc” стварыла ў СССР школу перадавога індустрыяльнага будаўніцтва.
Разам з заводамі ствараліся гарады для працоўных. Эрнст Май – нямецкі архітэктар удзельнічаў у распрацоўцы архітэктурных праектаў каля 20 савецкіх гарадоў.
У СССР прыехалі тысячы амерыканскіх інжынераў і тэхнікаў, якія кіравалі амаль мільённым войскам зьняволеных ГУЛАГа – плюс нешматлікія пакінутыя ў Расіі дарэвалюцыйныя кадры.
Натуральна, той факт, што заводы і фабрыкі ў СССР будуюць замежнікі, ніхто не афішаваў. Філіял кампаніі Альберта Кана ў Маскве насіў савецкую назву – “Дзяржпраектбуд”. У ім працавалі 25 амерыканскіх і 2,5 тысячы савецкіх інжынераў, якія вывучалі заходнюю навуку праектаваньня і будаўніцтва буйных прамысловых аб’ектаў.
Філіял нямецкай кампаніі “Demag” у Маскве таксама быў зашыфраваны і насіў назву Цэнтральнага бюро цяжкага машынабудавання.
Амерыканскія прафесары падрыхтавалі на рабфаках трыста тысяч кваліфікаваных спецыялістаў – гэта значыць усе кадры для Савецкай прамысловасьці на доўгія гады наперад! Такім чынам, матэрыяльную базу сацыялізму

пабудавалі ЗША плюс танная праца зэкаў.

Вынікі індустрыялізацыі ўражваюць. Многія прадпрыемствы да гэтага часу складаюць аснову расейскай прамысловасці. Да 1940 году па аб’ёме прамысловай прадукцыі СССР заняў другое месца ў сьвеце, саступаючы толькі ЗША. З дапамогай замежных інжынераў было падрыхтавана больш як 2000000 савецкіх спецыялістаў, якія асвоілі новыя тэхналогіі. І сталі займацца іх далейшым развіцьцём.
Адмыслова была створана легенда, што СССР сам правёў індустрыялізацыю. Каб назаўжды пакінуць індустрыялізацыю ў вачах народа як “беспрыкладны подзвіг вызваленага пралетарыяту, кіруемага партыяй бальшавікоў і геніяльным Сталіным”, генеральны сакратар расстраляў усіх, хто так ці інакш быў зьвязаны з закупкамі імпартнага абсталяваньня.
Сотні высакакласных інжынераў у канцы 30-х гадоў апынуліся “ворагамі народа” і “шкоднікамі”. Фактычна дзякуючы іх рабоце СССР змог падрыхтавацца да вайны з фашысцкай Германіяй. Але гісторыя аб’явіла героямі зусім іншых людзей.
Вось такія падзеі адбываліся амаль 100 год таму. Існуе такое меркаваньне розных дасьледчыкаў, што калі б не каласальная дапамога ЗША, то СССР як дзяржава не праіснаваў бы і 20 год. Развал гэтай дзяржавы быў адцягнуты Штатамі на вялікі гістарычны пэрыяд.
Але ЗША сталі для СССР, як працяга Расейскай імпэрыі, выратаваньнем. Пазьней гэта вылілася ў нянавісць, супрацьстаяньнне і ледзь не прывяло да ядзернай вайны. Вось такую падзяку ЗША атрымалі ад краіны, у якую ўклалі свае сродкі, магчымасці і веды. На сёньняшні дзень Расея вядзе велізарную вайну ва Украіне, зьнішчаючы гэты народ. Але ЗША ў гэтым выпадку дапамагаюць ужо Украіне. Хочацца спадзявацца, што гістарычная памылка ЗША пераасэнсаваная і разбурэньню Мордара яны толькі паспрыяюць.

# POLITICAL PRISONERS IN BELARUS




**Marlon Parker**

**US – Belarus**

The number of political prisoners in Belarus continues to grow. Every day human rights organizations receive information about new detainees. According to the data from the human rights center Viasna there are 1437 persons who are considered political prisoners in Belarus (as of 12/14/2022 https://prisoners.spring96.org/en).

Most of the arrests are made among those who were members of the community group chats. The witnesses state on their social media that the police arrested “literally the whole families”. And they warn the others to think twice before someone makes a decision to come to Belarus “for the upcoming Christmas and New Year holidays”.

The repressions in Belarus haven’t stopped for a day since the election campaign in August 2020. Most of the arrests were made during the protests or right after them. When the activists from the streets were imprisoned the secret forces started to look for new potential detainees on social media. People posted

thousands of their photos online and it didn’t take much to deduct and capture them. Also, many pictures of the protesters became available because they were posted in independent news media and TV reports.

The lack and negligence of security led to the fall of the “community chats”. These chats were created to coordinate protests and no doubt they were infiltrated by police and KGB.

Later these undercover special agents transferred all the data for future arrests. Access to some of the chats was gained after the detention and arrest of the activists. Sometimes police used torture to get passwords.

The opposition groups which started their activities out of Belarus are also responsible for a number of arrests. One of the initiatives called “Black Book of Belarus” was called to collect information about the police officers and other special agents connected to the repressions and tortures against Belarusians. But for some reason, an undercover police agent was able to work there for several months and even to manage the secret chats where people were sending personal data about the police and other officers. Only One year after the problem was disclosed, the responsible opposition persons admitted the failure and recommended to more than 10,000 people who had cooperated with the initiative to leave the country.

Things worsened a lot with the beginning of the Russian invasion of Ukraine. This war is extremely unpopular among Belarusians. Some of them formed underground groups and tried to attack the railway and communication infrastructure. The Belarusian authorities organized special operations to catch them. As a result, some of the activists were severely wounded and received enormous terms of imprisonment.

Last week Belarusian parliament introduced the death penalty for “State treason” – the measure widely used in Soviet times, especially during Stalin’s repressions.

Some of the opposition leaders claimed 2 years ago that these political prisoners “will not stay in custody for the full terms”. But in reality, we see that some of the detainees start to return back to normal life after the end of their terms, as do now the figurants of the “Student’s case”.

The regime claimed a couple of months ago that an amnesty would take place in Fall. But as of now – no one of the political prisoners has been released according to it.

The security forces in Belarus continue methodical repressions and the situation is not going to improve in the nearest future.



# БЕЛАРУСЫ НЬЮ-ЁРКА ВЫЦІНАЛІ ВАСЬМІКАНЦОВЫЯ “АЎСЫКЛІСЫ”



***Алесь Пазьняк***
***Здымкі: Алесь Пазьняк і Юры Эбер***

**“Беларуская выцінанка – гэта форма мысьленьня”, – кажа мастачка Вольга Бабурына-Палуніца.**
**Творца зрабіла незвычайную выставу ў Грамадзкай Залі Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью-Ёрку. Мастачка з Беларусі стварыла праект выцінанкі валадароў Вялікага Княства Літоўскага. Разам з тым, у нядзелю 18 сьнежня, яна правяла майстар-кляс для ўсіх прысутных і распавяла пра старадаўнюю гісторыю папяровай творчасьці на Беларусі.**
Займаецца выцінанкай Вольга Бабурына больш за 30 год. Мастачка каля 10 гадоў кіравала секцыяй выцінанкі Беларускага саюза майстроў народнай творчасьці. Брала ўдзел у праектах і выставах, дзе прадстаўляла Беларусь у міжнародных конкурсах. 3 гады назад Вольга ўступіла ў амэрыканскую гільдзію выразльшчыкаў з паперы. У гэтым годзе мастачка пераехала па палітычных матывах у ЗША.
*“Мая маці выразала прыгожыя сьняжынкі да Калядаў на вокны, на адзеньне. Таксама яна ўпрыгожвала старыя іконы, аздабляючы іх папяровымі кветкамі. У кветках яна таксама рабіла выцінанкі. На маім шляху таксама трапілася цудоўная выкладчыца з мастацкай дзіцячай школы з Маладэчна Вікторыя Мікітаўна Чырвонцава, якая паказала мне “азы” выцінанкі. Цяпер выцінанку на міжнародным узроўні прасоўваю я”,* – *распавяла пра сябе мастачка.*
Вольга стварыла ў Беларусі адзіны музэй выцінанкі ў Валожынскім раёне. А ўвогуле, па як словах, гэтаму мастацтву ў Беларусі больш за 1000 год. Таксама існуе такі музэй ў Польшчы, у Даніі, два музэі ва Украіне, адзін у ЗША ў Піцбургу.
*“Ужо вядома, што ў IX-XII стагодзях на тэрыторыі сучаснай Беларусі на адзеньні жанчыны выразалі дзірачкі, якія несьлі абярэжна-ахоўныя функцыі. У шляхэтным асяродзьдзі была традыцыя сілуэтнага выразаньня, якая*

*прыйшла з Заходняй Эўропы. Потым гэта перацякло ў народныя традыцыі. Выцінанка была пашыраная сярод габрэяў. у XVI стагодзьдзі пачалі рабіць сургучовыя пячаткі, над якія рабілі выразкі з паперы – кустодзіі. Гэта таксама выцінанка”, – коратка расказала для прысутных Вольга.*

Улетку 1951-га году прыехаў у ЗША і пасяліўся ў Брукліне япіскап Васіль Тамашчык і з прэстыжных і практычных прычынаў давялося шукаць больш адпаведнае за краму мейсца на архірэйскія адправы, а разам і на грамадзкія патрэбы.

З гэтай мэтай быў створаны камітэт куплі рэлігійна-грамадзкага будынку на чале з праф. М. Дарашэвічам і Данілам Клінцэвічам — скарбнікам.

Збор грошай, аднак, ішоў марудна, а пошук аб'екту яшчэ памалей. Тады япіскап Васіль выпадкова сустрэўшыся з сьвятаром карпатарускае парафіі з юрысдыкцыі Канстантынопальскага патрыярхату і дамовіўся служыць разам з ім у ягонай царкве на Іст 4-й вуліцы ў Мангатане.

Гэткім чынам з канца 1951-га, ціпачатку 1952-га году адправы нашай парафіі, ачоленыя ўладыкам Васілём, пачаліся ў Сьвята-Траецкай карпатарускай царкве, а таму, што ў ёй ўжо засталося вельмі мала вернікаў — старых украінскіх эмігрантаў, туды перанёсься й цэнтр беларускага грамадзкага жыцьця ў Нью Ёрку, а Беларуская Хатка была зачыненая.

Цяпер пару слоў пра парафіяльны хор. Праф. М.Куліковіч ўлетку 1951-га году адыйшоў ад кіраваньня хорам і гэтую справу пераняла Галіна Ганчарэнка, якая выявіла сябе таленавітым рэгентам нятолькі царкоўнага, але й сьвецкага хору, які з посьпехам выступаў на беларускіх і на міжнацыянальных імпрэзах.

Пасьля ейнага выязду на працу ў «Радыё Вызваленьне» ў Эўропу, кіраўніцтва хору абняў на доўгі час Андрэй Каптуровіч, хоць з перапынкамі.

У гэтых перапынках заступаў яго Міхась Тулейка, хто ўрэшце пераняў кіраваньне хорам настала й выдатна выконваў гэты абавязак праз шмат год.

Пасьля выязду Тулейка, хорам кіраваў Барыс Данілюк і часам Ларыса Курылла.

11-га красавіка 1952-га году парафія была інкарпараваная (зарэгістраваная). Але, з нястачы асобнага закону для беларускіх цэркваў, была інкарпараваная паводле артыкулу VIII-га правоў аб рэлігійных карпарацыях штату Нью Ёрк, што датычыць Украінскае Праваслаўнае Царквы. Гэта ня значыць, што яна стала часткай Украінскае Праваслаўнае Царквы, але прынятыя штатам рэгуляміны для Украінскае Царквы, датычылі й нас.

У 1954-м годзе былі першыя рэгулярныя выбары Парафіяльнае Рады й яе ачоліў інж. Мікола Гарошка. Стараньнямі гэтае Парафіяльнае Рады было пачатае выдаваньне «Голасу Царквы», быў надрукаваны першы насьценны каляндар і было зарганізаванае кожнагадовае абыходжаньне дамоў парафіянаў з вадохрышчанскай вадою.

Усталяваньне амаль нармальнага парафіяльнага жыцьця ў падсуседзстве ў карпатарускай царкве мела і адмоўны бок, збор грошай на свой будынак і ягоныя пошукі амаль спыніліся. І калі летам 1956-га году кіраўнік і фактычны ўласьнік царквы





наІст 4 й вуліцы, сьвятар Іван Фядына, памёр, ягоная сям'я спытала за будынак цану, на якую нашая парафія не магла здабыцца.

Ў выніку мы засталіся без памешканьня на адправы й толькі крыху пазьней знайшлі і пачалі нядзелямі наймаць залю ў пратэстанцкай Labor Temple на Іст 14-й вуліцы ў Мангатане.

Усё-ж, у гэтай крызыснай сытуацыі нашая грамада ўрэшт схамянулася й пасьля рээрганізацыі камітэту куплі рэлігійна-грамадзкага будынку збор грошай і пошукі аб'екту ўзмоцніліся.

Па нейкім часе, дзякуючы знаёмству Кастуся Мерляка з Кангрэсмэнам Дорнам гэтыя пошукі скончыліся пасьпяхова й у 1957-м годзе быў куплены будынак прэзьбітэрыянскае царквы пры 401 Atlantic Avenue ў Брукліне, дзе й цяпер месьціцца наш Сабор. [Пад знаёмствам з кангрэсмэнам Дорнам трэба разумець, што Мярляк даў кангрэсмэну грошы на перавыбары, зусім нармальная рэч. Сума была не малая, казалі $5,000, але затое кангрэсмэн сапраўды памог. Грошы былі добра выданыя.]

Гэты будынак быў у страшным стане, але каштаваў толькі $25,000. Заплаціўшы $11,000 і выдаўшы яшчэ некалькі тысячаў на новую страху, агравальную сыстэму й электрычную інсталяцыю, давялося сплачваць пазыку яшчэ 15 ці 20 год. Сьпіс ахвярадаўцаў на куплю будынку вісіць унізу на дошцы каля сходаў да царквы.

Ня маючы больш грошай, каб заплаціць за ўпарадкаваньне будынку, беларуская грамада ўзялася рабіць рамонты сваімі рукамі й дзякуючы ўспалу ахвярнасьці і дабраахвотнасьці, працягам некалькіх месяцаў давяла яго да годнага стану.

Працай кіраваў камітэт, старшыня якога, Янка Ніхаёнак, прысьвяціў шмат часу й собскіх выдаткаў на рамонт будынку. Ён выдатна выканаў ягоны абавязак, за што яму належыцца вялікая ўдзячнасьць. На гэткую удзячнасьць таксама заслугоўвае й нямала іншых парафіянаў і беларусаў зь Нью Ёрку і ваколіцаў, фактычна бальшыня тагачаснай беларускай грамады.

Іхняя ахвярная й натужная праца дала добры вынік і 3-га лістапада 1957-га году стала магчымым першы раз адправіць у будынку Сьв. Літургію. Гэты дзень азначае пачатак існаваньня Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага.

Уладжаньне будынку працягвалася. Напрыклад іканастас, паводле праекту Барыса Данілюка, выкананы рукамі Івана Чыгіровіча, а найбольш Пётры Мельяновіча, быў скончаны ажно на Вялікдзень 1959-га году.

Ня гледзячы на ход рамонтаў, здабыўшы даволі прасторнае памешканьне, парафіяльнае й грамадзкае жыцьцё, узварухнулася і неўзабаве стала вельмі актыўным.

Пад наглядам уладыкі Васіля, царкоўным жыцьцём займалася Парафіяльная Рада пад старшынствам Міхася Тулейка, а пазьней Івана Казьлякоўскага.

У 1960-м годзе ў саборы адбыўся ўстаноўчы зьезд Амэрыканскае Япархіі БАПЦ, а ў 1961-м Асамблея Штату Нью Ёрк прыняла Артыкул XVIII ты закону аб рэлігійных карпарацыях, які ўрэгуляваў праўнае становішча нашае Царквы ў ЗША і паводле якога Япархія зараз-жа была інкарпараваная.

У 1964-м годзе паводле гэтага закону была рэінкарпараваная й парафія Катэдральнага Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага. Грамадзкім жыцьцём кіравала Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Згуртаваньне Беларускае Моладзі, жаночая й вэтэранская арганізацыі.

Урадаваньне гэтых арганізацыяў і ўсе амаль ладжаныя імі нарады, зьезды й урачыстасьці адбываліся ў залі і канцылярыі рэлігійна-грамадзкага цэнтру, як у той час наш царкоўны будынак называўся і яшчэ так называецца сёньня.

Працавала сыботняя школа для дзяцей.

Пры ўсім гэтым уздыме й росквіце працы была занядбаная вельмі важная справа, гэта набыцьцё пры царкве жыльлёвага дому што можна было тады купіць за $5,000. За гэтую цану прадаваўся суседні дом, але грошай ня было. Выканчэньне падвалу потым часткова направіла гэтую памылку.

Такія былі пачаткі нашай парафіі. Азіраючыся ў мінулае можна сказаць, што канец 50 х – пачатак 60 х гадоў быў часам уздыму, актыўнасьці й асягненьняў беларускае эміграцкае калёніі тога часу ў Нью Ёрку, улучна з нашай парафіяй.

На канец, трэба зазначыць, што Парафія Катэдральнага Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне — гэта неадлучная частка гісторыі Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы. Яна, так як і ўся БАПЦ, мае асаблівую місію, сьвятую місію, высока трымаць факел з полымем веры нашых продкаў атрыманым на Саборы ў Менску і вярнуць яго назад у свабодную Беларусь.









# «БІЎ МАСКАЛЁЎ», «БЫЎ БОСТВАМ ДЛЯ НАРОДА». ЯК НАЙСЛАВУЦЕЙШЫ ВЫХАДЗЕЦ З БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ (НЕ) СТАЎ ДЫКТАТАРАМ



***Марыя Маляўка, Беларусь – Польшча***

**Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка — самая парадаксальная фігура беларускай гісторыі. Дзеяч сусветнага ўзроўню, малавядомы і не зразуметы на радзіме.**

Травень. Маёнтак Сасновіцы пад Люблінам. Стары занядбаны сад акрыўся зелянінай і ажыў, вечарамі заліваецца салавейка. Ды ўсё адно тут не зашкодзіла б усё добраўпарадкаваць, так сказаць, навесці ландшафтны дызайн.

Пан Юзаф Сасноўскі запрашае маладога шляхціца, што нядаўна вярнуўся з Парыжа, даваць урокі жывапісу сваім дачкам Людвіцы і Кацярыне. Сасноўскі — тытулярны ваявода Смаленскі. Гэта значыць, што тытул у яго ёсць, хоць ваяводства «адціснула» Масква.

Настаўнік выяўляецца дужа актыўным ды рознабаковым маладым чалавекам. Акрамя ўрокаў малявання ён узяўся за ўладкаванне парку, навёў дызайн адпаведна з перадавымі еўрапейскімі трэндамі: спраектаваў модную па тым часе зялёную альтанку, у якой усё больш і больш часу стаў праводзіць з чароўнай Людвікай…

Крыніцы разыходзяцца наконт таго, ці сватаўся Тадэвуш Касцюшка, ці не, ці выкрадаў Людвіку, ці не выкрадаў. Ёсць версія, што ў пошуках пратэкцыі ён распавёў аб сваіх пачуццях каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму, свайму земляку (апошні кароль Рэчы Паспалітай таксама быў родам з-пад Берасця). Але той якраз іпапярэдзіў бацьку Людвікі аб занадта настойлівым жаданні беднага шляхціца заваладаць магнацкай дачкой. Адна думка пра такі шлюб прыводзіла Сасноўскага ў лютасць. Да таго ж усё было вырашана: у выніку выйгрышу ў карты ды перадзелу маёмасці Людвіка павінна была стаць жонкай князя Станіслава Любамірскага. Так ці інакш Касцюшку было забаронена з’яўляцца ў Сасновіцах.

Не маючы занятку на радзіме і асаблівага даходу ад родных Сяхновічаў, ён накіроўваецца ў Амерыку. Наводзіць дызайн фартыфікацыйных збудаванняў для галоднай і босай рэспубліканскай арміі, што ваюе за незалежнасць ад Англіі.

Людвіка напіша яму за акіян праз некалькі гадоў, знаходзячыся ў шлюбе з Любамірскім: «Думкай я імкнулася да цябе, і толькі маё цела я аддала князю. Гэта я мовіла яму перад вянчаннем, а табе, Тадэвуш, кажу пасля вяселля і хачу цябе запэўніць, што сэрцам я заўсёды і да труны твая». І яна сапраўды будзе кахаць яго да канца дзён і шукаць сустрэчы, калі ён вернецца са сваёй амерыканскай славай. Апошні раз яны ўбачацца пасля паўстання, калі ён будзе ехаць у абозе ў расейскі палон. Сустрэча будзе доўжыцца тры хвіліны. Лежачы з прабітым казацкай шашкай чэрапам, ён так і не прыйдзе да свядомасці.

**«Швед» з-пад Берасця**

У кадэцкім корпусе было прывабліва славіцца забіякам. Тут міжволі «каваліся кадры» для будучага паўстання. Тадэвуш трапляе ў прэстыжную вайсковую навучальную ўстанову Варшавы дзякуючы пратэкцыі князя Адама Чартарыйскага. Род Касцюшкаў, нягледзячы на сваяцтва з каралеўскай дынастыяй Ягелонаў, бедны. Прапрадзед Канстанцін служыў пісарам у вялікакняжацкай канцылярыі Жыгімонта Старога, які ласкава зваў яго Касцюша. Адсюль і звонкае прозвішча. І адсюль жа — маёнтак Сяхновічы (сённяшні Жабінкаўскі раён). Лічыцца, што Тадэвуш Касцюшка нарадзіўся 4 лютага 1745 года, хоць датанедакладная. наконт месца нараджэння таксама ёсць спрэчкі — Сяхновічы ці маёнтак Марачоўшчына каля мястэчка Косава (цяпер у Івацэвіцкім раёне). У любым выпадку — «нарадзіўся ліцвінам», як сам пра сябе казаў.

Сярод кадэтаў Тадэвуш набывае рэпутацыю выдатнага таварыша, і адначасова сяброў уражваюць ягоная не па гадах высокая мэтанакіраванасць і аскетызм. Ён падымаецца ў чатыры і, каб прагнаць сон, апускае ногі ў таз з ледзяной вадой па прыкладзе Карла XII. За што атрымоўвае мянушку Швед.

Парыж стае магчымым праз поспехі ў вучобе і атрыманую стыпендыю. Ёсць жаданне ўдасканальваць вайсковую навуку. Але афіцыйна чужынцы не маюць на гэта права, таму прыкрыццём стае Акадэмія жывапісу і мастацтваў. Зрэшты, і ў жывапісе Касцюшка выяўляе немалы талент. Кажуць, займіся ён гэтым сур’ёзна, і ягоны лёс мог бы быць іншы. Аднак пра скрыжаванні лёсу казаць пакуль рана.

**Палескае каханне**

Першае вяртанне на радзіму — пасля Парыжа — яшчэ абяцала радасныя надзеі. Чаму сведчанне — гісторыя з Людвікай. Другое — пасля дзевяці гадоў у Амерыцы — навалілася ўсім цяжарам безнадзейнасці. Сяхновічы канчаткова прыйшлі ў заняпад і абраслі даўгамі. Рэзка акрэсліўся кантраст паміж убачаным «там» — вольнымі народамі, што адваявалі сваю дэмакратыю, — і феадальным застоем ды забітасцю тут. То быў адкат у мінулае. Між тым справа ішла да другога падзелу Рэчы Паспалітай.

Некалькі гадоў Тадэвуш займаецца гаспадаркай, намагаецца зрабіць у родавым маёнтку маленькую рэвалюцыю і зрушыць яго з феадальных рэек. Ён палягчае павіннасці сялянаў. Але гаспадарчыя справы, загнаныя ў кут старэйшым братам Юзафам, ніяк не ідуць да ладу.

У 1789 годзе Касцюшка атрымоўвае пасаду камандзіра брыгады ў польскім войску. Служыць у войску ВКЛ — недасяжная мара. Аднойчы, калі ягоная брыгада знаходзіцца ў Заходняй Украіне, ён сустракае ў старажытным мястэчку Меджыбож 17-гадовую Тэклю Журоўскую. Яна — дачка берасцейскага харунжага, што вывез сям’ю на адпачынак ды лячэнне. І другі раз — у 44 гады — Тадэвуш паддаецца надзеі здабыць сямейнае шчасце. Магчыма, гэта апошняя спроба пераламіць лёс ці забыць напалам расколатае каханне да Людвікі.

Але ў бацькі дзяўчыны, хоць ён і небагаты, амбіцый не менш, чым у Сасноўскага. Заслугі жаніха перад амерыканскай рэспублікай не залічваюцца. Наадварот, яны дадаюць абурэння: «Гойсаў па Амерыцы, як татарын па стэпе, нічога не прыдбаў». І зноў нязгода бацькі стае трагедыяй для дамы: Тэкля ўпадае ў адчай і потым да канца жыцця носіць медальён з выявай каханага. Па іншай версіі, справе перашкодзіла тое, што ў генерала закахалася маці нявесты.

**Перад навальніцай**

У чэрвені 1792 года ў Рэч Паспалітую ўваходзіць 100-тысячнае расейскае войска, заклікана прарасейскай Таргавіцкай канфедэрацыяй. На чале аднаго з карпусоў — магнат Сымон Касакоўскі, што знаходзіцца на расейскай службе. Кароткая інтэрвенцыя доўжыцца два месяцы.

Касцюшка не прайграе ніводнай бітвы супраць праўзыходных сіл Расейскай Імперыі. Тым больш яго шакуе загад караля скласці зброю. Панятоўскі вымушана прыяднноўваецца да таргавічанаў і і спыняе ўсялякую барацьбу. Канстытуцыя, абвешчаная 3 траўня 1791 года, фактычна скасаваная.

На прыяднаных да Расеі тэрыторыях зачытваецца ў цэрквах і касцёлах маніфест, дзе маляўніча апісваецца, як доўга імператрыца спачувальна назірала за «неустройствами и насилиями, происшедшими из раздоров и несогласий, непрестанно республику Польскую терзающих», і як клопат пра добрае для суседзяў вымушае яе вялікасць прыняць «участие в делах польских». Выказваецца заклапчанасць з нагоды прыгнёту прававерных падданых імператрыцы з боку «недостойных поляков».

Выходзіць на арэну і тагачасны міф пра «фашыстаў» — тлятворны подых Французскай рэвалюцыі ды якабінскі дух, што пагражаюць духоўным «скрэпам» праваслаўнай веры.

Касакоўскі прымае тытул польнага гетмана Літоўскага, ігнаруючы той факт, што пасада скасаваная канстытуцыяй, дэманстратыўна носіць расейскі мундзір. Ён стае самаўладным кіраўніком краіны, хутка ўзбагачае свой клан. Расейскія войскі прысутныя паўсюль, а паборы на пастой ды марадзёрства вядуць да таго, што «ветлівыя людзі» выклікаюць усё болей прыхаванага абурэння. Іхныя «подзвігі» ўвайшлі ў тую самую народную песню, што вядомая як гімн касінераў.

Коней нам пазаязджалі.
Што хацелі, то і бралі.
Пойдзем жыва да Касцюшкі,
Рубаць будзем маскалюшкі.

**Гарматны стрэл**

Кажучы пра мэты паўстання і няпростыя стасункі Касцюшкі як «Вярхоўнага начальніка» з «якабінцам» Якубам Ясінскім як лідарам у ВКЛ, звычайна акцэнтуюць увагу на нацыянальных інтарэсах, забываючыся, што паўстанне было спробай рэвалюцыі, звязанай з падзеямі ў Францыі і Амерыцы. Гэта стала відавочна пасля ўзорна-паказальнага пакарання смерцю Сымона Касакоўскага адразу пасля захопу паўстанцамі Вільні.

У лепшых традыцыях Французскай рэвалюцыі асуджанага прывезлі на Ратушную плошчу пад бой барабанаў. У цішыні перад натоўпам зачыталі прысуд. Касакоўскі адправіўся на шыбеніцу ў жоўтым хатнім халаце, у якім яго захапілі ўначы за два дні да таго. Хоць самапрагалошаны гетман і прадчуваў грозныя падзеі, і прыкладаў ліхаманкавыя намаганні, каб іх прадухіліць, ягоны дом паўстанцы ўзялі амаль без супраціву. Варта ўжо была ў спісах паўстанцаў.

Смерць Касакоўскага не абудзіла спачування да яго, аднак усім было зразумела, чыя фігура стаіць за гэтай публічнай дзеяй. Ясінскі мінуў кропку незвароту, калі абвесціў патрабаванне: кожны, незалежна ад думкі, мусіць маўчаць аб гэтым пакаранні пад пагрозай гэткай жа смерці. Да таго ж 33-гадовы палкоўнік адкрыта і палка падтрымліваў ідэі Французскай рэвалюцыі ў радыкальным варыянце.

Касцюшка яшчэ на этапе падрыхтоўкі быў прызначаны Вярхоўным начальнікам паўстання і яго дыктатарам. Так любілі называць у той час людзей, што надзяляліся надзвычайнай уладай у надзвычайны момант; іранічна, што гэтае званне дасталася Касцюшку, хоць у нашым разуменні больш пасавала б Касакоўскаму ці, напрыклад, Сувораву.

Касцюшка звазіў у Парыж радыкальны план абноўлены і пераўтворанай Рэчы Паспалітай у спадзеве атрымаць дапамогу. Францыя дэкларавала гатоўнасць падтрымліваць рэвалюцыйны рух у іншых краінах. Але справа не прасунулася далей за агульныя абяцанні. Будучым паўстанцам даводзілася разлічваць толькі на сябе. Ды й небяспечна было заяўляць пра сувязі з рэвалюцыйнай Францыяй, каб не згуртаваць вакол сябе манархічныя дзяржавы Еўропы. Праграма стала не такой радыкальнай.

Абвяшчаючы, што не будзе змагацца «за адну шляхту», Касцюшка шукаў шлях да аб’яднання супярэчлівых інтарэсаў.

Ці здавалася магчымым знайсці варыянт, каб паўстанне магло перамагчы? Вайсковы досвед генерала напэўна прымушаў яго трымаць у галаве не толькі тыя часткі расейскіх войскаў, што размяшчаліся ў краіне і былі параўнальныя па колькасці з польска-літоўскім войскам ды шэрагамі паўстанцаў, але і шматтысячную моц, што пазней насунецца з прастораў Імперыі пад кіраўніцтвам Ферзена і Суворава. Апошні ўжо даўно ірваўся «в Польшу», з якой, на ягоную думку, ён разабраўся б за 40 дзён.

**«Быў гразой для ворагаў і боствам для народа»**

Атрады касінераў згралі важную ролю ў першай перамозе Касцюшкі пад Рацлавіцамі — яшчэ да пачатку паўстання ў Літве. У адказ адразу ж пачалася інфармацыйная вайна: расейскі пасол Ігельстром дакладваў у Пецярбург, што Касцюшка камандуе «сволочью, вооруженной копьями и топорами, в пьяном виде».

Імя Касцюшкі мела магічны ўплыў на народ. Нягледзячы на тое, што літоўскае крыло паўстання імкнулася час ад часу адасобіцца ад цэнтральнага

кіраўніцтва ў Варшаве. Менавіта Касцюшка, а не хтосьці з мясцовых лідараў,
стаў героем міфаў. Пра яго складаліся легенды, напрыклад: «Кажуць, што ў Касцюшкі то быў такі плашч, што кулі яго не прабівалі: аднаго разу маскалі на яго знячэўку напалі, так ён не паспеў таго плашча злажыць, так яго чыста пасеклі і забралі». Як уласціва міфам, параза тлумачыцца драматычнай выпадковасцю. Мабыць, нават у Напалеона не было такога падоранага народнай любоўю непрабівальнага плашча.

Пра яго спявалі народныя песні. Па версіі адной з іх Касцюшка загінуў у бітве:

Вазьмі, маці, пяску жменю,
Пасей на каменю.
Калі той пясок узыдзе,
Касцюшка з вайны прыйдзе.
Ляціць воран цераз мора,
А лятучы, крача.
А хто ж майго Касцюшачкі
Магілку аплача.

Народная свядомасць надзяляла гэтага чалавека неабмежаванай сілай: «Касцюшка зваяваў бы свет цэлы, каб паны яго слухаць хацелі». Міхал Клеафас Агінскі казаў пра яго: «...Карыстаўся вялікай пашанай усёй Эўропы, быў гразой для ворагаў і боствам для народа; узвышаны да рангу Начальніка, не ведаў іншага гонару, як служыць Айчыне і змагацца за яе, заўсёды сціпла сябе паводзіў..., не насіў ніякіх знакаў вышэйшай улады, хадзіў у сурдуце з простага шэрага сукна і сталаваўся так, як звычайны афіцэр».

Магчыма, у тое лета барацьбы і спадзяванняў міфатворчасць запалала асабліва яскрава. Аднак лета змянілася восенню незлічоных стратаў. Задушыўшы паўстанне, імперская адміністрацыя вытраціла багата сілаў, каб сцерці вобраз героя з народнай свядомасці. І ў яе гэта атрымалася. У выніку Касцюшка, уганараваны па ўсім свеце, катастрафічна недаацэнены сваімі землякамі сённяшняга часу.

Аб вызваленні Касцюшкі з расейскага палону таксама ёсць легенда: нібыта ён перад тым, як прынесці прысягу імператару Паўлу, здабыў зямлі з Літвы і насыпаў у боты. І абвесціў, што клянецца служыць зямлі, на якой стаіць.

**Скрыжаванне лёсу**

Са звестак аб апошніх спробах Касцюшкі ўдзельнічаць у міжнароднай палітыцы мы ведаем, што ён не паладзіў з Напалеонам. Яму не імпанавала неабмежаваная ўлада ў руках аднаго чалавека і вяртанне да манархіі. І тут паўстае самае цікавае пытанне: а ці была ў яго самога магчымасць сабраць у сваіх руках неабмежаваную ўладу, як гэта рабілі рэвалюцыйныя лідары? І калі так, то ці мог быць іншым зыход паўстання? Ці ўдалося б згуртаваць разрозненыя групы і дабіцца перамогі ў краіне, хаця б ненадоўга? Ці было б гэта апраўданым?

Адказаць на гэтыя пытанні мы не можам, аднак ясна тое, што ён не зрабіў спробаў выкарыстаць народную пашану для зацвярджэння асабістай улады. Магчыма, гэта самы важны жыццёвы выбар, які дае ключык да разумення асобы генерала Тадэвуша Касцюшкі.

Ён правёў апошнія гады ў швейцарскім Залатурне. Людвіка Сасноўская пасля смерці мужа парывалася прыехаць да яго — але не паспела. Падобна, што яна так і не зразумела: і травень, і стары парк з салаўямі, і ўвесь папярэдні свет сышлі незваротна.

А Юзаф Сасноўскі застаўся вядомы ў гісторыі толькі сваёй фразай: «Галубкі не для вераб’ёў, а дочкі магнатаў не для бедных шляхцюкоў». Што ж, у кожнага свае дасягненні.

---

# ДЗЬВЕ ПАДЗЕІ АДЗНАЧАЛІ Ў БЕЛАРУСКІМ ЦЭНТРЫ Ў БРУКЛІНЕ І САБРАЛІ ПАДТРЫМКУ ВАЯРАМ



*Алесь Пазьняк*
*Здымкі аўтара*

**Адразу дзве падзеі адзначылі ў беларускім цэнтры ў Брукліне ў нядзелю 5 лютага. “Зубр” паваеннай эміграцыі, 97-гадовы Анатоль Занковіч прэзентаваў кнігу уласных успамінаў “Лёс беларуса: паміж Эўропай і Амэрыкай”.**

**А таксама адбылося ўшанаваньне 160-ых угодкаў паўстаньня Кастуся Каліноўскага.**

**Лёс беларуса**

Анатоль Занковіч прыйшоў на імпрэзу сваёй кнігі разам з дачкой і трыма ўнукамі, якія ведаюць пра Беларусь па расповедах свайго дзядулі.

Біяграфія спадара Анатоля цікавая для даследчыкаў ваенных падзей ў Эўропе ў 1940-ыя гады, бо нягледзячы на дасьледаванасьць, тыя гады яшчэ застаўляюць шмат цёмных плямаў, невядомых, альбо малавядомых дасьледчыкам.

Пра Анатоля Занковіча грунтоўна распавяла Ганна Сурмач, рэдактар газэты “Беларус”. Яна прадставіла аўтара ўспамінаў, як апошняга, хто яшчэ можа штосьці распавесьці пра ваенныя часы ў Эўропе.

Анатоль Занковіч прыйшоў на сьвет у 1925 годзе ў сям’і сялянаў на Вілейшчыне, што ў той час была часткай польскай дзяржавы. Таму ў ягоных успамінах ёсьць і пра гэты пэрыяд, а таксама пра ўсталяваньне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Але значная частка ўспамінаў Занковіча прысьвечаная жыццю пад нямецкай акупацыяй.

Цікава, што ў 1944 годзе аўтар праходзіў навучаньне ў Менскай афіцэрскай школе Беларускай краёвай абароны. Потым ён апынуўся ў шэрагах войска Андрэя Уласава ў Расейскай вызвольнай арміі (РОА). Ён адзначае, што значную частку ўласаўцаў складалі беларусы, але пра тое вельмі мала ўзгадак. Навукоўцы амаль не ведаюць пра гэты факт.

Пасьля вайны былі часы вучобы ў еўрапейскіх універсітэтах, дзе спадар Анатоль набыў сьпецыяльнасьць хірурга. У Бельгіі ён пазнаёміўся з будучай жонкай Матыльдай. У 1958 годзе сям’я перабралася ў ЗША.

Год таму ўспаміны Анатоля Занковіча ўбачылі сьвет на ангельскай мове. У гэтым годзе на беларускай.

*“Я хацеў данесьці старонкі свайго жыцьця сваім нашчадкам – дзецям, унукам і праўнукам. Там не толькі мой лёс, але і лёс нашай Бацькаўшчыны – Беларусі. Яе пакуты і яе выпрабаваньні”, – сказаў на імпрэзе аўтар кнігі.*

Спадар Анатоль бацька трох дачок: Ан-Мары, Наташы і Ніны. Ён браў актыўны ўдзел у жыцьці беларускай грамады ў Чыкага. Там жа ён зрабіў выдатную кар’еру медыка – хірурга.

Пасьля выступленьня Анатоля, тыя хто ўжо прачытаў ягоную кнігу, дзяліліся ўражаньнямі і рознымі момантамі з прачытанага. Таксама кожны мог задаць аўтару пытаньне і атрымаць адказ, а таксама набыць і падпісаць у аўтара ягоны твор.

Пасьля прэзентацыі ўсіх чакаў смачны абед, падчас якога можна было паразмаўляць і ўбачыць старых знаёмых.

**Постаць Кастуся**

У час абеду прысутныя маглі ўбачыць таксама кадры з перапахаваньня Кастуся Каліноўскага ў Вільні ў 2019 годзе.

Другую частку імпрэзы адкрыла старшыня BAZA Натальля Федарэнка.

Пасьля прагучаў выступ Алеся Пазьняка пра прынцыпы нацыянальнай ідэі Кастуся Каліноўскага паводле ягоных “Лістоў з-пад шыбеніцы”. Было агучана 10 тэзісаў, якія базуюцца на тэксце твораў Каліноўскага, якія выразна адлюстроўваюць ягоныя пагляды на Літву – Беларусь і яе становішча ў сучасным і ў будучым.

*“Постаць Каліноўскага з’яўляецца зоркай, якая ўказвае накірунак у сёньняшнім змаганьні за вольную Беларусь. І гэтая зорка сьвеціць ў цёмнай начы сёньня, якая апусьцілася на Беларусь”, – сказаў Алесь.*

Другі выступовец Міхал Чаропка выступіў з дакладам “Спадчына Кастуся Каліноўскага”. Спадар Міхал зьвярнуў увагу на тое, што і па сёньняшні дзень постаць змагара за свабоду не дае супакою акупацыйным уладам у Беларусі.

*“Я помню той час, калі на два тыдні Кастрычніцкая плошча ў Менску была празвана пратэстоўцамі і народам плошчай Каліноўскага. На жаль, плошча ў 2006 годзе доўга не пратрымалася”, – зазначыў актывіст.*

**Кансалідацыя на справе**

Спадар Аляксандр Хомчанка, стараста царквы Сьв. Кірылы Тураўскага (БАПЦ), распавёў пра сітуацыю з беларускімі дабраахвотнікамі ва Украіне. А ў прыватнасьці пра параненага Паўла Шурмея і ягоных пабрацімаў. Ён паказаў здымак, дзе Павел сфатаграфаны ў шпіталі пасьля аськепачнага раненьня ў баі.

Пасьля Аляксандр Хомчанка аб’явіў збор сродкаў на дапамогу, лячэньне і рэабілітацыю вяроў. У выніку было сабрана больш за тры тысячы даляраў. Сродкі ў хуткім часе будуць накіраваны ва Украіну.

*“Нам патрэбна кансалідацыя і падтрымка адзін аднаго. Мы павінны памятаць пра тых, хто ваюе за Украіну ад вольнай Беларусі і яднацца вакол нашых нацыянальных сымбаляў”, – прамовіў Аляксандр.*

Скончыла імпрэзу старшыня Бруклінскага аддзелу BAZA Аксана Пятрашка, якая запрасіла прысутных зрабіць агульны здымак і ўскласьці кветкі да помнікаў Тадэвуша Касьцюшкі і Кастуся Каліноўскага.

На вуліцы было цудоўнае надвор’е, таму прысутныя яшчэ доўга стаялі звонку і вялі размовы. У гэты час на падворку царквы Сьв. Кірылы Тураўскага спадарыні Людміла Хомчанка і Валянціна Бардакова прадавалі ўкраінскі хэнд мэйд. Усе атрыманыя сродкі жанчыны перасылаюць на дапамогу ЗСУ.








# ЯК БЕЛАРУСЫ ГУКАЛІ ВЯСНУ НА БЕРАГАГ ГУДЗОНА



















***Алесь Пазьняк***
***Здымкі аўтара***

**У суботу, 18 лютага, рыбацкі дом Оссінінга, што ў Нью-Джэрзі, на ўзбярэжжы ракі Гудзон, гасьцінна адчыніў дзверы. Менавіта сюды к 12 гадзінам дня сьцякалася з розных абшараў беларуская грамада, каб прыняць удзел у абрадавым сьвяце «Гуканьне вясны».**

«Гуканьне вясны» – гэта адзін з самых жыцьцярадасных і аптымістычных старадаўніх беларускіх звычаяў. Бо ў гэты час зіма ўжо адыходзіць, а на зьмену ёй крочыць буйнымі крокамі прыгажуня-вясна. Каб паскорыць яе прыход і ладзіцца народнае сьвята, якое мае аўтэнтычны назоў дадзены нашымі прашчурамі – “Гуканьне вясны”.

Апошні раз беларусы зьбіраліся ў гэтых мясьцінах амаль тры гады таму. Быў неспрыяльны час, выкліканы пандэміяй каранавірусу. Але ў гэтым годзе для правядзеньня фэста на Гудзоне былі ўсе нагоды і ўмовы.

Арганізатармі сьвяткаваньня выступіла суполка ў Фэйсбуку *«Беларусы ЗША. Разам лягчэй»*, а таксама Пётр і Алена Рыжыя.

Пачалося мерапрыемства са смачнага пачастунка ў рыбацкім доме, дзе гасьцей чакаў разнастайны стол. Тут пяклі бліны, варылі пюрэ, кашу і кампот. А таксама прапаноўвалі мясныя стравы і салаты.

Пасьля абеду адбыўся непасрэдна сьвяточны абрад у парку на беразе ракі.

«Гуканне вясны» – сьвята вельмі музычнае. Зваць вясну пачынаюць дзяўчаты. Яны засьпявалі песьні-вясьнянкі. Асаблівасцю такіх песень з’яўляецца тое, што кожны куплет заканчваецца гучнымкрыкам “Гу-у-у-у!”. Адсюль і назва – “гуканьне”.

Алена Рыжая, Ганна Шарко і Ганна Губянкова вялі беларускую грамаду ў абрадавым сьпеве:

*«Благаславі Божа*
*Прачыстая маці*
*Вясну гукаці*
*Зіму замыкаці*
*Лета у карэце*
*Зіма у вазочку*
*Па белым сьняжочку».*

Працягнулася мерапрыемства карагодамі, конкурсамі, гульнямі, перацягваньнем канату, сьмешнымі забаўкамі.

Грамада запытвала ў вясны:

*«Ой, вясна ты красна,*
*Што ты нам прынясла?*
*Можа масла брусок?*
*Можа сыру кусок?*
*Можа сала шматок?*
*Можа бульбы мяшок?»*

Сьвяточны карагод прыцягнуў ўвагу амэрыканцаў, якія рабалі шпацыр уздоўж ракі. Некаторыя з іх спыняліся і пыталіся, што за гэта за мерапрыемства. Адзін з такіх, 75-гадовы Джон, распавёў, што ягоны дзядуля быў з Валожына. Але бацька ўжо быў народжаны ў ЗША. Сам ён па адукацыі хімік і ўсё жыцьцё прапрацаваў у буйной фармакалягічнай кампаніі. Пра Беларусь, акрамя назвы Валожын, ён больш нічога не ведае. Але генетычны код адазваўся ў ім і ён стаў адным з удзельнікаў беларускага фэста.

Трэба сказаць, што арганізатары паруліліся аб упрыгожваньні пляцоўкі ля рыбацкага дома. Паўсюль былі рознакаляровыя самаробныя птушкі, сплеценыя з саломы і абматаныя беларускімі колерамі і нацыянальнымі сымбалямі. Разам з амэрыканскім, вісеў нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг.

Нашы продкі вывешалі дэкаратыўных птушак перад сьвятам звонку дамоў, бо лічылася, што так птушкі якія адляцелі на поўдзень хутчэйзаўважаць адваротны шлях дадому. Упрыгожвалі таксама дрэвы ў садзе, дамы, гаспадарчыя пабудовы. Лічылася, што калі птушкі абяруць чыйсьці дом, то там будзе шчасце і дастатак. Акрамя таго яркія стужкі на дрэвах абазначалі красаваньне. Нашы продкі думалі, што дрэвы заразяцца весялосьцю і яркасцю стужкі і хутчэй зазелянеюць.

Таксама адметнасьцю сьвята на Гудзоне стала лялька – вядзьмарка Марэна, якой сымбалічна перадалі ўсе негатыўныя думкі. Спаленьне лялькі плянуецца пазьней, на Купальле летам.

Працягнулася мерапрыемства за кавай ў рыбацкім доме, дзе можна было пад кіраўніцтвам Пятра Рыжага сплесьці сабе ваўняны пояс на адмысловым старадаўнім станку. А таксама паслухаць беларускую музыку, паразмаўляць і атрымаць новыя знаёмствы.

Віталь Зайка раздаў жадаючым беларускія перакідныя календары ад суполкі «Пагоня». У кніжнай краме «Літарка» можна было набыць кнігі беларускіх аўтараў, бел-чырвона-белыя вязаныя шапкі, шалікі і іншыя рэчы.

Ніхто з прыехаўшых на мерапрыемства ў рыбацкі дом Оссінінга не пашкадаваў аб гэтым. Выходная субота атрымалася насычанай і зьмястоўнай. А вясна павінна хутка атрымаць сваю ўладу і ўвайсьці ў жыцьцядаўчую моц.



# ВЕТРАМОВЫ




***Марына Кражова***

*Малюнак* ***Сяржук Сай****; шрыфт з “****Наша Назва****”, аўтар* ***Алесь****.*

**Да Дню Матчынай Мовы**

Адным з асноўных інструментаў і, адначасна, рухавіком чалавечай эвалюцыі з’яўляецца мова. Мова дазваляе людзям разнасцежыць дзверы фантазіі і (ствараючы наватворы, метафары,аднаўляючы архаізмы, ужываючы дыялектызмы) супрацоўнічаць і штурхаць чалавецтва наперад.

Мова – гэта таксама мастацтва, а перафразоўваючы Эрыка Хофера, мастацтва ачалавечвае за конт таго, што мастак несупынна павінен намацваць і адчуваць накірунак свайго шляху, бо не існуе шаблону, які можна выкарыстоўваць адвечна, у любыя часы, з рознымі аўдыторыямі.

Чалавек і мова/мова і чалавек – гэта працэс, які не можна засвоіць, але ў якім можна прымацаь актыўны ўдзел, таму, ў цудоўны Дзень Матчынай Мовы, хочацца ўзгадаць “Ветрамоваў” (Windtalkers) – сакрэтную зброю ЗША падчас Другой Сусветнай Вайны.

У той складаны перыяд, некаторыя чальцы японскай выведкі былі даволі дасведчанымі гульцамі канфлікту з-за атрыманай у Амерыцы адукацыі. Яны не пакуталі ад перашкоды у перахопе і расшыфроўцы паведамленняў паміж супернікамі, таму ваяваць з Японіяй, выкарыстоўваючы ангельскую мову, стала бессэнсоўна і небяспечна. Паўстала нагодадля стварэння новай сістэмы кадавання, на якую не было ні часу ні сродкаў, і на сцэну міжнародных падзей заступілі ваяры індыянскага племені Наваха.

Толькі ўявіце сабе збянтэжанасць “перахопшчыкаў”, якія ўпершыню сутыкнуліся з кодам, што ніяк не прычэпліваўся да індаеўрапейскіх правіл, не адгукаўся з вядомым раней вымаўленнем, націскамі і інтанацыямі.

Наіснасць кода рассакрэцілі толькі ў 1968 годзе, але лінгвістычны цуд адбыўся значна глыбей – людзі, якія ўжывалі ад нараджэння мову Наваха, не заўсёды маглі зразумець Ветрамоваў. За час працы, ваяры стварылі слоўнік з 600 дадатковымі кодавымі словамі ад неабходнасці называць рэчы, якіх не магло існаваць у арыгінальным слоўніку (субмарына, авіябомба ды іншая вайсковая (і не толькі) тэрміналогія).

Прыклад Наваха яскрава ілюструе існаванне і важнасць падводных муроў, якія трымаюць на сабе саму мову. Словы і сказы без падводнай часціны ледагора не абавязкова ўспрымаецца слухачамі ў аднолькавым сэнсавым, канцэптуальным значанні.

Напрыклад, задумайцеся, як бы вы дакладна пераклалі на ангельскую мову састарэлае слова “чэрнь” у дачыненні да пэўнай сацыяльнай класы? Этымалагічныя слоўнікі выдаюць, што з старaславянскай ***чьрнь*** з’яўляецца эквівалентам сучаснаму слову “***чорны***”, але ці ж гэта “***black***” у сучасным кантэксце? Тое ж самае і з болей звыклымі, штодзённымі словамі: адзін кажа “свет” і ўяўляе сабе кампаненты ўсёй планеты і космас, іншы, слухаючы слова “свет” думае пра палітычную сетку прывелігаванай меншасці, якой падпарадкоўваюцца і жучкі і павучкі, а трэці ўспрымае “свет” як творчасць пэўнага Бога. Шматлікія філосафы (напрыклад, Людвіг Вітгенштейн (1889-1951)) сцвярджалі, што калі б у нас усіх было аднолькавае ўспрыманне і разуменне такіх слоў як праўда, справядлівасць, гонар, свабода – мы б жылі ў лепшым свеце. На сёння такой опцыі няма, таму падводныя кампанент ы моўнага ледагора адыгрываюць крытычную ролю ў фармаванні думак.

Згодна з гэтым, мова без агульнай культуры, каштоўнасцей, каапераций становіцца штучнай, статычнай і, у вынятку, дэкаратыўнай, неабавязковай. Дэкаратыўная мова не можа быць зброяй.

Сёння, мы чуем і дзівімся, як часам жывая мова дапамагае ўкраінскім ваярам. Насамрэч, так ужо неадноўчы было і так будзе заўсёды. Нягледзячы на развіццё тэхналогій і Штучнага Інтэлекту свет заўсёды прыхоўвае сакрэтную карту – мову, якую могуць разумець адзінкі і тое, што іх адзінкі не робіць іх слабейшымі. З-за адсутнасці шаблонаў і сусветных правіл, кожны мае права рабіць выбар і ці то заставацца ў полі заклішаваных і навязаных прынцыпаў «Один в поле не воин», ці то жыць у бязмежнай прасторы альтэрнатыўных меркаванняў з уласна абранай опцыяй, як да прыкладу – “Адзін ды ладзін” (Вушацкі словазбор Рыгора Бар адуліна).

# ПАЛЯШУК БАЧЫЎ ТЫТАНІК



***Марыя Маляўка, Беларусь – Польшча***

**АЛЬБО ЯК БЕРАСЬЦЕЙЦЫ ЕЗЬДЗІЛІ Ў АМЭРЫКУ 100 ГОД ТАМУ**

***Пасля Другой сусветнай вайны ня рэдкасцю было пачуць у сельскай хаце на Берасьцейшчыне размову па-ангельску. Мінулае ўспаміналі “амэрыканцы” – тыя, хто пабываў за акіянам.***

Ва ўкраінскіх Карпатах ёсць народная песьня пачатку XX стагоддзя “Гамерыцький край”, дзе выказваецца туга эмігранта, змушанага ехаць у далёкую невядомасьць, каб “зарабіць хлеба”. Была гэтая тэма блізкая і для Заходняй Беларусі. Зрэшты, гастарбайтэры таго часу ехалі ў ЗША не толькі ад беднасці, але і каб зарабіць грошай для развіцьця гаспадаркі.

Ураджэнка вёскі Задуб’е цяперашняга Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласьці (а пры Польшчы — Дабраслаўскай гміны Палескага ваяводства) **Любоў Малышка** расказала пра свайго бацьку Фёдара Маляўку, які на здымку зьверху разам з жонкай і дзецьмі. Ён езьдзіў у Амэрыку і... трапіў у рабства. Але аб усім па парадку.

**Бацькоў загубіла балота і Будзёны**

Фёдар (Хведар па-мясцоваму) быў не адзіным у сваёй сям’і, хто адправіўся ў ЗША. Ягоны старэйшы брат Пятрук таксама пачаў ездзіць на заробкі не пазьней пачатку 1910-х. Але пра яго зьвестак і ўспамінаў засталося мала.

Вядома, што ён на цягніках і пароме дабіраўся да Лондана, а там садзіўся на карабель да Амэрыкі. Менавіта яму пашчасьціла ўбачыць легендарны «Тытанік».

Трансатлантычны параход будаваўся ў Белфасце, сталіцы Паўночнай Ірландыі, і Пятрук, мог назіраць яго, калі карабель праходзіў выпрабаваньні перад сваім першым і апошнім падарожжам у ЗША...

Браты паходзілі з сям’і заможных сялян, дзе з 14 народжаных дзяцей выжыла сямёра. Фёдар, які нарадзіўся ў 1903 годзе, быў малодшым з чатырох братоў. Сядзіба бацькоў была зьнішчана падчас Першай сусьветнай вайны. Адступаючыя расейцы спыніліся ў ёй на тры дні, з’елі і забралі ўсю жывёлу і харчы, а пабудовы і хату разабралі, каб праклсьці грэблю праз балота. Не хацелі шумець, секчы дрэвы. Захаваліся ўспаміны, што гэта былі людзі Будзёнага, таму эпізод памылкова адносілі да часу Грамадзянскай вайны. Магчыма, салдаты належалі да падраздзялення, якім камандаваў Будзёны, будучы афіцэрам царскай арміі. А магчыма, конныя войскі зьвязваліся з імі па асацыяцыі.

*«Сядзіба была прыцiснута да балота, гэта іх загубіла», — расказвае са шкадаваньнем Любоў Фёдараўна.*

Пару тыдняў сям’я жыла пад грушай у будане. Потым дзед нашай суразмоўніцы памёр – «не вытрымала сэрца». Баба таксама пайшла за ім празлічаныя дні.

**Рабства на плантацыі і зьбіцьцё паліцэйскага**

Фёдар пасьпеў скончыць два клясы расейскай школы. Ягоны бацька быў ляснічым, ездзіў на службу і вазіў дзяцей у школу за 10 кіляметраў. Ён лічыў, што самае галоўнае – даць дзецям адукацыю. Пятрук пасьпеў скончыць больш класаў, пазней ажаніўся з полькай і асеў у ЗША. Там ён узяў прозьвішча жонкі, а чаму – сямейныя версіі адрозніваюцца...

Фёдар з Амэрыкі ехаць назад не зьбіраўся. Перасылаў грошы Якаву, хацеў з цягам часу забраць яго да сябе.

*«Звычайна зьбіралася партыя і ехала. Ён паехаў у таварыства іншых, і ў іх не хапіла грошай. У каго хапіла, той даехаў, у каго не, тыя затрымаліся ў Канадзе. Думалі, падпрацуюць і паедуць далей. Але працу знаходзілі толькі ў фермераў – хапала толькі на жыцьцё ды і толькі. Потым патрапілі на тытунёвую плантацыю і там фактычна апынуліся ў рабстве. Іх адтуль не выпускалі. У Амерыцы такое было. Людзей сагітуюць, напрыклад, у непраходныя лясы здабываць смалу. І амерыканцы трапляліся, не толькі прыезджыя».*

Любоў Фёдараўна ўзгадвае, як чытала артыкул пра чалавека, які вярнуўся з такога рабства ў лясах Амазоніі праз 25 гадоў. У адзіночку без грошай выбрацца было нерэальна: непраходныя месцы, трапічныя хваробы. Некаторыя ўцякалі, але гінулі.

*«Але нашыя – горды народ. Яны зладзілі страйк. Такі моцны, што гаспадары плантацыі не маглі справіцца. Яны зьвярнуліся да ўладаў. І ўлады разабраліся. Замежнікаў выслалі».*

Ёсць і гісторыя, што Фёдар нібыта прыхапіў у рукаве кавалак арматуры і падчас бойкі з паліцыяй ударыў па галаве аднаго з копаў. З-за чаго ўвесь ягоны ўдзел у страйку быў інтэрпрэтаваны як сувязь з камуністычным рухам.

На плантацыі ён правёў тры гады, а ўсяго ў Амерыцы разам з дарогамі – пяць. Гэта была першая палова 30-х гадоў, Вялікая дэпрэсія – значна менш шчаслівы час, чым выпала Пятруку на яго першыя паездкі.

Яркім успамінам гэтага перыяду, які потым расказваўся дзецям, стаў ручны мядзведзь, які развозіў па плантацыі бочкуз вадой.

*«Збяруцца гэтыя «амэрыканцы» і гавораць не панашаму у нас у хаце, — успамінае Любоў Фёдараўна сваё дзяцінства. – Старыя людзі былі, без радыё, без тэлевізара, а які развіты народ! Сядуць – лапці плятуць, кошыкі, і языкамі малоцяць, усякія загадкі, разгадкі, галаваломкі, з запалак што-небудзь пабудуюць. Мужыкі за сталом, бабы рукадзельнічаюць. У суседнім пакоі моладзь».*

**Вяртаньне дамоў**

Не злавіўшы посьпехі за акіянам, Фёдар вярнуўся ў роднае сяло. Пяць гадоў “хадзіў” за будучай жонкай Маняй. Яна была сіратой. Мачыхе, відаць, не хацелася страціць танную працоўную сілу. У выніку выдала яе замуж «у чым стаяла» – не дала нават зьменнага адзеньня.

*«Бацька паехаў на заробкі ў горад. Хаця што я кажу: паехаў! Пайшоў. Зараблялі часцей за ўсё ў Пінску, нават за хлебам туды хадзілі пешшу. Накупіў маме адзеньня. Потым прыкупілі часовую хатку».*

Да Пінска – цэнтра ваяводства – прамымі дарогамі было 60 км.

Пасля зьмены ўлады Фёдар стаў першым брыгадзірам у калгасе, а Якаў – яго памагатым. Фёдар таксама быў дэпутатам, таму што, нягледзячы на слабую адукацыю, быў чалавекам “пісьменным”.

**Кандыдаты на расстрэл**

Становішча абвастрыла мясцовая нязгода: чалавек, які дзякуючы зносінам з Якавам разбіраўся ў першапачатковых лозунгах рэвалюцыі, адмовіўся адбываць абавязковыя працы, таму што «уся зямля сялянам». Яго засадзілі ў турму. У выніку пасьля акупацыі немцамі братоў выдалі ім як камуністаў.

Якава расстралялі. Па Фёдара прыйшлі ў дзень, калі жонка нараджала трэцяга сына.

*«Ён прыняў роды і хацеў пайсці. Сказаў: «Цяпер за мной прыйдуць. Мяне папярэдзілі». Зірк – ужо ідуць. Ён праз акно і ў жыта. Па ім стралялі, а ён па жыце ўцякаў зігзагамі, як заяц. Тады загадалі расстраляць жонку з дзецьмі. Ужо прыйшоў немец і цэліцца, цэліцца. Але тут адна баба прыбегла, упала на калені, давай галасіць і прасіць. «Яна ж сірата, яна нічога не ведае. Божа ж мой, як мне*

*будзежыць, калі я за яе не заступлюся?»*
І іх пакінулі ў жывых, а на наступную раніцу Маню выклікалі і пратрымалі цэлы дзень, не ведаючы, што з ёй рабіць. Але не знайшлі віны і адпусцілі.
Пасля гэтага Фёдар пайшоў у партызаны – не хацеў загінуць дарма. У 1943 годзе, калі абстаноўка абвастрылася, схаваў сям'ю на хутары Пароціна.
*«Ён не быў камуністам і не мог быць, – лічыць дачка Фёдара. – У калгасе быў брыгадзірам, але сам сыйшоў, таму што калгас быў не такім, як ён яго прадстаўляў. Ён прадстаўляў яго калектыўнай гаспадаркай. Каровы ў нас свае, сабралі ў калгас, уся скаціна своя, а калі мы пазычаем грошы на тэхніку ў дзяржавы, то будзем абавязак аддаваць. А чаго дзяржава лезе і камандуе? Прыязджае, гарлапаніць, патрабуе таго і таго? Гэтага ён не разумеў».*
**“Я наогул не піў, а амэрыканцы напіліся”**
Патрапіўшы ў рэгулярнае войска, Фёдар дайшоў да Берліна. Ён добра ведаў ангельскую і стаў перакладчыкам пры штабе маршала Ракасоўскага падчас сустрэч з заходнімі саюзнікамі. Мовы ён увогуле вучыў «на аўтапілоце». Цытаваў па памяці ўрыўкі з польскіх газет. Сьпяваў украінскія песні.
*«Прайшоўшы краіну, ён схопліваў зьмены, чым новая мова адрозніваецца ад папярэдняй. Колькі краін прайшоў, столькі і ведаў моў”.*
Гэта заўважылі і часта прыцягвалі яго ў якасьці перакладчыка, а потым перавялі бліжэй да штаба. Ён займаўся разведкай, але пра гэта потым нічога не расказваў.
А пра сустрэчу з амэрыканцамі любіў расказваць.
*«Кажа, нас сабралі і загадалі: піць не больш за 300 грам. І тое паступова. Для нашага чалавека гэта ня быць п'яным. І мы, кажа, сустракаліся, я ўвогуле не піў, бо мне перакладаць трэба, а амэрыканцы панапіваліся — адзін падаў, сцягнуў на сябе абрус і ўвесь стол рагатаў з гэтага. А мы, кажа, усе як агурочкі».*
На вайне Фёдар шмат разоў быў на мяжы сьмерці. Падчас жорсткіх баёў у Памераніі на тэрыторыі Прусіі (цяпер Польшча) ён як сувязіст стаў мішэнню нямецкага снайпера. Снайпер цэліўся ў сэрца. Фёдар адчуў штуршок у грудзі, як быццам ударылі бярвенем, і страціў прытомнасць. Калі ачуняў, знайшоў у нагрудны кішэні прабітую кніжку і спляскани трафейны гадзіннік. Яны і абаранілі ад кулі.
**Пасьля вайны**
Любоў Фёдараўна была передапошняй з дзевяці дзяцей у сям'і. Нарадзілася ў 1954 годзе. Аб пасляваенным жыцці бацькі распавядае з тугой, быццам не жадаючы набліжацца да сумнага фіналу.
*«Пра вайну расказваў і плакаў, плакаў. Пакуль гадавалі дзяцей, працаваў на дзвюх працах, сьпівацца не было калі. Асноўная праца – лесьніком, дадатковая – вартаўніком. Бочкі рабіў. Кошыкі плеў вечарамі. Дзяцей любіў. Для кожнага дзіцяці ў яго была свая гісторыя, адкуль дзіця ўзялося. Брат Іван быў верхалаз, вечна па слівах поўзаў – дык яго са сьлівы зьнялі. Мяне ў агародзе выкапалі. Была я маленькая, як бульбінка. Таму назвалі «Любінка». Калі ў краму вартаўніком пайшоў, зьбіраліся ў качагарку пасядзець выпіць, і яму налівалі. Тут ужо ў яго мазгі адмаўлялі».*
Мы даведаліся крыху больш пра працоўную міграцыю беларусаў у першай палове XX стагоддзя ў гісторыка Анатоля Сідарэвіча, таксама ўраджэнца вёскі Задуб'е. Ягоны сваяк Філіп Сідарэвіч, вядомы як «Філіп Мерыканец», вярнуўшыся з ЗША, «прывёз новую веру».
Ён пражыў у ЗША 10 гадоў, пачынаючы з 1911, атрымаў багаслоўскую адукацыю і пазней заснаваў у родным рэгіёне як мінімум пяць баптысцкіх цэркваў – гэта значыць быў дзеячам той жа хвалі «евангельскага абуджэння», што і вядомы брэсцкі пастар Лука Дзекуць-Малей.
Як расказаў Анатоль Сідарэвіч, беларусы пачалі ездзіць у Амэрыку пры цары Мікалаі ІІ, гэта значыць з пачатку XX стагоддзя або канца XIX. Для такіх мэт нават быў выдадзены англа-беларускі размоўнік.
Папулярным месцам адпраўлення праз акіян быў порт Гаўр на поўначы Францыі. Другім напрамкам міграцыі сялян была Сібір. Пасля рэвалюцыі міграцыя ў апошнюю стала прымусовай.

# АКЦЫІ Ў ПАДТРЫМКУ УКРАІНЫ Ў НЬЮ-ЁРКУ



***Алесь Пазьняк***
***Здымкі: Людміла Хомчанка, Ірына Хадарэнка***

**24 лютага на гадавіну расейскага ўварваньня ва Украіну свабодныя людзі ўсяго сьвету выйшлі на вуліцы розных гарадоў, каб падтрымаць украінцаў.**
У Нью-Ёрку акцыі пачаліся яшчэ зьвечара 23 лютага. Актывісты ў гэты дзень выйшлі да расейскага консульства і скандавалі лёзунгі.
24 лютага мітынг пачаўся у 10 гадзін раніцы ля будынка ААН. Адна з удзельніц акцыі Людміла Хомчанка распавяла, што ў гэты час сабралася звыш сотні чалавек. Людзі несьлі з сабой плякаты і ўкраінскую сымболіку.
Таксама на акцыі былі заўважаныя і беларускія бел-чырвона-белыя сьцягі.
*«Гучала шмат лёзунгаў. Людзі без перапанку скандавалі «Слава Украіне!» І галоўным патрабаваньнем было выдаленьне Расеі з ААН і Рады Бясьпекі гэтай арганізацыі, каб яна не мела права накладаць вета на прыняцьце рашэньняў. У сувязі з гэтым прымаюцца адпаведныя пэтыцыі», – распавяла Людміла Хомчанка.*
Увечары на Таймс-сквер прайшоў буйны мітынг. Украінцы, амэрыканцы, беларусы, выйшлі з плякатамі ў падтрымку Украіны, несьлі ў натоўпе і пудзіла з фота пуціна.
Шмат у каго на руках былі фатаздымкі разбураных украінскіх гарадоў і параненых людзей.
*«Людзі стаялі шэрагамі. Шмат хто быў у вышыванках. Нашы беларускія сьцягі таксама луналі, бо прыйшла і беларуская падрымка», – адзначыў адзін з актывістаў Гэнік Лойка.*
Таксама на акцыях былі заўважаныя польскія, латвійскія, грузінскія, азэрбайджанскія, татарскія сьцягі.
Трэба адзначыць, што ў іншых амэрыканскіх гарадах таксама прайшлі пікеты і мітынгі, арганізаваныя ўкраінскай дыяспарай.
Прэзідэнт Украіны 24 лютага ў гадавіну расейскага ўварвання заявіў, што Украіна зробіць усё, каб атрымаць перамогу. Аб гэтым Уладзімір Зяленскі сказаў у звароце да ўкраінцаў раніцай 24 лютага. У сваёй заяве ён некалькі разоў згадаў пра перамогу і адзначыў, што «нягледзячы на пастаянныя масіраваныя ракетныя ўдары і адключэньне электраэнергіі, мы бачым сьвятло гэтай перамогі».
Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн таксама ў гэты дзень заявіў, што Расея ніколі не пераможа Украіну.
*«Дыктатар, які імкнецца аднавіць імперыю, ніколі не сатрэ любоў народа да свабоды. Жорсткасць ніколі не зломіць волю вольных. І Украіна ніколі не будзе перамогай Расіі. Ніколі», – сказаў Байдэн у сваёй заяве.*
Дарадца Байдэна па нацыянальнай бясьпецы Джэйк Саліван заявіў, што Расея «ужо прайграла гэтую вайну».







# STATEMENT ON ALES BIALATSKI AND VIASNA LEADERSHIP SENTENCING

*March 3, 2023*
https://belarusff.org/
There is a particular level of despair and inevitability that surrounded today's sentencing of prominent Belarusian human rights defenders by the courts of Belarusian dictator Lukashenka. Ales Bialiatski, Valiantsin Stefanovich, and Uladzimir Labkovich, the founders of the largest Belarusian human rights center Viasna were sentenced to 7-10 years in prison. While many fabricated charges were mentioned, their only offense was protecting the human rights of people in Belarus, a gross crime in the eyes of the Lukashenka regime. Many organizations around the world recognize Viasna's contributions and awarded Ales Bialiatski numerous prestigious awards, including the 2022 Nobel Peace Prize. The center provided major legal and financial assistance to numerous Belarusians who went through Lukashenka's repression machine ever since he came to power in 1994.
In a country where laws and human rights no longer exist and being Belarusian can be equated to “extremism” in the eyes of Russia's puppet Lukashenka regime, such a trial is no longer shocking. It is even less surprising for Ales, who, in 2011-2014, went through the Lukashenka-controlled “justice” system. While Minsk District Court could not come up with something more sophisticated than charging Ales with the same fabricated “tax evasion” charges as a decade ago, this time feels different. The court that refused to conduct the trial in Belarusian, the official primary language of Belarus, has now become a conveyer of political prisoners. As Ales said, ***“...the entirety of Belarus is in prison. Journalists, political scientists, trade union leaders are all in jail...”***
As the news of Russia's plans to fully integrate Belarus and eradicate the Belarusian culture continues to grow, there is a sense that Lukashenka courts will also become the direct extension of the Kremlin repression machine. The system that was once targeting those opposing Lukashenka might now be used to target any Belarusian.
Therefore, today serves as a reminder about the catastrophic situation with human rights in Belarus, where over 1700 political prisoners are already in jail and thousands are being sentenced on politically motivated criminal cases. We point out to disastrous **discrimination of the Belarusian language and culture** and stress the **danger of the annexation of Belarus by Russia**. We underline that free, independent democratic Belarus is vital for the national security of the United States and its transatlantic allies. We call on the United States officials to develop a comprehensive policy to hold the Lukashenka regime accountable for its gross violations and abuse of human rights, to force the regime to release the political prisoners, and to safeguard the independence and sovereignty of Belarus.
**Statistics of Political Repressions in Belarus since 2020.**
**As of March 3, 2023:**

Killed: 10+

Arrested: 50,000+

Political prisoners: 1708 ↑

Imprisoned journalists: 32 ↑

Politically motivated charges: 4691+

## ЯК БЕЛАРУСЫ ЗША АДЗНАЧАЛІ ДЗЕНЬ ВОЛІ 60 ГАДОЎ ТАМУ



***Міхась Чаропка***

У 2023 годзе сьвяткаваньне Дня Волі адметнае сымбалічнай падзеяй. У сталіцы ЗША Вашынгтоне – мэр Мёрыель Боўзэр **абвесьціла 25 сакавіка – Днём Волі Беларусі**.
Кіраўнікі гарацкіх адміністрацый, а таксама губэрнатары розных штатаў ужо некалькі дзясяткаў гадоў робяць праклямацыі з нагоды Дня Волі.
Я праліcтаў падшыўку старых эміграцкіх выданьняў, каб знайсьці прыклады і даведацца, як беларусы ЗША сьвяткавалі Дзень Волі ў розныя гады.
Так, у **нумары 75 газэты “Беларус” за сакавік 1962 году** расказваецца пра сьвяткаваньне **сорак чацьвёртых** угодкаў абвяшчэньня **Незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі**. У 10 гадзін раніцы ў Катэдральным саборы сьв. Кірылы Тураўскага правілася Сьвятая Літургія з Малебнам за Беларусь. А ўжо а трэцяй гадзіне папаўдні ў музычнай залі гатэлю Білтмор пачлося сьвяточнае мерапрыемства.
У самім Нью Ёрку **мэр гораду Робэрт Ф. Вагнэр абвесьціў дзень 25 сакавіка – Беларускім Днём Незалежнасьці**. Згодна паведамленьню ў газэце, праклямацыя была *“выдадзеная 20 сакавіка й даручаная прадстаўніком беларускіх арганізацыяў у меставой ратушы (Сыты Гол)”*. Праклямацыю з рук мэра атрымалі **Ю. Станкевіч, В. Кіпель, Я. Каханоўская, В. Юрцэвіч, Яра Тумаш, К. Марляк, А. Шукелойць, М. Казьлякоўскі**.
У **76-77 нумары “Беларуса” за красавік-травень 1962 году** расказваецца пра візіт беларускай дэлегацыі на аўдыенцыю да віцэ-прызыдэнта ЗША.
**Ліндан Б. Джонсан** прыняў у сваім габінеце Архіепіскапа Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы **Уладыку Васіля** й старшыню Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня **сп. Кастуся Мерляка**. Пасьля ў Сэнаце Уладыка Васіль памаліўся за Беларусь стоячы за трыбунай віцэ-прэзыдэнта.
Там жа на Капіталійскім халме 20 сэнатараў і кангрэсмэнаў выступілі з прамовамі і асьветчаньнямі з нагоды сорак чацьвёртых угодак абвяшчэньня Незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі.
**У тым жа годзе** ўрачыстыя сьвяткаваньні адбыліся ў **Ню Брансвіку (Ню Джэрзі), Кліўлендзе, Лос Анджэлесе, Чыкага, Дэтройце**.
**Мэр гораду Пассэйк у Ню Джэрзі Пол Г. дэ Маро абвясціў 25 сакавіка 1962 году – Днём Незалежнасьці Беларусі**.
**У другім нумары газэты “Беларускае слова” за 1958 год** таксама знаходзім згадку, што губэрнатары штатаў **Ню Ёрк (Аверэль Гарыман), Ню Джэрзі (Робэрт Мэйнэр), Огайо (Вільямс О’Ніль) абвесьцілі 25 сакавіка 1958 году – Днём Незалежнасьці Беларусі.**
Дык што гэта за “праклямацыі” ад мэраў і губэрнатараў і як яны выдаюцца?
**Праклямацыя – гэта не юрыдычны, а сымбалічны зварот да грамацкасьці, абвяшчэньне, якое робіць мэр ці губэрнатар датычна нейкай значнай падзеі.**
Тэкст такога звароту павінны быць дасланы ў офіс мэра ці губэрнатара за пару тыдняў. Пасля абвяшчаецца дата, калі падпісаная праклямацыя будзе перададзеная прадстаўнікам арганізацыі, якая яе дасłала.
Такія праклямацыі ня могуць быць абвешчаныя з нагоды юбілеяў, альбо, напрыклад, вясельляў. Павінны быць значныя для горада ці штата і групы іх насельнікаў падзеі. У 2023 годзе, як і ў папярэднім, у Вашынгтоне такое абвяшчэньне адбылося **па замове Вашынгтонскага аддзела Беларуска-Амэрыканскага Задзіночання (БАЗА)**.
Унізе я даў спасылку на старонку офісу мэра Ню Ёрку, дзе падрабязна апісваецца працэдура і ёсць адпаведная форма для запаўненьня.
З вывешваеньнем сьцягоў крыху іншая справа. На сваёй прыватнай уласнасьці ў межах закону і здаровага сэнсу можна вывесіць любыя сьцягі. Але перад будынкамі афіцыйных уладаў дэманстрацыя розных сымбаляў вельмі рэглямантаваная.
Як мы бачым, беларусы ЗША надавалі і надаюць вялікую важнасьць сьвяткаваньню Дня абвяшчэньня Незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі. Актывісты пры любой магчымасьці абазначалі і абазначаюць сваю прысутнасьць у ЗША, расказваюць пра Беларусь і праз сымбалічныя ўчынкі не даюць забыцца на інсаваньне краіны, якая марыць аб Свабодзе і Незалежнасьці.

Жыве Беларусь!

---

## Пад знакам “Пагоні”

***Ірына Хадарэнка***

Напярэдадні Дня Волі ў грамадскай залі катэдральнага сабору імя Св. Кірылы Тураўскага у Нью-Ёрку адкрылася выстава рэпрадукцый беларускага мастака-графіка Зміцера Шапавалава.
Малады творца скончыў аддзяленне графікі, а пазней магістратуру Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі Мастацтва. З 2004 года пачаў актыўна ўдзельнічаць у рэспубліканскіх і міжнародных выставах.
За свой адметны мастацкі стыль “беларускі Дзюрэр”, як ужо паспелі назваць мастака, неаднаразова станавіўся лаўрэатам шэрагу міжнародных конкурсаў, а таксама быў узнагароджаны прэміяй імя Вацлава Ластоўскага.
У ЗША творы Зміцера Шапавалава экспануюцца упершыню. Мерапрыемства арганізавана Беларускай Асветніцкай Лігай Амерыкі (BELA) пры падтрымцы Нью-Ёркскага аддзялення БАЗА, Парафіяльнай Рады Сабора БАПЦ Св. Кірылы Тураўскага, Беларускага Інстытута Амерыкі і Беларускай Фундацыі Крачэўскага.



## СЬВЯТКАВАНЬНЕ ДНЯ ВОЛІ Ў НЬЮ-





















***Алесь Пазьняк***
***Здымкі аўтара***

**З канцэртам і сьвяточнымі прамовамі. Так адзначалі Дзень Волі ў Нью-Ёрку**
Беларусы па ўсім сьвеце 25 сакавіка адзначалі 105-ую гадавіну абвяшчэньня незалежнасьці БНР. Насычаныя мерапрыемствы, акцыі, выступы, канцэрты, шэсьці, выставы, мітынгі, узьняцьце сьцягаў прайшло як у эўрапейскіх краінах, так і ў ЗША.
У Нью-Ёрку галоўнае сьвяточнае мерапрыемства прайшло не 25, а 26 сакавіка і пачалося са службы ў саборы сьв. Кірылы Тураўскага, што на Атлянтык Авэню. Тут сонечным нядзельным ранкам на будынку сабора былі ўсталяваны сьвежыя сьцягі: нацыянальны беларускі, украінскі і амэрыканскі. Гатавалася бабка, смажыліся каўбаскі ды дранікі. Сьцягі на саборы мяняюцца 2 разы на год – падчас сьвяткаваньня Дня Волі і ўтак і ў ЗША.
У Нью-Ёрку галоўнае сьвяточнае мерапрыемства прайшло не 25, а 26 сакавіка і пачалося са службы ў саборы сьв. Кірылы Тураўскага, што на Атлянтык Авэню. Тут сонечным нядзельным ранкам на будынку сабора былі ўсталяваны сьвежыя сьцягі: нацыянальны беларускі, украінскі і амэрыканскі. Гатавалася бабка, смажыліся каўбаскі ды дранікі. Сьцягі на саборы мяняюцца 2 разы на год – падчас сьвяткаваньня Дня Волі і ўсаборы сьвю Кірылы

Тураўскага пачалася сьвяточная праграма, якая распачалася сьпяваньнем гімна Беларускай народнай Рэспублікі «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», вядомы таксама як «Ваяцкі гімн».

Пасьля гэтага з віншавальным словам выступіла старшыня Галоўнай управы BAZA Натальля Федарэнка. Яна зьвярнула ўвагу на тое, што 25 сакавіка – гэта Дзень Волі, бо ў 1918 годзе беларусы абʼявілі аб сваёй незалежнасьці. Таксама яна ўзгадала сёньняшнюю сітуацыю і складаныя варункі для беларускай дзяржаўнасьці.

*«25 сакавіка 1918 года мара ўсіх пакаленьняў беларусаў, што жылі і цярпелі пад імпэрскім гнётам і змагаліся за аднаўленьне сваёй дзяржавы, нарэшце ажыцьцявілася. Мы шчасьлівыя, што беларусы, што стаялі ў вытокаў БНР, зрабілі амаль немажлівае і абвесьцілі аб ставарэньні незалежнай беларускай дзяржавы, і заклалі цьвёрды падмурак для нашай Бацькаўшчыны, які быў скарыстаны ў 1991 годзе, калі паўстала незалежная Беларусь», – прамовіла старшыня ўправы.*

Акрана Пятрашка, старшыня нью-ёркскага адзьдзела BAZA, зрабіла акцэнт на выкарастыньні роднай мовы ў паўсядзённым жыцьці. А таксама заклікала шанаваць і працягваць барацьбу беларускіх сыноў за незалежнасьць Беларусі.

У залі таксама быў уключаны зварот Івонкі Сурвілы, старшыні Рады БНР. Прыгадаўшы гісторыю абвяшчэньня незалежнасьці БНР, спадарыня Сурвіла зьвярнулася да беларусаў з нагоды 105-гадавіны гэтай падзеі:

*«Дарагія суродзічы, дзеля прысутнасьці 105 год таму пазьней на нашай усходняй мяжы таго самага крывавага ворага, які дасюль не пазбыўся сваіх імпэрскіх намераў, мы сёньня яшчэ раз абвяшчаем сьвету, што мэтай нашага народу дасюль ёсьць змагацца ўсімі даступнымі нам сіламі, каб абараніць наш вольны і незалежны край ад цяперашняга самазванца і ад ягоных расейскіх патронаў, якія яшчэ ўсё пагражаюць зноў паняволіць наш народ», — сказала Івонка Сурвіла.*

Пры гэтым яна падкрэсьліла, што беларусы зʼяўляюцца самастойным, адукаваным, разьвітым народам у сямʼі эўрапейскіх народаў.

Віншавальнае слова старшыні Парафіяльнай Рады сабору Сьв. Кірылы Тураўскага Расьціслава Гарошкі было прысьвечана дзейнасьці паваеннай беларускай эміграцыі, важнасьці акта 25 сакавіка 1918 года.

Сябра Рады БНР Ганны Сурмач павіншавала прысутных і нагадала аб ідэалах БНР.

*«Рада БНР – гэта не толькі сымбаль нашай дзяржаўнай незалежнасьці, а гэта і дзейсная палітычная структура. Рада БНР будзе працаваць да таго часу, пакуль Беларусь не стане цьвёрда на шлях дэмакратычнага развіцьця. Я спадзяюся, што гэты час настане і мы гэтаму паспрыяем», – сказала спадарыня Ганна.*

Міхал Чаропка, заступнік старшыні нью-ёркскага адзьдзела BAZA, зрабіў мультымэдыйны дакляд на тэму «Гісторя БНР». У ім ён паказаў значнасьць Акта 25 сакавіка і падкрэсьліў моманты барацьбы беларускага народа за сваю незалежнасьць і свабоду.

Аліна Коўшык, прадстаўніца па нацыянальным адраджэньні Абʼяднанага пераходнага кабінэта, якая цяпер знаходзіцца ў ЗША, прывітала беларусаў ад імя кабінэта. А таксама адзначыла складанасьці нацыянальнага адраджэньня, варожасьць і чужасьць улады да нацыянальна-культурных памкненьняў беларусаў.

*«Воля, гонар, незалежнасьць – гэтыя каштоўнасьці падзялялі заснавальнікі БНР. Гэтыя каштоўнасьці праз 105 гадоў падзяляем і мы з вамі», – зазначыла Аліна Коўшык.*

Таксама на мерапрыемстве прагучала віншаваньне ад Згуртаваньня Беларусаў Сьвету “Бацькаўшчына”, зачытвалася 3-я Устаўная Грамата БНР, з віншавальным словам выступіў старшыня Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня” Віталь Зайка. Адбылося паўторнае адкрыцьцё выставы мастака-графіка Зьмітра Шапавалава, ад Ірыны Хадарэнка, сябры Беларускай Асветніцкай Лігі Амерыкі (BELA), чытаньне эсэ У. Арлова «Незалежнасьць – гэта»...

Сапраўдным упрыгожваньнем сьвяточнай імпрэзы сталі сьпецыяльныя музычныя госьці – Сяржук Сокалаў-Воюш, Вольга Казак-Анлар і Зьміцер Вайцюшкевіч, які напярэдадні выступіў у Бостане.

Сяржук Сокалаў-Воюш сьпяваў вядомыя і любімыя свае песьні, а таксама прадставіў новую, якая яшчэ не зʼяўлялася на прасторах інтэрнэта і на шырокай аўдыторыі.

Вольга Казак прасьпявала як народныя беларускія, так і ўкраінскія, а таксама карагодныя песьні. Яны былі прасякнутыя любоў да сваёй зямлі і прыродным хараством.

Зьміцер Вайцюшкевіч выканаў шмат песень на словы Уладзіміраў – Караткевіча і Някляева. Прагучалі ў яго песьні і дзіцячай тэматыкі. Як адзначыў сам Зьміцер, гэта асаблівыя песьні, якія служаць абуджэньню нацыянальных пачуцьцяў у маленькіх беларусікаў.

Усім музыкам вядомы скульптар Гэнік Лойка падараваў бюсты Тадэвуша Касьцюшкі і Кастуся Каліноўскага, якія ён адліў адмыслова да Дня Волі.

У грамадзкай залі пры саборы сьв. Кірылы Тураўскага ў гэты дзень было шматлюдна, цікава, насычана, лёгка і свабодна.

Адзін з удзельнікаў мерапрыемства, дальнабойшчык, распавёў у прыватнай гутарцы, што ехаў з грузам з Флорыды на поўнач. Пакінуў трак і прыйшоў на некалькі гадзін на сьвяткаваньне Дня Волі, каб потым зноў сесьці за стырно.









# СА ШКЛОЎСКАЙ КАЛЁНІІ Ў ЗША. АПОВЯД ПАЛІТВЯЗЬНЯ З ВАЎКАВЫСКА



***Алесь Пазьняк***
***Здымкі прадастаўлены Надзеяй Нортан***

**Сямʼя Фаміных – «сьвежыя эмігранты» у ЗША. Прывыкаюць да краіны і новага жыцьця. Аднак яшчэ да нядаўняга часу Алег і Наста былі палітвязьнямі і адбывалі пакараньне. Ён да гэтага часу перажывае псыхалягічны стан турэмнага сядзельца.**

Алег адсядзеў 2.5 года агульнага рэжыму за «гвалт альбо пагрозу ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных справаў» (арт.364 КК РБ). Таксама Алег выплаціў «пацярпеламу» міліцыянту Вячаславу Іванову 2000 рублёў. Анастасія, як саўдзельніца злачынства, атрымала «хатнюю хімію».

48-гадовы жыхар Ваўкавыска быў затрыманы разам з жонкай 15 жніўня 2020 года, якраз праз некалькі дзён пасьля так званых выбараў. Па словах Алега Фаміна, да таго моманту ён ніякай палітычнай актыўнасьці не праяўляў, жыў жыцьцём звычайнага беларуса. Меў дом, невялічкі агарод і месца на рынку, якое карміла сямʼю.

Наста доўгі час працавала мікрабіёлагам на прадпрыемстве, але ў 2020 годзе звольнілася і занялася ўласнай справай – грумінгам.

## Сусед-міліцыянт

*«Да 2020 года я часта чуў пра тое, што ў Беларусі выбары ўвесь час фальсіфікуюцца. Але на апошніх выбарах мне проста стала цікава, а ці так гэта? 9 жніўня ўвечары, ужо пасьля закрыцьця выбарчага ўчастка, я пайшоў даведацца, якія вынікі? На гэты раз я удзельнічаў і галасаваў за Сьвятлану Ціханоўскую. Я сам бачыў, як у прыпаркаваны “Фольксвагэн” чальцы камісіі выносілі нейкія паперы, а новыя заносілі ў залю. Магчыма, што гэта былі бюлетэні для галасаваньня...*

*Калі на мой званок адкрылі дзьверы на выбарчым участку, я спытаў, дзе можна азнаёміцца з пратаколам галасаваньня? Але замест таго, каб паказаць пратакол, што павінен вывешвацца для ўсеагульнага агляду, на мяне вахцёр і ахоўнік выклікалі нарад міліцыі. Была доўгая размова з двума міліцыянтамі, але выніковы пратакол так і не паказалі.*

*Не дабіўшыся жаданага, пайшоў на плошчу ў цэнтр Ваўкавыска. Але не даўшоў. Пачуў крыкі і енкі і ўбачыў пару дзяўчын і хлопца, магчыма студэнтаў, якія былі пабітыя. Дзяўчынкі расказалі, што пабілі міліцыянты. У адной з іх быў шнар на наге ад гумовага дручка», – расказвае Алег Фамін.*

На наступны дзень ён вырашыў зноў ісьці ўвечары на вуліцу. Праходзячы каля плошчы, убачыў, як выстройваеццца міліцыя са шчытамі. Некаторыя былі ў бронекамізэльках і з табельнай зброяй. Непадалёк стаялі некалькі чалавек моладзі і пару дзесяткаў дарослых. Міліцыя пасьля пастраеньня рушыла на іх. Пачаўся масавы хапун і зьбіццё людзей. Алег кажа, што ў гэтым разгоне ўдзельнічаў ягоны сусед – міліцыянт Вячаслаў Іваноў.

Паміж Івановым і Фаміным былі звычайныя суседскія адносіны. Сябрамі яны не былі, але заўсёды віталіся. Сітуацыя кардынальна зьмянілася пасля выбараў.

*«Я памятаю шалёныя вочы Іванова, які быў узбуджаны і, напэўна, задаволены, што бліскуча расправіўся з пратэстоўцамі. На наступны дзень, 11 жніўня, я зноў прыйшоў на плошчу. Праходзячы, павіншаваў суседа з «дасканала выкананай апэрацыяй». У той жа дзень мяне затрымалі, прысудзілі двое сутак арышту і далі 5 базавых велічынь штрафу. 13-га жніўня я выйшаў позна ўвечары», – распавёў Алег.*

15 жніўня Алег і Наста Фаміны вярнуліся пасьля чарговай акцыі пратэсту. Якраз у гэты вечар бацькі міліцыянта Іванова сьвяткавалі юбілей. Алег Фамін убачыў, як з дому выйшаў Вячаслаў Іваноў і вырашыў з ім пагутарыць. Падыйшоў да дома ягоных бацькоў. Але размова не заладзілася і прывяла да бойкі. Міліцыянт першым ударыў суразмоўцу ў твар. Алег адказаў. Выбеглі сваякі міліцыянта і пачалі зьбіваць Алега. Жонцы Насце, якая прыбегла на падмогу, таксама дасталася. Сямёра білі дваіх. У той вечар скрываўлены Алег не выйшаў на волю. За ім прыехала міліцыя.

У РАУСе тагачасны начальнік Віталь Асоцкі “адпаласкаў” Фаміна гумовым дручком. Пасьля трох дзён зьняволеньня яго адвезьлі ў лякарню з гематомамі, зрабілі апэрацыю. Там ён 6 сутак знаходзіўся пад вартай чацьвярых міліцыянтаў і ў кайданках.

## Паліьтзняволеныя ў калёніі на асаблівым рэжыме

Напачатку мужчыну утрымоўвалі ў Ваўкавыскім ізалятары часовага ўтрыманьня. Пасьля суда перавялі ў турму №1 горада Гродна, а потым у Шклоўскую калёнію №17. На судзе ні Алег, на Наста сваёй віны не прызналі.

Пра турму зараз Алег можа распавесьці вельмі шмат. За час адбываньня пакараньня, кажа, што азнаёміўся з усімі правіламі і канонамі адсідкі.

*«Да палітзьняволеных было асаблівае стаўленьне. За любую «правіннасць», хоць насамрэч нічога не парушаў, слова якое не спадабалася, цябе караюць, бо ты палітзьняволены. Атрымаць штрафны ізалятар – гэта элементарная справа. Асабліва перад выхадам на волю. Супрацоўнікі часта зьдзекаваліся з людзей, без прычын. Самыя злосныя парушальнікі вісяць на лістку. У гэтым сьпісе заўсёды ёсьць палітзьняволеныя. Але мы пра яго казалі, што гэта наша дошка гонару. Але тых, хто ў сьпісе, пазбаўляюць нават мінімальных правоў і бэнэфітаў – пасылак, спатканьняў усіх відаў, абмежаваньняў па ежы і зносінах з іншымі», – успамінае суразмоўца.*

*Палітычным сядзельцам была забарона на наведваньне стадыёна і спартыўных секцый. Адзін час ў шклоўскай калёніі была забарона*

*нанаведваньне бібліятэкі і царквы. Але потым адміністрацыя ўсё ж гэта дазволіла.*
*Здаралася часам, што палітзьняволеныя траплялі ў адну камэру. Алег адзін час сядзеў разам з беларускамоўным паэтам з Жодзіна Сяргеем Лаўкайцісам. Адзін час там адбываў пакараньне філёзаф Уладзімір Мацкевіч. Акрамя некаторых беларускамоўных сядзельцаў у калёніі па-беларуску было толькі адно слова "ЛАЗНЯ".*

Бачыў Алег і Паўла Севярынца. Сустракаўся з ім на прамзоне і ў штабе. Павел нават і ў зоне па магчымасьці хадзіў у царкву. Аб ім склалася самае лепшае ўражаньне ў палітычных.

*«Я бачыў у Паўле моц і выхаванасьць. Аднак ён быў самым "злосным парушальнікам" парадку. Кожны месяц атрымоўваў пакараньне. Ці знаходзіцца павел ў штрафным ізалятары мы даведваліся ў сталоўцы. Глядзелі, калі заходзіў 17 атрад. Калі там не было Паўла, то значыць ён адбывае чарговае пакараньне», – распавёў суразмоўца. Ён "адкатваў" больш за ўсіх.*

Алег таксама распавёў, як з былым карэспандэнтам «Першага рэгіёна» Сяргеем Гардзіевічам і іншымі палітычнымі рабілі на Новы год торт. Тады хтосьці набываў каржы, хтосьці раздабыў згушчонкі, масла, цукра. Алег кажа, што ён прынёс гарэхі. Але гэта ўсё было небясьпечна. Можна было атрымаць пакараньне нават за жаданьне малюсенькага кавалачка сьвята...

## Пра сьмерць Ашурка даведаўся не адразу

Трое сутак Алег правёў у гродзенскай турме разам з Вітольдам Ашуркам.

*«Разам з Вітольдам сядзелі разам трое сутак у камэры №164, дзе знаходзілася 8 чалавек. Потым яго перавялі ў іншую. Ён тады добра выглядаў, на здароўе не скардзіўся. Мы нават адзін раз хадзілі разам на шпацыр. На вуліцы было шмат сьнега, сукамернікі адмовіліся ад шпацыра, а мы пайшлі. Ён увесь час размаўляў пра будучае Беларусі. Меркаваў, як будзе пасьля Лукашэнкі. Ён быў аптымістам, верыў у Бога і спадзяваўся на лепшае. Вітольд увесь час казаў, што мы да канца не адсядзім, штонас вызваляць. Зараджаў сваім бачаньнем іншых. Тры дні, што мы былі разам, я назіраў, як ён адказваў на лісты, якія яму прысылалі ў вялікай колькасьці. У яго быў каліграфічны почырк...*
*Людзі, што сядзелі з намі ў камэры, былі забойцамі. У асноўным усе зьдзейсьненыя імі злачынствы адбываліся праз алкаголь. Але некаторыя з іх таксама цікавіліся палітыкай, задавалі пытаньні Ашурку, уступалі ў палеміку.*
*Аб сьмерці Вітольда я даведаўся толькі праз некалькі дзён у гутарцы з Настай. Бо не было на зоне ніякай інфармацыі пра гэта», – ўспамінае з сумам Алег. – Версію пра тое, што яго забілі, я дапускаю, як абсалютна верагодную. Бачыў, якія адносіны да так званых палітычных. Там забіць чалавека, ўвогуле, няма ніякіх праблем».*

## Стаяў на прафілактычным уліку, працаваў у кацельні

Як расказаў былы зьняволены, практычна ўсіх затрыманых па «палітычных артыкулах» ставяць на прафілактычны ўлік як «схільных да экстрэмізму і іншых дэструктыўных дзеянняў». Некаторым дадаюць іншыя прафулікі. Напрыклад, «схільнага да гвалту да адміністрацыі і захопу закладнікаў», «схільнага да суіцыду і членашкодніцтва», «схільнага да ўцёкаў» і г.д. У Алега Фаміна быў 3-ці і 10-ы прафулік. Па яго словах, усяго існуе 10 катэгорый прафулікаў.

Таксама ў калёніі выкарыстоўваюць жоўтыя біркі, каб пазначаць палітычных. Дарэчы, упершыню аб тым, што «палітычным» зняволеным, асуджаным за падзеі 2020 года нашываюць жоўтыя біркі ў шклоўскай калёніі, распавёў у сваіх лістах на волю загінулы Вітольд Ашурак.

Ёсьць яшчэ і чырвоныя біркі. Такія нашываюць тым, хто схільны да пабегу. З чырвонай біркай не дапускалі нават да працы, яны сядзелі ўвесь час у бараку.

*«Абстаноўка ў калёніях і турмах складаная. Ня ведаеш, каму можна давяраць, а каму не. Бо цяпер ты п'еш гарбату з кімсьці, а праз пайгадзіны аб вашых размовах ужо ведае адміністрацыя. Там людзі сядзяць па 15-20 гадоў. Вядома, што яны гатовыя боты лізаць ахоўнікам, каб толькі зьменьшыць свой тэрмін. Там стукач на стукачу сядзіць і суткачом паганяе. Многіх прымусілі і завербавалі. Бывала і такое, што нехта нават лічыў, колькі раз я схадзіў у туалет і ў які час. Там усе і ўсё знаходзіцца пад каўпаком», – кажа мой суразмоўца.*

Таксама ў калёніі трэба было працаваць. Алег трапіў у кацельню. Рабіў на спецыяльнай машыне дранку, якую выкарыстоўвалі як паліва для катлоў. Хтосьці на прамзоне шыў вопратку, хтосьці абутак, хтосьці рабіў плітку і бардзюры.

*«На працы можна было сустрэць вельмі розных людзей. Для прыкладу, фрэзероўшчыкам на рамонтна-механічным участку працаваў былы дырэктар станкабудаўнічага завода з Віцебска Сяргей Міхайлавіч Баяшоў. Чалавек, які сам рабіў калісьці станкі, стаяў за станком на зоне. Ён аднойчы перанёс інсульт на працоўным месцы. Яго адвялі ў санчастку, далі валідола і зноў адправілі за станок», – кажа суразмоўца.*

Абсталяваньне, па словах Алега, у цахах зношанае і старое. На адным з участкаў стаяў такарны станок 1936 года, вывезены пасьля вайны з Нямеччыны. І на ім на ўсю поўніцу працавалі. Траўматызм быў жахлівы. Кожны месяц здараліся няшчасныя выпадкі, асабліва ў тых, хто працаваў з дрэвам. То руку там раздробіць, то пальцы адрэжа, то прыцісьне нечым...

*«Наш 13-ы атрад працаваў альбо ў кацельні, як я, альбо ў механізаваным двары слесарамі па рамонту тэхнікі. Туды бралі тых, хто разьбіраўся, як палітвязень Сяргей Гардзіевіч з Драгічына. За час адсідкі я зарабіў на зоне 540 рублёў. Але заробак там такі: за люты можаш атрымаць 45 рублёў, а за ліпень – 5. Быў нават заробак і ў 1 капейку! Бо які ацяплялны сэзон летам? Мы з жонкай тады моцна сьмяяліся. І з гэтых грошай яшчэ трэба падатак аддаць дзяржаве. А які падатак з капейкі?»*

## Праз Польшчу ў Мэксіку да канечнай – ЗША!

Сям'я Фаміных ужо другі месяц як пераехала ў каліфарнійскі горад Сан-Дыега. Ён прыйшоўся ім да спадобы. Яны зьнялі за 1200 даляраў трэйлер з усімі ўмовамі, як сапраўдны дом. Там ёсьць душ, кухня, спальні.

Пасьля зьняволеньня жыць у суседняй Польшчы ці Літве адмовіліся. Хацелася падалей. Алег гэта тлумачыць тым, што шмат былых ваўкавыскіх міліцыянтаў працуе там. А сустракацца з імі ўвогуле не хочацца ні пры якіх абставінах. Таму на сямейным савеце было вырашана паспрабаваць новае жыццё ў ЗША.

Фаміны выехалі праз Польшчу ў Мэксіку па турыстычнай візе. Адтуль, як і шматлікія ўцекачы, перайшлі мэксікана-амэрыканскую мяжу. Як гэта лепей зрабіць, глядзелі парады на ютубе.

Наста, жонка Алега, кажа, што выбар краіны, куды з'ехаць, быў прыняты невыпадкова. Некалькі год яна наймала рэпэтытара дачцэ, каб тая вучыла ангельскую. Таму сям'я і абрала ЗША, каб практыкаваць мову. Наста кажа, што зараз Вікторыі ў школе нескладана. Яна лягчэй за ўсіх праходзіць працэс адаптацыі. 28 красавіка дачка будзе сьвяткаваць 13 год ужо ў новай краіне.

*«Пераезд – гэта дзікі стрэс. Вядома, што цяпер цяжка, але мы будзем змагацца. У мяне за месяц перад вызваленьнем Алега дома быў ператрус. Да мяне прыехалі са зброяй, перавярнулі ўсё, палохалі сабакамі. Пыталіся ў якіх я экстрэмісцкіх чатах знаходжуся. Гэта такі псыхалягічны ціск . Зараз нас атачаюць пазітыўныя, адкрытыя і прыемныя людзі. Вакол прыгажосьць: паркі, зеляніна, кветкі, сонца, бяскрайні акіян. А самае радаснае, што наша сям'я разам. Таму жывём і радуемся жыцьцю», – кажа Наста Фаміна.*

*«Больш за ўсіх падабаецца нашай дачцэ Вікторыі. Ёй хутка будзе 13 год. У яе добра ідзе ангельская мова. Яна ўжо знайшла сабе сяброўак і кажа, што нікуды адсюль не паедзе. Таксама нядрэнная мова і ў Насты. А я 25 год прастаяў на рынку, не развіваўся ў гэты бок, таму мне складаней за ўсіх», – дадае Алег.*

Алег чакае дакумэнтаў, каб выйсьці на працу. Але кажа, што псыхалягічна яму складана. Па ягоных словах, кожны дзень яго псыхалягічна цягне назад у турму. Кожную раніцу ён прачынаецца менавіта з такімі думкамі. Алег з гэтым змагаецца і спадзяецца, што калі выйдзе на працу, усё павінна зьмяніцца.

## Анёл – ахоўнік

Дапамогу, сустрэчу на мяжы і знаёмства з мясцовасцю сям'і Фаміных дапамаглі арганізаваць беларусы Каліфорніі. Адна з іх – сям'я Скарабагатых з Сан-Дыега, а таксама Надзея Нортан, кіраўніца Асацыяцыі Беларусаў Амэрыкі (АВА) з Сан-Францыска. Яе Фаміны лічыць сваім Анёлам – ахоўнікам, бо яна шмат зрабіла і працягвае рабіць для гэтай сям'і.

*«Усё пачалося з набыцьця падарункаў дзецям праз праэкт DISSIDENTBY на Новы год. Мне рандомна трапілася сям'я Фаміных. Я набывала навагоднія падарункі за грошы сабраныя суполкай беларусаў Сан-Францыска для дзяцей палітвязняў, у тым ліку і для дачкі Фаміных. Камунікацыя спачатку адбывалася ананімна, але ж калі каляды падарунак быў дастаўлены, яны даведаліся, што гэта ад беларусаў з Каліфорніі, такім чынам мы і пазнаёміліся. Тады я даведалася, што яны хочуць эміграваць з Беларусі і яны разглядалі некалькі варыянтаў. Пасьля нашай размовы Фаміны вырашылі ехаць у Каліфорнію. Тут таксама ў іх былі варыянты гарадоў. Асабіста я раіла ім Сакрамэнта. Гэты горад зручны для эмігрантаў, бо там ёсьць падтрымка для навічкоў. Але Фаміны абралі Сан-Дыега. Я пазнаёміла іх з мясцовымі беларусамі», – кажа Надзея Нортан.*

Алег Фамін яшчэ не здаў на аўтамабільныя правы, але рыхтуецца і ўжо запісаўся на здачу. Фаміны шчасьлівыя, што разам і ў бясьпецы. Яны вераць у тое, што калісьці вернуцца ў свабодную Беларусь. Хаця б у госьці – да сваякоў.



# ВЕЛІКОДНАЕ АРХІПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАНЬНЕ



***Годнаму сьвятарству й вернікам Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы, якія жывуць на Бацькаўшчыне і ў Замежжы.***

***†Сьвятаслаў, архіяпіскап БАПЦ.***

Вялікдзень, 2023 лета Божага

*“Што шукаеце жывога сярод мёртвых?*
*Яго няма тут: Ён Уваскрос...”*
*(Дабравесьце паводле Лукаша 24:5-6)*

Любыя вялебныя айцы, браты й сёстры ў Хрысьце!

Мінае літургійны год і Царква, праходзячы гадавое кола Набажэнстваў, вяртаецца да сьвяткаваньня галоўнага сьвята – Уваскрасеньня Хрыстовага – падзеі, якая адбылася дзьве тысячы гадоў таму і ёсьць сутнасьцю Хрысьціянскае веры, дзякуючы якому мы атрымалі жыцьцё вечнае для нашае душы. Таму гэтае сьвята называем – Вялікдзень. Без любові, якую прынёс нам Хрыстос, не магчыма пераадолець свае грахі й быць у яднаньні з Госпадам, бо сьвятое Дабравесьце вучыць нас: “Па тым пазнаюць усе, што Вы мае вучні, калі будзеце мець любоў паміж сабою.” (Ян. 13:35). І ў сёньняшні смутны час, наша вера дае нам сілы і патрэбу змагацца за праўду й дабро, за свабоду свае Радзімы.

Віншую зь Велікоднем ўсіх беларусаў, якія жывуць на Бацькаўшчыне, асабліва палітычных зьняволеных і перасьледаваных, і тых, што знаходзячыяся ў Замежжы, змагаюцца за Вольную Беларусь, у тым ліку й беларускіх жаўнэраў, што дапамагаюць братняй Украіне абараняцца ад агрэсіі

суайчыньнікам напоўніць свае сэрцы любоўю да Госпада і сваіх блізкіх, да роднае Беларусі і ўсяго ейнага духоўнага скарбу, які захавалі й перадалі нам нашыя продкі. Молімся таксама за ўсіх хрысьціянаў, каб кожны народ быў вольным і мог славіць Бога у сваёй Царкве, у сваіх традыцыях і абрадах, на сваёй роднай мове.
Ласка ўваскрослага Госпада нашага Ісуса Хрыста, любоў Бога Айца й супольнасьць Сьвятога Духа хай будуць з усімі вамі!
Хрыстос Уваскрос! Сапраўды Ўваскрос!

Зь любасьцю й малітвамі

# BELARUSIANS IN THE USA



***Mikhail Charopka, “Bielarus”***

Belarusians began to arrive in America as long ago as the **XVII century**.
Up to the XIX century, their number was small. They came here alone or as part of small groups. For example, we can recall **doctor Aliaksandr Kurytus (Kurchewski)**, a scientist and a teacher in New Amsterdam who arrived in the colonies in **1659**.
But the XX century has changed this situation. The flow of Belarusians to the United States augmented drastically and is still very numbered.
**In the XIX century, most Belarusian emigrants headed to America because of the economic situation in their country.** So they were looking for a better and more prosperous life. And they were focused on creating businesses and earning money. That’s why emigrants started different self-aid organizations like the **Jewish Voluntary Association of Mutual Aid “Ashmiany Brothers”** (1882), which also helped Belarusian emigrants from Ashmiany.
Later, the wars, revolutions, and political disturbances in Europe of the **XX century changed the character of migration**. As a result, thousands of emigrants left their homes and tried to start a new life on the other side of the Atlantic Ocean. They did it to save their lives and secure their children’s futures. Unfortunately, **the beginning of the XXI century has mostly stayed the same in the life stories of the Belarusians** who are still arriving in the United States of America. People flee from political repression just because they want a better life in their country – Belarus.
Here I can recall the name of **Anatole Sankovich**, who couldn’t return to Belarus but became **a surgeon in Chicago** and dedicated most of his life to saving people’s lives.
Or we have to mention **Barys Kit, a long-standing member of the American Institute of Aeronautics and Astronautics**. His works helped America to get to the Moon. But at the same time, he could be arrested and sent to GULAG (Soviet forced labor camps, auth.) and finish his life unknown and without any contribution to humankind.
The United States of America saved the lives of these Belarusians. It allowed them to develop their talents and skills, and they contributed considerably to the Country and the World.
Belarusians have been grouped into many organizations. For example, we can recall one of the oldest – **The Belarusan-American Association (BAZA), founded in 1949**. It still exists and helps new waves of Belarusian migrants to start their new life in the US.
But at the same time, migrants **don’t stop their activities and are trying to affect the situation in Belarus**. People still want to bring **freedom, genuine independence, and democracy** to their country of origin. They are running rallies in the cities and towns where they reside. Belarusians sign claims and petitions to the government of the United States. Many activists established and developed connections with other Belarusian political groups in exile worldwide.
It’s no secret that these groups can support democratic movements in Belarus only because they now live in a democracy. And everyone knows that democracy demands sacrifices. **We also must contribute to the country which gave us peace and surety in our future.**
Millions worked hard to build the United States of America as a great and prosperous democracy. **Hard labor and equality under the law** – that’s what America meant to many generations of emigrants.
Thousands of Belarusians already understood this simple but fundamental idea. We must be confident that our Belarusian community will transfer it to our children.
Not every one of us may become a surgeon or a scientist. Still, **everyone can be a respectful member of his local community**. We can easily sacrifice some part of our time for charity. It is effortless to join any volunteer movement to make our neighborhoods’ streets more beautiful and comfortable.
America does a lot for us and can do much more. We are free to become whoever we want and climb to the summits, whichever we choose to climb. But at the same time, **we must contribute to the country we are living in now**. We must make it an even better place to live by sacrificing our efforts and labor as our predecessors did.

# У БРУКЛІНЕ БЕЛАРУСЫ АДЗНАЧЫЛІ ВЯЛІКДЗЕНЬ

***Алесь Пазьняк***
***Здымкі: Алесь Пазьняк, Аляксандра Станкевіч***

**У Катэдральным саборы імя сьвятога Кірылы Тураўскага, што ў Брукліне, вернікі адзначылі Вялікдзень.**
Урачыстыя набажэнствы распачаліся 13 красавіка. У Вялікі Чацьвер успаміналі Сьвятыя Пакуты Хрыстовы і чыталі 12 урыўкаў з Новага Запавета аб апошніх гадзінах Ісуса Хрыста перад укрыжаваньнем.
У Вялікую Пятніцу адбыўся вынас Плашчаніцы. Таксама клірыкі Катэдры пратаярэй Іван і дыякан Мікола чыталі ўрыўкі з Дабравесьцяў аб сьмерці Госпада.
Позна вечарам у суботу 15 красавіка, каля 11.30 беларусы сабраліся на Паўночную службу. Яна плаўна перацякла ў Вялікодную.
Вернікі зрабілі хросны ход па будынку царквы і грамадзкай залі і засьпявалі:
*“Хрыстос уваскрэс з мёртвых, сьмерцю сьмерць патаптаў і існым у трунах жыццё падарыў”.*
Пасьля гэтага ўсе адзін аднаго пачалі вітаць словамі радасьці **“Хрыстос уваскрос!”, “Сапраўды ўваскрос!”**
Сутнасць Вялікадня ў Новым Запавеце – вечнае жыццё праз веру ва ўваскрэсенне Збавіцеля. У Сьвятым Пісаньні сказана: “Калі мы верым, што Ісус памёр і ўваскрос, то і памерлых у Ісусе Бог прывядзе з Ім”.
Гэта надзея для ўсіх вернікаў на ўваскрасеньне. Таму у храмах праходзяць урачыстыя богаслужэнні, якія праслаўляюць перамогу Хрыста над сьмерцю. Пазітыўны настрой свята выяўляецца і ў яго атрыбутах: кулічах і фарбаваных курыных яйках.
Падчас набажэнства айцец Іван Кухар зачытаў вялікоднае віншаваньне ад аріяпіскапа БАПЦ Сьвятаслава. У ім былі такія словы:
*“Віншую зь Велікоднем ўсіх беларусаў, якія жывуць на Бацькаўшчыне, асабліва палітычных зьняволеных і перасьледаваных, і тых, што знаходзячыся ў Замежжы, змагаюцца за Вольную Беларусь, у тым ліку й беларускіх жаўнёраў, што дапамагаюць братняй Украіне абараняцца ад агрэсіі маскоўскае імперыі зла. Зычу ўсім суайчыньнікам напоўніць свае сэрцы любоўю да Госпада і сваіх блізкіх, да роднае Беларусі і ўсяго ейнага духоўнага скарбу, які захавалі й перадалі нам нашыя продкі. Молімся таксама за ўсіх хрысьціянаў, каб кожны народ быў вольным і мог славіць Бога у сваёй Царкве, у сваіх традыцыях і абрадах, на сваёй роднай мове”.*
Перад заканчэньнем вялікоднай літургіі пратаярэй Іван Кухар асьвяціў артас (“квасны хлеб”), які сьпякла верніца Тацьцяна Красоўская. Гэты хлеб звычайна ўжываецца праз тыдзень пасьля адзначэньня Вялікадня. Ён увасабляе уваскрасеньне Хрыстова.
Вялікоднае набажэнства ў саборы скончылася агульнай кайнаніяй за сьвяточным сталом, якому папярэднічала асьвячэньне кулічэй, яек і ежы.
Прысутныя таксама маглі паслухаць канцэрт Тацьяны Грыневіч, вядомай беларускай сьпявачкі, якая завітала ў ЗША з Турэччыны.



















# Сябры БАЗА адзначылі Дзень Зямлі валянтэрскай



***Міхась Чаропка***

**22 красавіка** ва ўсім сьвеце адзначаецца **Дзень Зямлі**.
У гэты дзень праводзяцца мэрапрыемствы па ахове нашай плянэты ад забруджваньня і скарачэньня колькасьці лясоў.
Сябры **Ньюёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА)** не засталіся ў баку ад праблемаў навакольнага асяроддзя. Тым больш, што **26 красавіка** беларусы будуць адзначаць сумную гадавіну **Чарнобыльскай трагедыі.**
У гэтым годзе беларускія валянтэры далучыліся да арганізацыі Gowanus Canal Conservancy, якая займаецца ператварэньнем каналу Гаванус у Брукліне ў парк.
Канал знаходзіцца на мейсцы саляных балотаў, якія існавалі там да прыходу эўрапейцаў. Соль у канале з’явілася ад перамешваньня вады з крыніцаў і акіянскіх прыліваў. Каланісты, якія пасяліліся на берагох каналу, адразу зразумелі яго патэнцыял і пачалі выкарыстоўваць у камэрцыйных мэтах. Гаванус быў зручным шляхам вывазу тавараў з заводаў і фабрык, якія былі разьмешчаныя на яго берагох. Цягам часу паабапал ад каналу з’явіліся нафтаперапрацоўчыя заводы, якія і прывялі да асноўнага забруджваньня. Выкіды фабрык прапіталі зямлю пад каналам і вакол яго на 100 футаў. Зараз канал Гаванус – самая забруджаная водная артэрыя ў ЗША.
Другая праблема – гэта сцёкавыя воды. Яны слаба затрымліваюцца ў грунце пад вуліцамі суседніх кварталаў Брукліну і нясуць увесь бруд у канал. Адзін са спосабаў затрымліваць такую ваду – гэта пабудова водных садзікаў (як на фота). Такія садзікі на ўзбочынах вуліц могуць затрымліваць да 2240 галонаў дажджавой вады.
І менавіта для такіх садзікаў беларускія валянтэры рыхтавалі і высаджвалі расьліны.
Суботняй раніцай на перасячэньні 9-й авеню і Сміт стрыт сабралося з дзясятак людзей, у якіх ёсьць жаданьне аднавіць дадзены куток прыроды. У асноўным гэта былі мясцовыя жыхары, а таксама беларусы.
Па словах каардынатара з беларускага боку, Міхася Чаропкі, ўдзел у такіх мерапрыемствах вельмі важны для беларусаў у Нью Ёрку.
*“Мы паказваем, што мы ня проста жыхары гораду, ці краіны, а актыўныя ўдзельнікі ў справах мясцовых камʼюніці. Нам ня ўсё роўна і мы зацікаўлены, каб сьвет вакол нас станавіўся лепшым. Праз такія мэрапрыемствы мы наладжваем стасункі з горадам і робім свой унёсак у справу выратаваньня навакольнага асяроддзя. Напярэдадні трыццаць сёмай гадавіны Чарнобыльскай трагедыі, хто як не беларусы разумеюць важнасьць экалагічных праблемаў і іх наступстваў?”* – расказаў Міхась Чаропка.
Усе ўдзельнікі мэрапрыемства атрымалі вялікую асалоду ад працы на адкрытым паветры. Ладзілася шмат гутарак і адбываўся сапраўдны нэтворкінг. З расьлінамі прыйшлі папрацаваць і рэдактар спартыўнага часопісу, і мэнаджары з Заходняга ўзьбярэжжа Мангэтану, і рэжысэр-дакумэнталіст, і шмат іншых цікавых людзей.
Наступны раз беларусы прыйдуць валянтэрыць сюды ўжо ў чэрвені месяцы.
Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне і надалей плянуе прымаць удзел у розных валянтэрскіх праграмах. Сябры БАЗА запрашаюцца да актыўнага ўдзелу, а таксама чакаюцца прапановы па арганізацыі сваіх падобных мерапрыемстваў.
Калі ласка, зьвяртайцеся са сваімі прапановамі да нас праз форму звароту на нашым сайце.



# WHY IT’S IMPORTANT TO SUPPORT THE BELARUSIAN LANGUAGE TO OVERCOME THE POST-COLONIALISM IN BELARUS




***Marlon Parker***
***US – Belarus***

**Have you ever thought of the Soviet Union as a colonial state?**
**There are** many reasons why historians and political scientists have described the Soviet Union as a colonial state. One of the central ideas was that the Soviet system was oppressing nationalities inside of it. The goal was to elevate a Russian-speaking “Soviet citizen.” The primary and only language was supposed to be – Russian. The State treated all other nations but the Russian majority as second-class citizens.
Another reason why the Soviet Union was a colonial state is that it often used military force to maintain control over its territories. For example, the Soviet Union invaded and annexed several neighboring countries, including Poland, the Baltic states, and parts of Finland. The Soviet Union often justified these actions to protect the interests and its people. Still, they were also a means of expanding Soviet influence and power.
**The Soviet Union** also imposed economic and political systems on its controlled territories. The metropole set Soviet-style communism on the nationalities within the Soviet Union and countries under Soviet influence. The Soviet System suppressed local cultures and traditions and imposed a Soviet-style bureaucracy on local populations.
Overall, the Soviet Union was a colonial state because it sought to control and dominate the incorporated territories, often at the expense of local populations and cultures. Moreover, while the Soviet Union did provide some benefits to the domains it contained, such as education and healthcare, these benefits were often outweighed by the negative aspects of Soviet rule.
From this prospect, we will discuss Belarus, its past, and its possible future.
Post-colonialism in Belarus has been a topic of much discussion in recent years. Belarus was once part of the Soviet Union, and its history as a colony of the Soviet Union has had a lasting impact on the country. Many scholars argue that Belarus still struggles with the legacy of Soviet colonialism and that this legacy is evident in its politics, economics, and social structures.
**Belarus was a state** in the colonial Russian and later – Soviet Empire. The administrative center of the Empire – Moscow, was responsible for the decisions made and directed to its colonies with no other goal but to obligatory execute the orders.
After gaining Independence, Belarus had a chance to overcome post-colonial syndrome and head toward a bright and prosperous future. But the country failed it and has to stumble with the Reaction now.
**Let’s take a look** at what post-colonialism is.
**Post-colonialism** is a complex and multifaceted topic that examines colonialism’s cultural, economic, and political legacies. It is concerned with how the histories of colonialism continue to shape our world today and with the struggles for liberation and decolonization that have taken place in the wake of colonialism.
Post-colonialism in ex-Soviet countries refers to the aftermath of Soviet rule and its impact on these nations’ cultural, social, and economic landscape. While the Soviet Union officially dissolved in 1991, its legacy lives on in many ways. As a result, the process of decolonization in these countries has been complex and ongoing, marked by political turmoil, economic hardship, and cultural transformations.
**One of the most significant legacies** of Soviet rule in these countries is the persistence of authoritarian political systems. Nevertheless, many ex-Soviet states have struggled to establish stable democratic governments, with corruption and political repression remaining significant challenges. Moreover, the crash of the Empire contributed to ongoing social and economic problems, including poverty, inequality, and unemployment. And it played a negative role in Belarus. As a result, most people chose revisionist Alexander Lukashenka during the presidential elections in 1994. In his program, he offered the return to Soviet times with working factories, some stability, and close relations with Russia.
At the same time, post-colonialism in ex-Soviet countries and Belarus has also led to a resurgence of national identity and cultural expression. People in these countries have sought to establish their distinct identities separate from the Soviet Union. As a result, we saw a renewed interest in traditional culture and heritage.
**Thus, in 1990,** the “Law on Languages” was adopted in the Belarusian parliament. As a result, the Belarusian language became the state language. Furthermore, the government introduced a ten-year plan to implement the Belarusian language into all spheres of life in Belarus.
**But Lukashenka saw it** as a menace to his power and his main goal – restoring the Soviet-like State. As a result, the usage of the Belarusian language was shrinking yearly. The number of schools with the Belarusian language diminished drastically. No university or higher education institution has Belarusian language as the language of learning.
**A new-old metropole** – the Moscow state – directs most of the political rulings again in Belarus. Russia even decided alone to deploy troops in Belarus before the invasion of Ukraine. Therefore, it’s easy to prove that Belarus has never had any reason to participate in any aggression against its Southern neighbor.
Thus Belarus is stuck now between its Soviet colonial past and possible European post-colonial future. But the country has to break ties with the metropole to take a step ahead.
**Some countries like** Lithuania, Latvia, and Estonia fought against the weakening monster. They also sacrificed the lives of their patriots and heroes, but the Empire was already looking like a railed-off train. In 2014 Ukraine faced an enemy which had already restored its muscles and was craving fresh blood.
**And here we come** to the point that without a victorious and free Ukraine, there is no future for free and independent Belarus.
The ongoing war may weaken the Russian imperial monster again. Belarus will be able to profit from it by quitting the orbit of Moscow’s influence.
**And undoubtedly,** Belarusians have to be prepared to utilize this opening. One of the instruments is the Belarusian language.
At the end of the 18th century, the American founding fathers deeply understood the importance of mentally separating the new State from the Empire of King George III. And the language question was one of the highly discussable topics in most discourses.
**Some of the speakers** proposed to use the German language – the second unofficial country’s language at that time. There were also the ideas to invent a new language or to speak Hebrew. And here came Noah Webster, who decided to end these debates and adopt the American speech practices in a new version of the English language.
**In Belarus,** people can refrain from inventing any new language or rewriting a new version of a widely-used Russian language. Everything they need is to spread the usage of the Belarusian language. People must use their national language to secure their future and cut ties with the dying Russian Empire.
**The Belarusian language** is only the beginning of the long and heavy path. Still, it’s also a high start to this marathon. All that is needed now from the Western countries is the support of the runners and fair judgment during the race.

# ЦІ СТАНЕ БЕЛАРУСЬ НОВАЙ ХІРАСІМАЙ?

*Алесь Пазьняк*

*Здымкі: Алесь Пазьняк, Віталь Зайка*




**Такое пытаньне прагучала падчас акцыі памяці 37-й гадавіны Чарнобыльскай трагедыі.**
Беларусы Нью-Ёрка на бягучым тыдні правялі два мерапрыемства прымеркаваных да атамнай катастрофы ў Беларусі.
У сераду, 26 красавіка, ля будынку штаб-кватэры Аб'яднаных Нацыяў на Мангэтане апоўдні адбыўся мітынг, арганізатарм якога выступіла Беларуска- Амэрыканскае Згуртаваньне «Пагоня».
Па словах Віталя Зайкі, старшыні Згуртаваньня, штогадовая акцыя зьбірае беларусаў не толькі з Нью-Ёрку, але і з іншых эрый, якія паказваюць сваё прысутнасьцю неабыякавасьць да падзей, якія адбываюцца ўБеларусі.

*«Кожны год мы зьбіраем землякоў, каб правесьці акцыю памяці і салідарнасьці з пацярпелымі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, ахвярамі палітыкі рэжыму да жыхарой Радыяцыйна забруджаных тэрыторыяў, і да пратэсту Супраць разьмешчаньня расейскай атамнай зброі ў Беларусі», – выказаўся сп. Зайка.*
Актывісты сабраліся трымалі ў руках бел-чырвона-белыя сьцягі і плякаты з надпісамі, якія тлумачылі сітуацыю на Беларусі.
Спадар Зайка распавёў, што ААН як арганізацыя апынулася ў разгубленасьці пасьля пачатку вайны ва Украіне і не выконвае сваё прызначэньне. «Пагоня» неаднаразова падавала заявы ў структуры ААН аб узьдзеяньні на рэжым у Беларусі па спыненьні будаўніцтва новай АЭС і вынішчэньні беларускага народа праз наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС у 1986 годзе.

Таксама ў нядзелю, 30 красавіка, у саборы сьв. Кірылы Тураўскага на Атлянтык Авэню адбыўся малебен аб абароне Беларусі. Сьвятар БАПЦ Іван Кухар узгадаў наступствы аварыі на ЧАЭС і стварыў малітву прашэньня і заступніцтва за Беларусь у сувязі з чарговай атамнай пагрозай.
*«Беларусь шмат адпакутвала і працягвае несьці свой крыж перад Богам таксама ў пакутах і несвабодзе, атамным шантажы і дыктатуры», – прамовіў сьвятар.*

У грамадзкай залі сабора BAZA правяла імпрэзу «Не – расейскай атамнай зброі ў Беларусі». У залі не было шматлюдна. Відаць дождж, які ішоў двое содняў, унёс свае карэктывы ў чалавечыя пляны. Аднак тут гучала шмат цікавай і грунтоўнай інфармацыі пра Чарнобыльскую катастрофу і будучыню Беларусі.
З дакладамі і аповядамі па тэме выступілі
Віталь Зайка, Міхал Чаропка, заступнік старшыні нью-ёркскага адздзела BAZA, Натальля Федарэнка, старшыня Галоўнай управы BAZA, а таксама сябра Рады БНР Ганна Сурмач.

Присутныя паглядзелі фільм BBC аб аварыі на ЧАЭС і генацыдзе беларусаў праз сакрэтныя Распыленьні радыёактыўнага дажджу пасьля аварыі.
Зьміцер Левіт, сябра BAZA і амэрыканскі вайсковец падзяліўся ўспамінамі пра Чарнобыльскую трагедыю. Таксама ён распавёў пра бліжэйшыя пляны паездкі ў Нямеччыну для супрацоўніцтва і навучаньня вайскоўцаў ЗСУ.

Нагадаем, што Расея мае намер размясьціць сваю ядравую зброю на тэрыторыі Беларусі. Зараз праводзіцца будаўніцтва сховішча, якое плянуецца скончыць 1 ліпеня.
Па словах Віталя Зайкі, гэта можа прывесьці ў выпадку пашырэньня ваенных дзеяньняў, да новай Хірасімы, але ўжо на тэрыторыі Беларусі.

# ПАДЗЯКА АМЭРЫКАНСКІМ БЕЛАРУСАМ

**Зянон ПАЗЬНЯК**
**ад Беларускага Нацыянальнага Сакратарыяту Руху "Вольная Беларусь"**

На працягу лістапада і ў пачатку сьнежня гэтага году ў Нью-Ёрку адбывалася зборка грошай для руху "Вольная Беларусь" на набыцьцё рыштунку для палка Каліноўскага, які ваюе ў складзе збройных сілаў Украіны супраць маскоўскіх агрэсараў. Усяго сабрана 14.470 даляраў. Зь іх 390 ужо скарыстана на набыцьцё ўцяпляльнікаў,жгутоў (турнікетаў) і лекаў, на трансакцыю і перасылку. Рэшта — 14.080 даляраў — пойдзе па галоўным прызначэньні, пра якое ведаюць даўцы.
Кожнаму з 34-х даўцаў выказаная пісьмовая падзяка за падтрымку Руху і ваяроў. Але тут (у публічным рэсурсе), улічваючы ваенны час і стан рэпрэсіяў ў акупаванай Беларусі, мы не падаём імёны нашых дабрадзеяў, дбаючы пра бясьпеку.

Вялікая ўсім падзяка.
25 сьнежань 2022 г.





# МЭМАРАНДУМ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ Ў ЗША/ MEMORANDUM OF THE REPRESENTATIVE OF THE

Мы, прадстаўнікі беларускай дыяспары ў ЗША, прызнаючы наяўнасьць акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі й ўсьведамляючы адказнасьць за катастрафічныя наступствы расейскай ваеннай агрэсыі ва Украіне, зьвяртаемся да суродзічаў, якія засталіся на радзіме. Прымаючы да ўвагі той факт, што на сёньняшні момант Расейская Фэдэрацыя дэ юрэ й дэ факта з'яўляецца дзяржавай-тэрарыстам і нясе пагрозу ня толькі сваім бліжэйшым суседзям, але й ўсяму цывілізаванаму сьвету, мы абсалютна перакананыя ў тым, што беларускія грамадзяне не павінныя заставацца ў баку ад таго, што адбываецца, і мусяць любымі дасяжнымі сродкамі дамагацца наступнага:

- тэрміновага й неадкладнага вываду расейскіх войскаў з тэрыторыі Беларусі;
- скасаваньня дамовы аб калектыўнай бясьпецы (АДКБ), якая дазваляе Расеі выкарыстоўваць тэрыторыю Беларусі для ваеннай агрэсыі;
- ануляваньня незаконнай дамовы аб стварэньні так званай Саюзнай дзяржавы з Расейскай Фэдэрацыяй;
- выйсьця з Мытнага зьвязу й іншых хаўрусаў, створаных нелегітымнай уладай з мэтай паступовага паглынаньня нашай краіны ўсходнім суседам;
- увядзеньня пашпартнага кантролю на мяжы з РФ.
Беларусь павінна вярнуцца ў Эўропу, а не заставацца ў ганебных хаўрусах з дзяржавай-агрэсарам! Гэта будзе магчымым пасьля вырашэньня першачарговай задачы – ліквідацыі антыбеларускага па сваёй сутнасьці рэжыму Лукашэнкі. І за гэта неабходна штодзённа змагацца. Жыве Беларусь!

2 красавіка 2022 года
Ад імя Беларускага Нацыянальнага сакратарыяту (БНС) – Зянон Пазьняк;
Ад імя Беларуска-Амэрыканскага згуртаваньня "ПАГОНЯ" – Віталь Зайка;
Ад імя Беларускай Асьветніцкай Лігі Амэрыкі (BELA) – Ірына Хадарэнка;
Ад імя Беларуска-Амэрыканскага Заадзіночаньня "BAZA" – Натальля Федарэнка;
Ад імя Беларускага Інстытута Амэрыкі (BIA) – Алена Рыдзеўская;
Ад імя Беларускай Фундацыі Крэчэўскага – Галіна Тумаш-Павэлс.

We, the representatives of the Belarusian diaspora in the USA, recognizing the existence of the occupation regime on the territory of Belarus and realizing the responsibility for the catastrophic consequences of the Russian military aggression in Ukraine, claim to the compatriots who are currently in the homeland. Taking in the view the fact, that today de jure and de facto the Russian Federation is a terrorist state, that threatens not only its closest neighbors, but also the entire civilized world, we are absolutely convinced that Belarusian citizens should not stay away from the situation and they must achieve the following, using all available resources:

- urgent and immediate withdrawal of Russian troops from the territory of Belarus;
- the abolition of the Collective Security Treaty, which allows Russia to use the territory of Belarus for military aggression;
- annulment of the illegal agreement on the establishment of the so-called Union State with the Russian Federation;
- cancellation of the Customs Union and other allies formed by the illegitimate government and aimed to gradually absorb our native country by the eastern neighbour;
- implementation of passport control on the border with Russia.
Belarus must return to Europe and to leave all shameful alliances with the aggressor state! It will be possible after solving the priority task – the elimination of the anti-Belarusian regime of Lukashenka. It is necessary to fight for it every day.
Long live Belarus!

April 2, 2022
On behalf of the Belarusian National Secretariat (BNS) – Zianon Pazniak;
On behalf of the Belarusian-American Association "PAHONYA" – Vital Zaika;
On behalf of the Belarusian Enlightenment League of America (BELA) – Iryna Khadarenka;
On behalf of the Belarusian-American Association "BAZA" – Natallia Fedarenka;
On behalf of the Belarusian Institute of America (BIA) – Alena Rydzeuskaya;
On behalf of the Belarusian Kreceuski Foundation – Halina Tumash-Pavels.




## BAZA’s STATEMENT ON RUSSIA’s ATTACK AGAINST UKRAINE 02.25.2022

The Belarusian American Association (BAZA) strongly condemns the Russian Federation’s armed aggression against Ukraine and the participation of Aliaksandr Lukashenka’s illegitimate Belarusian regime in this aggression.
The current armed attack by the Russian Federation against Ukraine is unlawful. It carries the characteristics of an international war crime. The incumbent authorities of the Republic of Belarus are complicit in supporting these illegal actions.
We urge the United States government to take further action by:
- Designating Russia as a state sponsor of terror, and declaring Putin a war criminal
- Enforcing the Magnitsky Act on the Russian leadership and elites who profit from human rights violations inside and outside of Russia
- Cutting off Russia from all international public and private financial markets including SWIFT, trading sovereign debt, and trading sovereign currency
- Banning Russian government/propaganda accounts from all US media platforms including government officials who use social media platforms to promote state propaganda
- Directing US companies to cease all operations within Russia and enacting an energy embargo
- Identifying, exposing, and freezing the assets of all entities related to Putin and his officials.

In addition to the limited sanctions already announced, further measures are necessary to send a decisive message to the Belarusian regime. We call on the international community to take a firm stand on both the leadership of the aggressor state and Aliaksandr Lukashenka’s illegitimate regime in Belarus.
The recognition of the so-called “LPR” and “DPR” by the Belarusian regime of Aliaksandr Lukashenka is a violation of Ukraine’s sovereignty and a treasonous act against the national interests of Belarus and the Belarusian people,
We believe that the future of Belarus and the region will depend on the success of Ukraine in repelling this aggression.
BAZA calls on the international community to give its full support to the defense of Ukraine against the armed aggression of the Russian Federation.

Founded in 1949, the BAZA is the largest organization of Belarusian Americans in the United States.

2711 Woodley Place NW, Washington, D.C. 20008 e-mail: bazadcinfo@gmail.com

## ЗАЯВА БАЗА З НАГОДЫ ПЕРАКІДВАНЬНЯ РАСЕЙСКІХ ВОЙСКАЎ У БЕЛАРУСЬ

**Галоўная Управа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня 30 студзеня 2022 года**

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне вельмі занепакоена сучаснай сітуацыяй у Беларусі. У апошнія дні ў краіну прыбыла вялікая колькасьць расейскіх войскаў. Гэта супярэчыць Канстытуцыі Беларусі, пагражае канчатковай стратай суверэнітэту і незалежнасьці краіны, ставіць Беларусь пад пагрозу магчымага вайсковага ўдару ў выпадку вайны Расеі з Украінай.

Расейскія акупацыйныя войскі на тэрыторыі Беларусі могуць канчаткова прывесьці да страты дзяржавай магчымасьці вырашэньня сваёй унутранай і знешняй палітыкі, а таксама да ўцягваньня ў войны, якія вядзе Расея.
Дадзенаму становішчу паспрыяла мэтанакіраваная палітыка нелегітымнага ўзурпатара ўлады ў Беларусі Лукашэнкі А.Р.

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне заклікае да неадкладнага вываду расейскіх акупацыйных войскаў з тэрыторыі Беларусі. Мы таксама выступаем за вяртаньне Беларусі паўнавартаснага нейтральнага статусу і выхаду з дамоваў з Расеяй, якія пагражаюць беларускай незалежнасьці і суверэнітэту.



## АДКРЫЦЬЦЁ БЮСТАЎ ТАДЭВУША КАСЬЦЮШКІ І КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА
































**26 сакавіка 2022 года каля сабору Сьв. Кірыды Тураўскага ў Брукліне (Нью Ёрк, ЗША) адбылося ўрачыстае адкрыцьцё бюстаў Нацыянальнага Героя Беларусі, ЗША і Польшчы – Андрэя Тадэвуша Банавэнтуры Касьцюшкі і Нацыянальнага Героя Беларусі – Кастуся (Вінцэнта, Канстанціна) Каліноўскага.**

Ганаровы Нацыянальны праект па ўсталяваньні бюстаў герояў Беларусі быў рэалізаваны дзеля падтрымкі змаганьня беларускага народу супроць антынароднага тэрарыстычнага прамаскоўскага рэжыму ў Беларусі. Героі змагаліся за незалежнасьць Беларусі, Амэрыкі, а таксама Польшчы і Летувы, зь якімі Беларусь мела супольную гісторыю. Іх асобы і сёньня аб’ядноўваюць народы гэтых краінаў у супроцьстаяньні прамаскоўскаму рэжыму Лукашэнкі і агрэсіўнай палітыцы Расеі.

Урачыстасьць пачалася з выступу **Зянона Пазьняка**, дэпутата незалежнасьці, кіраўніка КХП БНФ, каардынатара Беларускага Нацыянальнага Сакратарыяту і непахіснага патрыёта Беларусі. Адпачатку сваёй прамовы, спадар Зянон аб’явіў хвіліну маўчаньня, каб ушанаваць герояў, якія сёньня паміраюць у змагманьні з маскоўскімі акупантамі. Завершыў сваю прамову сп. Пазьняк словамі:” *Дык няхай жа сьветлая памяць пра нашых герояў уздымае наш дух і вядзе нас да перамогі над расейскімі ворагамі чалавецтва, каб вечна была вольная Беларусь і вольная Украіна. Жыве Беларусь! Слава Украіне!*”

**Потым прамаўляў Аляксандар Хомчанка,** стараста сабора Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, арганізатар і каардынатар праекта.

Пасьля пад сьпеў Духоўнага гімну “Магутны Божа” (ў запісе царкоўнага хору Сабора з 1957 года у час адчыненьня Беларускай Царквы) павольна былі ўзьняты і спушчаныя белыя пакрывалы з помнікаў героям. Тады **епіскапам-уладыкам Сьвятаславам** пра асісьце духавенства адбылося асвячэньне усталяваных бюстаў.

Імпрэза працягвалася ў грамадзкай залі Сабора. Выступалі госьці - **амэрыканцы, украінцы, палякі, летувісы, прамаўлялі дзеячы беларускіх арганізацый з Канады, зЧыкага, з Фларыды, Каліфорніі, Мінесоты, Філадэльфіі** і іншых мясьцінаў. Выступіў аўтар бюстаў скульптар **Гэнік Лойка**.

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне і Парафіяльная радя Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы дзякуюць ўсім, хто верыў у гэты праект, усяляк падтрымліваў яго, ахвяраваў сродкі і спрычыніўся да ажыцьцяўленьня!

Выказваем падзяку Зянону Пазьняку – натхняльніку і ініцыятару праета. Выказваем асаблівую падзяку Аляксандру Хомчанку, арганізатару і каардынатару праекта, які быў сапраўдным цягніком праекта і яго жонцы **Людміле**, без чыей дапамогі ажыцьцяўленьне ўсяго праекту было б пад вялікім пытаньнем. Выказваем падзяку скульптару **Геніку Лойку**, які выцерпеў катаваньні ў лукашысцкай турме за беларускую пазыцыю, але здолеў ўцячы ад рэжыму і завершыць творчую працу над праектам. Мы дзякуем нашым сябрам, хто змаглі далучыцца да нас у такі ўрачысты і важны момант.

Былі рады прывітаць **Ховарда Колінса**, выконваючага абавязкі дырэктара карпарацыі мясцовага развіцця Атлантык Авеню; **Джона Кунстадтэра**, намесніка пасла ЗША у Беларусі у 2000—2001 гадах, аўтара 5 фотапраектаў прысьвечаных беларускай глыбінцы. Мы асабліва ўсьцешаны былі тым, што да нашай урачыстасьці далучыліся прадстаўнікі украінскай, польскай і літоўскіх дыяспар у Нью Ёрку. Дзякуем прадстаўнікам украінскай дыяспары **Іванцы Заяц**, Прэзідэнту Нью-Ёркскага аддзяленьня Украінскага кангрэсовага камітэта Амэрыкі (UCCA), **Андрэю Дабранскаму**, дырэктару па сувязях Украінскага кангрэсовага камітэта Амэрыкі і **Валянціне Бардаковай**, валянтэрцы і актывістцы украінскай дыяспары ў Нью Ёрку, што нягледзячы на вайну і на ачарняльную прапаганду супраць беларускага народа, выказалі падтрымку беларусам, якія знаходзіцца ў закладніках дыктатарскага рэжыма. Спадарыня Іванка Заяц выказала прадзяку беларусам, якія далучаюцца да батальёна Кастуся Каліноўскага і змагаюцца ва Ўкраіне супраць расейскай акупацыі.

Дзякуем прадстаўнікам польскай дыяспары **Стэфану Олеяшу**, незалежнаму аналітыку палітыцы бяспекі, адстаўному афіцэру арміі ЗША, член-заснавальніку і цяперашняму выканаўчаму віцэ-прэзідэнту Амерыканскай асацыяцыі сяброў Касцюшкі ў Вест-Пойнце, і **Кшыштафу Грабоўскаму**, кіраўніку па разьвіцьцю бізнэсу Польскага агенцтва інвестыцый і гандлю, якія далучыліся да ўрачыстасьці з нагоды адкрыцьця бюстаў Герояў і выказалі падтрымку беларускаму народу ў барацьбе за яго волю і за незалежнасьць Беларусі. Выказваем асобную падзяку Стэфану Олеяшу за цікавы расповяд з унікальнымі бібліяграфічнымі фактамі аб асобе Андрэя Тадэвуша Банавэнтуры Касьцюшкі.

Дзякуем прадстаўнікам літоўскай дыяспары ў Нью Ёрку **Дыяне Тамкявічэне і Вітасу Тамкявічусу**, якія далучыліся да важнай паедзі беларускай дыяспары, каб выказаць падтрымку беларускаму і ўкраінскаму народам у змагманьні супраць расейскай акупацыі.

Таксама былі рады прывітаць беларусаў з розных куткоў Амэрыкі, што знайшлі магчымасьць далучыцца да ўрачыстасьці ці даслаць сьвяточныя прывітаньні. Так, **Алесь Кот**, беларускі актывіст, сябра Згуртаваньня беларусаў Канады, сябра Прэзідыюму Рады БНР, прыехаў з Таронта (Канада), каб далучыцца да Адркыцьця Бюстаў Герояў. Рады былі прывітаць **Юрыя Беленькага**, намесьніка старшыні КХП БНФ, дарадцу па эканамічным пытаньні. З прывітаньнямі і віншаваньнямі з Каліфорніі далучылася **Надзея Нортан**, прэзідэнтка Асацыяцыі Беларусаў Амэрыкі. Таксама да ўрачыстасьці далучыліся **Віталь Зайка** – старшыня Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”, **Ірына Хадарэнка і Андрусь Асадчы** прадстаўнікі Беларускай Асветніцкай Лігі Амэрыкі. З прывітаньнямі з Фларыды далучыліся сябры БАЗА: **Натальля Багацішчава, Сяргей і Паліна Чарняк, Аляксандра і Андрэй Пушкаровы**.

Прывітальныя лісты былі атрыманыя ад **Івонкі Сурвілы**, старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі **Жанны Чарняўскай**, старшыні Беларусаў Чыкага. Асобную

падзяку выказваем актывістам Нью Ёркскага аддзела БАЗА і ўсім сябрам, хто дапамагаў у рэалізацыі праекта на любым яго этапе: **Вадзіму Васільеву, Дзянісу Дземчанка, Сяргею Мядзведзеву, Ігару Вырвічу, Ганьне Сурмач, Тацьцяне Красоўская, Натальлі Федарэнка, Сяргею Кудзелічу, Аксане Пятрашка, Віктару Данілаву, Андрэю Дундукову, Валеру Мінцу, Уладзіміру Караткевічу, Аксане Раманюк, Міхаілу Чаропку**.

# UNVEILING OF BUSTS OF TADEUSZ KASCIUSZKA AND KASTUS KALINOUSKI

**On March 26th, 2022, the monuments of the National Hero of Belarus, USA, and Poland – Andrei Tadeusz Bonaventura Kosciuszko, and the National Hero of Belarus – Kastus (Vincent, Konstantin) Kalinouski, were unveiled in Brooklyn, New York in front of the Saint Cyril's of Turau Cathedral.**

The Belarusian diaspora implemented an Honorary National Project to install Busts of Belarusian Heroes to support the struggle of the Belarusian people against the anti-people terrorist pro-Moscow regime in Belarus. The heroes fought for the independence of Belarus, America, Poland, and Lithuania, with which Belarus had a shared history. Their personalities still unite the peoples of these countries in opposition to the pro-Moscow regime of Lukashenko and the aggressive policy of Russia.

The celebration began with a speech by **Zianon Pazniak**, Leader of the Conservative Christian Party – BPF (Belarusian Popular Front), Coordinator of the Belarusian National Secretariat “Free Belarus,” and a staunch patriot of Belarus. At the beginning of his speech, Mr. Pazniak declared a minute of silence to honor the heroes dying today in a fight with the Moscow occupiers. At the end of his remarks, Mr. Pazniak said: “So let the bright memory of our heroes lifts our spirits and leads us tovictory over Russia's enemies of humankind, to be forever free Belarus and free Ukraine. Long live Belarus! Glory to Ukraine! ”

Then spoke **Aliaksandr Khomchanka**, head of the Cathedral of St. Cyril of Turau in Brooklyn, organizer, and coordinator of the project.

Afterward, the white hymns from the monuments were slowly raised and lowered to the singing of the Spiritual Hymn “Mighty God” (recorded by the church choir of the Cathedral in 1957 during the opening of the Belarusian Church). Then the busts were consecrated by **Bishop Sviatoslav** with the assistance of the clergy.

The event continued in the public hall of the Cathedral. The guests were **Americans, Ukrainians, Poles, Lithuanians, and activists of Belarusian organizations from Canada, Chicago, Florida, California, Minnesota, Philadelphia**, and other places. In addition, the author of the busts, sculptor **Henik Lojka**, spoke.

Belarusan-American Association (BAZA) and Parish Council of the Cathedral of St. Cyril of Turau of the Belarusian Autocephalous Orthodox Church would like to thank all those who believed in this project, supported it in every possible way, donated funds, and contributed to its implementation!

We thank Zianon Pazniak, the inspirer and initiator of the project.

We are incredibly grateful to Aliaksandr Khomchanka, organizer and coordinator of the project, who was a real locomotive of the project, and his wife **Ludmila**, without whose help the implementation of the whole project would be in question.

We want to thank the sculptor **Henik Lojka**, who was tortured in Lukashenka prison for his Belarusian position but managed to escape from the regime and complete his creative work on the project.

We thank our friends who were able to join us at such a solemn and meaningful moment.

We were pleased to welcome **Howard Collins**, Acting Director of Atlantic Avenue Local Development Corporation; **John Kunstadter**, US Deputy Ambassador to Belarus in 2000-2001, author of 5 photo projects dedicated to the Belarusian countryside.

We were especially pleased that representatives of the Ukrainian, Polish and Lithuanian diasporasin New York joined our celebration.

We thank the representatives of the Ukrainian diaspora: **Ivanka Zajac**, President of the New York Branch of the Ukrainian Congressional Committee of America (UCCA), **Andriy Dobriansky**, Director of Communications of the Ukrainian Congressional Committee, Bartholomew of America, and **Valentina Bardakova** Ukrainian diaspora in New York, who, despite the war and defamatory propaganda against the Belarusian people, expressed support for Belarusians held hostage by the dictatorial regime. Furthermore, Ms. Ivanka Zayats expressed gratitude to the Belarusians who joined the battalion of Kastus Kalinouski and fought in Ukraine against the Russian occupation.

We thank Polish Diaspora members **Stephen Olejasz**, independent security policy analyst, retired U.S. Army officer, founding member, currently executive vice president of the American Association of Friends of Kosciuszko in West Point, and **Christopher Grabowski** – Head of the Polish Investment and Trade Agency. He also joined the celebration and expressed support for the Belarusian people in the struggle for their freedom and independence of Belarus.

Special thanks to Stephen Olejasz for an exciting story with unique bibliographic facts about the person of Andrei Tadeusz Bonaventura Kosciuszko.

We thank the representatives of the Lithuanian Diaspora in New York, **Diana Tamkeviciene and Vitas Tamkevicius**. They joined Belarusian Diaspora to express their support for the Belarusian and Ukrainian peoples in their struggle against the Russian occupation.

We were also happy to greet Belarusians from different parts of America with the opportunity to join the celebration or send their greetings. As **Alexandre Kot**, a Belarusian activist, a member of the Union of Belarusians of Canada, and a member of the Presidium of the BNR Council came from Toronto (Canada) to join the Unveiling of the Busts of Heroes.

We were glad to greet **Yuri Belenky**, Deputy Chairman of the CCP BPF, Economic Adviser. **Nadzeya Norton**, President of the Association of Belarusians of America, joined the congratulations and congratulations from California.





**Vitaly Zaika**, chairperson of the Belarusian-American Pahonia Association, **Iryna Khadarenka, and Andruś Asadčy**, representatives of the Belarusian Enlightenment League of America, joined the ceremony.

Members of BAZA from Florida joined the celebration: **Natalia Bogatishcheva, Sergei and Pauline Chernyak, Alexandra and Andrei Pushkarov**.

**Ivonka Survilla**, Chairperson of the Council of the Belarusian People's Republic, and **Zhanna Charniauskaya**, Chairperson of the Belarusians of Chicago, also sent their welcoming letters.

Special thanks to the activists of the New York branch of BAZA and all friends who helped in the implementation of the project at any stage: **Vadim Vasiliev, Denis Demchenko, Sergei Medvedev, Igor Vyrvich, Anna Surmach, Tatiana Krasovskaya, Natalia Fedorenko, Sergei Kudzek, Sergei Kudel Danilov, Andrei Dundukov, Valery Mints, Uladzimir Karatkevich, Oksana Romaniuk, Mikhail Charopka**.

# СУМЕСНЫ МАРШ ПРЫСЬВЕЧАНЫ ДНЮ ВОЛІ 2022/ FREEDOM DAY RALLY



Сумесны Марш прысьвечаны Дню Волі 2022/Freedom Day Rally 2022

У пятніцу 25 сакавіка 2022 года на Манхэттане адбылася акцыя прысьвечаная Дню Волі. Мерапрыемства было арганізаванае Ірынай Хадарэнка, якая з'яўляецца прадстаўніком Беларускай Асветніцкай Лігай Амэрыкі, пры падтрымцы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночання, Беларускага Інстытута Амэрыкі і Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне прадстаўлялі Натальля Федарэнка, старшыня Галоўнай управы БАЗА, і Міхась Чаропка, сябра Управы Нью-Ёркскага аддзела.

Удзельнікі сабраліся ў дзве гадзіны апоўдні перад расейскім консулятам, а потым прайшлі маршам па Пятай авеню да будынка Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Адзначэньне галоўнага нацыянальнага сьвята Беларусі Дня Волі было вырашана правесьці акцыяй пратэсту супраць агрэсара Расеі, бо Расея сёньня з маўклівай згоды дыктатара Лукашэнкі вядзе зьнішчальную вайну ва Украіне, а беларускі народ існуе ў няволі і зьяўляецца закладнікам двух дыктатараў.

Падчас прамоваў выступоўцы выказвалі нязгоду і гнеў з нагоды вайны ва Украіне, якую развязала Расея. Дзеяньні расейскага рэжыму былі асуджаныя і прызнаныя фашысцкімі.

Удзельнікі акцыі патрабавалі вывядзеньня расейскіх акупацыйных войскаў з тэрыторыі Беларусь і спыненьня выкарыстаньня тэрыторыі Беларусі як пляцдарма для нападу на Украіну. Акрамя таго было задэклярравана патрабаваньне скасаваньня існуючага фармальнага хаўрусу Беларусі з агрэсарам Расеяй.

Калі ўдзельнікі акцыі рушылі па Пятай авеню да будынка Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, па дарозе яны заклікалі амэрыканцаў падтрымаць украінскі народ і зьвяртацца да амэрыканскіх чыноўнікаў з патрабаваньнем аказаць Украіне рашучую падтрымку і закрыць неба над Украінай.

У другой частцы акцыі перад будынкам ААН удзельнікі разгарнулі вялікі бел-чырвона-белы сьцяг і выступалі з патрабаваньнем да чыноўнікаў прыняць рашучыя дзеяньні па спыненьні зьнішчальнай акупацыйнай вайны ва Украіне, якую вядзе Расея і пагражае ўсёй Еўропе.

Жыве Беларусь!
Слава Украіне!

---

Freedom Day Rally 2022

A joint action dedicated to Freedom Day took place in Manhattan on March 25th, 2022. The event was organized by Iryna Khadarenka, a representative of the Belarusian Enlightenment League of America with the support of the Belarusan-American Association, the Belarusian Institute of America, and the Belarusian-American Association “Pahonia”. The Belarusian-American Association was represented by Natalia Fedarenka, President of the Headquarters of BAZA, and Mikhal Charopka, Member of the Board of the New York Chapter.

The participants gathered at two o'clock in the afternoon in front of the Russian consulate and then marched along Fifth Avenue to the United Nations building. It was decided to celebrate the main national holiday of Belarus Freedom Day protesting against the Russian aggressor, because Russia having the tacit consent of dictator Lukashenko is now waging a devastating war in Ukraine, and the Belarusian People exist in captivity and are hostages of two dictators.

The participants of the action expressed their disagreement and anger over the war in Ukraine, which was waged by Russia. The actions of the Russian regime were also condemned and declared fascist.

The protesters demanded the withdrawal of Russian occupation troops from Belarus and stopping the use of Belarusian territory as a springboard for an attack on Ukraine. In addition, a demand to abolish the existing formal alliance of Belarus with Russia was declared.

As protesters marched down Fifth Avenue to the United Nations, they called on Americans to support the Ukrainian people and to appeal to US officials to give Ukraine strong support and close the skies over Ukraine.

In the second part of the action in front of the UN building, participants unfurled a large white-red-white flag and demanded that officials take decisive action to stop the devastating occupation war in Ukraine, which is being waged by Russia and threatens the whole of Europe.

Long live Belarus!
Glory to Ukraine!












# НА МАНГЭТАНЕ ПРАЙШЛА АКЦЫЯ САЛІДАРНАСЬЦІ З НАРОДАМ УКРАІНЫ

27 лютага 2022 году ў Нью-Ёрку на Мангэттане адбылася акцыя пратэсту супраць расейскай агрэсіі ва Украіне. Мітынг сабраў больш за тысячу чалавек пад украінскімі, беларускімі, грузінскімі, літоўскімі, эстонскімі, латвійскімі і іншымі сьцягамі. Мерапрыемства пачалося перад расейскім консулятам, а потым перамясьцілася да будынку ААН. Удзельнікі выказалі абурэньне і з нагоды акупацыі тэрыторыі Беларусі расейскімі войскамі, выкарыстаньнем яе тэрыторыі дзеля атакаў на Украіну, а таксама нязгоду з магчымым выкарыстаньнем беларускіх жаўнераў у гэтай злачыннай вайне.

Пратэстоўцы выступілі супраць расейскай прысутнасьці, якая трывае ў Беларусі ўжо некалькі стагоддзяў і ў сёньняшнія часы працягваецца ў выглядзе прамаскоўскага рэжыма Лукашэнкі. Зараз змаганьне беларускага народа стала асабліва цяжкім, бо акрамя дыктатарскага рэжыма актывізаваўся галоўны вораг – імпэрская Расея, якая акупавала тэрыторыю Беларусі расейскімі войскамі. Дзесяткі беларусаў забіты ці зніклі бяз звестак, сотні – звольнены з працы ці выгнаныя з месцаў вучобы, тысячы беларусаў зараз сядзяць у турмах з тэрмінамі да 18 гадоў за свой удзел у барацьбе з прамаскоўскай дыктатурай. Дзесяткі тысяч беларусаў знаходзяцца ў палітычнай эміграцыі з-за палітыкі самазванцаў, якія захапілі і сілай утрымліваюць уладу ў Беларусі. І нават ня гледзячы на моцныя рэпрэсіі і злачынствы дыктатарскага рэжыма супраць беларускага народа, беларусы працягваюць барацьбу. І сёньня беларусы замежжа сабраліся разам з украінцамі, грузінамі, літоўцамі, эстонцамі і латвійцамі, каб выказаць салідарнасць з украінскім народам, які бароніць сваю зямлю ад нападаў расейскай арміі, а таксама выказаць салідарнасць з беларусамі, якія ва ўмовах жорсткіх рэпрэсій супрацьстаяць прамаскоўскаму рэжыму Лукашэнкі.

Увесь сьвет павінен ведаць, што прамаскоўскі дыктатар Лукашэнка ня ёсць прадстаўніком беларусаў і іх інтарэсаў. Беларусы масава асуджаюць злачынныя дзеяньні нелегітымнага дыктатара, які сілай утрымлівае ўладу ў краіне і падтрымлівае вайсковую агрэсію Расеі. Беларускі народ падтрымлівае ўкраінцаў і змагаецца са свайго боку ўсімі магчымымі сродкамі ва ўмовах унутранай акупацыі.

У мітынгу таксама прынялі ўдзел сябры БАЗА. Падчас мерапрымства яны звярнуліся да сабраўшыхся з наступнай заявай:

ЗВАРОТ:

Беларусы, сябры, браты,

Тры дні таму крамлёўская хеўра напала на Украіну. Наша Беларусь была выкарыстана як плацдарм для нападу. Ёсць вялікая верагоднасьць таго, што акупанты захочуць скарыстаць беларускіх вайскоўцаў дзеля атакаў на Украіну. Папярэджваем вас, што супраца з акупантамі ўжо ёсць злачынствам, якое стане яшчэ большым, калі беларускія жаўнеры будуць ваяваць на баку агрэсара.

Мы звяртаемся да грамадзян Беларусі з просьбай аб актыўным супратыве агрэсару.

Мы таксама звяртаемся да беларускіх вайскоўцаў словамі беларускага нацыянальнага лідара **Зянона Пазьняка**:

- Беларускія салдаты, не выконвайце злачынныя загады. Нявыкананьне загаду ня ёсць здрадай, а дасканалым выкананьнем свайго доўга.
- Беларусы, нельга нападаць на Украіну – самы брацкі беларусам народ.
- Не страляйце ва ўкраінцаў, не страляйце ў бок Украіны.
- Паварочвайце зброю супраць расейскіх акупантаў у Беларусі, знішчайце іх усімі спосабамі і відамі зброі.
- Пры немагчымасці разьвярнуць зброю супраць акупантаў, пераходзьце цэлымі аддзеламі на бок украінцаў.

Жыве Беларусь!
Слава Украіне!










# БЕЛАРУСЫ ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ У АКЦЫІ WE STAND WITH UKRAINE

***Міхась Чаропка***

**У** сімвалічны дзень пачатку паўстаньня Кастуся Каліноўскага – 21 студзеня 2022 году на Union Square у Нью Ёрку, беларусы прынялі ўдзел у акцыі падтрымкі Украіны “We Stand with Ukraine”.

Украінскі Кангрэсавы Камітэт Амерыкі і Сусветны Кангрэс Украінцаў заклікаў украінцаў, а таксама сяброў Украіны прыяднацца да сусветнай кампаніі дэманстрацыі падтрымкі ўкраінскага народу, яго права на свабоднае жыцьцё і мір на сваёй зямлі.

Беларуская дыяспара ў Нью Ёрку не засталася ў баку і яе прадстаўнікі таксама прынялі ўдзел у акцыі. Сябры Нью-Ёркскага аддзела БАЗА (Беларуска-Амерыканскага задзіночаньня) прыйшлі на Union Sqaure на Манхэттане са сьцягамі і плакатамі ў падтрымку права украінцаў на вольнае жыццё ў сваёй краіне.

Ня гледзячы на халоднае надвор’е, сабралося шмат людзей. Акцыя доўжылася гадзіну і падчас яе было шмат прамоваў аб становішчы вакол Украіны, аб магчымым уварваньні Расеі, аб небяспецы і неабходнасці ўсебаковай падтрымкі.

Выступілі таксама і беларусы. У сваёй прамове Міхаіл Чаропка – сябра Беларуска-Амерыканскага задзіночання – распавёў удзельнікам акцыі, што зараз на ўсходзе Еўропы вырашаецца не толькі лёс вольнай Украіны, але і свабоды для ўсяго еўрапэйскага кантыненту. Агрэсіўныя дзеяньні Расеі павінны быць спыненыя, і Украіне, якая змагаецца сам-насам, павінна быць аказана ўсебаковая дапамога. Таксама ад лёсу Украіны залежыць і лёс Беларусі, тэрыторыю якой зараз запаланілі войскі РФ, і суверэнітэт і самастойнасць якой зараз як ніколі пад пагрозай знікненьня.

Беларусы заўсёды застаюцца вернымі сябрамі ўкраінцаў і гатовыя іх падтрымаць. Зараз асабліва крытычны момант для абодвух краін, калі агрэсар Расея сваімі дзеяньнямі спрабуе развесьці два народы па розныя бакі лініі фронту. Але сваёй падтрымкай сапраўдныя патрыёты Беларусі паказваюць, што тое немагчыма па сутнасьці: беларусы і ўкраінцы – братэрскія народы, гісторыя якіх глыбока пераплеценая. Мы праходзілі шмат гістарычных выпрабаваньняў поруч. Так і сёньня: знойдзецца шмат беларусаў, якія прыйдуць на дапамогу ўкраінцам ў самай складанай сітуацыі.












# КАЛЯДНАЯ ВЕЧАРЫНА Ў САБОРЫ СЬВ. КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА Ў БРУКЛІНЕ

















***Міхась Чаропка***

У нядзелю шаснаццатага студзеня 2022 года ў беларускім цэнтры пры саборы Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне па адрасе 401 Atlantic Ave адбылася Калядная Вечарына. Яна прайшла з удзелам самага вядомага і таленавітага калядоўшчыка, Сержука Доўгушава – сьпевака, фальклярыста, этна-музыкі, стваральніка «Спеўнага схода», удзельніка калектыву Vuraj, кіраўніка установы “Этнатрадыцыя”.
Усіх гасьцей чакала цікавая праграма з каляднымі песьнямі, танцамі і гульнямі, самых малодшых чакалі падарункі. Па традыцыі дзеткі падрыхтавалі вершы, танцы і песьні для калядаваньня.
Арганізатарамі свята сталі Нью-Ёркскі аддзел БАЗА сумесна з Парафіяльнай Радай сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне.
На свята сабралося шмат гасьцей, і што асабліва прыемна – было шмат дзетак!
Вечарыну ўрачыста адчыніў царкоўны хор Парафіяльнай Рады. Спевакі ўнеслі галоўны атрыбут свята – Калядную зорку і праспявалі калядныя гімны. Пасля да справы прыступіў Сержук Доўгушаў. Разам з ім прысутныя дапамагалі Казе ачуняць і сабраць мех падарункаў. Мядзведзь рыкаў і лавіў удзельнікаў гульні. Калядны Казёл зьбіраў хлопцаў і дзяўчат на вясельле. Таксама не абышлося без жаніцьбы Цярэшкі, танцу “Ойра”, бясконцых хараводаў і іншых традыцыйных народных забаваў.
Усе госці засталіся вельмі задаволеныя. Вось, што распавёў адзін з удзельнікаў – Сяргей Шыманскі:
– Свята надта спадабалася. Мы першы раз на Калядках, але дакладана не апошні. Галоўнае, што вельмі спадабалася дзецям. Ды і ўвогуле трэба больш і часцей збірацца на такія мерапрыемствы!
Ірына Ярмалінская з Нью Ёрку таксама падзялілася сваімі ўражаньнямі:
– Мне вельмі спадабалася. Я прыйшла за “запалам” і яго атрымала. Зараз выдатны настрой на ўвесь дзень! Сустрэла шмат знаёмых, і хацелася б каб такі настрой заставаўся ў людзей як мага дольш і тады на Зямлі ўсё будзедобра!
Ала Орса-Рамана, кіраўніца парафіяльнага хору:
– У мяне надзвычайныя ўражанні ад калядкаў! Мы хорам рыхтавалі больш багатую праграму, але ўмяшаўся кавід. У нейкі момант мы зусім хацелі адмовіцца ад выступу, але ўсё ж такі вырашылі паўдзельнічаць – і не шкадуем! Настрой – на вышыні! Таксама жадаю падзякаваць БАЗА, што зрабілі разам гэта мерапрыемства і так выдтана атрымалася нашае супрацоўніцтва. Ёсць жаданне працаваць разам і надалей. Таксама дзякую Сяргею Доўгушаву – ён зрабіў вельмі добрую справу!
Пра мерапрыемства выказалася і Аксана Пятрашка – старшыня Нью-Ёркскага аддзела БАЗА:
– У мяне ўражанні – супер. Было вельмі весела, прыйшло шмат дзяцей, моладзі, што вельмі натхняе і дае ўпэўненасць, што ў нас у беларусаў і нашай культуры будзе будучыня на амерыканскай зямлі. Вельмі спадабаліся конкурсы для дзяцей і дарослых. Шмат хто прымаў у іх ўдзел і ўсе былі задаволеныя. Выдатныя ўражанні!
Свае эмоцыі “па гарачых слядах” выказаў і галоўны ўдзельнік Калядкаў – Сяргей Доўгушаў: –
Мне вельмі спадабалася. У Брукліне сабралося шмат дзяцей. І таму свята адбылося – атрымалася правесці больш гульняў. Агулам вельмі пазітыўны і ўзнёслы Калядны настрой. У царкве свая атмасфера і таму атрымоўваецца ладзіць асабліва выдатныя Каляды.
Усе ўдзельнікі Калядкаў пагадзіліся, што святкаванне атрымалася як ніколі вясёлым і ўзнёслым. Праз аднаго ўдзельнікі прапанавалі праводзіць такія мерапрыемствы як мага часцей. Вядома ж, што чым больш мы будзем збірацца разам, тым больш згуртуемся як адзіная беларуская сям’я, хоць і за тысячы кіламетраў ад родных хат, але ж незабыўшымі свае карані, святы і традыцыі.

## ЗВАРОТ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ “БЕЛАРУС”

Шаноўныя чытачы!
Амаль 72 гады прайшло з моманту выхаду першага нумару газэты “Беларус”. Увесь гэты час друкаваныя нумарывыданьня прыходзілі да чытачоў ў папяровым выглядзе.. Для шматлікіх беларускіх эмігрантаў папярэдніх пакаленьняў газэта была ці не адзінай крыніцай інфармацыі пра падзеі на Радзіме і пра такіх жа беларусаў за мяжой. Шмат дзясяткаў гадоў прагныя вочы ўглядаліся ў старонкі часопісу і шукалі навіны са сваіх мясьцінаў. Людзі пісалі і чыталі інфармацыі аб дзейнасьці беларускай эміграцыі за акіянам і праз газэту даносілі свой голас пра іх існаваньні ў Новым Сьвеце.
І вось, новыя пакаленьні эмігрантаў маюць патрэбу сказаць аб сабе. Але, гэта ўжо цяжка зрабіць толькі з дапамогай друку - часы зьмяніліся. У сьвеце пануе інтарнэт і зьявілася новыя магчымасьці даносіць сваё слова ў віртуальнай прасторы – гэта мець старонку ў сацыяльных сетках, вэбсайт, кантактаваць анлайн.
Рэдакцыя газэты лічыць патрэбным. каб і нашае выданьнне разьвівалася далей у накірунку гэтых зьменаў і выкарыстоўвала новыя формы кантакту з чытачамі.
Насьпела патрэба дапоўніць склад Рэдакцыі новымі сябрамі з маладой беларускай эміграцыі, якія, спадзяемся, будуць здольнымі працаваць ва ўмовах імклівага тэхнічнага прагрэсу. Рэдакцыя пры згодзе з Галоўнай управаю Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, чым органам зьяўляецца газэта, прыняла рашэньне стварыць электронны варыянт газэты, што дазволіць больш аператыўна інфармаваць чытачоў пра навіны жыцьця беларускай дыяспары ў ЗША, Таксама хацелі б пашырыць інфармацыйную прастору газэты і падаваць у ёй навіны пра беларускую дыяспару ў сьвеце і пра важнейшыя падзеі на нашай Бацькаўшчыне-Беларусі. Выданьне ў электронным фармаце дазволіць быць больш гнуткімі ў плане выкарыстання відэа- і фотафарматаў у асьвятленьні мэрапрыемстваў і падзей
Электронны варыянт газэты будзе размяшчацца на адмысловым інтэрнэт- сайце https://bielarus.info, які ўжо адчынены і будзе працаваць ад....э..э.
Акрамя сайту плянуецца і разьвіцьцё ў сацыяльных сетках. Ужо зараз можна падпісацца на старонку ўТвітары, дзе навіны будуць размяшчацца максымальна хутка: https://twitter.com/BielarusI

Газэта “Беларус” застаецца галоўным друкаваным органам Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА) і ўсе навіны арганізацыі будуць друкавацца ў ім і распаўсюджвацца ў першую чаргу праз сацыяльныя сеткі Арганізацыі BAZANewYork
Гэдакцыя газэты “Беларус” адчынена да супрацоўніцтва. Калі вам ёсць што сказаць, калі хочаце дасылаць свае навіны, меркаваньні, прапановы, дасылайце, калі ласка, свае лісты на гэты эмэйл: editor@bielarus.info
Вітайце, шаноўныя чытачы, абноўленую газэту “Беларус” у новым фармаце. Застаемся з вамі з павагай да папярэдніх пакаленьняў выдаўцоў газэты і з надзеяй на тое, што захаваем зробленае імі і ўздымем наша паважанае выданьне на больш высокі ўзровень адпаведна патрабаваньням нашага часу.

Жыве Беларусь!

Жыве “Беларус”!

Новы склад Рэдакцыі:

**Ганна Сурмач** – адказны рэдактар
**Міхал Чаропка** – намесьнік адказнага рэдактара
**Натальля Федарэнка** – сябра
**Тацьцяна Красоўская** – сябра, скарбнік
**Алесь Пазьняк** – сябра
**Вячаслаў Бортнік**- сябра

## АХОЎНЫ КРЫЖ СЬВ. ЭЎФРАСІНЬНІ ПОЛАЦКАЙ

***Ганна Сурмач***

Сёньня копію Крыжа Сьв. Эўфрасіньні Полацкай можна пабачыць у Катэдральным саборы Сьв. Кірылы Тураўскага на 401 Атлантык Авэню ў Брукліне.
Аўтэнтычны Крыж – унікальны твор мастацтва, лічыцца рэлігійнай і духоўнай сьвятыняй Беларусі, ахоўнікам нашай Бацькаўшчыны. Крыж вырабіў у 1161 годзе полацкі ювэлір Лазар Богша на замову Сьв. Эўфрасіньні Полацкай, як каўчэг для захоўваньня хрысьціянскіх рэліквіяў.
Рэліквія зьнікла пад час Другой Усясьветнай вайны і да сёньняшняга дня месца яе знаходжаньня невядомае.
У 1997 годзе на замову Рады Згуртаваньня беларусаў сьвету “Бацькаўшчына” берасьцейскі мастак Мікола Кузьміч вырабіў у высокай ступені дакладную копію Крыжа. Згуртаваньне фінансавала ўсе выдаткі, а духоўнае суправаджэньне вёў Уладыка Філарэт,тагачасны кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы. Гэта быў складаны працэс, цягам якога мастаку даводзілася спасьцігаць сакрэты майстэрства Лазара Богшы і старадаўніх майстроў, аднаўляць тэхніку эмаляў, выкарыстаных на Крыжы. Сьвятыні, якія былі закладзены ў Крыжы, перадаў Уладыка Філарэт. Новастворany Крыж быў асьвечаны Уладыкам Філарэтам і перададзены ў Спаса-Эўфрасіньнеўскі манастыр у Полацку, дзе захоўваецца і цяпер.
І вось сёньня сярод новай беларускай іміграцыі ў Нью-Ёрку знайшоўся майстра, які вырабіў другую (наколькі вядома) копію Крыжа. Сп. Ігар Вырвіч заняўся гэтай адказнай працаю па ўласнай ініцыятыве, рабіў усё самастойна і толькі, калі праца была амаль завершаная, паказаў яе ў Саборы Сьв. Кірылы Тураўскага, чым усе мы былі прыемна зьдзіўленыя і ўзрушаныя. Наколькі якасна была зробленая праца можна пабачыць на прыкладзеных тут фота і ў самой царкве. Усе каштоўныя матэрыялы майстар купляў за свае сродкі і адмовіўся ад аплаты працы, якую прапанавала яму Парафіяльная рада.
Новастворany Крыж сп. Вырвіч падараваў нашаму Сабору. Для захаваньня каштоўнасьці сп. Ігар вырабіў таксама прыгожы футляр з падсьветкаю і адмысловую тумбу, на якой Крыж устаноўлены ў царкоўнай залі. Пад час Багаслужбы ў мінулы Вялікдзень Крыж быў асьвечаны ў царкве сьвятаром - айцом Іванам.
Цяпер варта патлумачыць, чаму зьвяленне копіі Крыжа ў нашым Саборы ёсьць для нас асабліва знамянальнай падзеяю. Будынак Сабору быў закладзены 5 чэрвеня 1850 году, пра гэтую падзею паведамлялі мясцовыя бруклінскія газэты. У Беларусі 5 чэрвеня адзначаецца як дзень памяці Сьв. Эўфрасіньні Полацкай, нябесная патронкі нашай Бацькаўшчыны, якая замоўлены ёю Крыж даравала сваёй зямлі, як ахоўніка ад ўсяго злога.
З Божай ласкі сталася так, што Крыж Сьв. Эўфрасіньні прыйшоў у нашу царкву праз рукі майстра і стаўся цяпер ахоўнікам нашай беларускай царквы на чужыне.
Ігар Вырвіч не ёсьць прафесійным мастаком. Маючы прыродныя здольнасьці і мастацкі густ, сп. Ігар свае навыкі мастацкай працы здабыў саманавучаньнем і практыкаю. Але, галоўнае, што накіравала яго на такую ініцыятыву, найперш гэта ягоная высокая нацыянальная самаідэнтыфікацыя, пашана да сваіх каранёў , да сваёй гісторыі і культуры. Свойт вольны час, свае намаганьні ён ахвяраваў на грамадзка значную справу. Акрамя Крыжа, сп. Ігар па мастацку аздобіў сцэну ў грамадзкай залі Сабору. Дапамагае ў розных гаспадарскіх справах у царкве, браў удзел ва ўстаноўцы пастамэнтаў для бюстаў Касьцюшкі і Каліноўскага.
Чалавек шукае высокія мэты і працуе над імі сярод штодзённых клопатаў іміграцкага жыцьця.
Высокай пашаны і глыбокай ўдзячнасьці заслугоўвае сп. Ігар Вырвіч ад нашай беларускай грамады.

## ЧАРОЎНАЕ ЧЫТАНЬНЕ

***Ганна Сурмач***

У 2021 годзе ў Менску ў выдавецтве “Кнігазбор” выйшла кніга Ніны Занковіч «Талстой і фіялетавае крэсла. Мой год чароўнага чытаньня». Кніга напісаная амэрыканкаю і перакладзеная Алесем Дубкоўскім.
Для амэрыканскіх беларусаў гэта адметная падзея з той прычыны, што аўтарка мае беларускія карані. Ніна – малодшая дачка сп. Анатоля Занковіча, які ёсьць адметнай асобаю сярод беларускай іміграцыі ў ЗША паваеннага часу.
Доктар Занковіч вядомы хірург, які доўгія гады працаваў у Чыкага, а цяпер пераехаў у Нью-Ёрк. Ён нарадзіўся ў вёсцы Сіўцы Вілейскага павету Віленскага ваяводства. У 1944 годзе пакінуў Беларусь, у 1946
годзе скончыў Беларускую гімназію ў Рэгенсбургу, вучыўся ў Мюнхэнскім унівэрсытэце, потым скончыў Лювэнскі

ўнівэрсытэт у Бэльгіі. У Лювэне, на мэдычным факультэце, Анатоль пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай-бэльгійкаю Тыльдай . У 50-х гадох сямья пераехала ў Амэрыку. Абодва яны час ад часу прыходзяць у беларускі цэнтр пры Катэдральным саборы Сьв. Кірылы Тураўскага на 401 Атлантык Авэню і ньюёрскія беларусы іх добра ведаюць.
Аўтарка кнігі нарадзілася ў Эванстане недалёка ад Чыкага, як наймалодшая дачка ў сямьі Занковічаў. Старэйшую назвалі Ан-Мары, сярэднюю — Наташай.
Ва ўзросьце сарака шасьці гадоў з Ан-Мары здарылася бяда, яна захварэла на рак і памерла. Гэтая трагедыя зьмяніла жыцьцё сямьі. Ніна не магла зьмірыцца са стратаю і намагалася знайсьці апору, якая дапамагла б перажыць цяжкія часы і, як яна сама кажа « каб жыць за дваіх». Ніна вынайшла для сябе арыгінальны праект: калі споўнілася 46 гадоў ёй самой, яна пачала чытаць кнігі, кожны дзень па адной, седзячы ў «фіялетавым фатэлі». А потым пісала кароткія водгукі-рэцэнзіі на прачытаныя кнігі і выстаўляла на адмыслова заснаваным сайце (www.readallday.org). Ніна сцьвярджае: *«У чытаньні я знайшла свой спосаб пераадольваньня гора. Я больш не спрабавала пазбавіцца яго — я яго абсарбавала. З дапамогай памяці. Памяць ня можа зьнішчыць гора ці вярнуць мёртвых, але яна дазваляе мінуламу заставацца з намі назаўжды».*
За год Ніна прачытала 365 кніг і пра гэтае «чароўнае чытаньне» напісала сваю «Tolstoy and the Purple Chair: My Year of Magical Reading», апублікаваная ў 2011 годзе. І гэта не адзіны творчы набытак аўтаркі.
Сёньня Ніна Занковіч — даволі вядомая амэрыканская аўтарка нон-фікшн, кнігі якой нязьменна атрымліваюць вельмі прыхільныя рэцэнзіі. Акрамя названай вышэй кнігі, яна выдала яшчэ тры іншыя: «Signed, Sealed, Delivered: Celebrating the Joys of Letter Writing» (2014); «The Lowells of Massachusetts: An American Family» (2017); «American Rebels: How the Hancock, Adams, and Quincy Families Fanned the Flames of Revolution» (2020).
Сваю творчую працу Ніна Занковіч пасьпяхова спалучае з клопатамі пра сваю сямью, яны з мужам гадуюць чатырох сыноў.

## СЬВЯТА ЗАЛАТАВУСНАГА АДЗНАЧЫЛІ Ў ДВЮХ ЦЭРКВАХ





***Алесь Пазьняк***
***Здымкі аўтара***

Два дні запар, 13 і 14 траўня, у Нью-Ёрку сьвяткавалі Парафіяльнае сьвята ў двух цэрквах сьвятога Кірылы Тураўскага. Першае прайшло ў Квінсе, па адрасе 104-29 Atlantic Ave, другое ў Брукліне на Atlantic Ave, 401. Цікава, што абедзве маюць аднолькавую назву і знаходзяцца на адной вуліцы шмат год, але аб'яднаніся толькі пару месяцаў назад.

Царква, што на Atlantic Ave 104-29 у Квінсе ў 1972 годзе была пабудаваная беларусамі і доўгі час належала да Карпата-Русінскай праваслаўнай епархіі ЗША. У гэтым годзе вернікі выказалі жаданьне далучыцца да БАПЦ. Айцец Васіль з УПЦ ня так даўно стаў сьвятаром гэтай царквы.

Сама асоба Кірылы Тураўскага, які жыў у XII стагодзьдзі, займае выключнае месца ў беларускай духоўнай гісторыі. Ён вядомы, як манах-аскет, шчыры пастыр, выбітны пісьменьнік і прапаведнік Слова Божага. Яго называюць «другім Залатавусным», па прыкладу Яна Залатавуснага, за красамоўства і царкоўна-літаратурныя творы.

11 траўня адзначаецца дзень памяці гэтага сьвятога беларускай зямлі. Трэба адзначыць, што ў Амэрыцы й Канадзе існуе тры беларускія праваслаўныя царквы названые ў гонар Кірылы Тураўскага. І дзьве з іх знаходзяцца непадалёк адна ад адной.

Набажэнствы ў Нью-Ёрку узначаліў Высокапрывялебны Сьвятаслаў, архіяпіскап БАПЦ, які завітаў з Канады сьпецыяльна з гэтай нагоды. Архіяпіскапу саслужылі настаяльнік Парафіі Сьвятой Жыровіцкай іконы Божае Маці мітрафорны пратаярэй айцец Зіновій, пратаярэй айцец Іван і Багаслужба ў царкве сьвятога Кірылы Тураўскага ў Квінсе праходзіла на некалькіх мовах - царкоўнаславянскай, беларускай і украінскай. Такое сталася праз рознасьць сьвятароў, якія служылі ў царкве. Але пры гэтым не было ніякага разладу і дысананса.
Хор, які прыехаў з Катэдральнага сабору БАПЦ, цудоўна сьпяваў і скончыў набажэнства духоўным гімнам «Магутны Божа».

У сваёй прамове на сьвяце ў Квінсе архіяпіскап БАПЦ прывёў некаторыя зьвесткі пра жыцьцё і творчасьць Кірылы Тураўскага. Таксама ён адзначыў, што хрысьціянства
прынесла на зямлю любоў да бліжняга, ласку Божую ў перамозе над злом Сына Божага Ісуса Хрыста.

«Хрысьціянства перайшло межы класавыя і нацыянальныя, таму мы служым на розных мовах аднаму Богу ў братэрскай любові і павазе адзін да аднаго», - адзначыў архіяпіскап Сьвятаслаў.

Сьвята ў Квінсе працягнулася пачастункам у грамадзкай залі ў бэйсманце царквы.

Вернікі з Катэдральнага сабора ў Брукліне падарылі аднайменнай царкве ў Квінсе ікону з выявай Кірылы Тураўскага. На само сьвята, якое праходзіла ў Брукліне 14 траўня, сабраліся людзі з дзьвюх цэркваў. Службу вёў архіяпіскап Сьвятаслаў, якому дапамагалі тыя ж сьвятары.

Пратаярэй айцец Зіновій падчас службы нагадаў пра Дзень маці, які шырока адзначаецца ў сьвеце і ЗША. Стараста царквы Аляксандр Хомчанка з гэтай нагоды раздаў кожнай жанчыне па чырвонай ружы і павіншаваў іх ад царквы з гэтым сьвятам.

Пасьля архірэйскай багаслужбы адбылася сяброўская сустрэча ў грамадзкай залі сабора.













## ПРАДСТАЎНІКІ БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАГА ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ (БАЗА) ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ У СВЯТКАВАНЬНІ З НАГОДЫ ПРЫНЯЦЬЦЯ КАНСТЫТУЦЫІ 3 ТРАЎНЯ 1791 ГОДУ









***Міхась Чарoпка***

***Фота: Фота: Lietuvos Generalinis Konsulatas Niujorke/Consulate Gen. of Lithuania in NY, Ірына Хадарэнка, Міхась Чарoпка***

9 траўня 2023 году ў Генеральным кансуляце Рэспублікі Польшча ў Ню Ёрку адбыўся сьвяточны прыём з нагоды прыняцьця Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 траўня 1791 году.

Ад БАЗА на мерапрыемстве прысутнічалі старшыня Галоўнай Управы - Натальля Федарэнка і сакратар Галоўнай Управы - Міхал Чарoпка. Таксама на мерапрыемства была запрошана старшыня Беларускай Асьветніцкай Лігі - Ірына Хадарэнка.

Адметнасьцю мерапрыемства стала прысутнасьць украінскіх вайскоўцаў, што знаходзяцца зараз у ЗША на лячэньні і рэабілітацыі.

Генеральны консул Рэспублікі Польшча ў Ню Ёрку Адрыян Кубіцкі павітаў прысутных на мерапрыемстве: Генеральнага консула Летувы ў Ню Ёрку - спадара Вацлаваса Шалкаўскаса, Генеральнага консула Украіны - Олексія Голубава, прысутныхукраінскіх вэтэранаў, а таксама асобна - прадстаўнікоў беларускай дыяспары. У сваёй прамове ён адзначыў важлівую ролю, якую Канстытуцыя 3 траўня працягвае адыгрываць на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Яна аб'ядноўвае культурна і гістарычна народы, якія ўжо прайшлі свой шлях да свабоды і незалежнасьці, як Польшча і Летува. Альбо яшчэ толькі змагаюцца - як Украіна, ці каму яшчэ прадбачыцца змаганьне за сваю будучыню - Беларусі.

Генеральны консул Летувы Вацлавас Шалкаўскас таксама павітаў прысутных і падкрэсьліў, як Канстытуцыя 3 траўня дазваляе сёньня супрацоўнічаць і ладзіць сувязі паміж народамі. Ён адзначыў, што закладзеныя ў яе ідэі свабоды і роўнасьці былі перадавымі для тагачаснай Эўропы і застаюцца шмат у чым актуальнымі і сёньня.

Пасьля прысутныя паглядзелі кароткае відэа пра Канстытуцыю 3 траўня і паслухалі даклад былога чальца OSCE у Эўропе - спадара Juozas A. Kazlas, Ph.D. У сваёй прамове спадар Юозас распавёў пра яго досьвед працы ў якасьці назіральніка ва Украіне ў 2014-2015 гадох.

Пасьля прысутныя змагліпаслухаць творы Фрэдэрыка Шапэна ў цудоўнцм выкананьні Караліны Мікалайчык і Іва Еднэцкага.

Падчас мерапрыемства сакратар Галоўнай Управы БАЗА Міхал Чарoпка атрымаў ад Генеральнага консула Адрыяна Кубіцкага памятны медаль імя Яна Карскага.

Апасля афіцыйнай часткі ўсіх чакаў фуршэт.





## СПРАВАЗДАЧА ПРА ЎДЗЕЛ У ПРАГРАМЕ ДНЯ ПРАВААБАРОНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў КАНГРЭСЕ ЗША



***Алеся Сёмуха, Яўген Барысевіч***

26 красавіка 2023 г. сябры Вашынгтонскага аддзела Беларуска-Амерыканскага Задзіночаньня Алеся Сёмуха і Яўген Барысевіч брaлі ўдзел ў Дні Адвакатаваньня (Дні Праваабарончай Дзейнасці) ў Кангрэсе ЗША), арганізаваны прадстаўнікамі арганізацый дыяспараў з краінаў Цэнтральнай і Усходняй Эўропы.

Акцыя плянавалася цягам амаль двух месяцаў і ў выніку 40 прадстаўнікоў этнічных арганізацый з CEEC правялі 20 сустрэчаў у Кангрэсе.

У дадатак да агульнага праграмнага дакумента, у кожнай арганізацыі быў свой парадак дня і праблемы, якія яны жадалі ўзняць ці вырашыць.

Пытаньне пра патрэбу даўгатэрміновай падтрымкі Украіны ўздымалася на ўсіх сустрэчах. Прадстаўнікі БАЗА сканцэнтравалі свой час на абмеркаваньні пытаньняў беларускага суверэнітэту, санкцый, вызваленьня палітвязьняў і падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасьці.
Прадстаўнікі Кангрэса дадавалі і новыя тэмы -- аднаўленьне Акта аб Дэмакратыі, Правах Чалавека і Суверынітэце ў Беларусі 2020 года H.R.8438 (116 Кангрэс) і заклік да кансалідацыі лідэраў беларускай апазіцыі.

Алеся і Яўген прынялі ўдзел у наступных сустрэчах з прадстаўнікамі розных структураў Кангрэсу, з супрацоўнікамі офісаў кангрэсмэнаў:

- Сустрэча з супрацоўнікамі офіса кангрэсмэна Мікса (Gregory Meeks), які займаецца замежнымі справамі У сустрэчы прынялі ўдзел Яўген
Барысевіч і прадстаўнікі украінскіх
і польскіх арганізацый. Яўген распавёў пра цяжкую сітуацыю з палітвязьнямі, санкцыі і неабходную фінансавую і вайсковую падтрымку Украіны. Пэрсанал офіса быў асабліва зацікаўлены ў праблемах, з якімі сутыкаюцца украінцы, якія прыбылі па праграме «Аб'яднанне для Украіны» і сутыкнуліся з заканчэньнем 2-гадовага ўмоўнага знаходжаньня ў ЗША. Яўген выказаў занепакоенасьць цяжкасьцямі, з якімі сутыкаюцца беларускія грамадзяне, якія зьбеглі ва Украіну і зараз жывуць там, не маючы магчымасьці вярнуцца на Радзіму, або пераехаць у ЗША па аналягічнай праграме.

Офіс прапанаваў нам і ўкраінцам ідэю зладзіць вечарыну ў Нью-Ёрку, ў Кўінсе ці Фар-Рокавеі, і запрасіць выбаршчыкаў са сваякамі, каб сустрэцца з кангрэсмэнам Міксам, каб падзяліцца сваімі гісторыямі.

- Сустрэча ў Гэльсінскай Камісіі

На сустрэчы з чатырма дарадцамі па пытаньнях палітыкі і



прадстаўніком Дзяржаўдэпартамента прысутнічалі
Яўген Барысевіч, Міхаіл Савків (UNIS), прадстаўнікі армянскай і польскай дыяспараў. Большую часткунашагачасумыпрысьвяцілі абмеркаваньню праблемы і складанасьцямі прызнаньня ЧВК «Вагнер» тэрарыстычнай арганізацыяй.
Яўген гаварыў пра важнасьць вызваленьня беларускіх палітвязьняў і прадстаўнік Дзяржэдпартамента запэўніў нас, што Беларусь і вызваленьне палітвязьняў застаюцца для іх галоўным прыярытэтам. Мы атрымалі таксама інфармацыю аб планах іх дзейнасьці ў гэтым накірунку. Мы таксама абмяркоўвалі нашу пазіцыю што да прызнаньня Беларусі акупаванай краінаю, каб можна было б гэта ўлічыць у абноўленай вэрсіі BDA (Акт аб Дэмакратыі, Правах Чалавека і Суверэнітэце ў Беларусі).

- Сустрэча з прадстаўнікамі Камітэта Сэната па замежных справах – Дэніэлам Лангенкампам (Daniel Langenkamp, Legislative Fellow) і Дэніэлам Гатфрыдам (Daniel Gottfried, Legislative and policy Analyst).
Прысутнічалі армянскія, беларускія, грузінскія, польскія, украінскія прадстаўнікі. На сустрэчы гаворка ішла пра далейшую ваенную падтрымку Украіны, неабходнасць выпрацоўкі канкрэтных механізмаў прыняцьця Украіны ў НАТА, а таксама пра прызнаньне расейскай ЧВК «Вагнэр» тэрарыстычнай арганізацыяй.

Грузінскія прадстаўнікі ўзьнялі праблему інфармацыйнай вайны з боку Расеі і неабходнасць б большага супрацьдзеяньня гэтаму з



боку ЗША. Грузінская дэлегацыя выказалася супраць жорсткіх санкцый ў дачыненьні да Грузііізападтрымкуграмадзянскай супольнасьці.
Алеся Сёмуха таксама ў з ь н я л а пытаньне санкцый адносна Беларусі і сказала, што цяперашнія ш ы р о к і я эканамічныя с а н к ц ы і пагражаюць стратай Беларусі сувэрэнітэту і спрыяюць татальнаму зьбядненьню грамадзян. Алеся патлумачыла, што санкцыі ў цяперашнім стане не прынесьлі хуткай зьмены рэжыма Лукашэнкі і прывялі да таго, што Беларусь раўняюць з Расеяй па ступені адказнасьці. У выніку санкцыі вядуць да фінансавага, эканамічнага і палітычнга калапсу дзяржаўнасьці і поўнай залежнасьці ад Расеі. Калі Беларусь страціць незалежнасьць, межы Расеі пасунуцца да Польшчы і Расея зойме стратэгічную ядзерную пазіцыю для далейшых нападаў. Пазіцыю Алесі падтрымалі прадстаўнікі грузінскай і польскай арганізацый.

- Сустрэча ў офісе сэнатара Кэйна (Tim Kaine, VA) – Маха Саед (Maha Syed, Legislative Correspondent).
Сустрэча была кароткая і пераважна гаворка ішла пра падтрымку сэнатарам Акту аб Дэмакратыі, Правах Чалавека і Суверэнітэце ў Беларусі і фундаваньне падтрымкі Украіны.
- Сустрэча з прадстаўнікамі офісаў кангрэсмэнаў Майкла Маккола (Michael McCaul, TX-10) , Майкла Калесэна (Michael Callesen) і Біла Кітынга (Bill Keating, MA-9).
На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі грузінскай і польскай дэлегацый. Алеся і Яўген прадстаўлялі беларускую дэлегацыю. Алеся закранула тыя самыя пытаньні сувэрэнітэту і эканамічных санкцый, якія цалкам прывязваюць Беларусь да Расеі і могуць прывесьці да поўнай страты сувэрэнітэту. Алеся зьвярнула ўвагу на адсутнасьць выразнай стратэгіі да Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Яна падкрэсьліла, што беларускае пытаньне пакуль ня мае, але мусіць мець больш стратэгічны характар з увагі на важнае геапалітычнае становішча Беларусі паміж Расеяй і краінамі НАТА. Прывязка Беларусі да Расеі і паглынаньне яе створыць пастаянную стратэгічную небясьпеку для краін Эўропы.
Алеся таксама казала пра неабходнасьць большай большую падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі і па-за яе межамі, а таксама пра вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў.









# НЕЗАМЕННЫ



***Ганна Сурмач***

Вітаўт Кіпель быў з тых асобаў, якіх нельга замяніць, нельга закрыць тую вялізную прабоіну, якую пакінула ягоная смерць у шэрагах сьвядомага беларускага грамадзтва.
Адыходзяць нашыя волаты, “зубры”, якія былі прыкладам ахвярнага служэньня беларускай справе цягам усяго іхнага жыцьця. Гэты трагічны для сьвету 2022 год забраў у нас дзьвух такіх вялікіх асобаў, як Янка Запруднік і Вітаўт Кіпель.
Найлепшыя сябры па жыцьці, яны пакінулі гэты сьвет амаль аднačасна. Як хацелася, каб сп. Вітаўт пажыў яшчэ за сябе і за сябра. Нават, здавалася, што такая надзея была. Кожны раз, калі я тэлефанавала сп. Вітаўту, голас ягоны гучаў энэргічна, а настрой быў аптымістычны. За тыдзень да ягонай сьмерці мы актыўна абмяркоўвалі, як найлепш адзначыць 30 гадоў Першаму зьезду беларусаў сьвету у наступным годзе. Ён заўсёды з вялікім хваляваньнем узгадваў гэтую падзею, якая была для яго адной з найважнейшых.
Менавіта тады яны, паваенныя эмігранты, змаглі праз 50 гадоў наведаць Бацькаўшчыну, адчуць, што там іх чакалі і сустракалі з радасьцю. Гэта быў такі вялікі кантраст з тымі доўгімі часамі, калі савецкія ўлады ляпілі з іх ворагаў і яны не мелі магчымасьці пабачыць родныя мясьціны. Зора і Вітаўт Кіпелі прыехалі ў Менск з падарункам, у прагграме зьезда адбылася прэзэнтацыя кнігі сп. Вітаўта “Беларусы ў ЗША”, якая сьведчыла пра тое, як беларускія эмігранты будавалі сваё нацыянальнае жыцьцё на выгнаньні, як захоўвалі сваю беларускасьць і папулярызавалі імя Беларусі ў заходнім сьвеце. З вялікай радасьцю замежныя беларусы ўспрынялі тады перамены на Бацькаўшчыне – аднаўленьне дзяржаўнай незалежнасьці, нацыянальнае Адраджэньне.
Надзвычайнае ўражаньне ад тых падзеяў сп. Вітаўт захаваў да апошніх дзён свайго жыцьця. І як цяжка было яму бачыць, як топчацца і зьнішчаецца прамаскоўскай дыктатураю ўсё набытае тады беларускім дэмакратычным грамадзтвам.
Аднак, сп. Вітаўт з вопыту ўласнага жыцьця ведаў, што нельга траціць надзеі на лепшае і трэба працаваць, каб перамены насталі. Ён падтрымліваў усе нашыя тут у Амэрыцы ініцыятывы і праекты, што спрыялі актывізацыі беларускага жыцьця. Як адзначыў гісторык Захар Шыбека, Вітаўт Кіпель быў чалавекам, які больш радаваўся посьпехам іншых, чым сваім. Працаваў сам і дапамагаў новай іміграцыі. Ён меў багаты вопыт грамадзкай дзейнасьці і шчодра дзяліўся ім.
Дзялянкаю асаблівай ўвагі сп. Вітаўта было друкаванае слова, кнігі, перыядычны друк, навуковая праца ў галіне беларускай г і с т о р ы і . Выдадзеныя пад я г о н ы м кіраўніцтвам, як дырэктара Беларускага інстытута Навукі і Мастацтва (БІНіМ), шматлікія выпускі “Запісаў БІНІМ” зьяўляюцца сёньня неацэннай крыніцаю зьвестак пра гісторыю беларускай эміграцыі.
Зора і Вітаўт Кіпелі шмат зрабілі для збору эміграцыйных беларускіх пэрыёдыкаў і друкаў.
Найбагацейшая калекцыя, якую яны сабралі, была перададзеная імі на захаваньне ў Нью-Ёрскую публічную бібліятэку, дзе яны доўгі час працавалі. Гэты збор стаў асноваю іхнай унікальнай і фундамэнтальнай п р а ц ы “Беларускі друк на Захадзе: Бібліяграфія”. Трэба згадаць тут і іншыя кнігі: “Byelorussian-Americans and Their Community in Cleveland” (1982), у суаўтарстве з З. Кіпель: “Янка Купала і Якуб Колас на Захадзе. Бібліяграфія” (1985), “Byelorussian Statehood. Reader and Bibliography” (1988), “Беларускія слоўнікі і энцыкляпэдыі” (2002). Сёньня дзесяткі бібліятэк у Беларусі маюць у фондах эміграцыйныя калекцыі дзякуючы таму, што Вітаўт Кіпель сам асабіста іх туды перадаваў ці дасылаў.
Пасьпеў сп. Вітаўт напісаць і выдаць кнігу сваіх успамінаў “Жыць і дзеіць”, якую сёньня варта прачытаць новым беларускім эмігрантам, каб ведаць, як трэба жыць і дзейнічаць нават у неспрыяльных умовах на чужыне і застацца годным чалавекам і беларусам. Сп. Вітаўт увесь час цікавіўся газэтаю “Беларус”, клапаціўся, каб выходзіла да чытача.
Ягоная дзейнасьць была увесь час зьвязаная з газэтаю, асабліва ў той перыяд, калі сп. Зора была рэдактаркаю выданьня.
Калі мы са сп. Вітаўтам абмяркоўвалі ідэю напісаньня кнігі “Беларускі Нью-Ёрк”, ён вельмі захапіўся гэтай справай і актыўна падтрымліваў мяне. Я ўзгадняла з ім структуру кнігі, ён рабіў прапановы і даваў карысныя парады, за гэта я вельмі яму ўдзячная. Без яго гэтая кніга, якая пабачыла сьвет у 2019 годзе, не была б магчымая. Я цешуся, што мы пасьпелі гэта зрабіць, бо шмат чаго ўжо не было б ў каго даведацца.
Згадваючы сёньня пра лёс сп. Кіпеля нельга абыйсьці ўвагаю і ягонае асабістае жыцьцё, яно было наўпрост узорным і цесна зьвязаным з беларускасьцю.
Сп. Вітаўт разам са сваёй жонкаю Зораю стварылі дружную б е л а р у с к у ю сямью і ўвесь час у суладдзі ішлі па абраным імі шляхам служэньня беларускай справе, выгадавалі двух нацыянальна сьведамых дзяцей Алесю і Юрку. На жаль, сп. Зора заўчасна пакінула ў смутку сваю сямью ў 2003 годзе і сп. Вітаўт яшчэ 19 гадоў працягваў іхную агульную справу, працаваў за іх абодвух.
На пахаваньні сп. Кіпеля я бачыла побач з Юркам трох малалых “дубкоў” – унукаў Вітаўта і Зоры. Гэта іх магутны працяг побач з усімі творчымі набыткамі.
Адданы беларускі патрыёт сп. Вітаўт Кіпель усё сваё жыцьцё пражыў пад знакам беларускасьці, хаця на самой Бацькаўшчыне яму давялося жыць толькі восем гадоў, увесь астатні час – на выгнаньні. Страта наша вялікая. Але, напэўна, трэба падзякаваць Богу, які дараваў сп. Вітаўту доўгае жыцьцё, а сам ён напоўніў адведзены яму час вялікім сэнсам. Жыцьцё ягонае на кожным этапе было напоўненым і плённым, ягоныя жыцьцёвыя набыткі сталіся важкім укладам у гістарычную, духоўную, культурную скарбніцу Беларусі. Ягонае імя заняло пачэснае месца сярод выбітных прадстаўнікоў беларускай нацыі.

Сьветлая і ўдзячная памяць сп. Вітаўту Кіпелю!

## У ВЯНОК ДОКТАРУ ВІТАЎТУ КІПЕЛЮ

***Зянон Пазьняк***
***6 сьнежань 2022 г. Нью-Ёрк***

3-га сьнежня пайшоў з жыцьця выбітны беларус і грамадзкі нацыянальны дзеяч Вітаўт Кіпель (1927-2022). Я ведаў спадара Кіпеля з 1991-га года і, калі сказаць коратка, — гэта быў вельмі каштоўны для беларускай нацыі і для беларускай культуры чалавек. Ён жыў у жыцьцёвай парадыгме свайго пакаленьня беларусаў - адраджэнцаў, лёзунг якога быў: “Як жыць, дык жыць для Беларусі”. За сваё доўгае жыцьцё ён якраз гэты лёзунг і рэалізаваў. Зроблена вельмі шмат для беларусаў, для Бацькаўшчыны і культуры. Гэта набытак, і ён застаецца. Я б найбольш адзначыў яго навукова-выдавецкую дзейнасьць. З 1982 года ён
быў дырэктарам БІНІМ (Беларускага Інстытута Навукі і Мастацтва), заснаванага ў 1951 годзе ў ЗША (Нью-Ёрк). Выдадзена мноства кніг беларускіх паэтаў, вучоных, пісьменьнікаў на эміграцыі, слоўнікаў, бібліяграфічных даведнікаў, архіўных матар’ялаў пазнаваўчай літаратуры пра Беларусь. Гэта цэлы пласт беларускага жыцьця, адлюстраваны ў друку, што вельмі важна для гісторыі і культуры. Акрамя таго рэгулярна выдаваліся салідныя навукова-бібліяграфічныя “Запісы” БІНІМ. Будучая Вольная Беларусь будзе вельмі ўдзячная людзям, якія стваралі, множылі і захоўвалі беларускую культуру ў замежжы. Доктар Кіпель найбольш цаніў у культуры друкаваную кнігу і стараўся гэтую кніжную культуру ўздымаць у гару, разумеючы, што кніга зьберагае для народа вечнасьць.

Жыцьцё пражыта годна.
Вечная памяць.

## СЬВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ ЯНКІ ЗАПРУДНІКА



***Ганна Сурмач***

26 траўня адышоў у вечнасьць Янка Запруднік, патрыярх беларускай дыяспары ў Амэрыцы, доктар гісторыі, палітоляг, літаратар і публіцыст. Яму было 95 гадоў.

Янка Запруднік пакінуў Беларусь у 40-х гадах, і з гэтага часу ягоны жыцьцяпіс нагадвае энцыклапедыю самых разнастайных і паспяховых формаў беларускай нацыянальнай актыўнасці ў замежжы. Працуючы на шахтах у Вялікабрытаніі, ён Зрабіўся актыўным удзельнікам Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі і браў удзел у выданні часопіса «Наперад!». Навучаючыся на гістарычным факультэце ў Лювенскім універсітэце, быў старшынёй Беларускага студэнцкага згуртавання ў Лювене.

Янка Запруднік стаяў ля вытокаў «Радыё Свабода» (тады — беларускай секцыі радыёстанцыі «Вызваленне») і быў галоўным рэдактарам славутай газеты «Беларус».

Быў сябрам Беларуска-Амерыканскага Задзіночання і ўваходзіў у Прэзідыюм Рады БНР.

Спалучаючы журналісцкую працу з навуковай дзейнасцю, у 1969-м годзе ён атрымаў ступень доктара гістарычных навук у Нью-Ёркскім універсітэце і чытаў лекцыі па гісторыі Беларусі ў Куінс- каледжы Нью-Ёркскага ўніверсітэту, а таксама Калумбійскім і Ратгерскім універсітэтах.

Выдаваў англамоўны бюлетэнь «Facts on Byelorussia». Ад 1974 года ўваходзіў у склад рэдакцыйнай калегіі «Запісаў» Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку, браў удзел у безлічы кангрэсаў беларусістаў і з’ездах беларусаў свету, напісаў дзясяткі кніг (бібліятэка «Бацькаўшчыны» мела гонар выдаць дзве з іх — «Па гарачых слядах мінуушчыны:
мае лісты 1952–1959 гг.» і «Кантакты».

## СЬВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ ВАСІЛЯ КУЗЬМЕНКІ

Памёр сп. Васіль раптоўна на 73-м годзе свайго жыцьця 28 красавіка 2021. Нікому з родных ён не казаў пра тое, што хварэе на лейкемію, празь якую ў яго здарылася чарговае запаленьне лёгкіх. Нарадзіўся 1(21) кастрычніка 1948 у в. Новае Хорабрава, Аршанскага раёна, Віцебскай вобл. Падвойная дата нараджэньня тлумачыцца тым, што па сьлізкай вясковай восені 1948 году рэгістрацыя немаўляці адбылася толькі 21 кастрычніка. У 1966 годзе Васіль скончыў сярэднюю школу ў горадзе Орша. У 1967 – паступіў У Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, аднак сыйшоў адтуль на чацвёртым курсе, бо вырашыў стаць фізікам. У тым жа 1971 годзе паступіў на фізычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту й з першага курсу быў забраны ў армію, дзе адслужыў два гады ў ракетных войсках.
Атрымаў дыплём БДУ толькі ў 1978 годзе, працаваў па спэцыяльнасьці.
Напрыканцы 70-ых езьдзіў працаваць у Сібір, ствараючы там працоўныя калектывы, за што быў на допыце й потым пад доглядам КДБ.
З пачатку 90-х Васіль Кузьменка пачаў займацца бізнэсам. Разам з Паўлам Жуком ён выдаваў газэту “Свабода” і, відома, з гэтай прычыны ў яго паўсталі праблемы з уладамі. Таму ў сьнежні 1999 году Васіль выязджае ў Злучаныя Штаты Амэрыкі, дзе пачынаецца другая частка яго жыцьця.
У ЗША ён атрымаў палітычны прытулак. Скончыў College of Technology. Працаваў са шклом, у ювэлірнай майстэрні, апошнія 15 гадоў – у МТА.
Па сваім прыезьдзе ў ЗША Васіль Кузьменка адразу далучыўся да беларускай грамады.
Ён знайшоў сябе ў Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царкве, штонядзелі быў на літургіі ў Саборы Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку, прыслужваў у алтары. У розныя гады выбіраўся ў Парафіяльную раду, але пасады не былі для яго мэтаю, незалежна ад іх ён нязмушана й аддана клапаціўся пра парадак у храме, па-гаспадарску даглядаў будынак, быў дасьведчаным дарадцам, цікавым субяседнікам для сталых прыхаджанаў і новаэмігрантаў.

Меў у грамадзе рэпутацыю міратворцы, мудра абмінаў людзей канфліктных, бо ляг галоўнай была пазытыўная, стваральная беларуская праца.
Сын Андрэй зь вялікімі цяжкасьцямі пераадолеў бюракратычныя бар’еры ды Прыехаў на пабачаньне з бацькам. На жаль, на той час ужо нежывым, хворы так і ня выйшаў з комы.
Васіль Кузьменка быў крэміраваны ў Нью Ёрку. Будзе пахваны на могілках побач з бацькамі ў вёсцы Арлоўшчына каля Оршы. Пакінуў у жалобе жонку й двух сыноў, якія жывуць у Беларусі.

Вечная памяць добраму чалавеку й шчыраму хрысьціяніну!

Сям’я, сябры





## У ВЯНОК ПАМЯЦІ АЛЕГА ГУЛАКА



***Ганна Сурмач***

Сумная вестка з Беларусі.
Сяджу дома, хварэю на Ковід, і без таго не лепшы настрой. А тут гэтая нечаканая навіна – памёр Алег Гулак. Меў па сёньняшніх мерках усяго 55 гадоў, мог яшчэ шмат зрабіць дзеля беларускага грамадзтва.

Вядомы праваабаронца, з 1996 году ён працаваў у Беларускім Хэльсінскім камітэце, а з 2008 году быў старшынём гэтай праваабарончай арганізацыі.

Як грамадзкі абаронца ўдзельнічаў у сотнях судовых працэсаў і грамадзкіх дзеянняў па абароне правоў асобаў, якія сталі ахвярамі парушэння правоў чалавека ў Беларусі. У 2016 годзе атрымаў прэмію ў сфэры правоў чалавека і законнасьці ад міністэрстваў замежных справаў Францыі і Нямеччыны.

Праваабарончая дзейнасьць у сёньняшняй Беларусі адна з самых небясьпечных. Калі не трапіш у турму, дык страціш здароўе ад стрэссаў і негатыўных эмоцыяў, напружанай працы і адчуваньня пастаяннай небясьпекі.

Пазнаёмілася асабіста з Алегам толькі сёлета ўлетку, калі ён прыехаў у Нью-Ёрк пад час візіту Маргарыты Ляўчук. Яны разам наведалі наш Беларускі цэнтр у Брукліне, дзе адбылася прыемная сустрэча з гэтымі выбітнымі асобамі. Алег падыйшоў да мяне і нейк вельмі па-сяброўску прывітаўся. А потым запытаўся пра майго сына Алеся. Я зусім не ведала, што яны добра знаёмыя, а нават і сябры. Мой сын мае такі характар, што раскажа толькі пра тое, пра што запытаюцца, а я не магла падумаць запытацца. Аказалася, што на пачатку 2000-тысячных, калі Алег прыязджаў у Амэрыку, яны з Алесем разам працавалі, зарабляі грошы і бавілі шмат часу разам. У іх склаліся добрыя адносіны і цяпер яны абодва былі радыя сустрэцца. Я зьвяла іх па тэлефоне.

Гэты раптоўны адыход Алега ў вечнасьць прынёс вялікі смутак і ў нашу сямью.

Ад нас выказваем чырыя спачуваньні родным і блізкім сп. Алега і іграным паплечнікам у барацьбе за абарону правоў чалавека, якія жорстка ўтоптае ў гразь ашалелы дыктатрскі рэжым.

Сьветлая памяць сьветламу чалавеку!

## НА 94-М ГОДЗЕ ЖЫЦЦЯ ПАМЕРЛА МЭЦЭНАТКА Й БЕЛАРУСКАЯ ПАТРЫЁТКА МАРЫЯ ДЗЯМКОВІЧ



Дваццаць восьмага красавіка, на 94-м годзе жыцьця, памерла **мэцэнатка й сапраўдная беларуская патрыётка Марыя Дзямковіч**.
Яна будзе пахаваная побач з бацькам у Чыкага.
Зьмяшчаем тэкст колішняга сакратара Рады БНР **Вячаслава Бортніка** пра нашую выбітную дзячку. Артыкул быў зьмешчаны да 90- годдзя Марыі Дзямковіч на сайце Рады БНР дзясятага лютага 2020 году:
**https://www.radabnr.org/maryja-dziamkovic-90/**

“Праца на пасадзе Сакратара Рады БНР дала мне магчымасьць пазнаёміцца з многімі беларусамі замежжа: з кімсьці падчас асабістых сустрэчаў, зь іншымі ў працэсе ліставаньня ці размоваў па тэлефоне. Цікавая перапіска завязалася з доктаркай Марыяй Дзямковіч (Maria Demkowicz). Патрошку ў лістах яна распавяла мне гісторыю свайго жыцьця й дзейнасьці на карысьць роднай Беларусі.
Новае пакаленьне амэрыканскіх беларусаў амаль што нічога ня ведае пра тое, што рабілася 20-30, ня кажучы 70, гадоў таму. Нажаль, пераемнасьць пакаленьняў сёньня рэдкая зьява. Таму асабістыя гісторыі людзей як Марыя Дзямковіч маюць надзвычайную важнасьць для ўсіх нас. і прыпамінаць іх трэба ня толькі падчас юбілеяў.
Дарэчы, 15 лютага спадарыня Дзямковіч сьвяткуе 90-годдзе. Марыя пакінула родную вёску Моталь на Палесьсі маленькай дзяўчынкай, але любоў да Беларусі пранесла праз усё жыцьцё...
Дзядуля Марыі Пётра быў расстраляны партызанамі ў 1943 годзе. І ня толькі ён, але амаль уся сям’я. Гэта былі моцныя беларусы, якія цьвёрда стаялі на сваёй зямлі, умелі добра яе апрацоўваць, займаліся пчалярствам, мелі млын. Былі вясёлыя, прывязаныя да зямлі гаспадары...
Яе любімая 13-гадовая сяброўка Наста й брат Коля (якому споўнілася ўсяго 10 гадоў!) былі расстраляныя разам з бацькамі. “Віна” іхная складалася з таго, што дзядуля трохі ведаў нямецкую мову, і адночы немцы прымусілі яго нешта перакладаць. Марыі тады было 13 гадоў. Затым – выгнаньне з свайго дома, дзе жылі продкі, спроба ўладаў выкрэсьліць з народнай памяці тых, хто нешта ўмеў, нешта ведаў і меў мужнасьць супрацьстаяць гвалту. Перада мною ліст з малай радзімы, дасланы спадарыні Марыі ў 1989-м годзе: *“Больш пяцідзесяці год мінула з тае пары, калі лёс*

*разлучыў нас, маленькіх сяброваk зь вёскі Моталь. Так здарылася, што Марыя Дзямковіч апынулся ў далёкай Амэрыцы, дзе жыве з сям’ёй і ў цяперашні час, але не забыла за столькі год жанчына сваіх аднавяскоўцаў.*
*Ведаючы, што на радзіме настаў не вельмі лёгкі час, яна прыехала да нас з дапамогай. Прывезла ў родную вёску Моталь шмат мэдыкамэнтаў, акуляраў, многа чаго іншага. Усё гэта яна падаравала отальскай участковай бальніцы, а таксама людзям, якія прыходзілі да яе па дапамогу. Ніводнага чалавека не пакінула жанчына без увагі, для кожнага знайшлося ў яе й цёплае слова падтрымкі, й карысная парада. Асабліва ўразілі нас яе цярплівасьць, ветлівасьць, працавітасьць*”.
На пачатак 1992 года д-р Дзямковіч пераслала ў Беларусь мэдыкамэнтаў больш чым на 100 тысячаў даляраў. А вось яшчэ адзін ліст падзякі зь вёскі Закальле, надрукаваны ў газэце “Чырвоная Зьвязда” 23 верасьня 1997 года: “*Спн. Дзямковіч увесь час аказвае матар’яльную дапамогу сваім землякам ня толькі з роднай вёскі, але й суседніх. ...акрамя таго, што Марыя прывозіла асабіста, на адрас яе землякоў паступіла 13 пасылак зь лекамі, медыцынскімі прыладамі, абсталяваньнем.*
*Прыйшла такая пасылка і ў маю вёску. Яе перадалі ў маю сям’ю, бо ў нас сямёра дзяцей, ёсьць немалыя матар’яльныя праблемы. Дзякуй за гэта!*”
У красавіку 1993 года менская газэта “Набат” зьмясьціла артыкул пра наведваньне Беларусі амэрыканскай дэлегацыяй мэдыкаў на чале з прафесарам Пітсбургскага ўніверсытэту Томасам Фолі. Прафэсара Фолі зацікавіла чарнобыльскай праблемай менавіта Марыя Дзямковіч. Прафесар Фолі ўжо трэці раз быў у Беларусі. Дзякуючы ягоным захадам і пры актыўнай дапамозе доктара Дзямковіч, а таксама беларускае грамады ЗША, яму ўдалося атрымаць грант на 240 тысячаў даляраў дзеля супрацоўніцтва паміж амэрыканскімі й беларускімі лекарамі, што спэцыялізуюцца ў мэдычнай радыялёгіі.
Марыя Дзямковіч заваявала славу ў США як цудоўны доктар і грамадзкая дзяячка. Пра гэта гавораць найперш такія факты, што яна заўважана кіраўніцтвам ЗША. Была на сустрэчах з прэзыдэнтамі Бушам (старэйшым) і Клінтанам, а таксама сябруе з адной з самых слынных ва ўсім сьвеце нашых зямлячак, шматразовай алімпійскай чэмпіёнкай Вольгай Корбут.
Аднойчы, выступаючы на Кангрэсе Рэспубліканскай партыі ў Вашынгтоне, д-р Дзямковіч заявіла: “*...пытаньне, якое тычыцца маладых незалежных дзяржаваў новай Садружнасьці. Мы ня бачым занадта шмат энтузіязму з боку прэзыдэнта (Буша – В. Б.) ў аказаньні дапамогі новым незалежным рэспублікам былога СССР.*
*Прэзыдэнт Буш паказаў вялікую сілу падчас “халоднай вайны”, падчас зьменаў у былым Савецкім Саюзе. Ён не прызнаў “путч”.*
*Амэрыканскія беларусы хацелі б бачыць больш увагі й матар’яльнай падтрымкі новай дэмакратыі, праўдзеньні эканамічных рэформаў. Калі гэтага не зрабіць, то ізноў прыйдзе дыктатура й “халодная вайна”. А мы гэтага ня можам сабе дазволіць*”. Якія прарочыя словы!
У архіве спн. Дзямковіч шматлікія лісты падзякі ад амбасадараў й міністра замежных справаў Беларусі, Генэральнага сакратара ААН Бутраса Бутраса-Галі. Яна атрымала ўзнагароду Міністэрства аховы здароўя Польшчы і ейнае імя ўключана ў шматлікія біяграфічныя даведнікі ЗША. Спн. Дзямковіч многія гады падтрымлівала газэту “Беларус”, а таксама шматлікія дабрачынныя арганізацыі ў ЗША.
Марыі Барысаўне прысьвячалі вершы паэты. Некалькі вершаў напісаў Язэп Васілеўскі, праўда па-расейску. А яшчэ гісторыя ейнае сям’і лягла ў аснову манумэнтальнае трылёгіі Васіля Якавенкі пра лёс Беларусі ў 20-м стагоддзі “Пакутны век”. Вось, што піша пра яе ў гэтым кантэксьце філёляг Аляксей Рагуля: “*Тут мне ўяўляецца ўся сям’я Рамановічаў (дзявочае прозьвішча Марыі – В. Б.). Лёс іх моцна пакалечыў, пакруціў, яны праз вялікія “жорны” прайшлі, а ўцалела, па сутнасьці – хто? – можна сказаць, адна Марыя Раманавічанка. І мы бачым, засталася яна зусім неардынарнай асобай, вялікай жанчынай, чалавекам вялікага сэрца, з думкай пра сваіх блізкіх, пра родных, пра Бацькаўшчыну, пра яе будучыню. Нават ня думкай – у яе ж падсьвядомае адчуваньне свайго абавязку й сваёй нутранай патрэбы быць заўсёды зь людзьмі. Гэта яскравы беларускі нацыянальны характар*”.

Сьветлай памяці!..

## СЬВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ УЛАДЗІМЕРА КУДЗЕЛІЧА



22 лістапада 2021 пасьля цяжкой хваробы памёр малады беларус з новай іміграцыі Уладзімір Кудзеліч.

У ЗША Уладзімір з жонкаю Кацярынаю і дачкою Марыяй прыехалі ў 2016 годзе. Тут у іх нарадзілалася яшчэ двое дзяцей – сыны Раман і наймалодшы Марцін, якому на сёньня ўсяго толькі паўгады.

Уладзімір паходзіў з Пінску, дзе нарадзіўся 17 чэрвеня 1987. Скончыў Пінскі мясамалочны тэхнікум, а потым працягнуў вучобу у Беларускім аграрна-тэхнічным ўніверсітэце ў Менску і застаўся працаваць у сталіцы.

У Нью-Ёрку Уладзімір далучыўся да беларускай грамады праз свайго роднага брата Сяргея Кудзеліча, які ўзначальваў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА, а цяпер ёсьць намесьнікам старшыні.

Выказваем самыя шчырыя спачуваньні жонцы Уладзіміра сп. Кацярыне, ягоным бацькам і дзецям.

***Управа Нью-Ёрскага аддзела БАЗА***





## АДАМ МАЛЬДЗІС АДЫШОЎ У ВЕЧНАСЬЦЬ



***Ганна Сурмач***

Адам Мальдзіс памёр 3 студзеня 2022 ва ўзросце 89 гадоў, не дажыўшы сёлетняга 90-гадовага юбілею ў жніўні.

Не стала аднаго з тытанаў новага Беларускага Адраджэньня.
Навуковец, пісьменьнік, нястомны працаўнік на беларускай ніве, ён зрабіў шмат адкрыцьцяў, важных для нацыянальнай культуры і гісторыі. Быў няўрымсьлівы ў сваіх пошуках, умеў натхняць іншых сваім вялікім аптымізмам і вераю.

Заўсёды мог знайсьці кампраміс у цяжкіх сытуацыях, быў прыязным і кантактным чалавекам.

Адначасна быў цьвёрдым і мэтанакіраваным утых беларускіх справах, якія лічыў важнымі.
Сп. Мальдзіс шмат свайго часу аддаваў супрацы з беларускай эміграцыяй у сьвеце. Ён быў сярод першых, хто ў Беларусі пачаў ладзіць кантакты з беларускім замежжам.

Разам з прагрэсіўным беларускім грамадзтвам ён будаваў новую Беларусь і спадзяваўся на яе сьветлую будучыню. Як цяжка было яму пакідаць нас у гэты змрочны час разбурэньня нашых сумесных набыткаў, нашых дасягненьняў.

Сьветлая Вам памяць, Адам Восіпавіч!

## ВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ МІКАЛАЯ СУБАЧА (1937 - 2022)



***Ганна Сурмач***

5 студзеня 2022 г. адыйшоў у вечнасьць Мікалай Субач (Mikolaj Subocz), сябра Рады БАПЦ, парафіянін Парафіі Сьв. трох Віленскіх мучанікаў у г. Мельбурне, штат Вікторыя, Аўстралія. Нарадзіўся ў бацькоў Мікалая і Марыі Субач, у вёсцы Гліннае Вілейскага раёну ў Беларусі. У 1949 годзе, пасля Другой сусветнай вайны, Мікалай разам са сваім братам Віктарам і бацькамі эміграваў у Мельбурн, Аўстралія. Мікалай атрымаў ступень бакалаўра інжынера (электрыка) ва ўніверсітэце Мельбурна, а таксама ступень магістра інжынерных навук ва ўніверсітэце Монаша ў Мельбурне. На працягу больш за 20 гадоў Мікалай быў аддана і актыўна ўдзельнічаў у суполцы Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (БАПЦ) у Мельбурне. Не цураўся браць на сябе абавязкі, Мікалай заняў кіруючую ролю, калі заснавальнік парафіі вялебны а. Аляксандр Кулакоўскі захварэў і больш ня мог служыць або выконваць ролю ў царкоўным кіраваньні. Мікалай зрабіў вялікую працу па забеспячэньні фарміраваньня і функцыянаваньня парафіяльных і агульнацаркоўных камітэтаў у адпаведнасці зь іх статутнымі абавязкамі. Лагічная і практычная манера Мікалая дазволіла Парафіі БАПЦ у Мельбурне ўсталяваць спосаб, каб царква магла працягваць працу пасля пагаршэньня здароўя вялебнага а. Аляксандра. На працягу многіх гадоў Мікалай займаў пасаду старшыні Парафіяльнае Рады, а ў апошні час займаў ролю намесьніка старшыні і актыўна ўдзельнічаў у паседжаньнях Парафіяльна Рады, нават змагаючыся з хваробай. Ён таксама прадстаўляў Парафію на паседжаньнях Рады БАПЦ у ЗША. Як Мікалай, так і ягоная жонка Тамара Субач мелі прывілей прымаць у сябе дома архіяпіскапа Сьвятаслава з Канады зь некалькімі візітамі ў Аўстралію, дзе ён адслужыў Боскую Літургію ў царкве Сьвятых Віленскіх мучанікаў у Яравілі, Мельбурн, Аўстралія. Летам 2012 г. ён з жонкаю Тамараю, як дэлегаты ад свае парафіі, прымалі ўдзел у Саборы БАПЦ у Катэдры сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку, ЗША. Мікалай быў вельмі ганаровым беларусам і заўсёды быў у курсе беларускіх навін і падзей, захоўваючы надзею, што калі-небудзь Беларусь стане цалкам вольнай краінай.

## На выданьне газэты "Беларус ахвяравалі (Сакавік - Студзень 2022):

Ірына Аксёнчык....................$50
Лявон Анацка........................$50
Людміла Бакуновіч..............$75
Ліза Бакуновіч-Гройс
(Аустралія).............................$75
Таня Бурак.............................$50
Даша Белько..........................$50
Канстанцін Варабей...........$100
Кастусь Вайцяхоускі...........$100
Марыя Дземкавіч...................$50
Яўген Ждановіч......................$50
Рена Касьцюк.........................$50
Кацярына Кветко...................$50
Лізавета Кветка......................$50
Анна Куліна-Патэ
(у памяць Лёні Шкоды).........$50
Васілі Манкевіч......................$50
Сямья Мілеускіх.....................$50
Ганна Несцерава....................$50
Арцем Несцераў.....................$50
Элеанора Норык....................$50
Аксана Пятрашка...................$50
Уладзімір Ракуць.................$200
Аксана Раманюк.....................$50
Андрэй Раманюк....................$50
Ганна Сарачынская................$50
Артур Сянько..........................$50
Анатоль Занковіч.................$100
Міхал Чаропка........................$50
Цзяніс Юрага..........................$50

Вялікі дзякуй нашым ахвярадауцам, якія дапамагаюць выдаваць газэту